НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

МАТЭРЫЯЛЫ ПА АРХЕАЛОГІІ БЕЛАРУСІ

MATERIALS ON THE ARCHAEOLOGY OF BELARUS

Зборнік навуковых артыкулаў
Заснаваны ў 1957 годзе

Выпуск 21

Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка)

The Study of archaeological sites on the territory of Polotsk Land (to the 1150th anniversary of Polotsk)

Мінск
«Беларуская навука»
2011

УДК 902/904(476.5)(082)

У выданні прадстаўлены асноўныя вынікі навуковых даследаванняў археалагічных помнікаў ў межах г. Полацка і тэрыторыі Полацкай зямлі. Помнікі вывучаліся навуковымі супрацоўнікамі і аспірантамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі, супрацоўнікамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. У зборнік таксама увайшлі публікацыі аб старажытных паселішчах, могільніках і асобных катэгорыях знаходак з тэрыторыі Полацкай зямлі, якія раней не былі уведзены ў навуковы зваротак.

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я:

В. М. Ляўко, доктар гістарычных навук, прафесар (галоўны рэдактар);
П. Ф. Лысенка, доктар гістарычных навук, прафесар
(намеснік галоўнага рэдактара);
Г. В. Штыхаў, доктар гістарычных навук, прафесар;
А. Г. Калечыц, доктар гістарычных навук, прафесар;
Э. М. Загарульскі, доктар гістарычных навук, прафесар;
С. Я. Рассадзін, доктар гістарычных навук, прафесар;
І. А. Марзалюк, доктар гістарычных навук, прафесар;
С. А. Піваварчык, доктар гістарычных навук, дацэнт;
А. М. Мядзведзеў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (адказны сакратар);
В. Л. Лакіза, кандыдат гістарычных навук (намеснік адказнага сакратара)

Н а в у к о в ы р э д а к т а р, у к л а д а л ь н і к

доктар гістарычных навук, прафесар В. М. Ляўко

Р э ц э н з е н т ы:

доктар гістарычных навук, прафесар І. А. Марзалюк,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. М. Мядзведзеў

Выданне падрыхтавана ў рамках выканання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня 2007 г. № 647 «Аб зацвярджэнні Комплекснай праграмы развіцця г. Полацка на 2008–2012 гады», п. 23 «Арганізацыя працы пастаяннай археалагічнай экспедыцыі па вывучэнні Полацкай зямлі» (кіраўнік экспедыцыі – доктар гістарычных навук, прафесар В. М. Ляўко).

На вокладцы змешчана выява знаходкі з Полацка
(даследчык Д. У. Дук)

ISBN 978-985-08-1366-4

© ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2011
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2011

ЗМЕСТ

Прадмова 4

АРТЫКУЛЫ

Джумантаева Т. А. Музеефікацыя гісторыка-культурных помнікаў як частка працэсу адраджэння і захавання спадчыны 5

Саливон И. И., Емельянчик О. А. Формирование антропологического состава населения Полоцкой земли в XI–XIX вв. 19

Дук Д. У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. 30

Дук Д. У., Емяльянчык В. А. Могілкі полацкага гарадзішча (па выніках археалагічных раскопак ў 2007 г.) 61

Клімаў М. В. Новыя даныя аб Запалоцкім пасадзе ў Полацку (па выніках раскопак ў 2008 г.) 74

Дук Д. У. Экімань ў сацыятапаграфічнай структуры Полацка XV–XVIII стст. 99

Магалінскі І. У. Вытворчыя ювелірныя комплексы старажытнага Полацка (X–XVII стст.) 115

Левко О. Н., Войтехович А. В., Кенько П. М. Археологические исследования Друцка в 2008–2009 гг. 122

Левко О. Н. Витебск на пути «из варяг в греки» 154

Чараўко В. У. Да пытання аб раскопках М. Ф. Кусцінскім познесярэдневяковых курганных пахаванняў ў Лепельскім павеце 160

Штыхаў Г. В. Старажытны Лагойск у святле археалагічных раскопак 163

МАТЭРЫЯЛЫ

Магалінскі І. У. Ліцейныя формы і тыглі для плаўкі каляровых металаў з тэрыторыі Полацка (X–XVII стст.) 184

Клімаў М. В., Кенько П. М. Элементы паяснога набору з г. Полацка (па выніках раскопак 2008–2009 гг.) 194

Емяльянчык В. А. Комплексная антрапалагічная характарыстыка матэрыялаў пахаванняў XVII–XVIII стст. на полацкім гарадзішчы 199

Ляшкевич Э. А. О находках рыболовного инвентаря в средневековых могильниках Беларуси 204

Разлуцкая А. А. Новыя даныя аб ахвярных жывёлах з курганоў Полацкай зямлі 212

Салаўёў А. А. Новыя знаходкі сюжэтных кафляў у Полацку 220

Мядзведзева В. У. Культура сярэдневяковага насельніцтва Полацка (на аснове касцярэзнай вытворчасці) 225

Шарковская Н. Ю. Находки с Замковой горы в собраниях витебских музеев 232

Ермохин М. В. Результаты дендрохронологических исследований археологических материалов с территории Витебска в 2009–2011 гг. 265

Ермохин М. В. К вопросу о датировке «россонского идола» 270

ПРАДМОВА

У 2012 г. стольнаму гораду першага дзяржаўнага ўтварэння на тэрыторыі Беларусі – Полацку спаўняецца 1150 год. Полацк – адзін са старажытнейшых гарадоў Усходняй Еўропы, які побач з Ноўгарадам і Кіевам згаданы ў летапісах пад 862 г.

Полацкая зямля – дзяржава, у межы якой на працягу XI–XIII стст. уваходзіла насельніцтва паўночнага і часткі цэнтральнага рэгіёнаў тэрыторыі Беларусі. Да апошніх дзесяцігоддзяў X ст. у Полацку правілі князі, якіх можна яшчэ атаясаміць з князямі племянной пары. Першым у летапісе пад 980 г. згаданы полацкі князь Рагвалод, які «прыйшоў з-за мора». У тым жа 980 г. гэты князь разам са сваёй сям'ёй быў забіты наўгародскім князем Уладзімірам Святаславічам, які паставіў сваёй мэтай заняць Кіеўскі стол і ўзначаліць тую імперыю, якую ўтварыла дынастыя Рурыкавічаў у складзе Кіеўскай і Наўгародскай земляў. Паколькі Полацкае княства знаходзілася паміж дадзенымі землямі, яно таксама мела важнае значэнне ў палітычных адносінах. Страціўшы свайго князя Рагвалода, Полацкае княства папала ў залежнасць ад Уладзіміра Святаславіча, а дачка Рагвалода Рагнеда была прымушана стаць адной з яго жонак. Але ўжо напрыканцы X ст. Рагнеда разам з сынам Ізяславам павярнулася на радзіму і з таго часу ў Полацку ўсталявалася адноўленая дынастыя князёў Рагвалодавічаў (па дзеду Ізяслава). Тое, што Ізяслаў быў не толькі ўнукам Рагвалода, але і сынам Уладзіміра Святаславіча (гэта значыць таксама Рурыкавічам), верагодна ляжыць у аснове многіх канфліктаў, якія вынікалі паміж полацкімі і паўднёварускімі князямі і адлюстраваны ў летапісах і іншых крыніцах.

Неаднаразова рабіліся захады з боку паўднёварускіх князёў падпарадкаваць Полацкую зямлю Кіеву, але гэтыя спробы аказваліся безвыніковымі. Толькі напрыканцы 1130-х гадоў на працягу двух гадоў дзеці кіеўскага князя былі намеснікамі ў Полацкай зямлі, калі з дапамогай полацкага баярства яму ўдалося адправіць непакорных «рагваложычаў» у Візантыю на перавыхаванне. А ўжо ў 1132 г. Полацк і Полацкая зямля зноў былі пад кіраўніцтвам Васількa Святаславіча (унука Усяслава Чарадзея). Далейшы лёс Полацкай зямлі быў такім жа, як і Кіеўскай дзяржавы. На змену ім сталі прыходзіць больш дробныя княствы – ўдзелы, якія выдзеліліся з гэтых палітычных структур. Некаторы прамежкавы час рабіліся спробы захаваць ядро дадзеных дзяржаў – «Кіеўскую Русь» і «Полацкую воласць», якія выступалі ў якасці калектыўных уладанняў нашчадкаў Рурыкавічаў і Рагвалодавічаў. Але барацьба за ўладу і пашырэнне асабістых уладанняў удзельных князёў выйшла на першы план і прывяла да канчатковага распаду некалі буйных тэрытарыяльна-палітычных утварэнняў Усходняй Еўропы.

У дадзеным зборніку прадстаўлены матэрыялы археалагічных даследаванняў на самым раннім паселішчы старажытнага Полацка – гарадзішчы племянной пары, з якога пачалася гісторыя горада. Таксама не абдзелены ўвагай асобныя віды вытворчасці ў сярэдневяковым Полацку, некаторыя комплексы рэчаў, здабытыя ў апошнія гады пры археалагічных раскопках. Прыводзіцца грунтоўная характарыстыка матэрыялаў антрапалагічных даследаванняў насельніцтва старажытнага Полацка і Полацкай зямлі.

Некаторыя артыкулы прысвечаны вынікам даследавання ўдзельных цэнтраў Полацкай зямлі: Друцка, Лагожска, дзе адлюстраваны розныя аспекты іх гістарычна-тапаграфічнага развіцця, даецца характарыстыка матэрыяльнай і духоўнай культуры, адзначаны напрамак шляху «з варагаў ў грэкі» праз Віцебск. У 947 г. княгіня Вольга выкарыстала гэты шлях падчас вандроўкі на поўнач з мэтай абдзяржаўлення племянных тэрыторый.

Сярод вынікаў, атрыманых пры апрацоўцы археалагічных матэрыялаў, здабытых у раскопах, ёсць таксама і вынікі па распрацоўцы дэндрахраналагічнай шкалы старажытнага Віцебска і вызначэнні тэрміна спілоўкі дрэва, з якога выраблены выпадкова знойдзены ў р. Дрысе «расонскі ідал». Усе дадзеныя матэрыялы ўведзены ў навуковы зваротак упершыню, маюць вялікае навуковае значэнне і несумненна выклікаюць цікавасць навуковай супольнасці і тых, каму не абыякава старажытная гісторыя Беларусі.

В. М. Ляўко,
доктар гістарычных навук,
прафесар

АРТЫКУЛЫ

Т. А. Джумантаева, *Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, кандыдат культуралогіі (г. Полацк)*

Музеефікацыя гісторыка-культурных помнікаў як частка працэсу адраджэння і захавання спадчыны

У сучаснай культуры музей з'яўляецца шматфункцыянальным сацыякультурным інстытутам, адным з асноўных кампанентаў сферы культурнай спадчыны. Пашырэнне межаў музейнай дзейнасці сведчыць аб тым, што яна набывае ўсё большае сацыякультурнае значэнне. Музей стаў месцам развіцця культурнай разнастайнасці, якая ў сваю чаргу стала характэрнай рысай сённяшняга жыцця, здольнай процістаяць глабальнай культуры і глабальнай ідэнтычнасці. Сёння праблема захавання гісторыка-культурнай спадчыны стала вельмі актуальнай. Адным з найбольш аптымальных спосабаў захавання і выкарыстання спадчыны з'яўляецца яе музеефікацыя. У рамках дзейнасці музеяў-запаведнікаў, якія арганізуюць розныя віды музеефікацыі помнікаў, адбываецца аб'яднанне функцыі захавання і выкарыстання спадчыны шляхам уключэння музеефікаванага асяроддзя ў сучасную культуру.

Для дадзенай работы важнае значэнне мае канцэптуальная трактоўка музея як сацыяльна-культурнага інстытута, які займае сваё спецыфічнае месца ў жыцці грамадства. Пры ўсёй разнастайнасці навейшых тэндэнцый развіцця музеяў галоўнымі застаюцца адносіны наведвальніка музея да гістарычных традыцый і культурнай спадчыны. Перад музеем стаіць дваякая мэта: захаванне культурнай спадчыны для будучых пакаленняў і адкрыццё культурнай спадчыны для сучаснікаў.

Навуковых даследаванняў аб удзеле музеяў горада ў працэсе захавання культурнай спадчыны і музеефікацыі помнікаў як у замежнай, так і ў айчыннай літаратуры няма. Тым не менш Полацк з'яўляецца значным гісторыка-культурным комплексам нашай краіны з сусветна вядомымі помнікамі і пэўнымі музейнымі традыцыямі ў справе музеефікацыі не толькі асобных гісторыка-культурных каштоўнасцей, але і тэрыторый. Менавіта таму ў якасці даследавання ўзята сетка музеяў, аб'яднаных у структуру Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Прадметам даследавання з'яўляюцца асаблівасці функцыянавання і развіцця інстытута музея і яго роля ў інтэрпрэтацыі, прэзентацыі і захаванні культурнай спадчыны на фоне культурнай прасторы гістарычнага горада.

Дадзеная тэма была цесна звязана з працэсам падрыхтоўкі навуковых матэрыялаў для намінацыі помнікаў Полацка (Сафійскага сабора і Спаса-Праабражэнскай царквы) на ўключэнне іх у Спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. З гэтай нагоды прааналізаваны артыкулы Канвенцыі ЮНЕСКА па ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны [1]; юрыдычныя крыніцы, якія рэгулююць працэсы аховы і рэстаўрацыі помнікаў у Рэспубліцы Беларусь [2]; артыкулы Г. Кандрацьевай і І. І. Макавецкага аб захаванні помнікаў сусветнай спадчыны ў Беларусі і Расіі [3, 4]. Найбольш значнымі для навуковай работы па стварэнні канцэпцыі і стратэгіі захавання культурнай спадчыны Полацка сталі: «Дэкларацыя правоў культуры» Д. С. Ліхачова [5]; праца В. В. Глінніка аб гістарычных цэнтрах гарадоў Беларусі [6] і дадаткі да пастаноў урада Санкт-Пецярбурга аб захаванні культурнай спадчыны [7].

Канцэптуальнай мэтай Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка з'яўляецца музеефікацыя гістарычных раёнаў горада і яго цэнтра. У выніку музеефікацыі да адзінаццаці ўжо існуючых музеяў у хуткім часе будзе далучаны яшчэ адзін, які дапоўніць агульную экспазіцыю. Наперадзе – стварэнне музеяў, музеефікацыя помнікаў археалогіі і рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры, якія разам з тымі тэрыторыямі, што да іх прылягаюць, будуць прыстасаваны пад музейныя экспазіцыі.

Музеефікацыя помнікаў – гэта спецыфічны напрамак музейнай дзейнасці. Яе сутнасць у пераўтварэнні нерухомых помнікаў гісторыі і культуры (і прыродных аб'ектаў) ў аб'екты музейнага паказу з мэтай актыўнага ўключэння ў сучасную культуру пры ўмовах максімальнага захавання, выяўлення іх гісторыка-культурнай, навуковай і эстэтычнай каштоўнасці.

На тэрыторыі нашай краіны музеефікацыя помнікаў пачалася ў 20-ыя гады XX ст. ва ўмовах нацыяналізацыі маёнткаў, кляштараў і храмаў. У той час музейнае выкарыстанне было найлепшым, а часцей – адзіна магчымым спосабам захавання культурнай спадчыны.

У 1920-х гадах пачаўся працэс закрыцця «ідэалагічна шкодных» помнікаў-музеяў і прыстасаванне іх пад народнагаспадарчыя патрэбы ці пад экспазіцыі, якія не мелі адносін да самога помніка. У 1930–40-ыя гады для большасці помнікаў архітэктуры музейнае выкарыстанне азначала размяшчэнне ў іх інтэр'ерах экспазіцый, якія ігнаравалі культурную каштоўнасць помніка ці супярэчылі ёй (атэістычныя экспазіцыі ў храмах).

Тэрмін «музеефікацыя помнікаў» [8, с. 390–393] з'явіўся ў савецкай музеялогіі ў 1950–60-х гадоў падчас арганізацыі першых на тэрыторыі СССР музеяў-запаведнікаў і буйнамаштабных работ па рэстаўрацыі культурнай спадчыны. У 1970–1980 гг. музеефікацыя пачала прадугледжваць не толькі даследаванне, кансервацыю, рэстаўрацыю, захаванне і інтэрпрэтацыю помніка, але ў выключных выпадках і навуковую рэканструкцыю страчаных частак.

Важнейшым дасягненнем сучаснай музеялогіі стала ўключэнне ў арбіту музеефікацыі культурна-гістарычнага і прыроднага асяроддзя, а таксама асобных элементаў ладу людскога жыцця і відаў дзейнасці.

На падставе назапашанага музеем-запаведнікам практычнага вопыту ідзе інтэнсіўны працэс распрацоўкі і тэарэтычнага абгрунтавання асноўных прынцыпаў музеефікацыі полацкіх помнікаў. Сярод іх вылучаецца патрабаванне адначасовага стварэння рэстаўрацыйнага праекта і праекта музейнага выкарыстання. Распрацоўваюцца методыкі пашырэння ахоўных зон запаведніка (мал. 1), вызначэння аптымальных рэжымаў эксплуатацыі помнікаў, прасторавай арганізацыі экспазіцый, форм экспазіцыйнага абсталявання для музеяў-помнікаў. Пры выкарыстанні помнікаў архітэктуры пад музейныя экспазіцыі прасочваецца імкненне звесці да мінімуму дысананс паміж архітэктурна-прасторавым асяроддзем і прыўнесенымі элементамі экспазіцыі (экспанатамі, абсталяваннем). Пры музеефікацыі ў якасці самастойнага аб'екта паказу вялікае значэнне надаецца навуковай рэканструкцыі цэласнага ансамбля архітэктуры, жывапісу, прадметаў мэблі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а ў выпадках значных страт у інтэр'ерах – раскрыццю мастацкага значэння помніка пры дапамозе музейных сродкаў – музыкі, асвятлення, тэхнікі.

У план музеефікацыі Полацка запаведнікам былі ўключаны асобныя помнікі як архітэктуры, так і археалогіі. Складаныя праблемы ўзнікаюць пры музеефікацыі помнікаў археалогіі. Музейнае выкарыстанне – гэта адзіная магчымасць уключэння іх у сучасную культуру. Археалагічны аб'ект, які не музеефікаваны адразу пасля раскопак, страчваецца.

Гэтыя помнікі запаведніка маюць высокі ўзровень інфармацыйнага патэнцыялу. Паняцце «інфармацыйны патэнцыял» музейнага прадмета (рухомага і нерухомага) уключае ў сябе як вядомую інфармацыю аб прадмеце, яго «інфармацыйнае поле», так і схаваную. Інфармацыйнае поле музейнага прадмета вядома даследчыку ў сцёртым, збяднелым выглядзе, але ў працэсе працы з помнікам яно можа быць нарошчана з улікам пошуку «прывязкі» да пэўнага гістарычнага працэсу, выяўлення знакавых функцый аб'екта, устанаўлення асаблівасцей, дэталяў, падрабязнасцей, звязаных з яго бытаваннем; гэта значыць атрымання «інфармацыйнай дакладнасці». Найбольш паспяхова гэты працэс ажыццяўляецца пры вывучэнні рэчаў у комплексе. Першапачаткова музей-запаведнік уяўляе сабой комплекс сувязяў, якія захаваліся (у той ці іншай ступені) паміж асобнымі помнікамі, што дае аптымальныя магчымасці як для выяўлення і нарошчвання інфармацыйнага поля кожнага прадмета, так і для ўзнаўлення цэльнага і дакладнага вобраза эпохі, культуры, асобы. Дакладны вобраз нараджаецца толькі ў тым выпадку, калі інтэрпрэтацыя пачынаецца ўжо на стадыі музеефікацыі і ўся тэрыторыя запаведніка атрымлівае асэнсаванне як складаная, але адзіная экспазіцыя. Гэта ўмова набывае асаблівую важнасць там, дзе значная частка помнікаў страчана і сувязі паміж імі разарваны. Узнаўленне гэтых сувязяў, адраджэнне музейнымі сродкамі вобразаў мінулых эпох і культур, нарошчванне інфармацыйных палёў становіцца важнейшай задачай музеефікацыі, а задача гэта тым больш складаная, чым больш багатыя і разнастайныя сувязі былі страчаны ў мінулым.

Такім чынам, галоўнай канцэптуальнай мэтай запаведніка з'яўляецца паслядоўная музеефікацыя гістарычных раёнаў і цэнтра Полацка на прынцыпах унікальнай гістарычнай тэрыторыі.

Аднак пад аховай дзяржавы знаходзіцца толькі частка тэрыторый, яшчэ меншы абшар ахоплівае ахоўная зона запаведніка, але, як лічаць спецыялісты, музеефікацыя полацкага гістарычнага цэнтра ў яго фактычных межах магчыма [6, с. 7–8]. Тым больш што неабходнасць музеефікацыі гістарычных аб'ектаў унікальнай тэрыторыі Полацка не выклікае сумнення.

Паказальнай з'явай працэсу музеефікацыі асобнага помніка стаў Сафійскі сабор. Для яго музеефікацыі быў праведзены цэлы комплекс мерапрыемстваў:

– рэстаўрацыя будынка пасля архітэктурна-археалагічных даследаванняў, якія праводзіў В. А. Булкін;

– кансервацыя і частковая рэстаўрацыя фрэсак канца XI ст., якую праводзіла брыгада Спецыяльных навукова-вытворчых майстэрань Міністэрства культуры БССР на чале з рэстаўратарам В. Лукашэвічам [9, с. 14];

– стварэнне канцэпцыі прыстасавання помніка, аўтарамі якой сталі П. А. Раппапорт і В. Р. Слюнчанка;

– стварэнне экспазіцыі Музея гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора ў двух залах, уключаючы падвал;

– стварэнне ўмоў для неабходнага тэмпературна-вільготнага рэжыму;

– стварэнне ўмоў для выкарыстання акустыкі будынка;

– усталяванне аргана і размяшчэнне канцэртнага абсталявання.

У музеі спалучаецца паказ фрагментаў муроўкі, што належыць да розных этапаў будаўніцтва сабо-



Мал. 1. Карта-схема ахоўных зон гістарычнай тэрыторыі Полацка

ра, пачынаючы з сярэдзіны XI ст., з агульнай прасторавай структурай інтэр'ераў помніка. У сукупнасці гэтыя фрагменты, археалагічныя знаходкі і дапаможны матэрыял (у выглядзе чарцяжоў, слайдаў і макетаў) уяўляюць сабой арганічную экспазіцыю ў прасторава-пластычнай структуры помніка. Такая экспазіцыя валодае пазнавальным патэнцыялам, не патрабуе ўвядзення складанага музейнага абсталявання і аб'ёмнай тлумачальнай эксплікацыі, а таксама не парушае архітэктурнага вобраза будынка (мал. 2, 3).

У ходзе работы над кожным з асобных аб'ектаў мы часта вымушаны пераглядаць першапачатковыя мэты і ідэі. Трактоўка музейнага значэння архітэктурнага помніка ў працэсе музеефікацыі павінна дапускаць «адкрытую» даследчую пазіцыю. З'яўленне новых гістарычных і навуковых фактаў можа быць крыніцай фарміравання новых музейных функцый архітэктурнага помніка. Значэнне музеефікацыі помнікаў архітэктуры павялічваецца неабходнасцю захаваць гістарычны архітэктурна-горадабудаўнічы асяродак ва ўмовах гарадоў, якія растуць і развіваюцца. Сёння мала забяспечыць фізічную захаванасць помніка, яго неабходна ўключыць у агульны кантэкст духоўнай і матэрыяльнай дзейнасці. Тым больш што існуючыя вопыт і практыка паказалі, што ў нашых умовах ні выяўленне, ні ўлік, ні ахова дзяржавы не могуць забяспечыць захаванне нерухомых і рухомых помнікаў як нацыянальнай спадчыны. Кропкавыя аб'екты можна захоўваць і выкарыстоўваць толькі ў пэўным асяроддзі.

Таму неабходна разглядаць магчымасць музеефікацыі ўсяго гістарычнага цэнтра Полацка як адзінага цэлага. Але практычна гэта магчыма толькі на грунце канцэпцыі унікальнай культурна-гістарычнай тэрыторыі.



Мал. 2. Муроўка заходняй сцяны, якая захавалася з XI ст. на вышыню 8 м. Макет Сафійскага сабора XI ст. Фрагмент экспазіцыі

У Беларусі існуе тып унікальнай гістарычнай тэрыторыі – гэта гісторыка-культурныя музеі-запаведнікі. Запаведнік уяўляе сабой прасторавы аб'ект, дзе ў традыцыйным прасторавым і сацыяльна-культурным асяроддзі знаходзяцца прыродныя і гісторыка-культурныя аб'екты выключнай каштоўнасці і вартасці. Гэта комплекс помнікаў і тэрыторый, звязаных этнічнымі, эканамічнымі, гістарычнымі і геаграфічнымі фактарамі [10, с. 14], акрамя таго, гэта тэрыторыя гістарычнага горада.

Паколькі беларускае заканадаўства не вызначае «гістарычны горад» як аб'ект захавання і не рэгламентуе дзейнасць па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны ў гэтым напрамку, неабходна звярнуцца да дакументаў аўтарытэтных міжнародных арганізацый. У адпаведнасці з «Рэкамендацыяй аб ахове і сучаснай ролі гістарычных абшараў» (ЮНЕСКА, Варшава–Найробі, 1976) і «Хартыяй захавання гістарычных гарадоў і гарадскіх абшараў» (ІКАМОС, Вашынгтон, 1987) [1] і з рознымі іншымі міжнароднымі дакументамі, пад «захаваннем гістарычных гарадоў» маюцца на ўвазе тыя крокі, што неабходна зрабіць дзеля аховы, захавання і рэстаўрацыі такіх гарадоў...; таксама як і для іх развіцця і гарманічнай адаптацыі да сучаснага жыцця. Паводле «Вашынгтонскай хартыі», захаванню падлягаюць не асобныя аб'екты – будынкі ды паркі, а характэрныя для канкрэтнага гарадскога абшару асяродкавыя якасці, якія вылучаюць гістарычны характар горада, што выяўляецца ў такіх элементах, як:

«а) устойлівая планіровачная структура горада, вызначаная вуліцамі і зямельнымі пляцамі;

б) суадносіны паміж будынкамі, азяленымі і адкрытымі прасторамі;

Мал. 3. Фрагменты фрэскавых роспісаў і старажытныя аконныя праёмы на ўсходняй сцяне, якая захавалася з XI ст. на вышыню 12 м

в) фармальны выгляд будынкаў (інтэр'ер і экстэр'ер), вызначаны праз маштаб, стыль, памер, канструкцыю, матэрыялы, колер і дэкор;

г) сувязь горада або гарадскога абшару са сваім прыродным і рукатворным навакольным атачэннем;

д) разнастайныя функцыі, якія горад або гарадскі абшар набылі з цягам часу» [11, с. 39–40].

«Вашынгтонская хартыя» сцвярджае, што любая пагроза гэтым якасцям будзе кампраметаваць аўтэнтычнасць гістарычнага горада або гарадскога абшару.

У Законе «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» ёсць артыкул 15, які прысвечаны «Музеям-запаведнікам», дзе канстатуецца, што «Комплексы і ансамблі нерухомых матэрыяльных гістарычна-культурных каштоўнасцей, якія маюць асаблівую навуковую, гістарычную, мемарыяльную, мастацкую і (або) эстэтычную вартасць, разам з тэрыторыяй, гістарычна і культурна звязанай з імі, па прадстаўленні Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь... могуць быць аб'яўлены Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па яго даручэнні Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь музеямі-запаведнікамі» [12, 13]; што іх прававы статус вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь і што ахова запаведнікаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» [2]. Нічога не сказана ў Законе аб унікальных гістарычных тэрыторыях, аб рэгламентаванні дзейнасці на тэрыторыі запаведніка і ўвогуле аб тым, што такое гісторыка-культурны запаведнік на самой справе.

Вядома, што унікальная гістарычная тэрыторыя – гэта цэласны прасторавы аб'ект, дзе ў традыцыйным прасторавым і сацыяльна-культурным асяроддзі знаходзяцца гісторыка-культурныя і прыродныя аб'екты выключнай каштоўнасці і вартасці. Адзінкамі унікальнай гістарычнай тэрыторыі з'яўляюцца комплексы помнікаў і тэрыторый, звязаных геаграфічнымі, этнічнымі, эканамічнымі, гістарычнымі фактарамі. Зразумела, што кропкавыя аб'екты немагчыма ні захаваць, ні выкарыстаць без асяроддзя. Таму цалкам слушнымі ўяўляюцца вызначэнні паняццяў «музей-запаведнік» і «тэрыторыя музея-запаведніка», якія дае вядомы музеязнаўца А. М. Калбаска: «Музей-запаведнік – гэта комплекс помнікаў прыроды, гісторыі, культуры разам з тэрыторыяй, на якой яны знаходзяцца, што ўяўляе унікальную гістарычную, навуковую і культурную каштоўнасць. Музеі-запаведнікі могуць быць: біясферным, прыроднымі, культурнымі, гісторыка-архітэктурнымі, гісторыка-археалагічнымі і інш. Тэрыторыя, якую займае музей-запаведнік, выключаецца з сельскагаспадарчага ці іншага гаспадарчага выкарыстання і перадаецца яму на правах карыстання ў парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. На адведзенай для музея-запаведніка тэрыторыі забараняецца дзейнасць, якая супярэчыць яго функцыянальнаму прызначэнню і можа негатыўна ўплываць на стан захавання комплексу, а таксама іншая дзейнасць, не сумяшчальная з дзейнасцю музея як установы культуры.

На гэтай тэрыторыі адпаведна статуту музея-запаведніка могуць быць вылучаны зоны: *запаведная* – для захавання і аховы найбольш каштоўных гісторыка-культурных, прыродных ці іншых комплексаў; *экспазіцыйная* – для стацыянарнага экспанавання буйнамаштабных музейных прадметаў і выкарыстання ў культурна-пазнавальных мэтах; *навуковая* – для правядзення навукова-даследчай дзейнасці; *рэкрэацыйная* – для адпачынку і абслугоўвання наведвальнікаў музея; *гаспадарчая* – для размяшчэння дапаможных гаспадарчых аб'ектаў» [10, с. 16]. Несумненна, гэтыя паняцці павінны стаць юрыдычнымі нормамі, калі мы дбаем пра захаванне нацыянальнай спадчыны.

На старонках гэтай работы разглядаецца адзін з існуючых на тэрыторыі Беларусі тыпаў унікальнай гістарычнай тэрыторыі – гісторыка-культурны музей-запаведнік.

Як і звычайнаму музею, музею-запаведніку ўласцівы ўвесь набор традыцыйных музейных функцый: адбор, захаванне, вывучэнне і прэзентацыя. У адрозненне ад традыцыйнага музея ў сістэме кардынат запаведніка пашыраецца сэнс такіх музеялагічных паняццяў, як «музейны прадмет» і «прэзентацыя». Музейным прадметам тут можа быць помнік архітэктуры, рамяство, мова, свята, царква..., – усё, што бытуе і бытавала ў пэўным асяроддзі, што трэба ратаваць ці адрадзіць, захаваць і прэзентаваць – не проста прадэманстраваць знешні выгляд, а вярнуць ці ўключыць у плоскасць рэальнага існавання. Другім адрозненнем музея-запаведніка з'яўляецца абавязковая наяўнасць пэўнай тэрыторыі з людзьмі, якія хочуць у гэтым працэсе браць непасрэдны ўдзел.

З улікам усяго зробленага і назапашанага за гады існавання Полацкага запаведніка трэба ісці далей. Як вядома, у аснове рэальнай справы заўжды ляжыць мысленнае ўяўленне аб ёй – ідэя. Думаючы пра перспектывы развіцця запаведніка, мы прыходзім да неабходнасці скласці такое ўяўленне, знайсці ў ім адбітак сацыяльна-культурных працэсаў нашага часу. Позірк вузкага спецыяліста – архітэктара ці эколага, гісторыка ці эканаміста – ахоплівае адзін з бакоў і не дае ўяўлення пра цэлае. Таму ўзнікае неабходнасць сфармуляваць агульнае бачанне праблемы з пазіцыі кіравання гэтымі працэсамі (з аднаго боку, карціну будучага, вобраз, у якім заключаны сэнс справы; а з іншага – ідэальную мадэль развіцця).

На пачатку трэцяга тысячагоддзя нашай эры ўсё больш усведамляецца значнасць гістарычнай спад-

чыны. Полацку пашанцавала захаваць шэраг помнікаў у іх аўтэнтычным асяроддзі. У сувязі з гэтым у горада ёсць будучыня ў сэнсе адраджэння. На першым этапе гэтага працэсу магчыма адраджэнне Полацка ў яго новым гістарычным і культурным гучанні, у сэнсе прызнання яго імя тысячамі людзей. Не апошнюю ролю ў гэтай справе адыгрываў і паспяхова працягвае адыгрываць Полацкі запаведнік. Місія запаведніка вызначаецца ў аб'яднанні мэт на шляху захавання нацыянальнай культурнай спадчыны і інтэграцыі суседніх нацыянальных культур.

Каб дасягнуць пастаўленай мэты, трэба разумець, што развіцця аднаго запаведніка мала. Неабходна памятаць пра іншыя складнікі поспеху. Вядома, што, развіваючы толькі запаведнік, мы будзем сустракацца з праблемамі. Напрыклад, прадпрымальнік не заўсёды прыме да ўвагі ўмовы рэстаўратара і г. д. Розныя падыходы галіновых спецыялістаў будуць аб'ектыўна ствараць супярэчнасці. Таму галоўнымі складнікамі поспеху любой справы, а ў дадзеным выпадку – здзяйснення канцэпцыі развіцця горада і запаведніка, з'яўляюцца: культуралагічныя, эканамічныя і прававыя. Апошні мала паддаецца ўпраўленню, тым больш што сучаснае заканадаўства пакуль недасканалае, і таму трэба ў першую чаргу засяродзіць увагу на першых двух складніках.

Зыходзячы з практыкі, безумоўна, прыярытэтным трэба лічыць культурна-гістарычны аспект. Сувязнай тэмай, стрыжнем любой сённяшняй стратэгіі адраджэння Полацка з'яўляецца гісторыя унікальнай культурнай прасторы, таму неабходнасць яе далейшага даследавання, вывучэння, захавання і музеефікацыі не выклікае сумнення.

У сувязі з гэтым мы пазнаёміліся з дакументам «Пецярбургская стратэгія захавання культурнай спадчыны» [7], які стаў для нас арыенцірам у рабоце над праектам мадэлі *стратэгіі захавання культурнай спадчыны Полацка.* Дадзены праект вызначае асноўныя прыярытэты, крытэрыі і накірункі аховы культурнай спадчыны Полацка з улікам эпохі глабалізацыі, развіцця горада і інтэграцыі сучаснай архітэктуры ў гістарычную забудову; не парушаючы гістарычнага вобраза горада, прытрымліваючыся асноўнага прынцыпу – комплекснага захавання спадчыны на аснове збалансаваных і гарманічных адносін паміж патрабаваннямі грамадскасці, эканамічнай дзейнасці і аховы гістарычнага асяроддзя. Прыводзім вытрымкі з дакумента, распрацаванага намі і зацверджанага 20 чэрвеня 2008 г. Полацкім выканаўчым камітэтам. (Адрас поўнага тэксту на беларускай, рускай і англійскай мовах: http://polotsk.museum.by/node/126.)

Культурная спадчына ў эпоху глабалізацыі. Культурная спадчына ўяўляе сабой духоўны, культурны, эканамічны і сацыяльны капітал унікальнай каштоўнасці. Разам з прыроднымі багаццямі культурная спадчына з'яўляецца асновай для нацыянальнай самасвядомасці (самапавагі) і прызнання сусветнай грамадскасцю.

У эпоху глабалізацыі постіндустрыяльная цывілізацыя ўсвядоміла высокі патэнцыял культурнай спадчыны, неабходнасць яго захавання і эфектыўнага выкарыстання як адзін з важнейшых рэсурсаў сусветнай эканомікі. Любыя страты спадчыны непазбежна адбіваюцца на ўсіх абсягах жыцця сучаснага і будучых пакаленняў, прыводзяць да духоўнага збяднення, разрываў гістарычнай памяці, збяднення грамадства ў цэлым. Яны не могуць быць узноўлены ці кампенсаваны. Асновай развіцця цывілізацыі можа быць толькі прымнажэнне і захаванне культурных каштоўнасцей.

Культурная спадчына Полацка. Каштоўнасць – у аўтэнтычнасці. Выключная каштоўнасць Полацка заключаецца ў аўтэнтычнасці, універсальнасці і агульначалавечай значнасці яго культурнага набытку.

Старажытны Верхні замак Полацка ў канцы X – пачатку XI ст. стаў умацаваным княжацкім цэнтрам. У натуральным геаграфічным асяроддзі – пры злучэнні дзвюх рэк Палаты і Дзвіны, ён захаваўся ў нязменным выглядзе да нашага часу. Становішча дзядзінца на мысе каля зліцця рэк вызначыла трохвугольную ў агульных рысах канфігурацыю яго тэрыторыі яшчэ ў X–XIII стст., што нагадвала трохвугольную форму плана Канстанцінопаля, які амываецца з аднаго боку морам, з другога – вузкім залівам. Такі прынцып размяшчэння горада прыпадабняўся да ідэйных, функцыянальных і прасторавых сімвалаў, уласцівых сістэме формаўтварэння раннехрысціянскіх сталіц – Іерусаліма, Рыма, Канстанцінопаля.

Тут і быў пабудаваны Сафійскі сабор, што на многія стагоддзі вызначыла дадзеную тэрыторыю як адміністратыўны, духоўны і культурны цэнтр горада. Наяўнасць дадзенай тэрыторыі ў нязменным выглядзе захоўвае яго сацыяльна-прасторавую, сэнсавую і эмацыянальную нагрузку. У сувязі з гэтым асабліва каштоўным з'яўляецца комплекснасць аб'екта, які валодае не толькі знешнімі геаграфічнымі, архітэктурнымі і тапаграфічнымі прыкметамі X–XI стст., але і нясе ў сабе археалагічныя культурныя напластаванні ад моманту ўзнікнення да XVIII ст. Апошнія ўтрымліваюць *in situ* падмуркі храмаў і княжацкага церама XII–XIV стст., жыллё гараджан XI–XIII стст., абарончых збудаванняў, гарадской інфраструктуры.

У дадзены момант Сафійскі сабор уяўляе сабой складаны архітэктурны комплекс, у аснове якога ляжыць ацалелая частка візантыйскага кафедральнага сабора XI ст. Сабор таксама захоўвае значныя фрагменты рэнесанснай рэканструкцыі пачатку XVII ст. (заходняя бакавая капліца). Кампазіцыя

сучаснага сабора, якая канчаткова склалася ў сярэдзіне XVIII ст. у выніку перабудовы верхніх частак сцен і прыбудовы галоўнага фасада, без істотных змяненняў захавалася да нашага часу. Сабор уяўляе сабой трохнефавую базіліку з двухвежавым галоўным фасадам. Пасля пераарыентацыі ў пачатку XVII ст. алтарная частка візантыйскага сабора (XI ст.) уключана ў яго структуру ў якасці ўсходняй бакавой капліцы.

Сафійскі сабор стаў пачаткам фарміравання унікальнай полацкай школы архітэктуры, якая асабліва ярка адлюстравалася ў Спаса-Праабражэнскім храме.

У наш час Спасаўская царква ўяўляе сабой храм XII ст., які цалкам захаваўся, у XVII–XIX стст. дапоўнены надбудовамі. Зменаная канструкцыя даху не парушыла візантыйскую аснову помніка, але дазволіла захаваць унікальны канструктыўны элемент дадзенага аб'екта – двухступеньчаты рад закамар («какошнікаў»), які дэкарыруе ступеньчаты пераход ад скляпенняў да падкупальнага барабана. Менавіта гэтая асаблівасць знешняга аблічча адлюстравана і на старажытнай фрэсцы, нядаўна раскрытай У. Ракіцкім у келлі прападобнай Ефрасінні на хорах царквы.

Унікальнасць Спасаўскай царквы шматгранная, і адным з найярчэйшых бакоў гэтага выдатнага помніка з'яўляюцца роспісы XII ст., якія захаваліся практычна ў поўным аб'ёме храма.

Полацк, як і іншыя еўрапейскія гарады феадальнай эпохі, меў тэндэнцыю рухацца ўздоўж восі, улічваючы асаблівасці рэльефу. Такой воссю для Полацка, як і для многіх гарадоў, была рака, у дадзеным выпадку – Дзвіна. Верхні замак стаў першым умацаваным цэнтрам на ўзбярэжжы Заходняй Дзвіны, услед за ім з'явіліся іншыя пасады. Цэнтральная частка горада, зададзеная міжрэччам Палаты і Дзвіны, доўгі час (па XIX ст. уключна) развівалася па веерна-радыяльнай прасторавай схеме, якая амаль цалкам захавалася да нашых дзён.

Вобраз горада ствараюць не толькі шэдэўры архітэктуры, але і цэласнае архітэктурна-прасторавае асяроддзе з высокай ступенню захаванасці і аўтэнтычнасці забудовы XVII–XX стст., заснаванай на сінтэзе агульнаеўрапейскіх культурных традыцый, планіровачных рашэнняў і тыпаў будынкаў.

Археалагічная спадчына – бясцэнны летапіс старажытнейшага горада краіны.

Культурная спадчына як фактар устойлівага развіцця Полацка. Без культурнай спадчыны немагчыма ўявіць сучаснае жыццё Полацка і перспектывы яго развіцця. Спадчына ў многіх адносінах фарміруе асаблівы менталітэт палачан, зацвярджае пераемнасць гуманістычных каштоўнасцей, падкрэслівае неафіцыйны статус культурнай сталіцы Беларусі, стварае сусветны прэстыж Полацка.

Для Полацка спадчына мае такое ж значэнне, як для другіх рэгіёнаў прыродныя рэсурсы, месцараджэнні нафты і алмазаў. Спадчына ўключана ў многія сацыяльныя працэсы і з'яўляецца крыніцай духоўнага ўзбагачэння. Мабілізацыя эканамічнага рэсурсу культурнай спадчыны – аснова гарадской рэгенерацыі. У канчатковым выніку менавіта высокія эстэтычныя якасці і ступень захаванасці гістарычнага асяроддзя забяспечваюць асаблівую інвестыцыйную прывабнасць Полацка і яго рэальную камерцыйную каштоўнасць, служаць залогам дабрабыту грамадзян. Гэта павінна выяўляцца не толькі ў хуткай эканамічнай аддачы і росце занятасці насельніцтва ў розных галінах дзейнасці, але і ў шырокім коле непрамых выгод, якія стануць здабыткам усёй гарадской грамады (даходы ад кіравання спадчынай, рэстаўрацыі, турызму і яго інфраструктуры).

Дзяржаўная палітыка ў галіне захавання культурнай спадчыны. Базавы прынцып – комплекснае захаванне спадчыны, згодна з якім гэтая дзейнасць эфектыўная толькі ў рамках палітыкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця Полацка, у складзе праектаў перспектыўнага планавання і горадабудаўніцтва. Захаванне аб'ектаў культурнай спадчыны павінна стаць ключавым элементам стратэгіі гарадскога абнаўлення.

Прынцып комплекснага захавання ўключае ініцыіруючую і каардынуючую функцыі органаў дзяржаўнага кіравання ў развіцці партнёрскіх адносін з грамадскасцю і недзяржаўным сектарам. Варта стымуляваць міждысцыплінарны, міжведамасны падыход да захавання культурнай спадчыны, выкарыстоўваючы ўсе даступныя рэсурсы. Задача захавання культурнай спадчыны павінна вырашацца не толькі органамі аховы помнікаў, але таксама тымі структурамі, якія адказваюць за горадабудаўніцтва і архітэктуру, эканоміку і прамысловае развіццё, экалогію, транспарт, добраўпарадкаванне, маёмасны комплекс, жыллёва-камунальную гаспадарку, юрыдычныя службы і г. д.

Розныя канцэпцыі захавання культурнай спадчыны. Традыцыйная ахова помнікаў, заснаваная на мерах забароннага характару, у сучасных умовах, пры наяўнасці многіх гаспадарчых суб'ектаў, параджае канфліктныя сітуацыі ў ходзе сацыяльнага, культурнага і эканамічнага развіцця гарадской тэрыторыі. У гэтым выпадку ахова культурнай спадчыны адчужаецца ад мясцовай грамады, гараджане пазбаўляюцца матывацыі ўдзелу ў гэтай дзейнасці.

Іншая канцэпцыя, калі палітыка аховы культурнай спадчыны выгадная насельніцтву, прадугледжвае сітуацыю, калі некаторыя нязручнасці пражывання на асаблівай тэрыторыі, звязаныя з аховымі абмежаваннямі, кампенсуюцца пэўнымі льготамі. Цэласнасць культурнага і прыроднага асяроддзя становіцца якасцю, якая можа забяспечыць развіццё гарадской грамады (праз даходы ад турызму, рэс-

таўрацыйна-ўзнаўленчыя работы, павышэнне сацыяльнага статусу і г. д.).

Новая стратэгія будуецца на аснове збалансаваных і гарманічных адносін паміж патрабаваннямі грамадскасці, эканамічнай дзейнасці і аховы гістарычнага асяроддзя. Яна павінна прывесці да прызнання агульнай адказнасці за захаванне спадчыны.

Ахоўныя практыкі. Склад і прадметы аховы культурнай спадчыны. На працягу доўгага часу ахоўваліся асобныя помнікі без уліку іх акружэння. Спецыфіка культурнай спадчыны Полацка дыктуе практыку спалучэння аб'екта і асяроддзя ў горадабудаўніцтве. Прадметы аховы культурнай спадчыны – гэта ключавыя элементы, параметры, характарыстыкі асяроддзя, якія з'яўляюцца носьбітамі гістарычнай, архітэктурнай, мастацкай каштоўнасці. Побач з асобнымі аб'ектамі культурнай спадчыны ахоўваюцца і галоўныя горадабудаўнічыя прынцыпы. Найвышэйшую каштоўнасць уяўляюць аб'ёмна-прасторавы планіровачны каркас, канфігурацыя цэнтральных водных прастораў, агульнагарадскі сілуэт, панарамы рэк, ансамблі плошчаў, перспектывы асноўных вуліц. Прадметам аховы з'яўляецца характар асяроддзя, які ўключае планіровачны модуль кварталаў і ўчасткаў, маштаб, высотнасць і чляненне забудовы. Горадабудаўнічая ахова прадугледжвае рэжым археалагічных даследаванняў для найбольш ранніх і каштоўных участкаў культурнага слою, пошукавыя і маніторынгавыя мерапрыемствы.

Зоны аховы – гэта тэрыторыі, дзе ўсталёўваецца рэжым горадабудаўнічай і гаспадарчай дзейнасці, што забяспечвае фізічную захаванасць аб'екта культурнай спадчыны і яго гістарычнага акружэння. Асаблівасць ахоўнага заніравання ў Полацку – зона аховы гістарычнага цэнтра, дзе павінна быць забаронена новае будаўніцтва (за выключэннем мер, накіраваных на рэгенерацыю гістарычнага асяроддзя і прыстасаванне аб'ектаў культурнай спадчыны для сучаснага выкарыстання); забаронена змяненне гістарычнай планіровачнай структуры вуліц і ліній кварталаў; абмежавана рэканструкцыя аб'ектаў, якія ўяўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць.

У зоне рэгулявання забудовы павінны быць устаноўлены дыферэнцыраваныя рэжымы абмежаванняў, якія дапускаюць рэканструкцыю без змяненняў планіровачнай структуры, асноўных асяроддзевых характарыстык, асобных аб'ектаў культурнай спадчыны, у тым ліку археалогіі, што забяспечыць захаванасць гістарычнай забудовы.

Зараз ў Полацку пад дзяржаўнай аховай знаходзіцца каля 100 аб'ектаў культурнай спадчыны.

Пагрозы і рызыкі фізічнай страты гісторыка-культурнай спадчыны Полацка. Пагрозы фізічнай страты (разбурэння) аб'ектаў спадчыны звязаны з працэсамі старэння, якія паскараюць:

– неспрыяльныя кліматычныя ўмовы, структурна-няўстойлівыя грунты паблізу ад басейнаў рэк;

– атмасферныя забруджванні;

– некантраляваная урбанізацыя і рух аўтатранспарту;

– недарэчнае новае будаўніцтва ў гістарычным асяроддзі;

– няправільны рэжым эксплуатацыі будынкаў;

– пажары, вандалізм і іншыя агрэсіўныя дзеянні.

Для захаванасці аб'ектаў культурнай спадчыны ўяўляе небяспеку таксама інтэнсіўны турызм, які прыводзіць да празмернай нагрузкі на аб'екты. Згубныя «татальныя» рэстаўрацыі, якія наносяць шкоду аўтэнтычнасці помніка.

Адсутнасць належнай абароны будынкаў ад умоў надвор'я, тэхнагеннай нагрузкі на грунты і канструкцыі, загазаванасць і кіслотныя дажджы ствараюць кумулятыўны эфект. Актывізуюцца працэсы карозіі металаў і карбанізацыі слаёў тынкоўкі, «дзікая» рыхлая паціна раз'ядае бронзавыя і медныя паверхні, абразіўнае ўздзеянне знішчае пазалоту, пераражаюцца камень і мармур, грунтавыя воды разбураюць падмуркі, біялагічныя пашкоджанні распаўсюджваюцца на драўляныя канструкцыі. З-за ўздзеяння экалагічных і антрапагенных фактараў сёння ўжо многія помнікі знаходзяцца ў актыўнай фазе разбурэння.

Метадаў вечнага захоўвання не існуе. Галоўная задача – прыпыніць працэсы натуральнага старэння і зношвання, мінімізаваць фактары іх паскарэння.

Меры і метады супрацьдзеяння разбуральным з'явам. Агульныя меры прыпынення працэсаў разбурэння:

– скарачэнне крыніц забруджвання і вібрацыі (аддаленне аўтатранспарту, абмежаванне парковак, забарона руху транспартных сродкаў паблізу ад асабліва каштоўных помнікаў);

– зніжэнне пагаршэння становішча гістарычных пабудоў шляхам правільнай эксплуатацыі і догляду канструкцый, аховы будынкаў ад кліматычных умоў, ліквідацыі дэфектаў, якія аслабляюць структуру, дапускаюць пранікненне і капілярны рух вод, перашкаджаюць дрэнажам;

– эфектыўнае выкарыстанне помнікаў павінна быць вартым іх значэння і не супярэчыць захаванасці;

– забарона на выкарыстанне непрыдатных і шкодных матэрыялаў у рэстаўрацыі, кансервацыі і рамонце;

– фізічная ахова;

– сістэматычныя супрацьпажарныя мерапрыемствы.

Для кожнага віду небяспекі і тыпу гістарычных збудаванняў належыць распрацаваць прафілактычныя меры з комплексам арганізацыйных, адміністратыўных і тэхнічных мерапрыемстваў па прадухіленні пагроз, зніжэнні страт, а таксама пастаянна праводзіць маніторынг становішча і прагноз развіцця.

Рэстаўрацыя, кансервацыя, узнаўленне аб'ектаў культурнай спадчыны. Рэстаўрацыя – мера вымушаная, надзвычайная, яна прадугледжвае глыбокае ўмяшанне ў сапраўдную тканіну помніка, цягне за сабой элементы ўзнаўлення і знішчае часцінку аўтэнтычнасці. Венецыянская хартыя, якая зацвердзіла міжнародныя прынцыпы рэстаўрацыі, аддае перавагу кансервацыі, а рэстаўрацыя праводзіцца ў выключных выпадках, калі іншыя спосабы захавання не вартыя.

Школа сапраўднай рэстаўрацыі з выкарыстаннем традыцыйных тэхналогій, руплівым даследаваннем фрагментаў арыгінальных фрагментаў помнікаў, іканаграфічных і архіўных матэрыялаў у дадзены момант у краіне адсутнічае. Сучасная рэстаўрацыйная практыка, на жаль, не заснавана на прынцыпе належнай археалагічнай рэстаўрацыі (гэта значыць руплівым, метадычным вывучэнні помніка ў арыгінале, падобным да вывучэння аб'екта археалогіі). У адпаведнасці з «Венецыянскай хартыяй» навуковая рэстаўрацыя заканчваецца тады, калі пачынаецца домысел.

Актуальная задача – стварэнне навукова-даследчага цэнтра (інстытута рэстаўрацыі) для распрацоўкі і ўкаранення сучасных рэстаўрацыйных прынцыпаў, нормаў і методык, новых тэхналогій, якія адпавядаюць спецыфіцы беларускай спадчыны, для ацэнкі якасці матэрыялаў і работ, для атэстацыі і падрыхтоўкі спецыялістаў. Мэтазгоднай з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў па рэстаўрацыі і ахове спадчыны ў сістэме сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі на аснове дзяржаўных заказаў. Іншыя меры па забеспячэнні рэстаўрацыйнай дзейнасці:

– дакладная дыферэнцыяцыя, устанаўленне нормаў і расцэнак на ўсе віды рэстаўрацыйных работ;

– забеспячэнне і абарона аўтарскіх правоў праз выкарыстанне там, дзе гэта магчыма, знакаў якасці, сертыфікатаў майстэрства;

– прапаганда якасці рэстаўрацыйных работ з дапамогай выстаў, конкурсаў, майстэрняў рамеснікаў у турыстычных зонах;

– заахвочванне вучобы, прадастаўленне грантаў;

– стварэнне майстар-класаў, стымулюючых як высакакласных спецыялістаў, так і таленавітую моладзь, якая жадае авалодаць сакрэтамі майстэрства;

– шырокае інфармаванне грамадскасці праз сродкі масавай інфармацыі.

Гэта павінна павысіць вартасць прафесіі, каштоўнасць і сацыяльна-эканамічную значнасць рэстаўрацыі і рамяства, а адпаведна адкрыць новыя перспектывы працаўладкавання і асабістай рэалізацыі.

Сучасная архітэктура ў кантэксце аховы культурнай спадчыны. Полацк – горад, які развіваецца, таму ўзгадненне інтарэсаў аховы культурнай спадчыны з неабходнасцю развіцця і рэканструкцыі тэрыторый – адна з важнейшых задач.

Інтэграцыя сучаснай архітэктуры ў гістарычную забудову перыядычна ўзнікае ў тэорыі і практыцы ахоўнай справы. Новая архітэктура ў кантэксце гістарычнага асяроддзя – адна з важнейшых складаючых стратэгіі захавання культурнай спадчыны. Зоны рэгулявання забудовы вызначаюць магчымасці новага будаўніцтва на тэрыторыях незавершанага або дэградзіраванага горадабудаўнічага асяроддзя, разарваных вулічных франтоў, унутрыквартальных участках і на месцах страчаных будынкаў. Новае будаўніцтва павінна служыць рэстаўрацыі горадабудаўнічай тканіны, узнаўленню страчаных элементаў гарадскога ландшафту, планіровачнай структуры, маштаба, чляненняў, рытму, сілуэта, візуальных сувязяў, прасторавых адносін забудовы. Існуюць розныя прыёмы гарманічнага ўключэння сучаснай архітэктуры ў групы гістарычных пабудоў: ад поўнага «растварэння» новых архітэктурных аб'ёмаў, матэрыялаў і колераў у акаляючым асяроддзі да метадаў «кантрапункта», разнастайных стылізацый і ўзнаўленняў сродкамі новага будаўніцтва, новымі тэхналогіямі і матэрыяламі. У адрозненне ад узнаўлення, якое ставіць памылковы знак роўнасці паміж арыгіналам і навадзелам, рэгенерацыя і рэнавацыя як больш творчыя метады дыктуюць новай архітэктуры неабходнасць выяўлення ўнутранай заканамернасці гістарычнага асяроддзя, архітэктоніку мастацкіх вобразаў.

Адкрытыя гарадскія прасторы. Добраўпарадкаванне адкрытых прастораў, іх насычэнне музеефікаванымі археалагічнымі аб'ектамі і малымі архітэктурнымі формамі паляпшае якасць жыцця гараджан у цэлым.

Найбольш эфектыўны спосаб захавання і папулярызацыі гістарычнага асяроддзя ўяўляе сабой уцягненне адкрытых прастораў у сацыяльнае абарачэнне шляхам развіцця пешаходных зон і іх інфраструктуры. Стварэнню камфортнай абстаноўкі ў гістарычным цэнтры спрыяюць яго добраўпарадкаванне, азеляненне, асвятленне і ўстаноўка малых архітэктурных формаў, сумаштабных акаляючаму асяроддзю і адпаведных яго эстэтыцы.

Прававыя нормы па захаванні аб'ектаў культурнай спадчыны. Асновай захавання культурнай спадчыны з'яўляецца адпаведная нарматыўна-прававая база. Прававы каркас сферы аховы помнікаў фарміруюць:

– міжнародныя нарматыўныя акты: Еўрапейская канвенцыя па ахове археалагічнай спадчыны (Лондан, 06.05.1969, для СССР увайшла ў сілу 14.02.1991), Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (Парыж, 16.11.1972, для Беларусі ўвайшла ў сілу 12.10.1988), Канвенцыя аб ахове архітэктурнай спадчыны Еўропы (Гранада, 03.10.1985, для СССР увайшла ў сілу 01.03.1991);

– Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» ад 09.01.2006 г. № 98-З;

– Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Палажэння аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ» ад 22.05.2002 г. № 651;

– Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні генеральных планаў гарадоў Баранавіч, Наваполацка, Полацка» ад 08.12.2004 г. № 1557;

– Пастанова Савета Міністраў БССР «Аб Полацкім гісторыка-культурным запаведніку» ад 16.07.1990 г. № 158.

Прававая база патрабуе ўдасканалення і развіцця.

У мэтах захавання аб'ектаў культурнай спадчыны і развіцця прынятых прававых актаў, рэгулюючых прававыя адносіны ў сферы дзяржаўнай аховы спадчыны неабходна зрабіць наступнае.

1. Унесці прапановы і дапаўненні ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» ад 09.01.2006 г. № 98-З:

– у мэтах стварэння больш эфектыўнай сістэмы кантролю і выпрацоўкі гарманічнага развіцця асяроддзя, акружаючага ахоўныя гісторыка-культурныя аб'екты, уключыць у заканадаўчыя і нарматыўныя акты шэраг паняццяў (унікальная гістарычная тэрыторыя, гістарычны горад, горад-музей, гістарычны ландшафт), якія не былі ўнесены як асобныя катэгорыі ў дзеючыя зараз ахоўныя дакументы; гэта значна дапаможа спецыялістам у рабоце па ахове цэласнай гарадской прасторы, што склалася гістарычна, і распрацоўцы рэгламенту горадабудаўнічай і гаспадарчай дзейнасці для суб'ектаў гаспадарання, накіраванай на стварэнне сістэмы мерапрыемстваў па забеспячэнні захаванасці ўстойлівых прасторавых утварэнняў;

– прадугледзець норму аб магчымасці выдзялення ўласніку аб'екта культурнай спадчыны бюджэтных субсідый на фінансаванне затрат па захаванні аб'екта ў выпадку, калі рэжым гаспадарчай дзейнасці гэтага аб'екта, устаноўлены ў мэтах яго захавання, не дазваляе забяспечыць рэнтабельнае выкарыстанне аб'екта;

– асабліва каштоўныя аб'екты культурнай спадчыны, уключаныя ў Спіс сусветнай спадчыны, гісторыка-культурныя запаведнікі, аб'екты археалагічнай спадчыны не павінны падлягаць адчужэнню з дзяржаўнай уласнасці;

– прадугледзець абавязковае страхаванне рызыкі страты і пашкоджання аб'ектаў культурнай спадчыны пры правядзенні рамонтна-будаўнічых работ, а таксама ў выпадку стыхійнага бедства з умовай, што страхавая выплата накіроўваецца на ўзнаўленне страчанага ці пашкоджанага аб'екта.

2. Распрацаваць і зацвердзіць на рэспубліканскім узроўні рэстаўрацыйныя нормы і правілы па падрыхтоўцы, узгадненні і зацвярджэнні праектнай і каштарыснай дакументацыі на выкананне работ па захаванні аб'ектаў культурнай спадчыны.

3. Распрацаваць Правілы землекарыстання і забудовы Полацка, якія ўключаюць у сябе карты горадабудаўнічага заніравання з указаннем межаў заніравання і рэгламентаў гранічных памераў і параметраў; устанавіць парадак аднясення земляў да катэгорыі земляў гісторыка-культурнага прызначэння рэгіянальнага значэння і ў сувязі з гэтым прадугледзець падатковыя льготы.

Вторая каноническая переменная разделяет между собой две серии, представленные материалами ранних жальничных погребений и материалами из сельского кладбища Лукомля. Вертикальная ось графика отражает изменения лицевого отдела черепа: уменьшается верхняя и средняя ширина лица, ширина нёба, уменьшается высота носа. При этом увеличивается высота черепной коробки. Серия мужских черепов из ранних жальничных погребений отличается от сельского населения региона более высокой черепной коробкой и более грацильным строением лицевого скелета. Установленные различия могут указывать на особенности генетического состава пришлого населения, представленного ранними жальничными погребениями, по сравнению с коренным населением региона.

Выводы

1. Между близкими к современности краниологическими сериями из белорусских сельских кладбищ не выявлено отчетливых различий. Все серии представляют локальные варианты большой европеоидной расы. Они в целом характеризуются средними размерами мозгового и лицевого отделов черепа, мезобрахикранностью, слегка ослабленной горизонтальной профилировкой лица на уровне орбит и сильной профилировкой на уровне скул, средней шириной довольно низких орбит, среднешироким грушевидным отверстием, средней шириной и высотой переносья при умеренно выступающих носовых костях по отношению к вертикальному профилю лица. Географическая изменчивость краниометрических показателей проявилась в виде тенденции с одной стороны – к более отчетливо выраженной брахикранности серий с западной и юго-западной территорий нынешней Беларуси, куда направлялись первые миграционные волны славян, с другой стороны – к относительной грацильности мозгового и лицевого отделов черепа в сочетании менее выраженной брахикранностью у населения с восточной территории.

2. Представляют интерес половые различия по важным расодиагностическим признакам, характеризующим горизонтальную профилировку лица у краниологических серий конца XVIII–XIX вв. с восточных территорий Беларуси. Так, по сравнению с другими локальными женскими группами здесь у женщин слегка уплощено лицо на уровне скул, а у мужчин по сравнению с другими локальными группами, напротив, на этом уровне лицо профилировано наиболее сильно. Кроме того, у женщин из д. Лукомль черепной указатель меньше, чем у мужчин, хотя обычно в локальных популяциях половой диморфизм по этому указателю имеет противоположную тенденцию. Такая антропологическая особенность женских серий с восточной территории Беларуси находит аналогии среди некоторых финно-угорских групп Прибалтики и Поволжья, что побуждает искать ее истоки среди более древних предков, возможно, предшествовавших расселению балтоязычного населения. Специфика полового диморфизма у некоторых территориальных групп в отношении важных расодиагностических показателей черепа могла бы найти объяснение в доминировании представительниц древнейшего антропологического пласта в структуре брачных связей при расселении балтского, а затем и славянского населения.

3. Сравнительный анализ краниологических показателей городского и сельского населения Полоцкого региона, представленного материалами из погребений XVII–XVIII вв. в г. Полоцке и материалами из сельского кладбища XVIII–XIX вв. в д. Лукомль Чашникского р-на, показало, что полоцкая серия отличается от лукомльской более крупными размерами черепа, а также повышенной внутригрупповой изменчивостью таких показателей, как высотный диаметр черепа, наибольшая ширина лба, верхнелицевой и носовой указатели. Это значит, что в отличие от сельского населения Лукомля, горожане Полоцка, как и жители любого города, были разнообразнее по антропологическому составу.

4. Средневековое сельское население Полоцкой земли, представленное материалами курганных погребений XI–XIII вв., материалами синхронных им грунтовых могильников, а также серией из ранних жальничных погребений XIII–XIV вв., более неод-

нородно по антропологическому составу, чем сельские серии конца XVIII – XIX в. К основному комплексу признаков, характеризующих курганную серию черепов, относятся массивная голова удлиненной формы, низкие глазницы, среднеширокое и относительно невысокое лицо, резко профилированное на уровне скул при некотором уплощении на уровне орбит, наиболее узкий по носовому указателю нос среди сравниваемых серий с территории Полоцкой земли. Этот комплекс отражает черты, свойственные древнейшему населению Западной Европы. Сочетание крупных размеров долихокранного черепа с большим высотным его диаметром, и относительно узким носом аналогичен такому же комплексу признаков у ряда групп Центральной Европы.

5. Анализ антропологических материалов двух грунтовых могильников курганного периода с территории Полоцкой земли (Дрисвяты–Пашевичи, Козловцы) указывает на активные межэтнические контакты. Присутствие в материалах грунтового могильника Козловцы лапоноидного типа с уплощенным и низким лицом свидетельствует о проникновении на территорию Полоцкой земли в XI–XII вв. отдельных групп прибалтийско-финского населения с севера. Особенности антропологического состава населения, оставившего грунтовый могильник Дрисвяты, указывают на активное взаимодействие пришлого славянского и местного балтского населения. В XIII–XIV вв. на территорию Полоцкой земли проникали отдельные группы населения с запада, о чем свидетельствует антропологическое сходство мезокранного, относительно грацильного населения, представленного ранними жальничными погребениями, с населением, представленным каменными могилами с территории Белорусского Понеманья.

6. Результаты анализа краниологических особенностей исследованных серий показывают, что городское население Полоцкого региона во второй половине II тысячелетия н. э. (XVII–XIX вв.) было значительно менее однородным по антропологическому составу, чем сельские белорусы в конце XVIII – XIX в. Тем не менее, судя по основному расодиагностическому комплексу признаков, антропологический состав населения городов формировался в основном за счет местного населения.

7. По совокупности краниологических показателей серия из ранних жальничных погребений (XIII–XIV вв.) в значительной степени близка к курганной серии (XI–XIII вв.), но за этот период начались структурные изменения мозгового (процесс брахикефализации) и лицевого (процесс грацилизации) отделов черепа, продолжавшиеся до конца II тысячелетия н. э. и получившие название «эпохальные изменения». В направленную во времени микроэволюционную структурную трансформацию черепа и скелета в целом могли внести вклад изменения генофонда славянских популяций при интенсивном межэтническом взаимодействии. В итоге мозговой отдел черепа приобретал более округлую (брахикранную) форму за счет сокращения продольного и увеличения поперечного диаметров черепа, а вследствие процесса грацилизации несколько сократилось большинство поперечных размеров лица. Аналогичный процесс во II тысячелетии н. э. характерен для большинства групп населения на территории Европы, в том числе и на территории Беларуси. Ближайшие аналоги антропологическому типу из ранних жальничных погребений Глубокского и Докшицкого р-нов прослеживаются среди населения, оставившего в этот же период могилы с каменными кладками на территории Белорусского Понеманья, где тоже происходила аналогичная структурная трансформация черепа.

8. Несмотря на эпохальные структурные изменения скелета на территории Беларуси между хронологически разновременными сериями наблюдается преемственность основных расодиагностических черт в ряду поколений сельского населения.

Литература

1. Алексеев, В. П. Краниометрия. Методика антропологических исследований / В. П. Алексеев, Г. Ф. Дебец. – М.: Наука, 1964. – 127 с.

2. Дерябин, В. Е. Биометрическая обработка антропологических данных с применением компьютерных программ / В. Е. Дерябин; Науч.-исслед. ин-т и Музей антропологии Московского гос. ун-та. – М., 2004. – 299 с. – Деп. в ВИНИТИ 12.01.04, № 34–В2004 // Деп. науч. работы: библиогр. указ. Естеств. и точные науки, техника, – 2004. – № 3. – С. 8.

3. Емяльянчык, В. А. Антрапалогія двух грунтовых могільнікаў курганнага перыяду (да пытання аб этнічнай сітуацыі на тэрыторыі Полацкай зямлі ў X–XIII стст.) / В. А. Емяльянчык // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы V Міжнар. навук. канф., Полацк, 24–25 кастр. 2007 г. / Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама, НПГКМЗ; уклад. Т. А. Джумантаева. – Полацк, 2009. – С. 279–286.

4. Емельянчик, О. А. Краниологическая характеристика населения Полоцкой земли XI–XIV вв. по материалам курганных, грунтовых и жальничных погребений / О. А. Емельянчик // Актуальные вопросы антропологии / Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск: Беларус. навука, 2010. – Вып. 5. – С. 238–250.

5. Можы, Ю. Дэмаграфічны спад на Беларусі і Літве ў сярэдзіне XVII стагоддзя / Ю. Можы // Спадчына. – 1992. – № 5. – С. 19–35.

6. Полоцк: ист. очерк / АН БССР. Ин-т истории; редкол.: П. Т. Петриков (отв. ред.) и др. – Минск: Наука и техника, 1987. – 2-е изд., перераб. и доп. – 320 с.

7. Саливон, И. И. Исторические и онтогенетические аспекты формирования физического типа белорусов // Славянскія культуры пасля другой сусветнай вайны. – Минск, 1996. С. 56–63.

8. Саливон, И. И. Роль древнего населения в формировании некоторых антропологических особенностей населения Белоруссии // Glasnik antropol. drustva Jugosl. – 1975. – Sv. 12. – S. 99–110.

9. Салівон, І. І. Краніялогія насельніцтва Беларускага Панямоння па матэрыялах каменных могільнікаў / І. І. Салівон, А. В. Квяткоўская, А. І. Кушнір // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1989. – № 3. – С. 77–81.

Рэзюмэ

І. І. Салівон, В. А. Емяльянчык

Фарміраванне антрапалагічнага складу насельніцтва Полацкай зямлі ў XI–XIX стст.

Даследаваны серыі чарапоў сельскага насельніцтва XI–XIV стст. и XVIII–XIX стст., а таксама гарадскога насельніцтва Полацка XVII–XVIII стст. Выяўлена значная неаднароднасць сельскіх папуляцый Полацкага рэгіёна ў XI–XIV стст. Сярод некаторых тэрытарыяльных груп пераважалі масіўныя варыянты (курганная група), а ў іншых – грацыльныя (жальнічныя пахаванні). Адносна грацыльнае насельніцтва з ранніх жальнічных пахаванняў мае рысы падабенства да насельніцтва Беларускага Панямоння з могільнікаў з каменнымі абкладкамі. Параўнальны аналіз краніялагічных паказчыкаў сельскіх серый XI–XIV стст. выявіў, што ў гэты перыяд у Полацкім рэгіёне фарміраванне лакальных антрапалагічных асаблівасцей насельніцтва адбывалася пры складаным міжэтнічным узаемадзеянні славянскіх, балцкіх і прыбалтыйска-фінскіх груп. Сельскае насельніцтва Беларусі XVIII–XIX стст. стала больш аднародным па антрапалагічным саставе і лакальныя адрозненні сталі менш выразнымі. Нягледзячы на выяўленыя змены за апошняе тысячагоддзе формы чэрапа (працэс брахікефалізацыі) і памяншэнне яго масіўнасці (працэс грацылізацыі) па комплексе асноўных расадыягнастычных прыкмет адзначаецца пераемнасць у шэрагу пакаленняў сельскіх папуляцый. Насельніцтва з пахаванняў XVII–XVIII стст. у г. Полацку адрозніваецца ад сельскіх груп з беларускіх могільнікаў XVIII–XIX стст. большай разнастайнасцю антрапалагічнага складу.

Summary

I. Salivon, O. Emeljanchik

The formation of anthropological structure of population of Polatsk Land in the 11th–19th centuries

The series of crania belonging to the rural inhabitants of the 11th–14th and 18th–19th centuries as well as Polatsk town dwellers of the 17th–18th centuries are analyzed in the paper. Heterogeneity of rural populations of Polatsk area in the 11th–14th c. is quite obvious. Massive variants predominate in some territorial communities (burial mounds), and gracile variants prevail in the others (memorial burials). Relatively gracile population from the early memorial burials bears general resemblance to the population of Belarusian Nioman Region from the burials with stone facing. The comparative study of craniological characteristics of the rural 11th–14th century series has shown that in Polatsk area the formation of local anthropological peculiarities of population through that period came about against the background of complicated multi-ethnic interaction between the Slavic, Baltic, and Baltic-Finnish groups. The rural population of Belarus in the 18th–19th c. grew more homogeneous according to its anthropological structure, and local differences got less evident. In spite of the changes in the course of the last millennium cranium shapes (the process of brachicephalism) and diminution of solidity (the process of gracility) detected, according to the complex of the main race diagnostic characteristics, continuity in the series of generations in the rural populations can be traced. The population from the 17th–18th century burials in Polatsk differs from the rural groups from Belarusian 18th–19th burials in a more heterogeneous anthropological structure.

Поступила 28.04.2011

Д. У. Дук, *Полацкі дзяржаўны універсітэт, загадчык кафедры айчыннай і усеагульнай гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Наваполацк)*

Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г.

Уводзіны. Археалагічныя раскопкі ў г. Полацку ў 2007 г. праводзіліся на помніку гісторыі і культуры – полацкім гарадзішчы.

Полацкае гарадзішча размешчана на правым беразе р. Палата за 0,8 км ад упадзення яе ў р. Заходнюю Дзвіну. Яно было выяўлена ў 1928 г. А. М. Ляўданскім, які зрабіў на гарадзішчы 3 траншэі і 1 шурф, сумарнай плошчай 20,5 м^2 [15, с. 163–165]. Пагорак размешчаны на перасечанай мясцовасці правага берагу ракі. Вышыня гары – да 13 м, агульныя памеры 73 × 75 м. Верхняя пляцоўка меншая – 75 × 40 м і па форме нагадвае прамавугольнік з выступам ва ўсходняй частцы [23, с. 21] (мал. 1). Пачынаючы з 1947 г., гарадзішча шчыльна забудавана, сёння на ім размешчана 11 сядзіб з прысядзібнымі ўчасткамі.



Мал. 1. Археалагічныя раскопы і шурфы на гарадзішчы (паводле С. В. Тарасава): *1–4* – 1928 г.; *5–9* – 1959; *10* – 1960; *11* – 1962; *12* – 1978; *13* – 1987 г. (*а*) і план размяшчэння раскопу 1 (*б*)

Асноўным даследчыкам полацкага гарадзішча ў пасляваенны час з'яўляўся Г. В. Штыхаў, якім у 1960 і 1962 г. былі пракапаны дзве траншэі. З якім дапамогай была вызначана стратыграфія старажытных абарончых збудаванняў полацкага гарадзішча [23, с. 21]. У 1959 г. полацкае гарадзішча даследаваў Л. Д. Побаль. Ім было закладзена 4 шурфы [20, с. 4–5]. У 1978 г. годзе В. В. Булкіным праводзіўся археалагічны нагляд за траншэяй, выкапанай мясцовымі жыхарамі пад склеп [4, с. 9–11]. У 1989 г. С. В. Тарасаў праводзіў археалагічнае даследаванне жаночага пахавання, выпадкова раскапанага мясцовымі жыхарамі [22, с. 23]. Сумарная ўскрытая археалагамі плошча культурнага пласта склала каля 80 м^2, большай часткай гэта былі шурфы А. М. Ляўданскага, Л. Д. Побаля і дзве траншэі Г. В. Штыхава[1] (мал. 1).

У 2007 г. археалагічным атрадам Полацкага дзяржаўнага універсітэта былі праведзены раскопкі на полацкім гарадзішчы. Мэта раскопак – удакладненне ролі і месца гарадзішча ў сацыятапаграфічнай структуры Полацка IX–XVIII стст., вызначэнне ўзроста помніка, этапаў і працягласці яго існавання.

Папярэдне была заключана вусная дамоўленасць з уладальнікам сядзібы № 20 па 2-му завулку Фрунзэ аб дазволе правядзення на яго ўчастку археалагічных раскопак. Гэта быў адзіны ўладальнік сядзібы на гарадзішчы, які даў дазвол на правядзенне раскопак. Нами было высветлена, што ўвесну 2007 г. уладальнік сядзібы зрабіў перапланіроўку прысядзібнага ўчастка: бульдозерам быў зняты верхні пласт на глыбіню да 0,3 м на плошчы 14 × 12 м. На гэтай плошчы намі быў зроблены раскоп (плошча 44 м^2) і прадугледжана пляцоўка пад вынятую зямлю (плошча каля 70 м^2).

Раскопкі пачаліся 11.06.2007 г. і працягваліся да 28.07.2007 г. Падчас раскопак 18.07.2007 г. уладар сядзібы ва ультыматыўнай форме запатрабаваў спыніць правядзенне усіх работ і засыпаць раскоп да 28.07.2007 г. Таксама патрабавалася не называць у справаздачнай дакументацыі і падчас кантактаў з грамадскасцю імя уладальніка сядзібы. На сітуа-

[1] За ўвесь час археалагічнага вывучэння гарадзішча сумарная ўскрытая плошча склала каля 80 м^2, большай часткай гэта былі шурфы А. М. Ляўданскага, Л. Д. Побаля, дзве траншэі Г. В. Штыхава і назіранні за земляными работамі В. В. Булкіна і С. В. Тарасава.



Мал. 2. Ляпная кераміка: *1–4* – венцы гаршкоў. Малюнак М. А. Плавінскага. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

цыю не паўплываў зварот кіраўніцтва полацкага гарадскога выканаўчага камітэта з просьбай аб дазволе працягнуць раскопкі. На заканчэнне раскопак нам было адведзена дзесяць дзён (з 18.07 па 28.07.2007 г.), разам з засыпкай раскопу уручную. У выніку намі было прынята рашэнне ўдвая паменшыць плошчу раскопу і разабраць пласт да мацерыка з глыбіні 1,8 м на плошчы 22 м^2 у межах кв. 1–6 (на мал. 2 стратыграфіі паўднёвай сценкі раскопа ўзровень, з якога пачаўся разбор пласта ў межах кв. 1–6, пазначаны чорнай лініяй са стратыграфічнымі адзнакамі 373 (усход) і 339 см (захад)).

Раскоп 1 меў памер 11 × 4 м, быў арыентаваны доўгім бокам практычна па накірунку захад–усход паралельна паўночнай і паўднёвай межаў сядзібы з улікам вольнай ад садовых дрэў плошчы[1].

[1] Спачатку планавалася разбіць раскоп памерам 11 × 6 м, быў зняты верхні пласт на глыбіню 0,2 м, аднак далей плошча раскопу была зменшана па прычыне немагчымасці размяшчэння вялікай колькасці зямлі з раскопу.

Сярэдняя магутнасць культурнага пласта на гарадзішчы складае 1,8 м, у паўночнай частцы яна максімальная і дасягае 4 м. На месцы раскопу 1 магутнасць культурнага пласта складае 2,8–3,0 м.

Стратыграфія культурнага пласта раскопу 1. Культурны пласт раскопа 1 складаецца з трох выразных стратыграфічных гарызонтаў.

Верхні стратыграфічны гарызонт – гэта вельмі аднародная зямля светла-шэрага колеру з карычневым адценнем, камкаватая, сухая. У межах гэтага стратыграфічнага пласта былі знойдзены артэфакты пераважна XI–XIII стст., сярод іх рарытэтныя бронзавыя і медныя рэчы: адваротная створка меднага крыжа-энкалпіёна, бронзавыя часткі кіотнага крыжа з выявай Богамацеры і апостала Іаана, інструмент ювеліра – бронзавая кіянка, свінцовы кісцень, донца бронзавай лампадкі і іншыя, жалезныя вырабы (інструменты вытворчасці, зброя і побытавыя рэчы), шкляныя вырабы (пераважна фрагменты шкляных бранзалетаў), рэшткі гаршкоў пераважна XI – пачатку XIV ст., фрагменты амфар і іншыя рэчы. Усяго ў верхнім стратыграфічным пласце было знойдзена 104 індывідуальныя знаходкі з агульнай колькасці 496 шт. (вызначэнне датавання рэчавага комплексу прадстаўлена ніжэй).

У межах верхняга стратыграфічнага пласта было адкрыта і даследавана 35 рознай ступені пашкоджанасці і некранутых пахаванняў, размешчаных на глыбіні ад 0,8 да 1,4 м. Пахаванні зроблены ў пласце зямлі верхняга стратыграфічнага гарызонту.

Сярэдні стратыграфічны гарызонт – гэта пласт зямлі магутнасцю каля 1,4 м з вельмі стракатай структурай. Гэты гарызонт фіксуецца з узроўню каля 1,2 м (паўночная сценка раскопу, кв. 1–6, нівеліровачная адзнака кв. 6 – 285, кв. 1 – 312) (мал. 3), і каля 0,8–1,2 м ў паўднёвай частцы раскопу (кв. 7 – 12, нівеліровачная адзнака кв. 7 – 305, кв. 12 – 258) (мал. 4). Найбольшая магутнасць пласта ў паўднёва-заходняй частцы (1,6 м, кв. 11, 12), найменшая – ў паўночна-ўсходняй (1,2 м, кв. 1–2). Ніжняй мяжой пласта з'яўляецца прапластка вугалю магутнасцю каля 0,1 м у паўночнай частцы раскопу на глыбіні каля 2,2–2,5 м (максімум – у кв. 5, 6) (мал. 3, 5), і прапластка вугалю магутнасцю каля 0,2 м у паўднёвай частцы раскопу на глыбіні 2,2–2,6 м (максімум у кв. 11–12) (мал. 4, 5). Нівеліровачныя адзнакі ніжняй часткі пласта ў кв. 1 – 443, у кв. 6 – 410 (мал. 6), у кв. 7 – 427, у кв. 12 – 414 (мал. 4). Максімум магутнасці сярэдняга стратыграфічнага гарызонту прыходзіцца на мяжу кв. 4, 5 і кв. 2, тут пласт мае магутнасць 1,7 м і распаўсюджаны да мацерыка (нівеліровачныя адзнакі кв. 2 – 521, кв. 4, 5 – 489) (мал. 3).

У межах кв. 2–6, 12 верхняя частка сярэдняга стратыграфічнага гарызонту прадстаўлена прапласткай чырвонай моцна ўтрамбаванай і абпаленай глінай з вугалем, магутнасцю ў сярэднім 0,35 м (мал. 3, 5). Гэтая прапластка мае чырвоны колер. У кв. 2–3 пад гэтай прапласткай знаходзіцца прапластка камянёў дыяметрам каля 0,1 м, моцна перапаленых і перамешаных з вугалем. Развалы камянёў памерамі 0,1–0,2 м зафіксаваны ў межах кв. 2–4, 6, 10. Пад згаданай прапласткай знаходзіцца прапластка вапны і пяску магутнасцю 0,15 м у межах гэтых жа квадратаў. Аналагічная пра-



Мал. 3. Паўночны профіль раскопу 1. Гарадзішча. Полацк. 2007



Мал. 4. Паўднёвы профіль раскопу 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

пластка зафіксавана ў межах кв. 5, 6, аднак тут пад ёй размешчана тонкая прапластачка чырвонай абпаленай гліны з каменьчыкамі, магутнасць якой складае 0,03–0,05 м (мал. 3, 5). Гэтая ж прапластачка зафіксавана ў кв. 1–4.

Верхняя частка сярэдняга стратыграфічнага гарызонту ў межах кв. 8–12 прадстаўлена прапласткай чорнай зямлі з вугалем, магутнасцю ад 0,2 да 0,4 м (максімум у кв. 8, 9) (мал. 4). У гэтай прапластцы сустракаюцца лінзы чырвонай перапаленай гліны (кв. 12), лінзы белай гліны дыяметрам да 10 см, гэтая прапластка змыкаецца з прапласткай спечанай гліны па лініі ўсход–захад мяжы квадратаў пасярэдзіне раскопу. У кв. 11, 12 пад пластом чорнай зямлі з вугалем зафіксаваны дзве прапласткі магутнасцю па 0,1 м кожная: вышэйшая – цёмна-шэрай камкаватай зямлі, ніжэйшая – вапны. Пад імі зафіксавана прапластка 0,2 м цёмна-шэрай камкаватай зямлі, ніжняя мяжа якой маркіравана прапластачкай вугалю, магутнасцю 0,02 м (мал. 4, 5).

Планіграфія пласта на глыбіні 1,5 м прадстаўлена на мал. 7. У межах кв. 8, 9 зафіксаваны развал камянёў дыяметрам 0,1–0,2 м, а таксама вялікі камень, дыяметрам 0,5 м, камень дыяметрам 0,4 м зафіксаваны ў межах кв. 1. На планіграфіі верхняй часткі сярэдняга стратыграфічнага пласта бачна, што прапластка чырвонай гліны ў межах кв. 2, 3 мае форму прамавугольніка, памерам 1 м ад паўночнай сценкі раскопу і 2,2 м даўжыні на захад ад мяжы кв. 1 і 2.



Мал. 5. Заходні і ўсходні профілі раскопу 1. Гарадзішча. Полацк. 2007



Мал. 6. Ляпная кераміка: *1–5* – венцы гаршкоў. Малюнак М. А. Плавінскага. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

З верхняй вугальнай прапласткі сярэдняга стратыграфічнага гарызонту атрыманы дзве радыёвугляродныя даты, матэрыялам з'яўляўся вугаль: кв. 5 проба 1 (далей у тэксце пробы маркіраваны літарай «П») – 430–530 гг. н. э., кв. 11 П 2 – 1270–1310 гг. н. э.[1] Апошняя дата цалкам карэлюецца з археалагічным матэрыялам.

Так, у згаданых археалагічных прапластках была знойдзена асноўная колькасць індывідуальных знаходак (315 шт. з агульнага ліку 496 шт.) і керамікі. Сярод іх вылучаюцца датаваныя рэчы: жалезныя пласцінкі наборнага даспеха і іх нарыхтоўкі, жалезныя карпусы навясных замкоў і ключы да іх, авальныя жалезныя крэсівы, жалезныя наканечнікі стрэл тыпу «зрэзань», каменныя асялкі, у тым ліку з шыфернага сланца, шыферныя праселкі, вялікая колькасць фрагментаў шкляных бранзалетаў, частка з якіх аплаўлены ў моцным пажары, касцяныя вырабы, у тым ліку арнаментаваныя дзяржанні нажоў і касцяная шахмата. З рарытэтных знаходак адзначым бронзавую міску, фрагмент сярэбранай пляцёнкі, накладку на драўляную чашу з выявай грыфона, бронзавую дэталь пэндзля, візантыйскую бронзавую фібулу[2], бронзавую падвеску з раслінным арнаментам, бронзавую дэталь хораса з двухбаковым пле-

[1] Радыёвугляроднае вызначэнне зроблена ў ДНУ «Інстытут геахіміі і геафізікі» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (лабараторыя геахіміі ізатопаў пад кіраўніцтвам канд. тэхн. навук М. Д. Міхайлава).

[2] Вызначэнне Інгмара Янсана (Стакгольм, Швецыя).



Мал. 7. Жалезныя наканечнікі стрэл (*1–9*). Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

ценым арнаментам. Знойдзена шмат вырабаў з чорных (нажы, свердзелы і інш.) і каляровых (кісцяні, накладкі на аддзенне, дыскападобныя фібулы і інш.) металаў. Знойдзена жалезная сякера рэдкай формы і фрагмент каменнай сякеры ці молата з прасвідраванай адтулінай. З керамікі вылучаюцца кавалкі плінфы. Большая частка венцаў гаршкоў прадстаўлена формамі, характэрнымі для XII – пачатку XIV ст. і добра вядомымі ў іншых гістарычных частках Полацка. Знойдзена некалькі фрагментаў венцаў міскававай кафлі. Такім чынам, большасць рэчаў датуюцца XII – пачаткам XIV ст.

У гэтым пласце знойдзена 6 кавалкаў вохры чырвонага колеру (5 выпадкаў) і 1 кавалак жоўтага колеру. Разам з бронзавай дэталлю пэндзля гэтыя знаходкі можна разглядаць як комплекс прылад і матэрыялаў мастака.

Сярэдняя частка вызначанага стратыграфічнага гарызонту прадстаўлена пластом аднароднай камкаватай зямлі цёмна-шэрага колеру. Гэтая прапластка мае магутнасць 0,4–0,8 м, у сярэднім – 0,5 м. Найбольшая яе магутнасць знаходзіцца ў межах кв. 7–9, найменьшая – у кв. 6. У цэлым гэтая прапластка даволі аднародная, толькі ў кв. 1 яна падзяляец-

ца прапластачкай перапаленай гліны чырвонага колеру, у кв. 6, 12 – гліны з вапнай. Магутнасць гэтай прапластачкі 0,05–0,08 м, яна размешчана на глыбіні 1,9 м (мал. 3, 5). У кв. 10, 11 сярэдняя частка вызначанага пласта падзяляецца дзвюма прапластачкамі вапны магутнасцю 0,03–0,05 м на глыбіні 2,0–2,2 м ад паверхні (мал. 4). Ніжэй гэтай прапласткі ў заходняй частцы кв. 6, 12 выяўлена лінза падоўжанай формы памерамі 1,2 × 0,3 м (даўжыня × шырыня) перапаленай гліны з камянямі дыяметрам 0,1–0,2 м (мал. 5). Ва ўсходняй частцы раскопу ў межах кв. 1 ніжэй прапластачкі спечанай гліны і вапны зафіксаваны пласт вугалю з авальнымі лінзамі пяску белага колеру (даўжыня 0,2 м, шырыня лінзаў 0,1 м) (мал. 5).

На мяжы кв. 4 і 5 на глыбіні 2 м ад паверхні раскопу зафіксаваны развал печы-каменкі. Зверху развал камянёў перакрыты пластом чырвонай спечанай гліны магутнасцю 0,2 м і даўжынёй 0,7 м (мал. 3). Гэты пласт гліны добра фіксуецца на профілі раскопу і на планіграфіі пласта 11 (мал. 3). Пад пластом



Мал. 8. Вырабы з косці: *1, 2, 3, 6* – дзяржанні чаранковых нажоў; *4* – нарыхтоўка муфты; *5* – нарыхтоўка капавушкі; *7* – накладка. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

гліны зафіксаваны развал перапаленых камянёў дыяметрам 0,1 м, магутнасць развала 0,4 м на шырыню 1 м. У пласце гліны і побач з развалам печы каменкі знойдзена шмат кавалкаў глінянай абмазкі печы. Усе яны, як правіла, маюць адну загладжаную роўную плоскасць.

У гэтай пасярэдняй частцы вызначанага стратыграфічнага гарызонту знойдзены кавалкі керамічнага посуду, пераважна гаршкоў, якія датуюцца XI–XIII стст. У гэтым пласце зафіксаваны адзінкавыя фрагменты ляпнога посуду апошняй чвэрці I тысячагоддзя н. э. Канцэнтрацыя знаходак ў пасярэдняй частцы вызначанага пласта значна меньшая ў параўнанні з верхняй часткай, адпаведна 63 шт. супраць 315 шт. (агульная колькасць – 496 шт.). З індывідуальных знаходак вылучаюцца арнаментаваны бронзавы наканечнік скуранога рэменя, свінцовы бранзалет, верхняя частка трохграннага жалезнага наканечніка стралы, дужка навяснога замка, жалезная стамеска, жалезны рыбалоўны кручок, кавалак смальты зялёнага колеру, кавалкі металічных пласцінак ад даспеха. Рарытэтнай знаходкай прадстаўлена праселка з шыфернага сланца з прадрапанымі літарамі «НАМГ».

Ніжняя частка сярэдняга стратыграфічнага гарызонту мае стракатую стратыграфію. Яе магутнасць складае каля 0,3–0,4 м і прадстаўлена чаргаваннем прапластак белага зярністага пяску, вапны магутнасцю каля 0,01–0,03 м з вугальнымі прапласткамі магутнасцю 0,1 м, што перакрывае прапласткі цёмна-шэрай зямлі з вугалем магутнасцю 0,2–0,3 м (паўночная частка раскопу, кв. 4). Згаданы пласт вугалю кв. 4, размешчаны паміж прапластачкамі белага пяску, мае радыевугляродную дату 60 г. да н. э. – 140 г. н. э. (П 5) (мал. 3).

Ніжняя мяжа сярэдняга стратыграфічнага гарызонту ва ўсходняй частцы кв. 4 прадстаўлена прапластачкай вугалю, магутнасцю 0,03 см і даўжынёй 0,4 м. Гэтая прапластачка размешчана на вышыні 0,2 м ад мацерыка і дасягае мяжы мацерыковай ямы кв. 4, 5. Прапластачка вугалю мае радыевугляродную дату 660–590 гг. да н. э. (П 6). Каля мяжы кв. 3 і 4 прапластка вугалю мае працяг у выглядзе прапластачкі пяску даўжынёй 0,35 м і магутнасцю 0,1 м. Над прапластачкай пяску зафіксавана авальная лінза драўлянай парахні магутнасцю 0,1 м (мал. 3).

На мяжы кв. 4 і 5 сярэдні стратыграфічны гарызонт дасягае мацерыка ў межах мацерыковай ямы 3. Яма запоўнена пластом чорнай зямлі з вугалем і драўлянай парахнёй, падзелена гарызантальнай прапласткай светла-шэрай зямлі на вышыні 0,4 м ад дна, магутнасць прапласткі 0,1–0,2 м. Яма мае вертыкальныя сценкі, якія закруглены каля дна, трапецападобную форму (мал. 9). Шырыня ямы 2,05 м, яна адступае ад края раскопу на 0,9 м і выходзіць за яго межы ў паўночным накірунку. Яма пачынаецца ад ніжняй мяжы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту на вышыні каля 1 м ад дна і заглыблена ў мацярык на 0,3 м у заходняй частцы (нівеліровачныя адзнакі 460 супраць 489) і на 0,4 м ва ўсходняй (нівеліровачныя адзнакі 451 супраць 489) (мал. 3). У яме былі знойдзены: 2 косткі жывёл, 30 сценак ляпных гаршкоў, 5 венцаў ляпных гаршкоў, 1 донца ляпнога гаршка, 1 кавалак абпаленай плахі. Венцы ляпнога посуду – гэта тыповыя гаршкі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, якія на тэрыторыі Беларускага Падзвіння датуюцца сярэдзінай VIII – X ст. (мал. 10). Радыевугляродная дата кавалка дрэва – 600–780 гг. н. э. (П 3) (мал. 3). Верхняя дата гэтага храналагічнага адрэзка пацвярджаецца керамічным матэрыялам.

У заходняй частцы кв. 5 і ў кв. 6 ніжняя частка сярэдняга стратыграфічнага гарызонту прадстаўлена цёмна-шэрым, амаль чорным пластом вільготнай камкаватай зямлі магутнасцю 0,3–0,4 м. У структуры пласта зафіксаваны абпаленыя камяні дыяметрам да 0,1 м, зверху прапластка перакрыта прапластачкай вапны 0,05 см, знізу – прапластачкай вугалю аналагічнай магутнасці (нівеліровачная адзнака 410) (мал. 3, 5). Тут ў межах кв. 4–6 адзначаны пласт зямлі на глыбіні 2,5 м, які мае выразныя межы з паўднёвага боку: у кв. 4, 5 ён абведзены трохвугольным выступам (магчыма, паўднёва-ўсходняя і паўднёва-заходняя сценкі пабудовы), які добра акрэслены на фоне светла-шэрай супесі ніжняга стратыграфічнага гарызонту. Даўжыня паўднёва-ўсходняй сценкі цёмна-шэрай плямы зямлі 2,15 м, яна пачынае фіксавацца ад мяжы кв. 3 і 4 каля паўночнай сценкі раскопу, утварае прамы вугал практычна па мяжы кв. 4 і 5 на адлегласці 1 м ад паўночнай сценкі раскопу і працягваецца да паўночнай сценкі пад прамым вуглом (даўжыня да сценкі раскопу 1,3 м). Гэтая пляма зямлі перакрывае другую ў кв. 5, 6. Запаўненне культурнага пласта ў ёй адрозніваецца ўтрыманнем вялікай колькасці абпаленых камянёў. Мяжа гэтай плямы прадстаўлена роўнай лініяй даўжынёй 2,8 м, якая пралягла па накірунку паўночны ўсход–паўднёвы захад. Пачынаецца яна ад паўднёва-заходняй сценкі згаданай вышэй трохвугольнай плямы і заканчваецца каля заходняй сценкі раскопу ў кв. 6 на адлегласці 0,42 м ад мяжы кв. 6 і 12 каля сценкі раскопу. Яе мяжа добра акрэслена на фоне светла-шэрай супесі ніжняга стратыграфічнага гарызонту, лінія мяжы праходзіць паралельна лініі мяжы паўднёва-ўсходняй сценкі трохвугольнай плямы цёмна-шэрай зямлі кв. 4, 5. На адлегласці 0,3 м ад паўднёва-ўсходніх межаў абедзвюх плямаў цёмна-шэрай зямлі адзначана паласа аналагічнай па структуры зямлі шырынёй 0,4 м, якая праходзіць паралельна іх межам. Магутнасць пластоў цёмна-шэрай зямлі аднолькавая і складае ад 0,3 да 0,4 м.



Мал. 9. План мацерыка. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007



Мал. 10. Ляпная кераміка з мацерыковай ямы 3: *1–5* – венцы гаршкоў; *6* – донца гаршка. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

Ніжні пласт сярэдняга стратыграфічнага гарызонту ў кв. 1–3 мае магутнасць 0,2 м і прадстаўлены чорнай, насычанай вугалем зямлёй. Зверху маркіраваны прапластачкай вугалю магутнасцю 1–2 см (кв. 2). У заходняй частцы кв. 2 пласт мае максімальную магутнасць (0,6 м) і дасягае мацерыка ў межах мацерыковай ямы 4 (мал. 3). У структуры пласта мацерыковай ямы вылучаюцца падоўжаныя лінзы 0,10 × 0,05 м белай супесі. Ніжняй мяжой пласта ў кв. 1–3 з'яўляюцца прапластка вугалю 0,1 м (кв. 1), перакрытая прапластачкай зярністага пяску (0,1 м магутнасці) белага колеру на мяжы кв. 1 і 2. Гэтая прапластка вугалю мае радыевугляродную дату – 130–230 гг. н. э. (П 7) (мал. 3). Пад прапласткай вугалю зафіксаваны пласт цёмна-шэрай камкаватай зямлі з вугалем магутнасцю 0,2 м (нівеліровачная адзнака ніжняй мяжы 443 см) (мал. 3, 5). У кв. 2 ніжняя мяжа сярэдняга стратыграфічнага гарызонту прадстаўлена



Мал. 11. Вырабы з каляровых металаў: *1* – міска; *2* – пляцёнка. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

пластом гумуса магутнасцю 0,1 м, які высцілае дно мацерыковай ямы 4 (нівеліровачная адзнака 521 см) і яе ўсходняй сценкі. Пласт гумуса распаўсюджаны да мяжы кв. 1 і 2, тут ён маркіруе ніжнюю мяжу сярэдняга стратыграфічнага гарызонту. Па-за межамі мацерыковай ямы пласт гумуса перакрывае танюткую прапластачку вугалю (2–3 см) у межах усходняй часткі кв. 1.

У кв. 3 ніжняя мяжа сярэдняга стратыграфічнага гарызонту маркіравана прапластачкай вугалю магутнасцю 0,08–0,10 м, якая пачынаецца ад заходняга краю мацерыковай ямы 4 на мяжы кв. 2 і 3, працягваецца да мяжы кв. 3 і 4, такім чынам яе даўжыня складае каля 2 м. Гэтая прапластка вугалю размешчана на адным узроўні з прапласткай вугалю кв. 1 і 2, якая ў межах гэтых квадратаў мае радыевугляродную дату (П 7). У межах кв. 3 радыевугляродная дата пласта вугалю (П 4) мае інтэрвал 20–220 гг. н. э. і карэлюецца з датай П 7 (мал. 3).

Мацерыковая яма 4 пачынаецца ад згаданай прапластачкі вугалю кв. 3, якая мае нівеліровачную адзнаку 428 супраць 186 (дзённая паверхня) і выразна прасочваецца на планіграфіі пласта 12 на глыбіні 2,4 м. Тут прапластка вугалю мае паўкруглую форму і размешчана на мяжы кв. 2 і 3, яна адступае ад края раскопу на 0,4 м па мяжы кв. 2 і 3. Каля ўсходняга краю ямы зафіксаваны камень дыяметрам 0,3 м, які мае нівеліровачную адзнаку 418. Гэтая

прапластка павольна паніжаецца да мацерыка з заходняга накірунку і пераходзіць у сценку мацерыковай ямы 4. Яма мае вертыкальныя сценкі вышынёй 0,58 м (заходняя частка, нівеліровачная адзнакі 459 супраць 521 на дне ямы) і 0,6 м (усходняя частка, нівеліровачная адзнакі 458 супраць 521) – на гэтую глыбіню яма ўпушчана ў мацярык. У раскоп трапіла толькі палова ямы ў межах заходняй часткі кв. 2. Яма мае паўкруглую форму, шырыню 0,9 м, адступае ад паўночнай сценкі на 0,3 м (мал. 9). Знаходкі ў яме адсутнічаюць.

У паўднёвай частцы кв. 4, 5 зафіксавана няправільнай падоўжанай формы лінза цёмна-шэрай аднароднай зямлі з вугалем. У гэтай прапластцы цёмна-шэрай зямлі вылучаюцца лінзы чырвонай перапаленай гліны, з усходняга боку зафіксавана лінза вугалю няправільнай падоўжанай формы шырынёй 0,5–0,6 м. Па краях гэтай лінзы з поўначы зафіксавана прапластачка магутнасцю 0,01 м зярністай супесі белага колеру, пласт белай супесі з правільна акрэсленым прамым вуглом, які выступае з паўднёвай сценкі раскопу, зафіксаваны на мяжы кв. 4 і 5 (памеры: з захаду на ўсход 1,3 м, вугал выступае на 0,2 м, нівеліровачная адзнака 402).

У кв. 1 у ніжняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту зафіксаваны тры камяні дыяметрам 0,3 м кожны, яны пакладзены ў паўночна-ўсходняй частцы кв. 1 і з захаду выкладзены падковападобнай прапласткай белага пяску з лінзай вугалю (нівеліровачныя адзнакі 384–404). Шырыня прапласткі пяску 0,08 м, даўжыня з улікам выгіну 0,4 м. Камяні адзначаны і над імі ў вышэйшым пласце (нівеліровачныя адзнакі 381), магчыма, рэшткі вогнішча. У гэтым жа квадраце зафіксавана трапецападобная пляма светла-карычневага супеску, якая пачынаецца ад ўсходняга края раскопу пасярэдзіне кв. 1 (тут яе шырыня складае 0,7 м), цягнецца на захад на адлегласць 1,3 м і мае шырыню ў заходняй частцы 1,2 м. Пасярэдзіне гэтай прапласткі зафіксаваны два камяні дыяметрам 0,1 і 0,2 м (нівеліровачныя адзнакі 400) (мал. 4).

У паўднёвай частцы кв. 2 зафіксаваны тры абпаленыя плахі дыяметрам 0,07 м кожная, даўжынёй 0,5 м. Плахі пакладзены ўшчыльную адна да другой і маюць накірунак размяшчэння з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Ніжняя частка сярэдняга стратыграфічнага гарызонту ў паўднёвай частцы раскопу па лініі сценкі кв. 1–6 прадстаўлена пластом чорнай зямлі з вугалем магутнасцю 0,2 м (кв. 8–12), у кв. 7 гэтая прапластка мае магутнасць 0,05 м (мал. 4).

У ніжняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту былі знойдзены нешматлікія індывідуальныя знаходкі (14 шт. з агульнай колькасці 496 шт.); у тым ліку бронзавае наверша харугвы, бронзавая падковападобная фібула з трохгранным сячэннем дужкі, жалезны наканечнік кап'я, сердалікавая шматгранная пацерка, цыліндрычная пранізка зялёнага колеру, зонная пацерка жоўтага колеру, бісер рублены жоўтага колеру, каменная шліфаваная сякера днепра-дзвінскай культуры. Асноўная колькасць ляпной керамікі была знойдзена менавіта ў ніжняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту. З яе складу вылучаюцца тыповыя формы гаршкоў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў канца VIII – X ст. (большасць усіх венцаў), венцы гаршкоў трэццяй чвэрці I тысячагоддзя н. э. і сценка посуду «з расчосамі» сярэдзіны I тысячагоддзя н. э., гаршкі днепра-дзвінскай культуры. Уся ляпная кераміка размешчана дысперсна ў ніжнім пласце сярэдняга стратыграфічнага гарызонту. Разам з тым гарызонты залягання асобных тыпаў гаршкоў не вылучаны. Побач з ляпной у гэтым стратыграфічным пласце былі знойдзены венцы ганчарнай керамікі канца X – XI ст. і больш позняй – XI–XII стст.

Ніжні стратыграфічны пласт раскопу 1 – гэта пласт светла-шэрай з карычневатым адценнем арганікі, вельмі мяккай, сухой і аднароднай па структуры. Гэты пласт мае магутнасць ад 0,2 м (усходняя частка раскопу), да 0,5 м (заходняя частка), прадстаўлены па ўсёй плошчы раскопу за выключэннем мацерыковых ям 3 і 4 (мал. 3–5). Зафіксаваны на глыбіні каля 2,5 м (заходняя частка раскопу, нівеліровачныя адзнакі 410 супраць 165) (мал. 3), і 2,4 м (усходняя частка, нівеліровачныя адзнакі 423 супраць 190). У гэтым арганічным рэчыве, якое вельмі нагадвае торф, адсутнічаюць камяні і вугаль. Знаходкі прадстаўлены рэдкімі фрагментамі сценак ляпных гаршкоў, косткамі жывёл пераважна ў кв. 6 (прычым на мяжы сярэдняга і ніжняга стратыграфічных гарызонтаў), а індывідуальныя знаходкі – напаўспарахнелым рогавым навершам кап'я.

У раскопе зафіксаваны 4 мацерыковыя ямы. Форма, структура пласта і колькасць знаходак мацерыковых ям 3 і 4 пазначаны вышэй ў апісанні сярэдняга стратыграфічнага пласта.

Яма 1 размешчана на поўнач ад пасярэдняй лініі ўсход–захад кв. 3 (мал. 12). Яма мае няправільную форму памерамі 0,40 × 0,45 м. Яма мае сценкі вышынёй 0,09 м (нівеліровачныя адзнакі 450 супраць 459), якія ўступамі пераходзяць у завостранае дно. Запоўнена пластом светла-шэрай з карычневым адценнем арганікай ніжняга стратыграфічнага гарызонту. У яме знойдзены 3 косткі жывёл, 1 кальцыніраваная костка жывёлы, 1 сценка ляпнога гаршка.

Яма 2 мае круглую форму дыяметрам 0,22 м, размешчана ў паўднёва-заходнім вуглу кв. 4. Яна мае вертыкальныя сценкі вышынёй 0,12 м (нівеліровачныя адзнакі 463 супраць 475), плоскае дно. Запоўнена пластом светла-шэрай з карычневым адценнем арганікі ніжняга стратыграфічнага гарызонту. Знаходак не выяўлена.



Мал. 12. Сякеры з каменю (*1, 2*). Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

Мацярык раскопу 1 мае роўную паверхню і прадстаўлены жоўтым аднародным дробназярністым пяском. Размешчаны на глыбіні 3 м у заходняй частцы і 2,7 м ва ўсходняй частцы раскопу.

Археалагічныя знаходкі. Калекцыя індывідуальных знаходак налічвае 496 пазіцыі паводле вопісу, масавых – 3652 пазіцыі. Сярод знаходак прадстаўлены рарытэтныя рэчы з каляровых металаў: адваротная створка меднага крыжа-энкалпіёна XI–XII стст. [13, с. 87], часткі кіотнага крыжа з выявай Богамацеры і апостала Іаана XI–XII стст., частка бронзавага ланцугатрымальніка для кадзіла, бронзавая дэталь хораса з двухбаковым плеценым арнаментам, накладка на драўляную чашу з выявай грыфона, візантыйская бронзавая фібула, бронзавая падвеска з раслінным арнаментам[1]. Да калекцыі вырабаў з каляровых металаў належаць таксама кісцень (мал. 13: *1*), інструмент ювеліра – бронзавая кіянка (мал. 13: *4*), донца бронзавай лампадкі (мал. 13: *5*). З калекцыі рарытэтных вырабаў адзначым таксама бронзавую міску (мал. 11: *1*), бронзавую дэталь пэндзля (мал. 14: *11*), фрагмент сярэбранай пляцёнкі (мал. 11: *2*). Увесь комплекс рэчаў стратыграфічна і тыпалагічна датуецца XII–XIII стст.

[1] Апісанне гэтых вырабаў падрабязна прадстаўлена ў артыкулах «Древо жизни полоцкого городища» і «Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст.» [5, с. 37–39; 6, с. 25–31].



Мал. 13. Вырабы з каляровых металаў: *1–2* – кісцяні (?); *3* – наканечнік харугвы; *4* – кіянка; *5* – донца лампадкі. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

У калекцыі вырабаў з бронзы прадстаўлены таксама зашпілька (?) (мал. 15: *4а*), дзяржанне куфра (мал. 15: *5*), пярсцёнкі (мал. 14: *3*; 15: *9*), паясовая накладка (мал. 15: *7*), размеркавальнік ювелірных вагаў (мал. 15: *4*), фрагменты дрота (мал. 14: *1*, *2*, *7*), абрэзкі пласціны (мал. 14: *4*; 16: *5*), рамонтныя накладкі на драўляны посуд (мал. 14: *8*, *10*)[1], скроневае кальцо (?), зробленае з жалезнага стрыжня і меднай

[1] Аб гэтым прызначэнні знойдзеных вырабаў сведчаць знаходкі аналагічных рамонтных накладак на драўляным посудзе з курганнага могільніка Пагошча [19, с. 135–145].



Мал. 14. Вырабы з каляровых металаў: *1, 2, 7* – дрот; *3* – фрагмент пярсцёнка; *4* – абрэзак пласціны; *5, 9* – фрагменты бранзалетаў; *6* – фрагмент зашпількі кашулі; *8, 10* – рамонтныя накладкі; *11* – дэталь пэндзля (зажым для ворсу і дзяржання). Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

аплёткі (мал. 15: *2*). З каляровых металаў прадстаўлены некалькі вырабаў невядомага прызначэння (мал. 15: *3*, *6*, *10*; 16: *3*).

У раскопе знойдзены тры дыскападобныя бронзавыя фібулы XII–XIII стст. са звонападобным купалам, да якога прымацавана вушка-дзяржанне. Аналагічныя вырабы былі знойдзены археолагамі Г. В. Штыхавым у Полацку і П. Ф. Лысенкам у Бярэсці. Паводле вызначэння П. Ф. Лысенкі, гэтыя вырабы з'яўляюцца часткай верхняга касцюма, яны замацоўваліся папарна скуранымі рамянямі і прызначаліся для прадзявання ў праразі верхняга адзення [14, с. 102] (мал. 16: *2, 4*). Знойдзены два бронзавых вушка-трымальніка для посуду (мал. 16: *6, 7*).



Мал. 15. Вырабы з каляровых металаў: *1* – зашпілька кашулі; *2* – скроневае кольца (?); *3, 6, 10* – вырабы невядомага прызначэння; *4* – размеркавальнік ювелірных вагаў; *4а* – зашпілька; *5* – дзяржанне куфра; *7* – паясовая накладка; *8* – наканечнік рэменю; *9* – пярсцёнак. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

Паводле стратыграфіі, арнаментаваны бронзавы наканечнік скуранога рэменя (мал. 15: *8*), свінцовы бранзалет (мал. 14: *9*), бронзавае навершша харугвы (мал. 13: *3*), бронзавая падковападобная фібула з трохгранным сячэннем дужкі (мал. 16: *1*) датаваны часам да XII ст. Гэтае датаванне пацвярджаецца данымі з іншых помнікаў. Аналагічныя наканечнікі бронзавага рэменя з'яўляліся прадметам усходняга імпарту і паводле шэставіцкага комплексу належалі да атрыбутаў дружыннікаў канца IX – пачатка XI ст. [11, рис. 8: *1*]. Бронзавыя падковападобныя фібулы былі шырока распаўсюджаны на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў X – пачатку XIII ст. [9, с. 43].

Бронзавая дэталь пэндзля з'яўляецца выключна рэдкай знаходкай (мал. 14: *11*). Яна прадстаўляе сабой трубачку даўжынёй 4,5 см з разрэзам па ўсёй



Мал. 16. Вырабы з каляровых металаў: *1, 2, 4* – фібулы; *3* – выраб невядомага прызначэння; *5* – абрэзак пласціны; *6, 7* – вушкі-трымальнікі ад посуду; *8* – накладка на рэмень (?). Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

даўжыні. Пасярэдзіне трубачка замацавана бронзавым кольцам з арнаментам у выглядзе насечак. Дыяметр трубачкі – 0,4–0,5 см, канцы пашыраны, дыяметр кольца – 0,5 см, шырыня – 0,4 см. У адзін канец трубачкі прадзявалася драўлянае дзяржанне, у другі – ворс для малявання. Гэтая дэталь пэндзля была знойдзена ў адным пласце з 5 кавалкамі вохры (акамянелых дробнадысперсных кавалкаў колеравага рэчыва вагой да 100 г) чырвонага колеру і 1 кавалкам жоўтага колеру. Гэтыя знаходкі – сведчанне пражывання ці працы мастака на полацкім гарадзішчы ў XII–XIII стст.



Мал. 17. Жалезныя вырабы зброевай майстэрні: *1, 2, 5–14* – пласцінкі наборнага даспеха; *3, 4* – кольцы кальчугі. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

У раскопе ў колькасці 44 адзінак знойдзены жалезныя пласцінкі наборнага даспеха і іх нарыхтоўкі (мал. 17–19), два кольца кальчугі (мал. 17: *3, 4*). Пласцінкі даспеха знойдзены ў пласце XII–XIII стст. У іх ліку вылучаецца шырокая пласціна-нарыхтоўка з раскляпанымі, але не завальцаванымі адтулінамі для трымання (памеры 2,5 × 6,5 см) (мал. 17: *5*), 13 вузкіх пласцінак і іх фрагментаў, якія маюць адзін падоўжаны зубчаты край і дзве ці тры адтуліны для крапяжу, адна – пасярэдзіне, дзве – па краям (памеры гэтых пласцінак ў сярэднім 1,0 × 6,5 см). Большасць пласцінак (30 цэлых і фрагментаў) зроб-



Мал. 18. Жалезныя вырабы зброевай майстэрні: *1–16* – пласцінкі наборнага даспеха. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

лены ў форме крыху выгнутых па даўжыні жалезных палосак з дзвюма-трыма адтулінамі для крапяжу. Пласцінкі з аналагічнымі памерамі на тэрыторыі Беларусі знойдзены падчас раскопак Гальшанаў у культурным пласце XII–XIV стст., і ў гомельскай зброевай майстэрні 1239 г. [8, рис. 32: *17*; 16, с. 125–130].

Зброя прадстаўлена таксама наканечнікамі стрэл і кап'я, сякерай. Жалезная сякера мае рэдкую форму, паводле стратыграфіі датуецца XI–XIII стст. (мал. 20). Аналагаў на тэрыторыі Беларусі не выяўлена. Паводле А. М. Кірпічнікава, дадзеная сякера падобная да тыпу VI. Час бытавання падобных сякер на Русі ахоплівае XI–XII стст. [10, рис. 6]. У пласце да XI ст. уключна знойдзены жалезны утулкавы наканечнік кап'я (мал. 21). Жалезныя наканечнікі стрэл тыпу «зрэзань» стратыграфічна датуюцца XII–XIII стст. (мал. 7: *1, 3, 4*). Аналагічнае датаван-



Мал. 19. Жалезныя вырабы зброевай майстэрні: *1–15* – пласцінкі наборнага даспеха. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

не маюць 5 чаранковых наканечнікаў стрэл (мал. 7: *5–9*). Выключэннем з'яўляецца фрагмент масіўнай трохграннай ў сячэнні стралы, якая знойдзена ў ранейшым за XII ст. пласце (мал. 7: *2*).

Зброя прадстаўлена двума свінцовымі кісцянямі (мал. 13: *1, 2*). Іх форма набліжана да куба са скошанымі гранямі. Памеры вырабаў: 2,2 см (шырыня) × 1,5 см (вышыня); 2,7 см (шырыня) × 2,3 см (вышыня). У першага вырабу адтуліна квадратнай формы памерам 0,9 × 0,9 см (шырокі бок) і 0,7 × 0,7 см (вузкі бок), да таго ж мае квадратную выемку з шырокага боку, у другога вырабу адтуліна круглай формы дыяметрам 0,9 см, з другога боку – ў форме няправільнага авала. Кісцяні вылучаюцца маленькімі памерамі, аналагаў ім не выяўлена. Знойдзены ў верхнім стратыграфічным гарызонце.



Мал. 20. Жалезная сякера. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007



Мал. 21. Жалезны наканечнік кап'я. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

У раскопе знойдзена тры металічныя карпусы навясных замкоў і ключы да іх. Большасць з іх належаць да тыпу А, Б і В паводле Б. А. Колчына [12, с. 162]. Знойдзена два ключы да нутраных замкоў. Гэтыя вырабы знаходзіліся ў пласце XI–XIII стст. Знойдзены таксама авальныя жалезныя крэсівы XII–XIII стст.: два кароткіх і адно доўгае разам з фрагментам калачападобнага крэсіва XI–XIII стст.

У пласце XI–XIII стст. знойдзены тры жалезных рыбалоўных кручка, жалезная дужка ад начыння, жалезная стамеска, шыла. Сабраны жалезныя скабяныя вырабы і дэталі дзвярнога набору, жалезныя дротавыя паўкалечкі невядомага прызначэння, жалезная спражка авальнай формы, жалезная шавецкая ігла, два размеркавальнікі. Прызначэнне асобных вырабаў і прылад працы высветліць не ўдалося.

Шкляныя вырабы прадстаўлены вялікай колькасцю фрагментаў бранзалетаў. Бранзалеты двух відаў: з гладкім стрыжнем і ілжэвітыя. Колеравая гама – зялёная, жоўтая, блакітная, чорная. Шкляныя пацеркі прадстаўлены жоўтым бісерам (мал. 22: *6*), цыліндрычнай пранізкай зялёнага колеру (мал. 22: *3*), зоннай пацеркай жоўтага колеру (мал. 22: *4*). У ніжняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту знойдзены бісер рублены (мал. 22: *19*), пранізкі (мал. 22: *14*), пацеркі-лімонкі (мал. 22: *9–11, 14–16*),



Мал. 22. Вырабы з каменю (*1, 2, 12*) і са шкла (*3–11, 13–19*): *1–6, 8–18* – пацеркі; *7* – устаўка ў пярсцёнак; *12* – смальта; *19* – бісер. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

фрагмент пацеркі з глазкавым арнаментам і іншыя пацеркі (мал. 17: *13, 15, 17, 18*). Пацеркі-лімонкі і залачоныя дзежкападобныя ўкладаюцца ў агульнапрызнаную схему датавання IX–X ст. і XI ст. адпаведна [24, с. 164]. У раскопе знойдзены таксама 2 кавал-кі смальты зялёнага колеру і 1 – жоўтага колеру (мал. 22: *5, 12*).

Да калекцыі пацерак належаць сердалікавыя шматгранная пацерка (мал. 22: *1*), якая знойдзена ў перамяшаным пласце ніжняй часткі сярэдняга стратыграфічнага гарызонту, і шасцігранная біпіраміда-льная сердалікавая пацерка, – у пласце XI–XIII стст. (мал. 22: *2*). Сердалікавыя біпірамідальныя пацеркі шырока вядомы ў курганных пахаваннях радзімічаў стадыі А, якая датуецца другой паловай X – пачаткам XI ст. [2, с. 68, рис. 9: *67*]. У Ноўгарадзе такія пацеркі датуюцца шырока – ў межах XII–XIII стст. [12, с. 170].

У пласце XI–XIII стст. сабрана вялікая калекцыя каменных асялкоў рознай формы і памераў, некаторыя зроблены з шыфернага сланца і маюць скразныя дзірачкі для падвешвання. Шыферныя



Мал. 23. Праселкі з каменю (шыферны сланец) з графіці і надпісамі (*1–3*).
Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

праселкі тыповыя для XII–XIII стст., некаторыя з іх маюць графіці ў выглядзе прадрапаных ліній і літар (мал. 23: *1, 2*). Рарытэтнай знаходкай з'яўляецца праселка з шыфернага сланца з прадрапанымі літарамі «НАМГ» (мал. 23: *3*).

Касцяныя вырабы прадстаўлены арнаментаванымі і неарнаментаванымі дзяржаннямі нажэй XII–XIII стст. (мал. 8: *1, 2, 6*). Неарнаментаванае дзяржанне захавалася разам з жалезным тарцавым крапяжом (мал. 8: *6*). Касцяная шахматная фігура слана XIII ст. (мал. 24: *4*) мае аналогіі з вырабам, знойдзеным у Мінску [17, с. 38], памеры фігуркі: вышыня 2,2 см, аснова авальная 2,0 × 1,5 см. Знойдзена рогавая муфта (мал. 24: *2*), два фрагменты двухбаковых касцяных грабянёў, з іх адзін з накладнымі тронкамі (мал. 24: *3–5*), кавалак касцянога дзяржання (?) (мал. 8: *3*), фрагмент касцяной накладкі крыху выгнутай падоўжанай формы (мал. 8: *7*), дзве нарыхтоўкі з косці: першая – рогавай муфты, а другая – капавушкі (мал. 8: *4, 5*). Усе гэтыя касцяныя вырабы стратыграфічна датуюцца XII–XIII стст.

Напаўспарахнелае рогавае наверша кап'я (?) знойдзена ў пласце днепра-дзвінскай культуры (мал. 12: *1*) у комплексе з каменнай шліфаванай сякерай днепра-дзвінскай культуры (мал. 12: *1*). Да гэтай жа культуры, відаць, трэба аднесці кавалак каменнай сякеры ці молата з прасвідраванай адтулінай (мал. 12: *2*). Выраб зроблены з дробназярністага белага каменю. Гэты выраб быў знойдзены ў пласце XI–XIII стст., аднак яго больш позняе паходжанне не выклікае сумненняў.

З керамікі вылучаюцца кавалкі плінфы, якая прадстаўлена ў выглядзе моцна патрушчаных кавалкаў у колькасці звыш 500 адзінак. Большасць кавалкаў мае сляды рошчыны-цамянкі. Цэлых пласцін знойдзена не было. Па асобных фрагментах магчыма меркаваць пра таўшчыню плінфы: 2,5 см – 2 шт.; 2,8 – 1; 2,9 – 1; 3,0 – 3; 3,1 – 1; 3,2 – 1; 3,4 – 2; 3,5 – 6; 3,6 – 1; 3,9 – 1; 4 см – 1 шт. Улічваючы вялікую колькасць аплаўленых фрагментаў свінца, а таксама загорнутых у трубачку свінцовых пласцін, знойдзеных у раскопе кавалкаў смальты і фрагментаў царкоўнага начыння, можна меркаваць аб размяшчэнні непадалёк ад раскопу 1 мураванай царквы. Фармат плінфы (сярэдняя вышыня 3,5 см) тыповы для храмаў полацкай школы дойлідства XII ст. [21, с. 142–163].

Зроблена класіфікацыя ўсіх венцаў гаршкоў XI–XIII стст., зробленых на ручным ганчарным кругу. Для класіфікацыі адабраны венцы ў колькасці 1116 шт., па якіх можна меркаваць аб профілі верхняй часткі гаршка. Усе гаршкі падзелены на 9 тыпаў (табліца).



Мал. 24. Вырабы з косці: *1* – наверша кап'я (?); *2* – муфта; *3, 5* – фрагменты грабянёў; *4* – шахматная фігура (слон); *6* – нарыхтоўка. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

Самым распаўсюджаным з'яўляецца тып А (агульная колькасць 611 венцаў), які падзяляецца на 4 варыянты. У гаршкоў гэтага тыпу складанае венца, край якога загнуты ўнутр у форме літары «S». Варыянт А 1 – гаршкі з арнаментаваным плечыкам і тулавам, як правіла, прамымі лініямі ці хвалістым арнаментам з нахілам у левы бок. Варыянт А 2 – гаршкі з арнаментаваным насечкамі ці ямкамі краем венца, тулава і плечыкі гаршкоў, як правіла, таксама арнаментаваны. Варыянт А 3 – кераміка без арнаментацыі. Паводле Г. В. Штыхава, аналагічная кераміка ў раскопе на Верхнім замку была знойдзена ў пластах XI – першай паловы XIII ст. [23, с. 82]. Сярод гэтай керамікі ёсць формы з раўчуком па краі венца (падтып А 4 полацкага гарадзішча). Такую кераміку Г. В. Штыхаў вызначае як спецыфічны полацкі тып.

Тып А бытаваў на полацкім гарадзішчы да канца XIII ст., максімум яго распаўсюджвання прыходзіцца на XIII ст. (верхняя частка сярэдняга стратыгра-

Распаўсюджванне тыпаў ганчарнай керамікі з раскопу 1 па пластах

Выява керамікі														
Пласт / тып керамікі	А 1	А 2	А 3	А 4	Б	В	Г	Д	Е 1	Е 2	Ж	З	К 1	К 2
1	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–
2	–	2	13	–	1	7	2	–	1	–	–	–	1	–
3	1	4	17	7	–	10	1	2	3	1	1	–	1	–
4	–	4	19	3	2	2	1	1	1	–	2	–	–	–
5	2	9	26	3	6	9	5	2	2	–	–	–	–	–
6	4	6	30	6	1	24	2	–	2	–	2	–	2	2
7	27	25	121	53	18	88	26	24	15	4	6	–	6	3
8	3	31	32	30	–	18	12	–	2	1	3	–	2	–
9	3	4	5	–	–	1	1	–	–	–	–	–		–
9а	1	4	22	12	–	13	14	18	5	–	1	2	2	–
9б–10	4	5	45	9	2	17	17	22	4	–	7	6	2	–
11	–	–	10	5	4	18	9	3	1	–	–	–	–	–
12	1	–	1	–	–	1	–	–	–	–	–	–	–	–
13	1	–	2	1	2	1	2	2	–	–	–	–	–	–
Разам:	47	94	341	129	37	209	92	74	36	6	22	8	16	5

фічнага гарызонту, што адпавядае пл. 7, 8 табліцы). Дыяметр венцаў ад 17 да 32 см.

Тып Б – гаршкі з высокай шыйкай і амаль вертыкальна пастаўленым венцам. Дыяметр гэтых пасудзін ад 12 да 27 см (агульная колькасць 37 венцаў). Гаршкі арнаментаваны лінейным у спалучэнні з хвалістым арнаментам па плечуку ці хвалістым арнаментам звонку пад самым краем венца. Максімальная колькасць гаршкоў (18 шт.) тыпу Б знойдзена ў верхняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту, што адпавядае пл. 7 табліцы.

Да тыпу В аднесены гаршкі з высокім, адагнутым вонкі каля 45° прамым венцам. Дыяметр гэтых пасудзін ад 22 да 28 см (агульная колькасць 209 венцаў). Гаршкі арнаментаваны хвалістым арнаментам у спалучэнні з лінейным, насечкамі па тулаву з хвалістым арнаментам. Максімальная колькасць гаршкоў тыпу В (88 шт.) знойдзена ў верхняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту, што адпавядае пл. 7 табліцы. У колькасці ад 13 да 18 шт. яны знойдзены ў сярэдняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту (пл. 9а–11 табліцы). Гэтая кераміка аналагічная некаторым тыпам гаршкоў з Верхняга замка, дзе яна датавана 50-мі гадамі XIII ст. [23, рис. 43: *8*]. Большасць венцаў гаршкоў тыпу В знойдзена ў пласце, які адпавядае гэтаму датаванню і ў больш ранніх – XI ст.

Тып Г – гаршкі сярэдняга памеру (дыяметр вусця ад 12 да 26 см) з адагнутым вонкі венцам і пакатымі плечукамі. На полацкім гарадзішчы гэтыя гаршкі знойдзены ў колькасці 92 шт. Максімальная колькасць гаршкоў тыпу Г (26 шт.) знойдзена ў верхняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту, што адпавядае пл. 7 табліцы. Аднак гэтыя пасудзіны даволі роўна распаўсюджаны ў сярэдняй і верхняй частках сярэдняга стратыграфічнага гарызонту (ад пл. 7 да пл. 11) (табліца). Такія гаршкі, паводле Г. В. Штыхава, адпавядаюць тыпу І і датуюцца X–XI – XII стст. [23, с. 81]. На полацкім гарадзішчы гэтыя пасудзіны распаўсюджаны ў пластах XI–XIII ст. Гаршкі, як правіла, арнаментаваны гарызантальнымі палоскамі па тулаву альбо двума радамі хвалістага арнаменту па тулаву (нахіл хвалі ў левы бок), асобныя гаршкі арнаментаваны хвалістым арнаментам па самым краі венца.

Да тыпу Д аднесены гаршкі з высокім, плаўна адагнутым вонкі венцам. Дыяметр гэтых пасудзін ад 14 да 34 см (агульная колькасць 74 венца). Некаторыя гаршкі арнаментаваны па тулаву адным-двума радамі хвалістага арнаменту (нахіл хвалі ў левы бок). Максімальная колькасць гаршкоў тыпу Д знойдзена ў сярэдняй і верхняй частках сярэдняга стратыграфічнага гарызонту (22 і 24 шт. адпаведна), што адпавядае пл. 9б–10 і пл. 7 табліцы. Такія гаршкі на Верхнім замку ў Полацку былі знойдзены пераважна ў пласце XII ст. [23, рис. 42: *21–23*]. На полацкім гарадзішчы яны бытавалі з XI па XIII стст.

Тып Е – гаршкі з невысокім, адагнутым вонкі венцам. Дыяметр гэтых венцаў ад 12 да 26 см. Гаршкі тыпу Е падзяляюцца на два варыянты. У варыянта Е 1 венца невысокае, у варыянта Е 2 яно мае значную вышыню (да 3 см), таўшчыня сценак каля 0,8 см. Некаторыя гаршкі арнаментаваны адным-двума радамі хваляў з нахілам у левы бок па тулаву. Агульная колькасць венцаў варыянта Е 1 – 36, з іх большасць знойдзена ў верхнім стратыграфічным гарызонце і верхняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту (табліца). На Верхнім замку такія гаршкі знойдзены ў пласце мяжы XII–XIII стст., што цалкам карэлюецца са стратыграфічным датаваннем гаршкоў на полацкім гарадзішчы [23, рис. 42: *32*]. Венцаў гаршкоў варыянта Е 2 знойдзена 6 шт., з іх 4 – у пл. 7 (табліца).

Венцаў гаршкоў тыпу Ж знойдзена 22 шт. Дыяметр гэтых венцаў ад 16 да 22 см. Вылучае гаршкі адна характэрная рыса: край венца ў іх загнуты ўнутр і ўтварае своеасаблівы карнізік. Гэтыя гаршкі даволі роўна прадстаўлены ў сярэдняй і верхняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту (пл. 7, 9б–10 табліцы). У калекцыі керамікі Верхняга замка прадстаўлена адно падобнае венца, якое датуецца 50-мі гадамі XIII ст. [23, рис. 43: *14*]. Гаршчок з гарадзішча арнаментаваны па плечуку рэльефнымі лініямі, а па краі венца – зашчыпамі.

Гаршкі тыпу З нешматлікія, знойдзены ў колькасці 8 шт. у сярэдняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту (табліца). Гэтыя гаршкі маюць пакатыя плечукі і гарызантальна адагнуты вонкі венчык. Дыяметр венцаў ад 18 да 22 см. Паводле стратыграфіі, гаршкі тыпу З ужываліся раней за XIII ст.

Гаршкі тыпу К падзяляюцца на два варыянты. Гаршкі варыянта К 1 маюць крыху адагнутае вонкі прамое венца са скошаным звонку краем, плечукі гаршка акруглыя, дыяметр венцаў ад 16 да 26 см. Вышыня краю венца не перавышае 2 см. Гаршкі варыянта К 2 маюць дыяметр 14–25 см і больш высокі прамы край венца (каля 2,5–3,0 см, часта аздоблены пад самым краем венца гарызантальным раўчуком па ўсім дыяметры). Некаторыя гаршкі арнаментаваны гарызантальнымі палоскамі па плечуку, маюць зашчыпы па краі ці аздоблены некалькімі радамі хвалістага арнаменту па тулаву. Большасць гаршкоў варыянта К 1 знойдзена ў пл. 7 (6 шт. з агульнай колькасці 16 шт.), астатнія даволі роўна распаўсюджаны ў верхніх пластах сярэдняга і ў верхнім стратыграфічным гарызонце. Гаршкі варыянта К 2 знойдзены ў колькасці 5 шт. ў верхняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту (пл. 6, 7 табліцы). Гэтыя гаршкі з'яўляюцца найбольш архаічным тыпам ганчарнай керамікі на полацкім гарадзішчы. Гаршкі сфармаваны на ганчарным крузе, аднак венца ў іх няроўнае, гузаватае, у керамічным цесце зафіксаваны кавалкі буйной жарствы, венца некаторых гаршкоў злеплена ад рукі і загладжана на ганчарным крузе.



Мал. 25. Ляпная кераміка: *1–5* – венцы гаршкоў. Малюнак М. А. Плавінскага. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

Пэўныя аналогіі раннеганчарным гаршкам тыпу К магчыма знайсці сярод групы раннеганчарнай керамікі старажытнага Пскова так званага раскошнага стылю (вызначэнне С. В. Бялецкага). Датаванне гэтага посуду ў Пскове ўкладаецца ў дыяпазон канца X – пераважна першай паловы XI ст. Формы полацкага раннеганчарнага посуду тыпу К маюць аналагічна пскоўскаму начынню вертыкальна пастаўленае венца і выразны плячук, аздоблены арнаментам. Полацкі посуд адрознівае непараўнальна меншае аздабленне плечука як па глыбіні нанясення арнаменту, так і па яго разнастайнасці. Тым не менш гэтая група керамікі аднолькава нешматлікая як у Пскове, так і ў Полацку. Аналагічнага посуду ў Ноўгарадзе няма [1, рис. 6: *4, 7*; 18, с. 115, табл. 138: *2*].

Гаршкі тыпу К, знойдзеныя на полацкім гарадзішчы ў колькасці 21 шт., з'яўляюцца пераходнымі ад ляпной керамікі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, вызначанай як група 3 паводле знаходак на селішчы-перадграддзі і вакольным горадзе. Варыянт К 2 прадстаўляе прыклад таго, як ляпны посуд групы 3 трансфармаваўся ў раннеганчарныя формы. У адрозненне ад гаршкоў тыпу І паводле Г. В. Штыхава, форма якіх шырока прадстаўлена ў культурных пластах канца X – XI ст. старажытнарускіх гарадоў [23, с. 81], формы гаршкоў тыпу К з полацкага гарадзішча выяўлены толькі ў Пскове [18, с. 115].

Да групы ганчарнай керамікі належаць фрагменты венцаў накрывак для гаршкоў, а таксама дзяржанні да іх. Накрыўкі маюць дыяметр 18–30 см і ў двух выпадках аздоблены насечкамі ў тры рады і двума радамі хвалістага арнаменту па вонкавым краі венца.

Асноўная колькасць ляпной керамікі была знойдзена менавіта ў ніжняй частцы сярэдняга стратыграфічнага гарызонту[1]. З яе складу вылучаюцца тыповыя формы гаршкоў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў канца VIII – X ст. (большасць усіх венцаў) (мал. 2: *3*; 25: *1, 5*; 26: *1, 3–7;* 10). Гэты

[1] Сёння поўная апрацоўка ляпной керамікі яшчэ не завершана.



Мал. 26. Ляпная кераміка: *1–7* – венцы гаршкоў; *8* – дзяржанне патэльні. Малюнак М. А. Плавінскага. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

посуд характэрны для тэрыторыі Беларускага Падзвіння і сустракаецца ў раннегарадскіх напластаваннях канца VIII – X ст. Лукомля, Віцебска і іншых гарадоў [3, рис. 13; 7, рис. 2–5]. Гэтая група керамікі зроблена з керамічнага цеста, у якім прысутнічаюць грубыя дамешкі жарствы. Паверхня вырабаў няроўная, гузаватая, кераміка мае сляды абпальвання.

Асаблівую цікавасць уяўляе комплекс ляпной керамікі з мацерыковай ямы 3 (мал. 10). Гэта кераміка тыповая для раннегарадскіх напластаванняў гарадоў Беларускага Падзвіння, паводле даных радыевугляроднага датавання кавалка дрэва з ямы 3, яна была выраблена не пазней 780 г. н. э. Гэты посуд характэрны для тэрыторыі Беларускага Падзвіння і сустракаецца ў раннегарадскіх напластаваннях кан-



Мал. 27. Верхняя частка ляпнога гаршка. Малюнак М. А. Плавінскага. Раскоп 1. Гарадзішча. Полацк. 2007

ца VIII – X ст. Лукомля, Віцебска і іншых гарадоў [3, рис. 13; 7, рис. 2–5].

Да групы ляпнога посуду, відаць, трэба аднесці дзяржанне керамічнай патэльні, знойдзенае ў верхнім стратыграфічным гарызонце (мал. 26: *8*).

Венцы гаршкоў трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э. тыповыя для банцараўскай культуры (мал. 2: *1–2*; 25: *2–4*; 26: *2*; 27), знойдзена 1 сценка посуду «з расчэсамі» сярэдзіны I тысячагоддзя н. э.

Венцы гаршкоў днепра-дзвінскай культуры знойдзены ў колькасці 13 экз. (мал. 28), большасць з іх аздоблена ямкавым арнаментам пад венцам.

Знойдзена 7 дробных фрагментаў венцаў гаршковай (міскавай) кафлі, дыяметр якой 12 см. Уяўляе цікавасць сценка начыння, зробленага з белай гліны і аздобленая пераплеценым хвалістым арнаментам. Рэдкімі з'яўляюцца сценкі начыння, зробленага з так званай каменнай масы, пакрытыя з двух бакоў карычневай празрыстай палівай. Знойдзены сценкі амфар, аздобленыя лінейным арнаментам.

Кераміка XVII–XVIII стст. прадстаўлена венцамі паліванай флягі, збана і іншых вырабаў. Венцы гаршкоў XVII–XVIII стст. тыповыя для свайго часу.

Такім чынам, колькасць і прадстаўнічасць калекцыі знаходак з полацкага гарадзішча пацвярджае высокі сацыяльны статус яго насельніцтва ў XI–XIII стст. Комплекс ляпной керамікі і асобных рэчаў сведчыць аб пражыванні на полацкім гарадзішчы насельніцтва днепра-дзвінскай, банцараўскай культур і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў.

Высновы. Жыццё на гарадзішчы было распачата ў першай палове I тысячагоддзя да н. э., верагодна, каля VII ст. да н. э. Захаваўся культурны пласт днепра-дзвінскай культуры (ніжняя частка сярэдняга стратыграфічнага гарызонту і ніжні стратыграфічны гарызонт раскопу 1). Паводле радыевугляроднага аналізу, у стратыграфічным гарызонце днепра-дзвінскай культуры захаваліся прапласткі вугалю ад VII ст. да н. э. (П 6) да I–III стст. н. э. (П4, П5, П 7). У гэтым пласце дысперсна размешчаны рэчы і кераміка I тысячагоддзя да н. э. – першай чвэрці I тысячагоддзя н. э, сярэдзіны I тысячагоддзя н. э., трэцяй і апошняй чвэрцяў I тысячагоддзя н. э. Пласт з керамікай культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганаў апошняй чвэрці I тысячагоддзя н. э. захаваўся толькі ў межах мацерыковай ямы 3 (радыевугляродная дата – 780 г. н. э.) (П 3). Верагодна, усе напластаванні старэйшыя за III ст. н. э. былі зніверіраваны падчас добраўпарадкавання тэрыторыі гарадзішча. Гэта, дарэчы, тлумачыць факт адсутнасці ляпнога посуду і рэчаў, старэйшых за XI ст., у паўднёвай частцы гарадзішча, дзе ўзровень мацерыка больш высокі ў параўнанні з паўночнай часткай гарадзішча (шурфы А. М. Ляўданскага і Л. Д. Побаля).

Культурны пласт XI–XIII стст. выдатна захаваўся, асноўная інтэнсіўнасць жыцця прыпадае на XII–XIII стст. У пласце гэтага часу знойдзена вельмі вялікая колькасць высокамастацкіх вырабаў і побытавых рэчаў. Жыццё на гарадзішчы спынілася ў пачатку XIV ст., што пацвярджае радыевугляродная дата – 1270–1310 гг. (П 2)[1].

Лакалізацыя ў межах верхняй часткі сярэдняга стратыграфічнага гарызонту абломкаў тыгляў і вырабаў з каляровых металаў[2], інструментаў вытворчасці, нарыхтовак і гатовых пласцінак металічнага даспеха дазваляюць вызначыць размяшчэнне ў межах даследуемай тэрыторыі гарадзішча ювелірнай і зброевай майстэрняў. Захаваліся сляды дзейнасці мастака. Верагодна, рамеснікі абслугоўвалі патрэбы княжацкага двара, які размяшчаўся на гарадзішчы на працягу IX–XIII стст.

Асобныя рэчы (кавалкі плінфы, царкоўнае начынне, смальта, свінец і інш.) сведчаць аб размяшчэнні на гарадзішчы дзесьці паблізу ад раскопу 1 мураванага храма.

У XVII–XVIII стст. тэрыторыя гарадзішча ператварылася ў могілкі, на якіх хавалі вернікаў каталіцкай канфесіі. Размяшчэнне могілак у цэнтры горада, а таксама канфесійная прыналежнасць веруючых да рымска-каталіцкай царквы, дазваляюць зрабіць заключэнне, што на могілках пахавана полацкая шляхта.

---

[1] Другая радыевугляродная дата – 430–530 гг. н. э. (П 1) відавочна памылковая, дадзеная хібнасць дапушчальна для адносна маладых напластаванняў.

[2] Найбольш паказальна ў гэтым плане знаходка бронзавага барэльефа з выявай апостала Іаана ў верхнім стратыграфічным гарызонце, фігурка мае выразныя сляды адліўкі ў форме і шэраг унікальных рыс.



Мал. 28. Ляпная кераміка днепра-дзвінскай культуры: *1–23* – венцы гаршкоў. Малюнак З. А. Харытановіч. Гарадзішча. Полацк. 2007

Літаратура

1. Белецкий, В. Д. Городское ядро средневекового Пскова / В. Д. Белецкий, С. В. Белецкий. – СПб., 1996. – Ч. 1: Белецкий, С. В. Начало Пскова / С. В. Белецкий. – 92 с.

2. Богомольников, В. В. Радимичи (по материалам курганов X–XII вв.) / В. В. Богомольников / под. науч. ред. О. А. Макушникова; ГГУ им. Ф. Скорины, Науч.-исслед. ин-т восточнославянских народов при ГГУ им. Ф. Скорины. – Гомель, 2004. – 226 с.

3. Бубенько, Т. С. Стратиграфия и хронология нижнего слоя Витебска / Т. С. Бубенько, О. Н. Левко // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья: материалы по археологии Беларуси. – Минск, 2003. – № 8. – С. 71–95.

4. Булкин, В. А. Отчет об археологических исследованиях Софийского собора и прилегающих к нему территорий в 1978 году / В. А. Булкин // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 594.

5. Дук, Д. Древо жизни Полоцкого городища / Д. Дук // Родина. – 2007. – № 10. – С. 37–39.

6. Дук, Д. Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст. / Д. Дук // Беларус. гіст. часопіс. – 2007. – № 11. – С. 25–31.

7. Еремеев, И. Древний Лукомль. Лепная керамика и раннесредневековый культурный слой / И. Еремеев, Г. Штыхов // Acta archaeologica Albarutenika. Vol. I (Вып. I). – Мінск: ИП Логвінаў І. П., 2007. – С. 110–134.

8. Зверуго, Я. Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. / Я. Г. Зверуго. – Минск: Навука і тэхніка, 1989. – 208 с.: іл.

9. Зверуго, Я. Г. Древний Волковыск (X–XIV вв.) / Я. Г. Зверуго. – Минск: Наука и техника, 1975. – 144 с.

10. Кирпичников, А. Н. Древнерусское оружие / А. Н. Кирпичников // САИ / под общ. ред. Б. А. Рыбакова. – Вып. Е1–36. – М.; Л.: Наука, 1966. – Вып. 2: Копья, сулицы, боевые топоры, булавы, кистени IX–XIII вв. – 216 с.: ил.

11. Коваленко, В. Археологические исследования Шестовицкого комплекса в 1998–2002 гг. / В. Коваленко, А. Моця, Ю. Сытый // Дружинні старожитності Центрально-Східно Європии VIII–XI ст. – Чернігів: Сіверянська думка, 2003. – С. 51–83.

12. Колчин, Б. А. Хронология новгородских древностей / Б. А. Колчин // Новгородский сборник. 50 лет раскопок Новгорода. – М.: Наука, 1982. – С. 156–177.

13. Корзухина, Г. Ф. Древнерусские энколпионы. Кресты-реликварии XI–XIII вв. / Г. Ф. Корзухина, А. А. Пескова. – СПб.: Петербургское Востоковедение, 2003. – 432 с.

14. Лысенко, П. Ф. Открытие Берестья / П. Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1989. – 159 с.

15. Ляўданскі, А. М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе / А. М. Ляўданскі // Зап. аддз. гуманіт. навук БАН. – Мінск, 1930. – Т. 2, кн. 2: Працы археолёгічнай камісіі. – С. 157–198.

16. Макушников, О. А. Древнерусская оружейная мастерская из Гомия / О. А. Макушников // Старожитності Південної Русі: Чернігів і його округа IX–XIII ст.: матеріали III іст.-археолог. семінару, Чернігів, 15–18 травня 1990 р. / редкол.: П. П. Толочко [та інш.]. – Чернігів: Сіверянська думка, 1993. – С. 121–130.

17. Мядзведзева, В. У. Сярэдневяковыя шахматы Беларусі (гісторыка-археалагічнае даследаванне) / В. У. Мядзведзева. – Мінск: ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2005. – 82 с.: іл.

18. Носов, Е. Н. Городище под Новгородом и поселения Северного Приильменья (новые материалы и исследования) / Е. Н. Носов, В. М. Горюнова, А. В. Плохов // Тр. Ин-та материальной культуры РАН. – СПб.: Издательство «Дмитрий Буланин», 2005. – Т. XVIII. – 404 с.: ил.

19. Плавінскі, М. Аб адной катэгорыі пахавальнага посуду ў курганах канца I – пачатку II тысячагоддзя н. э. на захадзе Полацкай зямлі / М. Плавінскі, А. Плавінскі // Acta archaeologica Albaruthenica. Vol. I (Вып. I). – Мінск: ИП Логвінаў І. П., 2007. – С. 135–145.

20. Поболь, Л. Д. Отчет об исследовании археологических памятников в г. Полоцке в 1959 г. / Л. Д. Поболь // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 594.

21. Раппопорт, П. А. Полоцкое зодчество XII века / П. А. Раппопорт // Советская археология. – 1980. – № 3. – С. 142–163.

22. Тарасов, С. В. Отчет о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 году / С. В. Тарасов // Архіў Ін-та гісторыі НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 1014.

23. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк IX–XIII вв. / Г. В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.: ил.

24. Щапова, Ю. Л. Стеклянные бусы Древнего Новгорода / Ю. Л. Щапова // Тр. Новгородской археолог. экспедиции // МИА. – М.: Изд-во АН СССР, 1956. – Вып. 55. – С. 164–179.

Резюме

Д. В. Дук

Археологические раскопки на древнем полоцком городище в 2007 г.

Статья содержит итоги археологических раскопок в 2007 г. на древнейшем в Полоцке памятнике истории и культуры – городище. Приводится подробная характеристика стратиграфии культурного слоя раскопа 1 на полоцком городище. Дана характеристика важнейших археологических находок. Представлена типология гончарной керамики раскопа. Определена датировка серии артефактов, а также приведены данные радиоуглеродного анализа культурного слоя городища (днепро-двинской культуры: VII в. до н. э. – III в. н. э.), культуры смоленско-полоцких длинных курганов (780 г.). Определена дата окончания функционирования городища (начало XIV в.). Дана характеристика ремесленной деятельности на месте раскопа в XII–XIII вв. (оружейная и ювелирная мастерская). Определен статус городища в IX – начале XIV в. (княжеская резиденция).

Summary

D. Duk

Archaeological excavations on the ancient hill-fort of Polotsk in 2007

The article presents the results of archaeological excavations in 2007 on the most ancient place in Polotsk – its hill-fort. The detailed characteristic stratigraphy of cultural layer 0^{f} the 1st trench on the hill-fort of Polotsk is resulted. The characteristic of the main archaeological finds is made. The types of pottery from this trench is presented. Dating of a series of artefacts is certain, and also data of the radiocarbon analysis of a cultural layer of the hill-fort (the Dnieper and Dvina Culture (the 7th c. BC – the 3rd c. AD) and Smolensk–Polotsk long barrows Culture (780). The date stopped of functioning of the hill-fort of Polotsk is early 14th century. The characteristic of craft activity as weapon and jeweller workshops on this place in the 12th–13th centuries is defined. Its status as princely residence in the 9th – early 14th is marked.

Паступіў 24.02.2011

Д. У. Дук, *Полацкі дзяржаўны універсітэт, загадчык кафедры айчыннай і усеагульнай гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Наваполацк)*
В. А. Емяльянчык, *Полацкі дзяржаўны універсітэт, старшы выкладчык кафедры айчыннай і усеагульнай гісторыі (г. Наваполацк)*

Могілкі полацкага гарадзішча (па выніках археалагічных раскопак у 2007 г.)

Гісторыя вывучэння могілак на старажытным полацкім гарадзішчы пачынаецца з 1928 г., калі А. М. Ляўданскім былі ўпершыню праведзены раскопкі на помніку. Паводле А. М. Ляўданскага, час існавання могільніку на месцы старажытнага гарадзішча прыпадае на XVIII–XX стст. [6, с. 163–164]. У 1987 г. С. В. Тарасаў зафіксаваў выпадкова знойдзенае жаночае пахаванне, якое даследчык датаваў XII ст. [8, с. 23]. Паводле звестак краязнаўца І. П. Дэйніса, у пачатку XX ст. на могілках хавалі самазабойц [2, с. 14]. Такім чынам, у гістарыяграфіі не існавала адзінага пункту гледжання аб часе існавання могільніка на полацкім гарадзішчы.

У 2007 г. на старажытным полацкім гарадзішчы былі праведзены археалагічныя раскопкі, у выніку якіх стала магчымым дэталёва вывучыць 35 рознай ступені захаванасці пахаванняў. Каштоўнасць вынікаў даследавання заключаецца ў тым, што пахавальных комплексаў гарадскога насельніцтва Новага часу зафіксавана адносна няшмат. У Беларускім Падзвінні толькі адзінкавыя могільнікі у г. п. Гарадок (XV–XVI стст.) [7, с. 161] і ў г. Віцебску (XVI–XVIII стст.) [5, с. 134–135].

Раскоп 1 меў плошчу 44 м^2 [4, с. 25–31]. Раскопкі праводзіліся па пластам 0,2 м, адпаведна якім прыводзіцца планіграфія пластоў на мал. 1–4. Усе



Мал. 1. Венцы гаршкоў XVI–XVII стст. (*1–11*)

пахаванні раскопу 1 зроблены ў верхнім стратыграфічным гарызонце, які прадстаўлены вельмі аднароднай зямлёй светла-шэрага з карычневым адценнем колеру, камкаватай, сухой. Гэтая зямля складаецца з зярністага пяску, жвіру, у ёй сустракаюцца камянямі дыяметрам да 5–10 см, зрэдку ў пласце фіксуюцца дысперсна размешчаныя кавалкі вугалю і невялікія лінзы вапны (дыяметрам да 3–5 см). Магутнасць гэтага пласта складае ад 0,9 м да 1,6 м, сярэдняя магутнасць верхняга стратыграфічнага пласта – 1,2 м.

Пахаванні размешчаны на глыбіні ад 0,8 да 1,4 м. Візуальна контуры пахавальных ям не прасочваліся. Аднак непасрэдна над пахаваннямі былі знойдзены нешматлікія знаходкі, пераважна рэшткі керамікі з зялёнай эмаллю XVII–XVIII стст. і непаліваных гаршкоў XVI–XVII стст. (мал. 1), каваныя цвікі.

В. А. Емяльянчык праведзена антрапалагічная экспертыза рэшткаў усіх пахаванняў.

Пахаванне 1 размешчана на мяжы кв. 10 і 11 на адлегласці 0,25 м ад паўднёвай сценкі раскопу. Пахаванне размешчана на глыбіні каля 0,8 ад дзённай паверхні. Пахаванне пераадкладзенае. Захаваўся чэрап, які пакладзены патылічнай часткай уверх на пераадкладзеныя косткі шкілета (мал. 2). Рэшткаў інвентару, труны не зафіксавана. Косткі арыентаваны па накірунку захад–усход.

Пахаванне 2 размешчана на мяжы кв. 5, 6, 11, 12. Пахаванне часткова пашкоджана (пераадкладзены косткі левай нагі памерлага) і размешчана на глыбіні каля 0,8 м (мал. 2). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены на грудзях. Даўжыня касцяка 1,9 м[1]. Пахаваны мужчына ва ўзросце 40–50 гадоў. Каля левай голені памерлага захаваўся жалезны цвік, магчыма, ад труны. Іншых рэшткаў труны і пахавальнага інвентару не зафіксавана.

Пахаванне 3 размешчана на мяжы кв. 5, 6, 11, 12 пад пахаваннем 2. Пахаванне некранутае і размешчана на глыбіні каля 1 м (мал. 3). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Захаванасць шкілета дрэнная. Косткі рук і ступняў ног спарахнелі. Чэрап размешчаны за межамі ракопу ў сценцы кв. 12. Чэрап быў вынуты, дзеля чаго зроблены падкоп у сцяне раскопу. Даўжыня касцяка 1,8 м. Пахаваны – мужчына ва ўзросце 30–50 гадоў. У нагах памерлага (каля ступняў) захаваліся 2 жалезных цвіка, магчыма, ад труны. Іншых рэшткаў труны і пахавальнага інвентару не зафіксавана.

Пахаванне 3а (чэрап) размешчана ў паўднёва-заходнім вуглу кв. 5, на мяжы кв. 5 і 11, каля ног памерлага з пахавання 3. Пахаванне пераадкладзенае, размешчана на глыбіні каля 1 м, акрамя чэрапа костак не знойдзена (мал. 3). Знаходкі каля чэрапа адсутнічалі.

Пахаванне 3б размешчана ў паўночнай частцы кв. 2 (уздоўж сценкі раскопу) і выходзіць за межы раскопу. Зафіксаваны асобныя моцна спарахнелыя косткі шкілету, чэрап альбо не захаваўся, альбо знаходзіўся па-за межамі раскопу. Цела было пакладзена галавой на захад у выцягнутым стане (мал. 3). Гэта пахаванне дзіцяці ва ўзросце 1,5 гадоў. Пахаванне размешчана на глыбіні каля 1 м. Даўжыня захаванага касцяка складае каля 0,8 м. На месцы мяркуемага размяшчэння чэрапа былі знойдзены два жалезных цвіка. Інвентару і рэшткаў труны не выяўлена.

Пахаванне 4 размешчана ў паўднёвай частцы кв. 6 і выходзіць за межы раскопу ў заходнім накірунку. У раскоп трапілі косткі ног памерлага, цела пакладзена галавой на захад (мал. 3). Пахаванне размешчана побач з пахаваннем 3 на глыбіні каля 0,9 м. Даўжыня часткі касцяка, якая трапіла ў раскоп, складае 0,75 м. Захаванасць костак добрая. Знаходак і рэшткаў труны не выяўлена.

Пахаванне 5 размешчана на мяжы кв. 9 і 10 на адлегласці 0,23 м ад паўднёвай сценкі раскопу. Пахаванне не пашкоджанае і размешчана на глыбіні каля 1 м (мал. 3). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены на жываце. Даўжыня касцяка 1,7 м. Каля левай і правай голені памерлага захаваліся жалезныя цвікі (па аднаму з кожнага боку), цвікі захаваліся каля чэрапа па аднаму справа і злева. Рэшткаў пахавальнага інвентару і труны не зафіксавана.

Пахаванне 6 размешчана ў межах ўсходняй часткі кв. 3 на адлегласці 0,5 м ад паўночнай сценкі раскопу. Пахаванне не пашкоджанае і размешчана на глыбіні каля 1 м (мал. 3). Арыентацыя касцяка – галавой на паўночны захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены: правая – на грудзях, левая – на жываце. Захаванасць касцяка дрэнная, спарахнелі косткі ступняў і кісцей рук. Даўжыня касцяка 0,8 м. Пахавана дзіця ва ўзросце 2,5–3 гадоў. Рэшткаў пахавальнага інвентару і труны не зафіксавана.

Пахаванне 7 размешчана на мяжы кв. 7 і 8, пасярэдзіне мяжы. Пахаванне не пашкоджанае і размешчана на глыбіні каля 1 м (мал. 3). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены: левая – на грудзях, правая – на жываце. Даўжыня касцяка 1,5 м. Пахаваны – мужчына ва ўзросце 30–40 гадоў. Захаванасць дрэнная, спарахнелі косткі ступняў ног і кісцей рук. Пад ніжняй сківіцай быў знойдзены алавяны нацельны каталіцкі крыж XVII ст. з выявай сцэны Распяцця (аверс)

[1] Тут і далей прыводзіцца даўжыня касцяка ў зямлі на момант расчысткі, гэтыя параметры не абавязкова супадаюць з вынікамі антрапалагічнай экспертызы.



Мал. 2. План размяшчэння пахаванняў. Пласт 4. Раскоп 1



Мал. 3. План размяшчэння пахаванняў. Пласт 5. Раскоп 1

і лацінскім надпісам «laureatus» (увенчаны лаўровым вянком) (рэверс) (мал. 4: *1*). Захаванасць крыжа добрая. Каля ног памерлага захаваўся жалезны цвік, яшчэ адзін цвік захаваўся каля чэрапа. Іншых рэшткаў труны не зафіксавана.

Пахаванне 8 (чэрап) размешчана ў кв. 7, паміж костак ног памерлага з пахавання 7. Пахаванне пераадкладзенае, акрамя чэрапа на поўдзень ад пахавання 7 на адлегласці 0,2 м ад яго былі знойдзены дзве паўспарахнелыя косткі, магчыма, ад пахавання 8. Пахаванне размешчана на глыбіні каля 1 м (мал. 3). Знаходкі каля чэрапа адсутнічалі.

Пахаванне 9 (чэрап) размешчана ў кв. 8 (на мяжы кв. 8 і 9), на адлегласці 1,2 м ад паўднёвай сценкі раскопу. Пахаванне належала дзіцю ва ўзросце 1,5–2 гадоў і было размешчана на глыбіні каля 0,9 м (мал. 3). Знаходкі каля чэрапа адсутнічалі.

Пахаванне 10 размешчана на мяжы кв. 4 і 5 на адлегласці 0,6 м ад паўночнай сценкі раскопу па лініі мяжы квадратаў. Пахаванне не пашкоджана і размешчана на глыбіні каля 1,2 м (мал. 5). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены: левая – на грудзях, правая – на жываце. Даўжыня касцяка 1,57 м. Захаванасць касцяка добрая, спарахнелі толькі косткі ступняў. Захаваліся рэшткі драўлянай труны ў выглядзе паласы таўшчынёй 1–2 см карычневай парахні. Гэтая паласа мае выгляд прамавугольніка памерамі 1,57 × 0,40 м (усходняя частка) ці 0,45 м (заходняя частка). У раёне костак таза і каля чэрапа ў паўднёвай сценкі труны захаваліся два жалезных цвікі. Два цвікі захаваліся ў заходняй сцяне рэшткаў труны. З рэшткаў пахавальнага інвентару зафіксаваны толькі алавяны крыжык, які вельмі моцна каразіраваны і практычна распаўся пры расчыстцы. Крыжык быў размешчаны ў раёне грудзей. Яма на месцы пахавання прасочана па напаўспарахнелым рэшткам труны, яна мае глыбіню каля 0,2 м, плоскае роўнае дно, вертыкальна пастаўленыя сценкі.

1

2

Мал. 4. Каталіцкі алавяны нацельны крыжык XVII ст. пасля рэстаўрацыі (аверс, рэверс) (*1*) і бронзавы медальён XVII ст. пасля рэстаўрацыі (аверс, рэверс) (*2*)



Мал. 5. План размяшчэння пахаванняў. Пласт 6. Раскоп 1

Пахаванне 11 (чэрап) размешчана ў кв. 4 на адлегласці 1 м ад паўночнай сценкі раскопу, практычна пасярэдзіне квадрата побач з пахаваннем 10. Пахаванне размешчана на глыбіні каля 1 м (мал. 5). Знаходкі каля чэрапа адсутнічалі.

Пахаванне 12 размешчана пасярэдзіне кв. 7 на адлегласці 0,9 м ад паўднёвай сценкі раскопу. Пахаванне часткова пашкоджана і размешчана на глыбіні каля 1,1 м (мал. 5). Арыентацыя касцяка – галавой на паўночны захад–паўднёвы ўсход. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Левая рука сагнута ў локці, правая выцягнута ўздоўж цела. Пахаванне належала даросламу чалавеку. Чэрап адсутнічае, таксама як і косткі левай нагі і голень правай. Даўжыня рэшткаў касцяка 1 м. Чэрап пахавання 8, зафіксаваны ў больш высокім пласце 5 у межах кв. 7 (мал. 3) належыць шкілету пахавання 12. Рэшткаў пахавальнага інвентару і труны не зафіксавана.

Пахаванне 13 размешчана на мяжы кв. 10 і 11 на адлегласці 1,42 м ад паўднёвай сценкі раскопу па лініі мяжы квадратаў. Пахаванне не пашкоджана і размешчана на глыбіні каля 1,1 м (мал. 5). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Даўжыня касцяка 1,6 м. Пахаваны – мужчына ва ўзросце 30–40 гадоў. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены на грудзях, захаванасць касцяка добрая, спарахнелі толькі косткі ступняў. Рэшткаў драўлянай труны не захавалася, аднак яе шырыню магчыма прасачыць па размяшчэнні чатырох цвікоў. Цвікі зафіксаваны папарна каля чэрапа на адлегласці 0,4 м адзін ад аднаго і каля каленных суставаў на адлегласці 0,4 м адзін ад аднаго. Рэшткаў пахавальнага інвентару не зафіксавана.

Пахаванне 14 размешчана на мяжы кв. 9 і 10 на адлегласці 0,2 м ад паўднёвай сценкі раскопу па лініі мяжы квадратаў. Пахаванне часткова пашкоджанае пахаваннем 5, якое часткова размешчана над ім. У шкілета адсутнічаюць косці прадплечча левай рукі і левае бядро. Пахаванне 14 размешчана на глыбіні каля 1,2 м (мал. 5). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Даўжыня касцяка 1,35 м. Пахаваны – мужчына ва ўзросце 30–50 гадоў. Правая рука сагнута ў локці і пакладзена на жываце, косткі ступняў спарахнелі. Рэшткаў пахавальнага інвентару і труны не зафіксавана.

Пахаванне 15 размешчана пасярэдзіне кв. 9 ушчыльную да яго заходняй мяжы, на поўнач ад пахавання 14, і на адлегласці 1 м ад паўднёвай сценкі раскопу. Пахаванне моцна пашкоджана. У шкілета адсутнічае большасць костак правай нагі, цалкам – левай рукі, няма большай часткі рэбраў з левага боку і чэрапа. Пахаванне 15 размешчана на глыбіні каля 1,1 м (мал. 5). Арыентацыя касцяка – галавой на паўночны захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Даўжыня касцяка 1,35 м. Пахаванне, верагодна, належала юнаку ва ўзросце 15–17 гадоў. На адлегласці 0,35 м на паўднёвы ўсход размешчаны фрагменты костак ног, магчыма, ад гэтага ж шкілета. Правая рука сагнута ў локці і пакладзена на жываце. Рэшткаў пахавальнага інвентару і труны не зафіксавана.

Пахаванне 16 размешчана пасярэдзіне кв. 9 ушчыльную да яго паўночнай мяжы, на поўнач ад пахавання 15, і на адлегласці 1,4 м ад паўднёвай сценкі раскопу. Пахаванне моцна пашкоджана. У шкілета адсутнічаюць большасць костак абедзвюх ног, косткі таза пакладзены не ў анатамічным парадку. Пахаванне 16 размешчана на глыбіні каля 1,1 м (мал. 5). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну. Даўжыня касцяка 1,25 м. Пахаваны мужчына ва ўзросце 40–60 гадоў. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены на жываце. Зафіксаваны два цвіка, якія размешчаны каля костак левага пляча. Рэшткаў пахавальнага інвентару і труны не зафіксавана.

Пахаванне 17 размешчана пасярэдзіне кв. 9 практычна пад пахаваннем 15. Шкілет размешчаны на адлегласці 0,8 м ад паўднёвай сценкі раскопу. Шкілет добрай захаванасці і размешчаны на глыбіні каля 1,2 м (мал. 6). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Даўжыня касцяка 1,6 м. Гэта пахаванне жанчыны ва ўзросце 60–70 гадоў. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены кісцямі ўверх, прычым кісці рук сагнуты ўніз і пакладзены пад ніжнюю сківіцу. Косці пазваночніка размешчаны не ў анатамічным парадку – яны ўтвараюць ламаную лінію. Правая бедраная косць размешчана пад вуглом 45° да левай. Парадак размяшчэння костак сведчыць пра тое, што цела было пахавана ў скурчаным стане. Зафіксаваны два цвікі, размешчаныя адзін супраць другога каля костак ступняў, трэці цвік – на поўнач ад левай галёначнай косткі, чацвёрты цвік – каля костак таза, пяты цвік – зафіксаваны каля чэрапа. У раёне гру-дзей памерлай, на левай ключыцы, знойдзены бронзавы медальён XVII ст. з двухбаковай выявай біблейскіх сцэн (аверс) і Дзевы Марыі з Немаўля (рэверс). Рэшткаў труны не зафіксавана (мал. 4: *2*).

Пахаванне 18 размешчана на мяжы і пасярэдзіне кв. 11 і 12. Шкілет размешчаны на адлегласці 0,7 м ад паўднёвай сценкі раскопу. Шкілет добрай захаванасці і размешчаны на глыбіні каля 1,2 м (мал. 6). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Чэрап размешчаны па-за межамі раскопу, у заходняй сценцы. Даўжыня касцяка 1,5 м (без чэрапа), ці 1,65 м (з чэрапам). Пасля расчысткі шкілета чэрап быў вынуты з культурнага пласта сценкі раскопу. Пахаваны – мужчына ва ўзросце 30–40 гадоў. Рукі выцягнуты ўздоўж цела. Рэшткаў труны і пахавальнага інвентару не зафіксавана.

Пахаванне 19 размешчана на мяжы кв. 1 і 2, ушчыльную да паўночнай сценкі раскопу. Пахаванне



Мал. 6. План размяшчэння пахаванняў. Пласт 7. Раскоп 1

моцна пашкоджана. Захаваўся толькі чэрап і асобныя напаўспарахнелыя косткі. Пахаванне размешчана на глыбіні каля 0,9 м (мал. 6). Арыентацыю касцяка з-за дрэннай захаванасці вызначыць цяжка. Комплекс пахавання (чэрап і нешматлікія косткі) размешчаны на пляцоўцы памерамі 0,30 × 0,25 м. Пахаванне належала двум дзіцянятам ва ўзросце 2–3 гадоў. Рэштkаў труны і пахавальнага інвентару не зафіксавана.

Пахаванне 20 размешчана на мяжы кв. 1 і 2. Пахаванне не пашкоджана. Шкілет размешчаны на адлегласці 0,3 м ад паўночнай сценкі раскопу па мяжы квадратаў. Шкілет добрай захаванасці і размешчаны на глыбіні каля 1,4 м (мал. 6). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Даўжыня касцяка 1,55 м. Гэта пахаванне жанчыны ва ўзросце 40–50 гадоў. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены на грудзі, кісці рук апушчаны ўніз. Рэштkаў труны і пахавальнага інвентару не зафіксавана.

Пахаванне 21 размешчана ў межах кв. 9 на поўдзень ад пахавання 17 і ўшчыльную каля яго. Фактычна прадстаўлена некалькімі фрагментамі костак, дысперсна размешчаных ўздоўж усходняй частцы пахавання 17 на адлегласці 0,7 м ад паўднёвай сценкі раскопу. Напаўспарахнелыя косткі размешчаны на глыбіні каля 1,2 м на агульнай адлегласці 0,63 м (мал. 6). Чэрап адсутнічаў. Пахаванне належала даросламу чалавеку. Рэштkаў пахавальнага інвентару і труны не зафіксавана.

Пахаванне 22 размешчана ў межах кв. 3. Пахаванне не пашкоджана. Шкілет размешчаны на адлегласці 1,3 м ад паўночнай сценкі раскопу (умоўная перпендыкулярная лінія на ўзроўні чэрапа). Шкілет добрай захаванасці і размешчаны на глыбіні каля 1,2 м (мал. 6). Арыентацыя касцяка – галавой на паўночны захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Косці ступняў спарахнелі. Даўжыня касцяка 1,5 м. Пахаваны – мужчына ва ўзросце 20–30 гадоў. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены: правая – на жывот, левая – на грудзі. Пад ніжняй сківіцай была знойдзена бронзавая засцежка ад аддзення. Яшчэ адна засцежка зафіксавана на ўнутраным баку локцевага сустава. На месцы скрыжавання рук быў знойдзены чорны шкляны гузік. Рэштkаў труны не зафіксавана.

Пахаванне 23 размешчана ў межах кв. 3 на поўнач ад пахавання 22. Большая яго частка, верагодна, размешчана па-за межамі раскопу, паколькі косткі зафіксаваны пасярэдзіне паўночнай сценкі кв. 3 і, адпаведна, раскопу. Фактычна прадстаўлена некалькімі фрагментамі костак, дысперсна размешчаных ўздоўж сценкі раскопу. Напаўспарахнелыя косткі размешчаны на глыбіні каля 1,3 м на агульнай адлегласці 0,7 м (мал. 6). Чэрап адсутнічаў. Гэта пахаванне дзіцяці ва ўзросце 4 гадоў. Рэштkаў пахавальнага інвентару і труны не зафіксавана.

Пахаванне 24 размешчана ў межах паўночна-ўсходняга вугла кв. 3 на ўсход ад пахавання 22. Большая яго частка, верагодна, размешчана па-за межамі раскопу, паколькі ў ім зафіксаваны напаўспарахнелыя косткі ног на плошчы памерамі 0,2 × 0,2 м. Гледзячы па накірунку размяшчэння ног, шкілет арыентаваны галавой на паўночны захад. Напаўспарахнелыя косткі размешчаны на глыбіні каля 1,3 м (мал. 6). Рэштkаў пахавальнага інвентару і труны не зафіксавана.

Пахаванне 25 размешчана ў межах паўночнай часткі кв. 1. Пахаванне не пашкоджана. Шкілет размешчаны ўшчыльную да паўночнай сценкі раскопу, у які трапілі косткі шкілета, за выключэннем чэрапа. Чэрап быў выкапаны з пласта ў сценцы раскопу. Шкілет добрай захаванасці і размешчаны на глыбіні каля 1,3 м (мал. 6). Арыентацыя касцяка – галавой на паўночны захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Косці ступняў спарахнелі. Даўжыня касцяка 1,55 м. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены на косткі таза. У раёне ключыцы, пасярэдзіне пазваночніка і на костках таза былі знойдзены адпаведна: два шкляных белых гузіка і адзін гузік чорнага колеру. Рэштkаў труны не зафіксавана.

Пахаванне 26 размешчана ў межах усходняй часткі кв. 7. Пахаванне выходзіць за межы раскопу. Шкілет размешчаны ўшчыльную да ўсходняй сценкі раскопу, пасярэдзіне кв. 7. У раскоп трапілі косткі чэрапа, плечавыя косткі і верхняя частка пазваночніка з рэбрамі. Шкілет размешчаны на глыбіні каля 1,4 м (мал. 6). Арыентацыя касцяка – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну. Гэта пахаванне жанчыны ва ўзросце 40–50 гадоў. Рэштkаў труны і пахавальнага інвентару не зафіксавана.

Пахаванне 27 размешчана на мяжы кв. 1 і 2 на адлегласці 1 м ад паўночнай сценкі раскопу па лініі мяжы квадратаў. Пахаванне не пашкоджана і размешчана на глыбіні каля 1,3 м (мал. 6). Касцяк размешчаны на паўднёвы ўсход ад касцяка 20. Арыентацыя касцяка 27 – галавой на захад. Цела пакладзена на спіну ў выцягнутым стане. Рукі сагнуты ў локцях і пакладзены: левая – на костках таза, правая – на жываце. Левая нага паўсагнута ў калене і прыхілена да правай. Даўжыня касцяка 1,4 м. Верагодна гэта пахаванне жанчыны ва ўзросце 40–50 гадоў. Захаванасць касцяка добрая, спарахнелі толькі косткі ступняў. Пад ніжняй сківіцай зафіксавана бронзавая засцежка ад аддзення. Захаваліся рэштkі драўлянай труны ў выглядзе паласы таўшчынёй 1–2 см з паўночнага і заходняга бакоў, фрагментарна – з паўднёвага боку. Ад труны засталася карычневая парахня ў выглядзе прамавугольніка памерамі 1,40 × 0,38 м. У раёне ўсходняй сценкі труны захаваліся тры жалезных цвікі, адзін цвік зафіксаваны каля чэрапа. Яма на месцы пахавання прасочана па напаўспарахнелым рэштkам труны, яна мае



Мал. 7. Дэталі адзення памерлых (*1–5)*

глыбіню каля 0,2 м, плоскае роўнае дно, вертыкальна пастаўленыя сценкі.

Пахаванне 28 (чэрап) размешчана практычна пасярэдзіне кв. 2, каля пахавання 27 і на адлегласці 1,3 м ад паўночнай сценкі раскопу. Пахаванне размешчана на глыбіні каля 1,2 м (мал. 6). Знаходкі каля чэрапа адсутнічалі.

У кв. 2 быў зафіксаваны фрагмент чэрапа, які належаў дзіцяці ва ўзросце 6 гадоў. Чэрап зафіксаваны паміж пахаваннем 27, побач з чэрапам 28. Фрагментарнае пахаванне было засведчана ў межах кв. 1 паміж пахаваннямі 25 і 27. Косткі былі размешчаны дысперсна і належалі дарасламу і дзіцяці. Каля сценкі раскопу ў кв. 12 былі зафіксаваны фрагментаваныя косткі дзіцяці ва ўзросце 1,5–2 гады, перакрытыя пахаваннем 18. У кв. 12 (пл. 3, глыбіня 0,6 м) зафіксаваны дзве верхнія дзіцячыя сківіцы, узрост памерлых 2 і 3 гады.

Такім чынам, нешматлікі пахавальны інвентар сведчыць аб прыналежнасці памерлых да каталіцкай канфесіі. З пахавальнага інвентару 16 найбольш захаваных і збольшага некранутых пахаванняў (2, 3, 5, 6, 7, 10, 12, 13, 14, 16, 17, 18, 20, 22, 25, 27) зафіксаваны: два алавяных нацельных крыжа (мал. 4: *1*), з якіх адзін вельмі пашкоджаны карозіяй, нацельная ікона-медальён (мал. 4: *2*), чатыры шкляных гузіка, тры бронзавыя засцежкі (мал. 7: *1, 2*). Гузікі з белага шкла маюць дыяметр 1,6 см, з унутранага боку ў шкло запаяна медная дужка, якая практычна цалкам разбурана карозіяй (мал. 7: *3, 4*). Чорны гузік мае дыяметр 1,1 см, з унутранага боку зроблена жалезнае дзяржанне-пяцелька (мал. 7: *5*). Бронзавыя засцежкі, тыповыя для адзення XVII стст. (мал. 7: *1, 2*), аналагічныя засцежкі знойдзены ў вялікай колькасці падчас даследавання сядзібы ювеліра на Вялікім пасадзе ў Полацку [3, с. 13–14].

Гэтыя рэчы былі знойдзены на целах пяці памерлых (пахаванні 10, 17, 22, 25, 27). Рэшткі драўляных трун захаваліся толькі на двух пахаваннях (11, 27), затое жалезныя цвікі былі знойдзены каля большасці шкілетаў у колькасці ад 1 да 4 штук, што сведчыць аб наяўнасці трун. Большасць пахаванняў (2, 3, 3б, 4, 5, 7, 11, 13, 14, 16, 18, 20, 26, 27) арыентаваны галавой на захад, меншая частка – на паўночны захад (6, 12, 15, 21 22, 25). Некаторыя пахаванні зроблены на месцы старых: целы памерлых перакрываюць адно другое (адпаведна пахаванні 2, 3, 15–21). Асобныя пахаванні размешчаны упарадкавана адзін каля аднаго: адзін рад пахаванняў 14, 15, 16 перакрывае пахаванні 17, 21. Зафіксавана і парнае пахаванне 20, 27. Выразна прасочваецца тэндэнцыя ў размяшчэнні целаў памерлых: жанчын хавалі са складзенымі на грудзях каля самага падбародка рукамі, кісцямі ўніз (пахаванні 17, 20), адной левай рукой на грудзях, другой – на жываце (пахаванне 7), дзвюма рукамі на жываце (пахаванне 27). Мужчын хавалі са складзенымі на жываце рука (пахаванні 14, 15, 16, 20), складзенымі на грудзях рукамі (пахаванні 2, 11), ці рукамі, выцягнутымі ўздоўж цела (пахаванне 18).

Пахавальны інвентар прадстаўлены вельмі бедна, у пераважнай большасці выпадкаў – алавяным крыжыкам на грудзях памерлага. Большасць крыжыкаў не захавалася па прычыне карозіі. Пра адзенне памерлых даных практычна няма. На целах трох памерлых жанчын і мужчын знойдзены бронзавыя засцежкі і шкляныя гузікі ў верхняй частцы шкілета. Верагодна, целы некаторых памерлых апраналася ў лёгкую тканевую кашулю на зашпільках і гузіках, большасць памерлых – у кашулю без зашпілек. Пахавальнага абутку не выяўлена.

Шкілетны матэрыял, выяўлены ў ходзе археалагічных раскопак, прадстаўлены рэшткамі 35 чалавек, сярод якіх 11 дзяцей і 24 дарослых (з якіх 11 мужчын, 5 жанчын; пол пяці пахаваных не вызначаны з-за фрагментарнасці шкілетаў). Пол і ўзрост пахаваных вызначаўся з выкарыстаннем традыцыйных метадаў [1, 9] і прадстаўлены ў табл. 1.

Табліца 1. **Полаўзроставы склад пахаваных**

№ п/п	Пахаванне	Квадрат	Пласт	Пол	Узрост	Заўвага
1	1(1)	10,11	4	?	?	Перапахаванне
2	1(2)	10, 11	4	?	?	Перапахаванне
3	2	5, 6, 11, 12	4, 5	М	40–50	–
4	3	5, 6, 11, 12	5, 6	М	30–50	–
5	5	9, 10	5	?	?	–
6	6	3	5, 6	Дзіця	2,5–3,0	–
7	7	7, 8	5, 6	Ж	30–40	–
8	9	8	5	Дзіця	1,5–2,0	–
9	10(8)	4, 5	6, 7	?	Дарослы	Фрагментарнае
10	12	7	5, 6	М	50–60	–
11	13	10, 11	6	М	30–40 (40–50)	–
12	14	9, 10	6	М	30–50	–
13	15	9	7	М?	15–17	Фрагментарнае (падлетак)
14	16	9	6	М	40–60	–
15	17	9	7	Ж	60–70	–
16	18	11,12	7	М	30–40	–
17	19(1)	1	7	Дзіця	2–3	–
18	19(2)	1, 2	7	Дзіця	2–3	–
19	20	1, 2	7	Ж	40–50	–
20	21	9	6	?	Дарослы	Фрагментарнае
21	22	3	7	М	20–30	–
22	23	3	7	Дзіця	4	–
23	25	1	7	Ж?	А–М	–
24	26	7	7	Ж	40–50	–
25	27			Ж?	40–50	–
26	28	1	7	–	–	Фрагментарнае
27	29	2	7	Дзіця	6	Фрагменты чэрапа
28	29?	1	7	–	–	Фрагментарнае (рэшткі дарослага і дзіцяці)
29	Невядомае	–	–	М	20–40	–
30	Сценка раскопу	12	7	Дзіця	1,5–2,0	–
31	Сценка раскопу 1	–	–	М	30–40	Толькі чэрап
32	Сценка раскопу 2	–	–	М	20–30	Толькі чэрап
33	3б	2	5, 6	Дзіця	1,5	–
34		12	3		3	Дзве верхнія сківіцы
35					2	

У цэлым шкілетны матэрыял характарызуецца добрай захаванасцю. Дзіцячыя пахаванні складаюць 45,8% ад усёй колькасці памерлых, што адлюстроўвае нармальны для таго часу ўзровень дзіцячай смяротнасці. Падобная высокая рэпрэзентатыўнасць дзіцячых пахаванняў з'яўляецца хутчэй выключэннем з правіла, паколькі ў большасці выпадкаў даводзіцца мець справу з недаўлікам рэштак дзяцей (па прычыне нізкай мінеральнай насычанасці дзіцячыя косткі разбураюцца значна хутчэй у параўнанні з косткамі дарослых). Фрагментарнасць асобных шкілетаў тлумачыцца працяглым выкарыстаннем могілак, у выніку чаго многія магілы былі парушаныя больш познімі пахаваннямі.

На падставе атрыманых характарыстык узроставага размеркавання смяротнасці была складзена табліца дажыцця (табл. 2). Сярэдняя чаканая працягласць жыцця з улікам дзіцячай смяротнасці (E_x) склала 25,5 года. Падобная нізкая сярэдняя працягласць жыцця з'яўлялася тыповай для таго часу і была абумоўлена перш за ўсё высокай дзіцячай смяротнасцю.

На мал. 8 прадстаўлена працэнтнае размеркаванне смяротнасці ў розных узроставых інтэрвалах (так званая крывая смяротнасці). Пік смяротнасці прыходзіцца на ранні дзіцячы ўзрост, у падлеткаў смяротнасць зніжаецца да мінімуму, у далейшым смяротнасць заканамерна павялічваецца з узростам. Падобнае размеркаванне смяротнасці з'яўляецца нармальным для груп з так званым традыцыйным тыпам узнаўлення насельніцтва (высокая смяротнасць, асабліва ў дзіцячым ўзросце, у спалучэнні

Табліца 2. **Табліца дажыцця**

Узрост, гадоў	D_x	d_x	l_x	q_x	L_x	T_x	E_x
0–7	10	35,7	100,0	0,357	492,9	2551,8	25,5
7–15	0	0,0	64,3	0,000	514,3	2058,9	32,0
15–20	1	3,6	64,3	0,056	312,5	1544,6	24,0
20–30	2,75	9,8	60,7	0,162	558,0	1232,1	20,3
30–40	5,25	18,8	50,9	0,368	415,2	674,1	13,2
40–50	6,25	22,3	32,1	0,694	209,8	258,9	8,1
50+	2,75	9,8	9,8	1,000	49,1	49,1	5,0
Разам:	28	100,0	–	–	–	–	–



Мал. 8. Крывая смяротнасці

з практычна неабмежаванай нараджальнасцю). Для насельніцтва, што пакінула могілкі на полацкім гарадзішчы, быў уласцівы нізкі працэнт дажываючых да фінальнай ўзроставай кагорты. Іншымі словамі, да старэчага узросту ў той час дажывалі нямногія палачане.

На падставе вымярэння даўгіх костак намі была здзейснена рэканструкцыя прыжыццёвай даўжыні цела пахаваных (паводле метаду Троттэр і Глэзер, 1952). Сярэдні рост мужчын склаў 167,25 см, жанчын – 154,30 см. Для параўнання: сярэдні рост мужчын Вроцлава (Польшча) ў XVI–XVIII стст. складаў 166,6 см, жанчын – 157,8 см [10].

У ходзе антрапалагічнай экспертызы былі зарэгістраваны некаторыя паталогіі:

Пахаванне 5 (жанчына 20–30 гадоў). Остэаперыястыт даўгіх костак, паталогія грушападобнай адтуліны (сіфіліс?); на целе грудзіны – скразная адтуліна невядомага паходжання; остэахандроз пазванкоў.

Пахаванне 7 (жанчына 30–40 гадоў). Хранічны остэаперыястыт (ключыца, плечавая, локцевая, прамянёвая, сцегнавая, вялікая і малая галёначныя косці).

Пахаванне 13 (мужчына 30–50 гадоў). Траўма правага локцевага сустава.

Пахаванне 14 (мужчына 30–50 гадоў). Скразная адтуліна ў лобнай косці; траўма правай лапаткі са слядамі зажыўлення; пераломы рэбраў са слядамі зажыўлення; касцявое зрастанне пазванкоў (у выніку пералому ?); на целе грудзіны – скразная адтуліна, падобная на аналагічную у пахаванні 5.

Траўмы, выяўленыя ў мужчын, могуць адлюстроўваць удзел мужчынскай часткі насельніцтва ў ваенных дзеяннях.

Такім чынам, у XVII–XVIII стст. тэрыторыя гарадзішча пераўтварылася ў могілкі, на якіх хавалі вернікаў каталіцкай канфесіі. Размяшчэнне могілак у цэнтры горада, а таксама канфесійная прыналежнасць веруючых да рымска-каталіцкай царквы, дазваляюць зрабіць заключэнне, што на могілках пахаваны прадстаўнік полацкай шляхты.

Літаратура

1. Алексеев, В. П. Краниометрия. Методика антропологических исследований / В. П. Алексеев, Г. Ф. Дебец. – М.: Наука, 1964. – 127 с.

2. Дейнис, И. П. Полоцкая старина (исторические места и памятники старины г. Полоцка). Полоцк, 1978 (рукапіс) / И. П. Дейнис // Фонды НПГКМЗ, кп-2, № 1422/8.

3. Дук, Д. У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе / Д. У. Дук // Вестн. Полоцкого гос. ун-та. Сер. А, Гуманит. науки. – 2007. – № 1. – С. 2–15.

4. Дук, Д. Станаўленне Полацка ў IX–XIII стст. / Д. Дук // Беларус. гіст. часопіс. – 2007. – № 11. С. 25–31.

5. Дучыц, Л. У. Археалагічнае вывучэнне гарадскіх і вясковых могільнікаў / Л. У. Дучыц, А. В. Іоў, В. М. Ляўко // Археалогія Беларусі: у 4 т. / В. М. Ляўко [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. – С. 132–138.

6. Ляўданскі, А. М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе // Зап. аддз. гуманіт. навук БАН. – Мінск, 1930. – Кн. 2: Працы археолёгічнай камісіі. Т. 2.– С. 157–198.

7. Ляўко, В. М. Гарадок / В. М. Ляўко // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. – Мінск. – С. 161.

8. Тарасов, С. В. Отчет о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 году / С. В. Тарасов // Архіў Ін-та гісторыі, Нац. акад. навук Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 1014.

9. Piontek, J. Biologia populacji pradziejowych. Zarys metodyczny / J. Piontek. – Poznań: UAM, 1996. – 217 s.

10. Piontek, J. Climatic changes and biological structure of the human populations from Poland in the Middle Ages / J. Piontek // Biological perspectives on ecology of the prehistoric popuation from Central Poland. – Warszawa: Wydawnictwo SGGW-AR, 1990. – 88 p.

Резюме

Д. В. Дук, О. А. Емельянчик

Кладбище полоцкого городища (по результатам археологических раскопок в 2007 г.)

В 2007 г. на древнем полоцком городище были проведены археологические раскопки, в ходе которых были исследованы погребения, датированные на основании погребального инвентаря XVII–XVIII вв. Скелетный материал представлен останками не менее 36 человек, из которых 13 детей и 23 взрослых. Сделан вывод о том, что в XVII–XVIII вв. территория городища превратилась в кладбище, на котором хоронили верующих католической конфессии. Погребений более раннего времени в пределах раскопа не выявлено. Размещение кладбища в центре города, а также конфессиональная принадлежность верующих к римско-католической церкви указывает на то, что на кладбище похоронена полоцкая шляхта.

Summary

D. Duk, O. Emeljanchik

Cemetery of the Polotsk site of ancient settlement (by results of archeological excavations in 2007)

In 2007 on the Polotsk site of ancient settlement archeological excavations have been spent, in which course burials dated to the 17th trhough the 18th centuries have been investigated. The skeletal material is presented by remains not less than 36 persons, from which 13 children and 23 adults. The conclusion that in 17th–18th centuries the territory of a site of ancient settlement has turned to a cemetery on which buried believers of Catholic faith is drawn. Tombs of earlier time on the place of excavation have not been revealed. Cemetery placing in city centre, an accessory of believers to Catholic church specifies that on a cemetery representatives of the Polotsk nobility have been buried.

Паступіў 24.02.2011

М. В. Клімаў, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск)*

Новыя даныя аб Запалоцкім пасадзе ў Полацку (па выніках раскопак 2008 г.)

Археалагічныя раскопкі, якія праводзіліся ў 2008 г. у Полацку археалагічнай экспедыцыяй Інстытута гісторыі НАН Беларусі былі выкліканы неабходнасцю выканання Дзяржаўнай праграмы археалагічнага даследавання Полацка на 2008–2012 гг., зацверджанай А. Р. Лукашэнкам у снежні 2007 г. Для першага этапа выканання праграмы было прапанавана летам 2008 г. правесці археалагічныя працы на частцы Запалоцкага пасада, якая раней амаль не мела археалагічнага вывучэння, насупраць стрэлкі (машны) Верхняга замка, на правым беразе р. Палаты. У сувязі з вышэйвыкладзеным была вызначана мэта будучых прац, а менавіта: удакладніць межы, час і характар фарміравання дадзенай часткі Запалоцкага пасада [15, с. 2].

Цікавасць да вызначанага ўчастка даследаў была выкліканa некалькімі акалічнасцямі. Па-першае, на плане гістарычнага развіцця г. Полацка ў перыяд IX–XIII стст., які быў складзены на аснове ранейшых даследаў на вылучаным для раскопак участку, культурны пласт зусім не значыўся [1, с. 102, рис. 221; 23, с. 137, мал. 42; 27, с. 172, мал. 32] (мал. 1: *1–3*).



Мал. 1. Планы гістарычнай тапаграфіі Полацка IX–XIII стст.: *1* – згодна з Г. В. Штыхавым (з пазначэннем месца раскопу 2008 г. М. В. Клімавым); *2* – згодна з С. В. Тарасавым; *3* – План Полацка XI–XII стст. па Л. В. Аляксееву; *4* – план Полацка па С. Пахалавіцкаму (з сучаснай прывязкай мяркуемага месца раскопак 2008 г. М. В. Клімавым)

Мал. 2. План археалагічных доследаў у 2004–2009 гг.

Па-другое, у 2003 г. Д. У. Дукам у гэтай частцы пасада, за 120 м ад месца будучых раскопак, быў закладзены шурф і знойдзена кераміка XI ст. і больш пазнейшага перыяду, а таксама ніжняя частка кафляной печы пачатку XVI ст. [5, с. 104–113]. З 2004 па 2006 г. культурны пласт на тэрыторыі завулкаў, якія дапасаваліся да вул. Ф. Міронавай, фіксаваўся А. Салаўёвым. Нягледзячы на гэта, у пазнейшых публікацыях выкарыстоўвалася схема распаўсюджвання культурнага пласта, прапанаваная старшымі навукоўцамі [6, с. 35; 7, 2007, с. 28, мал. 1]. Таму ўзнікла неабходнасць удакладніць стратыграфічную сітуацыю адносна ўчастка на правым беразе р. Палаты. Па-трэцяе, размывы самаробнага шляху, які пралягаў праз першую надпоплаўную тэрасу правага берага р. Палаты таксама засведчылі наяўнасць культурнага пласта магутнасцю каля 1 м, у якім пры папярэднім вывучэнні сустракаліся фрагменты гаршкоў з венчыкамі, звернутымі ўнутр (XI–XIII стст.), фрагменты шкляных бранзалетаў.

У выніку археалагічны раскоп быў закладзены ўздоўж першай надпоплаўнай тэрасы правага берага р. Палаты, за 25–28 м ад вады, за 44 м на поўдзень ад паварота р. Палаты, насупраць паўночнай аканечнасці (машны) Верхняга замка (мал. 1: *I*; мал. 2). Раскоп меў плошчу 72 м^2 з наступнымі памерамі: па лініі поўнач–поўдзень – 6 м, па лініі захад–усход – 12 м. Раскоп быў разбіты на квадраты памерамі 2 × 2 м. У працах на археалагічных раскопках прынялі ўдзел выкладчыкі і студэнты-гісторыкі першага курсу гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава ў межах практыкі[1].

Звернемся да аналізу стратыграфіі раскопу 1, у якой прасочвалася два выразных пласта. Першы з пластоў магутнасцю да 0,3 м даследаваўся, пачынаючы са здымання дзірвану. Пры гэтым заўважым, што дзённая паверхня на месцы археалагічных раскопак мела травяністае пакрыццё і перапад вышынь у накірунку з поўдня на поўнач складаў 30–44 см.

Першы пласт вызначаўся неаднародным характарам культурнага слою. У верхняй, дзірванай частцы раскопу, якая мела шэры колер, утрымліваліся розначасовыя матэрыялы, большасць якіх належала да керамічнага посуду XX ст. і фрагментаў шкла без слядоў ірызацыі. Амаль адразу пад дзірваном на ўзроўні 5–10 см ад дзённай паверхні фіксавалася пяшчаная паводле складу падсыпка. Магутнасць дадзенай падсыпкі складала ад 5 да 15 см. Падсыпка, якая добра чыталася ў профілях раскопу, мела позні характар і была зроблена не раней XIX ст. (мал. 3). Пад пяшчанай праслойкай прасочвалася цёмна-шэрая праслойка, якую магчыма звязваць з перыядам

[1] Прыносім удзячнасць за актыўны ўдзел у раскопках выкладчыкам Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава А. Субоціну і А. Дулаву.

несталага пражывання на дадзенай частцы Запалоцкага пасада ў перыяд XVII–XIX стст. Вызначаная праслойка мела значна перамешаны стан. На істотны характар перамешвання пласта ўказвалі такія знаходкі, як фрагменты керамічнай пліткі (кв. 12), мікраліты і крамянёвыя адшчэпы (кв. 7, 12), мелкія ўкрапленні глінянай абмазкі (кв. 13), солід-барацінчык (мал. 4: *8*) і бразготка X–XII стст. (мал. 5: *1*), металічны шлак, памерамі 8 × 9 см (кв. 15), шрапнэль XIX ст. Доля керамічнага посуду XI–XIII стст. у гэтым пласце складала мінімальную колькасць (мал. 6: *1, 2*). Разам з тым пераважалі больш познія па часе фрагменты, звязаныя з перыядам XV–XVII стст. (мал. 6: *3–5*).

Пераход да пласта 2 вылучаўся на глыбіні 0,25–0,35 м ад дзённай паверхні. Магутнасць пласта складала 0,8–1,2 м. Пласт у агульнай масе меў цёмна-шэрую афарбоку з праслойкамі шэрага і чорнага



Мал. 3. План мацерыка і мацерыковых ям раскопу: *1* – дзённая паверхня, дзірван; *2* – мяжа мацерыка; *3* – камяні; *4* – абпаленыя кавалкі дрэва; *5* – чорны слой; *6* – асобныя вуголлі; *7* – шэры слой; *8* – цёмна-шэры слой; *9* – светла-шэры слой; *10* – пясок; *11* – фрагменты абпаленай гліны; *12* – металічныя шлакі; *13* – межы ям

(вугальнага) слою, што было звязана з пажарам, які адбыўся на месцы помніка (мал. 3). Ва ўсім складзе пласта прасочваліся асобныя мелкія вуголлі і фрагменты глінянай абмазкі (абпаленнай гліны). У пласце не было выяўлена драўляных канструкцый, таму вызначыць будаўнічыя гарызонты не з'яўлялася магчымым. З мэтай больш рэльефнага апісання змен у стратыграфіі пласта 2 усе яго асаблівасці падаюцца адносна дзённай паверхні, тым больш што ўся фотафіксацыя і фіксацыя масавых і індывідуальных знаходак праводзілася па раскопачных пластах магутнасцю 0,2 м.

На ўзроўні 0,2–0,4 м ад дзённай паверхні пласт 2 у агульнай масе працягваў захоўваць цёмна-шэры колер з утрыманнем фрагментаў абпаленай гліны (глінянай абмазкі?) і вуголлю. Колькасць матэрыялаў, характэрных для перыяду XI–XIII стст., значна ўзрасла ў параўнанні з пластом 1. Асабліва гэта праявілася ў істотнай колькасці керамікі канца XI – першай паловы XIII ст. (мал. 6: *6, 12*) і характэрных для таго перыяду артэфактах: 4 фрагментах шкляных бранзалетаў, 2 шыферных прасніцах, бразготках (мал. 5: *2*). Адметным храналагічным маркёрам у верхняй частцы пласта 2 выступаў ключ да замка XII–XIII стст. з кв. 14, які захаваўся толькі фрагментарна (мал. 7: *1*). Адзін з арбалетных балтоў з кв. 7, таксама быў выяўлены на дадзеным узроўні (мал. 8: *6*).

Ужо на ўзроўні 0,2–0,4 м ад дзённай паверхні ў розных частках раскопу (кв. 2, 7, 10, 11) была выяўлена даволі істотная колькасць металічных шлакаў, адзін з якіх меў памеры 7 × 8 см. Пры перавазе керамічных матэрыялаў XI–XIII стст. відавочна прысутнасць і фрагментаў гаршкоў XV–XVII стст. (мал. 6: *3–5*), фрагмента макотры і нават кавалка паліванай, паліхромнай, каробкавай кафлі. Яркім



Мал. 4. Побытавыя рэчы з каляровага металу: *1* – лыжачка; *2* – іголка; *3, 7* – правушыны ад катлоў; *4, 5* – капавушкі; *6* – ключ; *8, 9* – манеты; *10* – гірка-разнавага; *1* – жоўты сплаў; *2, 4–6* – бронза; *3, 7, 8* – медзь; *9* – срэбра; *10* – медзь, чорны метал



Мал. 5. Упрыгажэнні і дэталі адзення: *1–3* – бразготкі; *4* –прывеска-меч; *5, 6, 8* – пярсцёнкі; *7, 9, 12* – элементы пасавай гарнітуры; *10* – бранзалет; *11–13* – спражкі; *14–16* – часткі фібул; *1, 2, 4, 7–11, 13, 15, 16* – бронза; *3, 6* – медзь; *5* – свінцова-алавяністы сплаў; *13* – медна-цынкавы сплаў; *14* – білонавы сплаў



Мал. 6. Венчыкі керамічных гаршкоў (*1–19*) і місак (*20–22*): *1–5* – пласт 1; *6–22* – пласт 2



Мал. 7. Побытавыя рэчы з чорнага металу: *1–3, 5, 6* – ключы; *4, 7–9* – часткі замкоў

храналагічным маркёрам, які ўказваў на XVII ст., з'яўляўся крыжык-цельнік (мал. 9: *5*). Несумненна, што клямка з кв. 10 (мал. 10: *7*) папярэдне, храналагічна, можа быць аднесена да XVIII–XIX стст. Безумоўна, што сляды жыццядзейнасці, пазнейшай за XIII ст., фіксуюцца ніжэй за 0,3 м ад дзённай паверхні.

Цвікі, нажы, адшчэпы крамянёвыя дапоўнілі сціслую карціну зместу слою на ўзроўні 0,2–0,4 м ад дзённай паверхні. Відавочна, што матэрыялы верхняй часткі раскопу сведчылі аб слядах жыццядзейнасці на дадзеным участку ў XV–XVII стст. і больш пазнейшы час. Гэты перыяд жыццядзейнасці, відаць, не меў сталага праяўлення ў культурным пласце і істотнай інтэнсіўнасці. Ён вызначаўся выпадковай прысутнасцю матэрыялаў у шэрагу квадратаў на значнай глыбіні ў выніку перакопаў (слупавых ям?), як гэта паказалі і матэрыялы ніжэй ад дзённай паверхні.



Мал. 8. Наканечнікі стрэл (*1–8*)

На ўзроўні 0,4–0,6 м ад дзённай паверхні назіраўся неаднародны склад пласта 2. Сярод цёмна-шэрага слою па ўсіх квадратах была прасочана інтэнсіўная прысутнасць украпленняў абпаленай гліны (глінянай абмазкі?) і вугольляў. У зрэзе культурнага пласта падобныя ўкрапленні не ўтваралі сталых праслоек, а размяркоўваліся хаатычна, дзе фрагменты абпаленай гліны і вуголлі не мелі кампактнага размяшчэння (мал. 3). У некаторых квадратах акрамя фрагментаў глінянай абмазкі і вугольляў была зафіксавана істотная колькасць камянёў, якія ў свой час патрапілі пад уздзеянне высокай тэмпературы. У кв. 13 сярод фрагментаў абпаленай гліны і вугольляў быў выяўлены фрагмент керамічнай пліткі (плінфы?) з ракавістым зломам таўшчынёй 2,4 см. Відавочна, што ў вышэйзгаданых квадратах сярод камянёў (мал. 11: *1*) канцэнтраваўся і шэраг артэфактаў XI–XIII стст., такіх, як: фрагменты шкляных бранзалетаў, шыфернае прасніца (мал. 12: *8*), фрагмент шпоры (мал. 13: *1*), фрагмент фібулы, язычок да фібулы (мал. 5: *16*). Адзначаецца таксама і істотная колькасць керамічнага посуду з венчыкамі, звернутымі ўнутр. У якасці адноснага храналагічнага маркёра выступае і рабрыстая, бочкападобная, шкляная пацерка з сярэбранай фольгай (мал. 14: *6*). У кв. 10, 18 фіксуецца некалькі адметных цвіковых заклёпак з плоскімі плешкамі (мал. 10: *3*).

На ўзроўні 0,4–0,6 м ад дзённай паверхні ў кв. 5, 16, 17, 18 выяўлены металічныя шлакі побач з артэфактамі позняга паходжання, сярод якіх вызначаюцца фрагменты зялёна-паліваных місак XVII–XVIII стст. (мал. 6: *20–22*), фрагменты тэра-



Мал. 9. Культавая мелкая пластыка з бронзы: *1* – іконка-прывеска; *2–5* – крыжыкі-цельнікі; *6, 7* – крыжы-энкалпіёны

котавага керамічнага посуду XV–XVII стст. (мал. 6: *13, 14, 16, 17*), фрагмент абутковай падкоўкі, фрагмент глінянай люлькі (мал. 12: *12*) і самы яркі храналагічны маркёр – манета, якая была вызначана як паўпенязь ВКЛ (мал. 4: *9*) і выраблялася, па вызначэнні Ш. І. Бекцінеева, у перыяд 1410–1420 гг. [3, с. 159].

Асаблівасці пласта 2 на ўзроўні 0,6–0,8 м ад дзённай паверхні праявіліся ў істотным павелічэнні колькасці вугалёў, што асабліва датычылася квадратаў раскопу, дзе назіралася асноўная канцэнтрацыя знаходак, характэрных для жылой пабудовы, а менавіта: фрагментаў шкляных бранзалетаў (кв. 1, 7, 13, 14), нажоў і асялкоў (кв. 2–4, 8–10, 14, 17), ключа тыпу «Б» XII – сярэдзіны XIV ст. (мал. 7: *5*), крэсіва (мал. 15: *18*) і інш. Сярод фрагментаў посуду венчыкі XI–XIII стст. мелі істотную перавагу (мал. 6: *7, 8*). Канцэнтрацыя рознабаковых матэрыялаў, характэрных у большай ступені для перыяду XI–XIII стст., адпаведна прасочвалася ў заходняй частцы раскопу, дзе прысутнічала і шмат камянёў (мал. 11: *2*). Далей кв. 8, 13 і ў кв. 14 на ўзроўні 0,6–0,8 м ад дзённай паверхні адзначаліся тыя ж



Мал. 10. Скабяныя вырабы з чорнага металу: *1, 2* – цвікі; *3* – цвікападобная заклёпка; *4, 5* – скобы; *6* – пятля; *7* – клямка; *8* – запорная скаба; *9* – заціск; *10* – правушына; *11, 12* – дзвярныя кольцы; *13* – крук



Мал. 11. План раскопу 1: *2.1* – на ўзроўні 0,4–0,6 м ад дзённай паверхні; *2.2* – на ўзроўні 0,6–0,8 м; *2.3* – на ўзроўні 0,8–1,0 (1,1) м ад дзённай паверхні. Планіграфія асноўных артэфактаў (спасылка на малюнак у артыкуле): № 1 (мал. 13: *1*); № 2 (мал. 4: *9*); № 3 (мал. 14: *6*); № 4 (мал. 13: *2*); № 5 (мал. 9: *6*); № 6 (мал. 8: *5*); № 7 (мал. 8: *2*); № 8 (мал. 9: *7*); № 9 (мал. 9: *2*); № 10 (мал. 5: *9*); № 11 (мал. 5: *11*); № 12 (мал. 8: *3*); № 13 (мал. 9: *4*); № 14 (мал. 8: *7*); № 15 (мал. 5: *5*); № 16 (мал. 4: *5*); № 17 (мал. 8: *1*)



Мал. 12. Вырабы з шыферу (*1–10*) і гліны (*11, 12*): *1–10* – прасніцы; *11* – элемент для гульняў; *12* – фрагмент люлькі

складнікі пласта. Тут, у цёмна-шэрым слоі, выяўлены фрагмент тэракотавай пліткі, фрагменты венчыкаў канца XI – XIII ст. і камяні. На дадзеным узроўні ў кв. 14 адбыўся выхад на перадмацерыковы слой, які складаўся з пяску і быў перанасычаны вуголлем, камянямі і вялікай колькасцю металічных шлакаў. Значная колькасць металічных шлакаў характэрна і для кв. 15, 16. У кв. 8 пры разборцы слою з камянямі і вуголлямі быў выяўлены скрутак ланцуга. Не выключана, што ланцуг выконваў функцыю ланцуговага трымальніка для катла, на што ўскосна ўказвае адмысловая адтуліна-фіксатар ў верхнім звяне (мал. 16: *1*). Паказальна, што шыферныя прасніцы (мал. 12: *1, 4, 7, 11*) знаходзіліся ў розных квадратах амаль на адным узроўні па нівеліры. Асаблівасцю пласта на ўзроўні 0,6–0,8 м ад дзённай паверхні з'яўлялася і павелічэнне колькасці знаходак наканечнікаў стрэл і культавай пластыкі. Наканечнік стралы і арбалетны болт былі знойдзены ў кв. 14, 11 (мал. 17: *2, 5*). З кв. 7 паходзіў крыжык-цельнік (мал. 9: *3*), з кв. 8 – створка крыжыка-энкалпіёна (мал. 9: *7*). Унікальнай знаходкай з кв. 16 выступае поўнасцю захаваны крыж-энкалпіён XII–XIII стст. са следам ўздзеяння высокай тэмпературы (мал. 9: *6*). Адметным храналагічным маркёрам з'яўляўся бронзавы ключ да нутранога замка XII–XIII стст. (мал. 4: *6*). Да рыштунку вершніка належаў фрагмент шпоры з кв. 9 (мал. 13: *2*). Выключэннем з храналагічнага шэрага XI–XIII стст. з'яўлялася дужка да замка тыпу «Е» па наўгародскай тыпалогіі (мал. 7: *9*). Бытаванне падобных замкоў пачынаецца ў сярэдзіне XIV ст. і адбываецца значна пазней вышэйуказанага



Мал. 13. Рыштунак вершніка і каня: *1, 2* – шпоры; *3, 4* – фрагменты цугляў; *5* – частка страмёнаў; *6, 7* – ледаходныя шыпы; *8* – частка падковы; *1–8* – чорны метал

храналагічнага прамежку [16, с. 162]. Таксама некаторыя з фрагментаў посуду з узроўню 0,6–0,8 м ад дзённай паверхні адносіліся да XVI–XVII стст. (мал. 6: *15*). У выніку магчыма казаць аб тым, што часткова перакоп культурнага пласта быў зафіксаваны і да глыбіні 0,8 м ад дзённай паверхні.

На ўзроўні 0,8–1,0 м ад дзённай паверхні асноўны склад пласта меў цёмна-шэрую афарбоўку з уключэннямі вугольляў і фрагментаў абпаленай гліны. Асабліва выразна падобны склад пласта праявіўся ў кв. 4, 8, 9. У кв. 13 пры выхадзе на мацярык былі зафіксаваны даволі вялікія вуголлі памерамі 2 × 3 см. Як і вышэй па слоі раскопу прасочвалася шмат металічных шлакаў. Побач са шлакамі звычайна фіксаваліся камяні і фрагменты глінянай абмазкі. У гэтым сэнсе паказальна наяўнасць вялікай колькасці шлакаў у кв. 17 побач з камянямі. Але казаць аб тым, што гэта рэшткі домнаў, не карэктна, бо зусім не былі сустрэты соплы і канцэнтрацыя фрагментаў глінянай абмазкі побач з камянямі мела неінтэнсіўны характар. Для складу пласта на ўзроўні 0,8–1,0 м ад дзённай паверхні характэрна значная колькасць камянёў, асабліва ў заходняй частцы раскопу. У кв. 2 сярод камянёў былі выяўлены вялікія фрагменты глінянай абмазкі і нават косткі. У большасці квадратаў пры зачыстцы перадмацерыковага слою прасочваўся выхад на мацярык і абазначыліся контуры мацерыковых ям. На перадмацерыковым узроўні рэчавы склад пласта 2 не істотна адрозніваўся ад складу пласта на ўзроўні 0,6–0,8 м ад дзён-



Мал. 14. Вырабы са шкла: *1–3, 5* – бранзалеты; *4, 6, 7, 9–11* – пацеркі; *8* – устаўка ў пярсцёнак

най паверхні, што можа сведчыць аб тым, што на ўзроўні 0,6–1,0 м (1,2 м) ад дзённай паверхні адбывалася фарміраванне пласта 2 у храналагічных межах XI – першай паловы XIII ст. У сувязі з гэтым заўважым, што ў складзе керамічнага посуду сярод традыцыйных венчыкаў канца XI–XIII ст. (мал. 18: *3–8*) павялічылася доля венчыкаў, у большай ступені характэрных менавіта для XI ст. (мал. 18: *2*). Асобна трэба адзначыць венчык з карнізікам (мал. 18: *1*).

Сярод іншых асаблівасцей культурнага пласта на перадмацерыковым узроўні адзначым наступнае. Асноўная колькасць нажоў і асялкоў канцэнтравалася ў заходняй і цэнтральнай частках раскопу, асабліва ў кв. 3, 4, 9, 10, 16. Усе фрагменты шкляных бранзалетаў выяўлены бліжэй да ўсходняй часткі раскопу (кв. 4–6, 18). У розных частках раскопу былі знойдзены наканечнікі стрэл (мал. 8: *1, 3, 7*). У якасці адносных храналагічных маркёраў перадмацерыковага пласта выступілі: фрагменты амфары з кв. 1, фібула з кв. 2 (мал. 5: *15*), крыжыкі-цельнікі з кв. 9, 17 (мал. 9: *2, 4*), ключ XII ст. (мал. 7: *2*), гірка-разнавага (мал. 4: *10*), шчытковы пярсцёнак з выявай праквітнеўшага крыжа з кв. 1 (мал. 5: *5*) і лірападобная спражка (мал. 5: *11*). Заўважана канцэнтрацыя ў кв. 10 асялкоў (мал. 19: *1, 10*). З гэтага ж квадрата паходзіць і керн ад свідраванай сякеры, асаблівасцю якога з'яўлялася наяўнасць аднаго зашліхтаванага, сплошчанага боку (мал. 19: *7*). Гэтую асаблівасць керна магчыма патлумачыць толькі яго другасным выкарыстаннем для шліфавальнай справы ці падточкі нажоў. Укажам на тое, што побач з кв. 10 у суседніх квадратах на ўзроўні 0,6–0,8 м ад дзённай паверхні заўважана канцэнтрацыя асялкоў, што з'яўлялася адным з ускосных маркёраў існавання пабудовы.

Асаблівасцю прадмацерыковага пласта трэба лічыць і тое, што на дадзеным стратыграфічным узроўні выяўлена даволі шмат фрагментаў рыштунку вершніка і каня, сярод якіх вылучаецца частка цугляў (мал. 13: *4*), падножная пласціна для стрэмені (мал. 13: *5*) і ледаходныя шыпы (мал. 13: *6, 7*).

Нягледзячы на аўтэнтычны пласт XI–XII стст. на перадмацерыковым узроўні, бліжэй да паўднёвай сценкі раскопу, фіксаваўся перакоп, аб чым сведчыць наяўнасць часткі ключа тыпу «Д» па наўгародскай класіфікацыі ў кв. 5 і дужка замка з пружынай тыпу «Д» (мал. 7: *8*). У гэтай сувязі застаецца не зусім зразумелай храналогія двух элементаў ад дзвярных запораў (мал. 10: *8, 11*).

Такім чынам, пласт 2 па сукупнасці матэрыялаў датаваўся ў межах XI – першай паловы XIII ст., аб чым сведчаць вышэйуказаныя матэрыялы. Звер-



Мал. 15. Побытавыя рэчы з чорнага металу: *1–6, 10, 14* – нажы; *7* – шыла; *8, 9* – іглы; *11–13* – рыбалоўныя кручкі; *15* – праколка; *16* – фібула; *17* – спражка; *18* – крэсіва; *19* – дужка

нем увагу на тое, што бліжэй да мацерыка павялічылася колькасць шлакаў, вуголлю і абпаленай гліны. На ўзроўні 0,6–1,0 м ад дзённай паверхні неабходна казаць аб наяўнасці пабудовы, якая знікла ў выніку пажару. Крыжыкі-цельнікі, фрагмент капавушкі (мал 4: *5*), шыферныя прасніцы, нажы і асялкі ўскосна ўказваюць на гэта. Звяртае на сябе ўвагу вялікая колькасць наканечнікаў стрэл на вышэйуказаным ўзроўні.

Пасля выбаркі пласта 2 пачалася зачыстка перадмацерыковай паверхні, якая дазволіла выявіць на перадмацерыку нагрувашчанне камянёў у кв. 14 (мал. 3). Адзначым, што глінянай абмазкі разам з камянямі не зафіксавана. На мацерыку прасочваліся асобныя



Мал. 16. Прылады з чорнага металу: *1* – ланцуг; *2* – зубіла



Мал. 17. Венчыкі керамічных гаршкоў (*1–7*) з археалагічных даследаванняў 2005–2009 гг.



Мал. 18. Венчыкі керамічных гаршкоў (*1–11*). Пласт 2

фрагменты керамікі XI–XII стст. Рэчавы склад слою зачысткі характарызаваўся разнастайнасцю. Рэдкай знаходкай трэба прызнаць бронзавую прывеску-іконку з выявай св. Георгія (мал. 9: *1*). З кв. 14 паходзіў наканечнік стралы (мал. 8: *4*) і шыла (мал. 15: *7*), у кв. 15 – рыбалоўны кручок (мал. 15: *11*), асялок (мал. 19: *5*). У кв. 13 выяўлена частка дужкі ад невядомай пасудзіны (мал. 15: *19*). У якасці рэдкай знаходкі згадаем біканічную пацерку (мал. 14: *4*). Мацярык меў жоўты колер і складаўся з пяску. Пасля зачысткі перадмацерыковай паверхні пачалася разборка мацерыковых ям.

У мацерыку сукупна было выяўлена 12 мацерыковых ям. Усе яны мелі свае асаблівасці запаўнення і храналогіі (мал. 3). Запаўненне ямы № 1 складаў шэры слой з дамешкам мелкіх вугольляў, фрагментаў керамікі XI–XIII стст. (мал. 20: *1–4*). Сярод матэрыялаў выяўлены цвікі, фрагмент нажа.

Запаўненне ямы № 2 складалася з цёмна-шэрага і чорнага слою з вуголлямі, фрагментамі абпаленай гліны і камянямі. У яме было шмат фрагментаў керамічных гаршкоў з венчыкамі, звернутымі ўнутр, канца XI – XIII ст. (мал. 20: *5, 6*) і значная колькасць костак жывёл. Адзін з венчыкаў гаршкоў таксама датаваўся ў межах XI ст. (мал. 20: *12*). Некаторыя з фрагментаў мелі больш познюю храналагічную мяжу, чым XIII ст. Гэта ўказвала на тое, што перакопы фіксаваліся і на дадзенай глыбіні (мал. 20: *7–11*). Істотная доля знаходак належала цвікам, скобам і пласцінам нявызначанага паходжання. Гэта сведчыла аб тым, што яма № 2 з'яўлялася часткай былой пабудовы. Гэту выснову дадаткова пацвярджалі рэчы побытавага характару, сярод якіх вызначаліся: нажы, шыла, шыферныя прасніцы (мал. 12: *5, 9*), фрагмент шклянога бранзалета, асялкі, зубіла (мал 16: *2*), жалезная іголка. У кв. 4 ў яме была выяўлена капавушка з фігуркай сабачкі на завяршэнні (мал. 4: *4*), фрагмент свянцовага пярсцёнка, бронзавае кальцо на пас (мал. 5: *7*) і наканечнік стралы (мал. 8: *8*). Яркімі храналагічнымі маркёрамі з'яўляліся дзве дужкі са спружынамі ад замкоў тыпу «В» (мал. 7: *4–7*) і масіўны ключ ад нутранога замка (мал. 7: *3*). Падобныя ключы сустракаюцца з XII ст. Звернем увагу на тое, што дзве дужкі ад аднатыпных замкоў знаходзіліся на адным стратыграфічным узроўні (адзнакі па нівеліру: 260 і 264 см адпаведна). Знаходка падобных артэфактаў не выглядае выпадковай з улікам таго, што ў гэтай жа яме на стратыграфічным узроўні 270 см была выяўлена частка дзвярнога запора ў выглядзе кальца і абламанай пласціны (мал. 10: *12*). Яма мела дачыненне да ямы № 3 і не выключана, што яна з'яўлялася ніжняй часткай пабудовы. Яма датуецца ў межах XI–XIII стст.

Яма № 3 была запоўнена цёмна-шэрым слоем з чорнымі праслойкамі, якія ў асноўным складаліся



Мал. 19. Вырабы з каменю: *1–5, 8–10* – асялкі; *6* – прывеска; *7* – керн

з вуголля. У верхняй частцы ямы было зафіксавана шмат камянёў, праслойка, якая складалася з вуголля, кавалкаў абпаленага дрэва, абпаленай гліны, камянямі са следам ўздзеяння высокай тэмпературы і ўтрымлівала металічныя шлакі. Вельмі важна адзначыць стратыграфічную сітуацыю, звязаную са шлакамі. Так, у кв. 5, 8 пад шлакамі былі знойдзены асобныя вуголлі і фрагмент керамікі з венчыкам, звернутым унутр (каля XI–XIII стст.). Тая ж сітуацыя ідэнтычна і для кв. 9, дзе пад праслойкай абпаленай гліны, сярод камянёў і вугольлю, у ніжняй частцы ямы былі зафіксаваны шлакі. У Запаўненні ямы выяўлена шыфернае прасніца (мал. 12: *6*) і асялкі (мал. 19: *2, 4*). Такім чынам, храналагічная сітуацыя ямы № 3 ідэнтычная сітуацыі ў яме № 2. Агульная форма ямы пасля поўнай разборкі культурнага пласта блізкая да авальнай, падобна на ніжнюю частку пабудовы, заглыбленай у мацярык. Яма датавалася XI–XIII стст.

Невялікая яма № 4 уваходзіла ва ўсходнюю частку раскопу і была запоўнена шэрым слоем з вуголлямі. Ідэнтычная сітуацыя прасочвалася



Мал. 20. Венчыкі керамічных гаршкоў з мацерыковых ям: *1–4* – яма № 1; *5–12* – яма № 2; *13–22* – яма № 3

і ў дачыненні да ямы № 5, у якой назіраўся шэры слой без істотных матэрыялаў. У верхняй частцы ямы выяўлена частка заціску для прабоя ці жалезнага ланцуга (мал. 10: *9*). Не мае датуючых матэрыялаў і шэры слой запаўнення ямы № 6, 8, 9. У ніжняй частцы ямы № 10 прасочвалася толькі прысутнасць вялікіх вуголляў.

У верхняй частцы запаўнення ямы № 7 быў выяўлены цёмна-шэры слой з вуголлямі, сярод якіх сустракаліся даволі вялікія, памерамі: 2 × 3 см; 4 × 5 см. У самым нізе ямы сярод фрагментаў гліны прасочваліся вуголлі, фрагмент амфары, цвікі. Яма № 11 мела адкрыты характар і фіксавалася побач з нагрувашчаннем камянёў на мацерыку. У яме выяўлены цвікі ў значна саржавелым стане, жалезная абламаная ігла. Яма № 12 таксама не мела датуючых матэрыялаў.

Звернемся да агульнай характарыстыкі матэрыялаў, атрыманых у выніку археалагічных раскопак.

Найбольшая колькасць індывідуальных знаходак была выраблена з чорнага металу, сярод якіх пераважалі скабяныя вырабы, прадстаўленыя цвікамі (мал. 10: *1, 2*), фрагментамі дзвярных кручкоў, клямкай (мал. 10: *7, 13*), пяцельнай завесай (мал. 10: *6*), прабоем (мал. 10: *8*), кольцамі дзвярнымі (мал. 10: *11, 12*), зажымам (мал. 10: *9*) і інш.

Значную колькасць вырабаў дадзенай групы складалі скобы і шыпы да скобаў. Скобы мелі розныя памеры, ад невялікіх (мал. 10: *4*) да масіўных (мал. 10: *5*).

Побытавыя рэчы ў раскопе былі прадстаўлены наборам рэчаў з чорнага і каляровага металаў, сярод якіх былі вылучаны наступныя вырабы з чорнага металу: шыла (мал. 15: *7*), іголкі (мал. 15: *8, 9*), спражка (мал. 5: *17*), частка дужкі для посуду, нажы. Апошнія датуюцца ў адносна шырокіх храналагічных межах: ад XI да XVII стст. Большасць нажоў належала да катэгорыі універсальных і адносілася да перыяду XI–XIII стст. (мал. 15: *1, 3–6*). Адзін з нажоў меў характэрную лажбінку на верхняй частцы палатна (мал. 15: *2*), а іншы быў дэфармаваны ў выніку ўздзеяння высокай тэмпературы і меў значнае скрыўленне палатна (мал. 15: *14*). З рамеснай дзейнасцю неабходна звязваць экзэмпляр нажа з шырокім лязом (мал. 15: *10*).

Асобную катэгорыю рэчаў складалі ключы і замкі. Большасць ключоў датавалася ў межах XII–XIII ст. і належала да нутраных замкоў (мал. 7: *1–3*). Адзін з ключоў адносіўся да перыяду XI–XIII стст. і меў абламаную круглую частку. Разам з тым ён быў арнаментаваны і прызначаўся для замкоў тыпу «Б» (мал. 7: *4*). Да тыпу «Е» адносіўся толькі фрагментарна захаваны экзэмпляр (мал. 7: *9*). У раскопе не было знойдзена ніводнага поўнасцю захаванага замка. Выяўлена некалькі частак замкоў, сярод якіх трэба адзначыць дужку ад замка тыпу «Д» (мал. 7: *8*), дужку са спружынай ад замка тыпу «Е» (мал. 7: *9*), дзве дужкі са пружынамі да замкоў тыпу «В» (мал. 7: *4, 7*).

Рэдкай знаходкай сярод побытавых вырабаў трэба прызнаць авальнае крэсіва з прадольнымі раўчукамі па корпусе (мал. 15: *18*). Авальныя крэсівы ўжываліся, згодна з наўгародскай храналогіяй, з сярэдзіны XII ст. [16, с. 163]. Рыбалоўныя кручкі (мал. 15: *11–13*), праколка (мал. 15: *15*), якая мела бронзавае калечка і правушыны для пасудзін (мал. 10: *10*) дапоўнілі спектр побытавых вырабаў. Спецыфічным вырабам, які ўжываўся ў сферы побыту з'яўляўся цэп са спецыяльным трымальнікам (мал. 16: *1*). Да інструментаў неабходна аднесці зубіла (мал. 16: *2*).

Асобную катэгорыю вырабаў з чорнага металу склалі зброя і ваенны рыштунак вершніка і каня. Зброя была прадстаўлена выключна наканечнікамі стрэл. Сярод апошніх былі адзначаны некалькі тыпаў: шылападобныя, чарашковыя (мал. 8: *7*, 8); лістападобны, чарашковы наканечнік (мал. 8: *1*), утулкавыя наканечнікі стрэл (мал. 8: *2–4*). Два наканечнікі адносіліся да арбалетных балтоў (мал. 8: *5, 6*). Шылападобны наканечнік (мал. 8: *7*, тып 87 па А. Ф. Мядзведзеву) датаваўся ў межах XII–XIV стст. [19, таб. 30: *80*]. Наканечнікі № 2–4 мелі шырокія межы бытавання, ад VII–VIII да XIII–XIV стст. [19, с. 56]. Ромбавідны наканечнік, які быў аднесены да 44 тыпу, мог быць датаваны ў межах IX–XI стст. [19, с. 67, таб. 30: *40*].

Склад рыштунку вершніка і каня з раскопу складаўся з двух фрагментаў шпор (мал. 13: *1, 2*) і ніжняй часткі стрэмені (мал. 13: *5*). Яе выгін і форма ўскосна сведчаць на карысць прыналежнасці стрэмені да XI–XIII стст., калі выкарыстоўвалі мяккі абутак. Па форме пласціны падножкі стрэмя блізкае да тыпу X (па класіфікацыі А. М. Кірпічнікава), які храналагічна адносіцца да XII–XIII стст. [14, с. 54, табл. 15].

Аб рыштунку каня магчыма меркаваць толькі па частках цугляў (мал. 13: *3, 4*), ледаходных шыпах (мал. 13: *6, 7*) і частцы падковы (мал. 13: *8*).

Значная група артэфактаў з раскопу была прадстаўлена вырабамі з каляровых металаў. Крыжыкі-цельнікі XVII ст. (мал. 9: *5*) і XI–XIII стст. (мал. 9: *2–4*) згадваліся вышэй. Упершыню ў Полацку сустрэты крыжык-цельнік са спецыфічнай арнаментацыяй (мал. 9: *4*), які мае прамыя аналогіі сярод падобных знаходак з Ноўгарада, Польшчы, Латвіі і Украіны [20, с. 96, рис. 49: *1*; 21, с. 50, рис. 16: *17*]. Выключнымі знаходкамі з'яўляліся два крыжыка-энкалпіёна. Ад аднаго засталася толькі створка (мал. 9: *7*). Падобная знаходка створкі вядома з гарадзішча Маскавічы і мае прамыя аналогіі сярод знаходак з тэрыторыі Латвіі [8, с. 52, рыс. 31: *1*; 17, с. 177, таб. 104: *IV.6.4/46*]. Другі крыж-энкалпіён захаваўся поўнасцю і меў пашкоджанне ад высокай тэмпературы (пажару?) (мал. 9: *6*). Прывеска-іконка

з выявай св. Георгія (мал. 9: *1*) мела аналогію сярод матэрыялаў з Ваўкавыска [12, с. 393, мал. 98: *1*].

Найбольшая колькасць вырабаў з каляровых металаў была аднесена да групы ўпрыгажэнняў і дэталяў адзення. Сярод іх вылучаліся часткі бразготак (мал. 5: *1–3*), віты бранзалет (мал. 5: *10*), пярсцёнкі (мал. 5: *6, 8*), дэталь (мал. 5: *4*). Падобны прадмет з Мінска трактаваўся як меч-амулет [10, с. 321, таб. XVII]. Адзін з пярсцёнкаў меў выяву праквітнеўшага крыжа (мал. 5: *5*). Гэта першая вядомая знаходка пярсцёнка з падобнай выявай на тэрыторыі Беларусі. Матыў «праквітнеўшага крыжа» шырока выкарыстоўваўся на вырабах з каляровых металаў у XI–XIII стст. на тэрыторыі Усходняй Еўропы і ў межах сучаснай Беларусі [4, с. 296, таб. 50, рис. 53: *19*, таб. 60: *14*; 18, с. 89, рис. 298–304].

Да адзення жыхароў X–XIII стст. з матэрыялаў раскопу належалі фрагменты фібул (мал. 5: *15, 16*). Адзін з фрагментаў фібул меў фігурную галоўку і быў зроблены з медзі і пакрыты срэбрам (мал. 5: *14*). Фібулы з аналагічнымі завяршэннямі былі выяўлены ў свой час яшчэ Завітневічам у Мінскім рэгіёне і пры пазнейшых раскопках у могільніку Нісімкавічы [2, с. 463]. Падобныя фібулы сустрэты і на тэрыторыі Расіі, у Курскай вобласці і Суздалі, дзе яны звязваюцца з колам скандынаўскіх старажытнасцей і класіфікуюцца як фібулы з савінымі галовамі [25, с. 207, 209]. Пасавая гарнітура была прадстаўлена кальцом (мал. 5: *7*), ліпападобнай спражкай (мал. 5: *11*), авальнай спражкай (мал. 5: *13*) і ажурнай накладкай (мал. 5: *9*). Падобная накладка выяўлена ўпершыню на тэрыторыі Беларусі. Аналагічныя рэчы найбольш характэрны для кола старажытнасцей Скандынавіі і Балтыйскага рэгіёна [24, стр. 257, таб. IX: *35*][1].

З ліку побытавых рэчаў, зробленых з каляровых металаў, неабходна адзначыць ключ, які выкарыстоўваўся для нутраных замкоў у XII–XIII стст. (мал. 4: *6*), частку лыжачкі (мал. 4: *1*), медныя дужкі да катлоў (мал. 4: *7*), фрагмент капавушкі (мал. 4: *5*) і бронзавая капавушка з выявай сабачкі (мал. 4: *4*). Дэкаратыўны элемент у выглядзе сабачкі быў даволі папулярны ў мастацтве XI–XIII стст. і вядомы на капавушках з тэрыторыі Беларусі [2, с. 452].

Аб грашовым абарачэнні сведчаць такія знаходкі, як солід – барацінка, канца 50-х – пачатка 60-х гадоў XVII ст. (мал. 4: *8*), паўпенязь ВКЛ XV ст. (мал. 4: *9*) і гірка-разнавага (мал. 4: *10*), якая датуецца другой паловай X ст.[2]

У прадстаўленай публікацыі свядома пазбягаем падрабязнага апісання керамічных вырабаў (посуду, будаўнічага матэрыялу), бо храналагічныя моманты адносна прадстаўленай катэгорыі рэчаў прыводзяцца па тэксту. У ліку рэдкіх знаходак згадаем фрагмент чырвонаглінянай люлькі для смалення (мал. 12: *12*) і керамічны шарык са сплошчанымі пласкасцямі (мал. 12: *11*).

Вырабы са шкла ў асноўным прадстаўлены пацеркамі, фрагментамі шкляных бранзалетаў і зялёнай устаўкай для пярсцёнка (мал. 14: *8*). Было выяўлена некалькі пацерак, сярод якіх адна сіняя (мал. 14: *7*), срэбрана-шкляная (мал. 14: *6*), пацеркі з празрыстага шкла (мал. 14: *9*, 10), біпірамідальная, пашкоджаная ад уздзеяння высокай тэмпературы (мал. 14: *4*). Адна пацерка па фактуры была зроблена з глушонага шкла, паліхромная па гаме колераў (мал. 14: *11*).

Шкляныя бранзалеты з раскопу сустрэты толькі ў фрагментарным стане і мелі гладкае (мал. 14: *1*), вітое (мал. 14: *3, 5*) і псеўдавітое сячэнне. Большасць з бранзалетаў была зроблена з сіняга шкла, але трапляліся і іншыя экзэмпляры. Адзін з бранзалетаў меў светла-жоўты колер і быў перавіты «залатой ніткай» (мал. 14: *2*).

Поўнавартасных вырабаў з косткі не выяўлена. Адна з костак мела рысы, падобныя на графіці літары «А».

Найбольшую колькасць вырабаў з каменю ў раскопе 1 склалі асялкі розных памераў. Масіўныя асялкі (тачыльныя камяні) вызначаліся няроўнымі прапорцыямі (мал. 19: *4, 8, 9*) ці мелі падпраўленыя да формы прамакутніка грані (мал. 19: *10*). Некаторыя фрагменты з шэрага сланца (шыфер) мелі значна сточаны стан (мал. 19: *5*) Два экзэмпляры асялкоў мелі адтуліны (мал. 19: *1, 2*).

Меншую па колькасці групу вырабаў з каменю склалі прасніцы, зробленыя з шыфернага сланца ў цэлым (мал. 12: *6–10*) і фрагментарным стане (мал. 12: *1–5*). Большасць з іх мела біканічную форму.

Асобная група вырабаў з каменю была прадстаўлена крамянёвымі вырабамі. У раскопе былі зафіксаваны фрагменты крэменю (скалкі), адшчэпы, некалькі скрабковых прылад і абламаны наканечнік, блізкі па апрацоўцы дзяржання да кола Свідэрскіх старажытнасцей[3].

Незвычайнай знаходкай з'яўляўся і керн, які належаў да адыходаў пры вырабе свідраванай сякеры (мал. 19: *7*). Асаблівасцю керна было яго другаснае выкарыстанне, у выніку чаго адна плоскасць аказалася сплошчанай.

Выклікае складанасці і ідэнтыфікацыя дэталі з адтулінай. Яна падобна на падвеску, зробленую з каменю (мал. 19: *6*). Падобная дэталь не мае дачынення да асялкоў з адтулінамі, бо зроблена з цвёрда-

[1] Падрабязна пасавая гарнітура аналізуецца ў асобным артыкуле аўтара і П. М. Кенькі.

[2] Просім ўдзячнасць Ш. І. Бекцінееву за зробленыя ім вызначэнні.

[3] Прыносім удзячнасць І. Язэпенку, М. Чарняўскаму, М. Крывальцэвічу.

га, не мелкадысперснага каменю і на ёй не фіксуецца след злому ў ніжняй частцы вырабу.

На аснове аналіза матэрыялаў, атрыманых у выніку археалагічных раскопак, разгледзім паэтапна гісторыю развіцця дадзенай часткі Полацка.

Наяўнасць крамянёвых прылад працы ўскосна можа сведчыць пра тое, што раскоп закрануў частку ранейшай па часе стаянкі. Абламанае свідэрскае дзяржанне прылады можа ўказваць на час мезаліту, якім магчыма датаваць пачатак жыццядзейнасці на гэтым участку.

Наступны перыяд жыццядзейнасці неабходна звязваць з перыядам сярэднявечча. Перш за ўсё выклікае пытанне час пачатковага засялення дадзенай часткі Полацка ў сярэднявечны час. Якім чынам дакладна вызначаць храналогію пачатка жыццядзейнасці на помніку: канцом X ст. ці пачаткам XI ст.? У гэтай сувязі звяртае на сябе ўвагу поўная адсутнасць фрагментаў ляпнога керамічнага посуду, падпраўленага на ганчарным коле, характэрнага для другой паловы X ст. Пытанне ўскладняецца і адсутнасцю дакладнага храналагічнага зрэзу некалькіх ганчарных венчыкаў, якія традыцыйна адносяцца да XI ст. (мал. 18: *1*; мал. 20: *1, 12*). Па нашым меркаванні, з'яўленне падобных венчыкаў павінна адпавядаць канцу X ст. Па ўкраінскіх матэрыялах, венчык раскопу з закругленым завяршэннем і падкарнізікам (мал. 20: *1*) датуецца па-рознаму: 1) у межах рубяжа X–XI – 30-х гадоў XI ст. [20, с. 58, рис. 32]; 2) характэрны для комплексаў сярэдзіны X – сярэдзіны XI ст. [13, с. 76, мал. 3: тып X]. Дакладна не вядома, калі разгледжаны тып керамікі патрапіў на тэрыторыю Полаччыны, таму гіпатэтычна магчыма дапускаць, што ніжняя храналагічная мяжа дадзенага венчыка ў Полацку вызначаецца X ст. у шырокім разуменні, бо пакуль не выяўлена зачыненных комплексаў у Полацку з падобным венчыкам, удакладніць яго храналогію не магчыма. Раннім венчыкам з'яўляецца і тып венчыка з карнізікам (мал. 18: *1*). Г. В. Штыхавым прадстаўлены венчык блізкі да тыпу II полацкай керамікі і датуецца аўтарам як тып, найбольш характэрны для XI ст. [26, с. 81, рис. 40]. Ю. А. Заяцам дапускаецца існаванне падобнага тыпу (аддзел II, тып 2, варыянт В) у шырокім часовым дыяпазоне (з канца X ст. да пачатаку XII ст.) [11, с. 76, рис. 55]. Таму адносна дадзенага венчыка бяспрэчным у храналогіі бытавання застаецца XI ст. Акрамя керамічнага посуду некаторыя рэчы таксама маюць ніжнюю мяжу бытавання – X ст. Так, па вызначэнні Ш. І. Бекцінеева, гірка-разнавага згодна з метралагічнымі дадзенымі адпавядае часу сярэдзіны – другой паловы X ст. Пацеркі з раскопу даюць у асноўным ніжнюю храналагічную мяжу, пачынаючы з XI ст. Так, па матэрыялах Кіеўскага Падола, рабрыстая бачонкападобная пацерка з сярэбранай фольгай (аналаг – мал. 14: *6*) паходзіла з комплекса XI – першай паловы XII ст., а пацеркі з пластычным арнаментам (мал. 14: *11*) – з комплексаў XII – першай паловы XIII ст. [9, с. 259]. Бачонкападобныя пацеркі з залатой і сярэбранай фольгай па наўгародскай храналогіі мелі шырокія межы бытавання, пачынаючы з X ст. [16, с. 167].

Вышэй указвалася на шэраг рэчаў, якія бытавалі ў XI–XIII стст. У гэтай сувязі ўзнікае пытанне, звязанае з храналогіяй пажару, які знішчыў помнік у перыяд сталага сярэднявечча. Калі вырашаць пытанне аб храналогіі пажару, неабходна мець канкрэтныя храналагічныя маркёры. Адносных храналагічных маркёраў, якія ўказваюць на шырокае датаванне (XII–XIII стст.) даволі шмат. Напрыклад, масавы матэрыял з адноснай храналагічнай схемай у раскопе прадстаўлены фрагментамі шкляных бранзалетаў і амфар. Шкляныя бранзалеты ў Полацку бытавалі з канца XII па канец XIII ст., а амфары – у X – першай палове XIII ст. [23, с. 32, мал. 43–46]. Гэтую ж катэгорыю матэрыялаў дапаўняюць і шыферныя прасніцы. Максімум іх распаўсюджвання на тэрыторыі Беларусі прасочваецца ў другой палове X – першай палове XIII ст. [22, с. 122]. Шыферныя прасніцы паступова выходзілі з выкарыстання, пачынаючы з 40-ых гадоў XIII ст., але гэты працэс не меў рэзкі характар. Каштоўнасць сярод артэфактаў з шырокімі межамі бытавання мелі тыя, якія паходзілі са слою пажару і на якіх фіксаваліся сляды высокатэмпературнага ўздзеяння. Сярод падобных артэфактаў перш за ўсё адзначым фрагменты керамікі, якія мелі венчыкі, звернутыя ўнутр (апісаны вышэй тып). Калі з пачаткам бытавання дадзенага тыпу пытанняў амаль не ўзнікае, то адносна знікнення тыпу могуць існаваць лакальныя дыскусіі, адносна таго, ці дажывае пазначаны тып у Полацку да сярэдзіны XIII ст.? У слоі пажару выяўлены таксама і крыжэнкалпіён са слядамі пашкоджання ад уздзеяння высокай тэмпературы. Найбольш блізкія аналогіі падобнага энкалпіёна былі выяўлены ў пачатку XX ст. на тэрыторыі Кіеўскай губерніі, адна з аналогій падобнага крыжа датавалася ў межах XII ст., адваротная створка іншага крыжа – XII – першай паловай XIII ст. [17, с. 133, 136, таб. 76: *III.3.1/32; III.1/5*]. Такім чынам, спыненне жыццядзейнасці найбольш верагодна датаваць у межах канца XII – першай паловы XIII ст.

Аналізуючы сам характар жыццядзейнасці ў межах XI–XIII стст., адзначым тое, што сукупнасць матэрыялаў дазваляе вылучыць некалькі накірункаў у жыццядзейнасці на даследаванай тэрыторыі ў перыяд XI–XIII стст. Адзін з накірункаў быў звязаны з апрацоўкай чорнага метала, аб чым сведчыць наяўнасць вялікай колькасці металічных шлакаў і зубіла. Але месца раскопак не магчыма лічыць у пэўным сэнсе месцам выплаўкі металу, на што ўказвае адсутнасць наступных ускосных артэфактаў: вялікай колькасці камянёў і глінянай абмаз-

кі, соплаў ад домнаў і металічнай шлакавай акаліны. Магчыма, дадзены працэс адбываўся побач, на пляцоўцы, якая не была закрануга археалагічным раскопам. Гэтаму працэсу, відаць, садзейнічала блізкасць да вады р. Палаты.

Другі накірунак у жыццядзейнасці быў звязаны з пражываннем на дадзеным месцы прадстаўніка феадальнага саслоўя і яго сям'і (наяўнасць шпор, капавушак, пярсцёнка з праквітнеўшым крыжом, крыжыкаў-энкалпіёнаў і інш.). Гэты этап жыццядзейнасці быў перапынены ў выніку ваеннага ўварвання, на што ўказваў шэраг наканечнікаў стрэл у слоі пажарышча, сярод якіх быў зафіксаваны і арбалетны наканечнік стралы. Асабліва вялікая колькасць стрэл адпавядала, як гэта ўказвалася вышэй, 4–5 раскопачным пластам (мал. 8: *1–3, 7*).

Застаецца адкрытым пытанне аб тым, хто мог прычыніцца да знішчэння пасада ў канцы XII – першай палове XIII ст. У гэты храналагічны прамежак Полацк меў канфрантацыю з Псковам, Ноўгарадам, крыжакамі і Смаленскім княствам. Гіпатэтычна падобныя дзеянні магла ажыццявіць і «летапісная Літва». Наяўнасць арбалетнага наканечніка стралы са следам уздзеяння высокай тэмпературы падкрэслівае, што ў нападаючага боку на ўзбраенні былі арбалеты. Жорсткі характар нападу на дадзеную частку Запалоцкага пасада можа быць растлумачаны тым, што яна мела важкае значэнне, якое падкрэслівалася наяўнасцю маста праз р. Палату. Калі прааналізаваць гравюру XVI ст. С. Пахалавіцкага, то магчыма заўважыць насупраць стрэлкі (машны) Верхняга замка, на выгіне берага р. Палаты мост (мал. 1: *4*). Месца раскопу 2008 г. знаходзілася побач з ранейшым мастом, калі ўзяць за арыентыр выгін берага р. Палаты. Не выключана, што мост мог існаваць і ў больш ранейшы перыяд і ўзнаўляцца на тым жа месцы. Таму, гіпатэтычна, магчыма казаць аб тым, што жорсткі характар знішчэння дадзенай часткі пасада на мяжы XII–XIII стст. мог быць выкліканы жаданнем авалодаць мастом, які быў неабходны для захопу Верхняга замка.

Аб перыядзе XIV–XV стст. мы не можам нічога дакладнага сказаць. Бытаванне пэўных рэчаў заходзіць ў гэты перыяд (некаторыя тыпы венчыкаў гаршкоў, ключы і часткі замкоў тыпаў Д і Е), але адсутнічае гаршковая кафля, што характэрна для культурнага пласта г. Полацка ў гэты час [23, с. 35]. Разам з тым паўпенязь ВКЛ першай чвэрці XV ст. выступае як адметны храналагічны маркёр гэтага перыяду.

У XVI ст. даследаваная частка Запалоцкага пасада пачынае ізноў павялічвацца па плошчы. Да перыяду XVI–XVII стст. з матэрыялаў раскопу 1 адносяцца некалькі фрагментаў керамікі, частка абутковай падкоўкі, фрагмент тэракотавай люлькі і інш. Гэта ж пацвярджаюць і працы Д. Дука побач з раскопам 1 у 2003 г., прааналізаваныя вышэй. Несумненна, што Інфлянцкая вайна XVI ст. і вайна 1654–1667 гг. не садзейнічалі развіццю дадзенай часткі пасада. У гэтай сувязі заўважым, што каробкавая кафля, як важны храналагічны маркёр на раскопе амаль адсутнічае.

У выніку ўсяго вышэйсказанага неабходна зрабіць выснову аб тым, што Запалоцкі пасад меў істотнае пашырэнне ў паўночна-усходнім накірунку, пачынаючы з XI ст., і быў выцягнуты ўздоўж правага берага р. Палаты. Для аналізу плошчы распаўсюджвання культурнага пласта ў перыяд XI–XIII стст. мае значэнне аналіз даных, атрыманых падчас назіранняў А. Салаўёвым у 2004–2006 гг., аўтарам – у 2008 г. і І. Магалінскім – у 2009 г.[1] У 2004 г. А. Салаўёвым фіксаваліся асобныя фрагменты керамічных гаршкоў у пачатку вуліцы Ф. Міронавай (мал. 2: *1*). У 2005 г. пры аглядзе траншэі для газавай трубы быў выяўлены слой з керамікай, якая мела значнае бытаванне ў XI ст. (мал. 2: *2*; мал. 17: *1*). Пры назіраннях 2006 г. слой і керамічны посуд XI–XII стст. прасочваўся па 5-му завулку Ф. Міронавай (мал. 2: *3*; мал. 17: *2, 3*), у канцы 4-га завулка Ф. Міронавай (мал. 2: *4*; мал. 17: *4, 5*) і напрыканцы вул. Ф. Міронавай (мал. 2: *5*; мал. 17: *6*). Акрамя гэтага, дадатковае абследаванне вул. Ф. Міронавай, праведзенае восенню 2008 г. аўтарам дадзенага артыкула, засведчыла наяўнасць істотнага культурнага пласта, магутнасцю да 1 м напрыканцы 5-га завулка, дзе былі сабраны фрагменты керамікі XI–XIII стст. (мал. 2: *6*). Археалагічны нагляд, праведзены І. Магалінскім у 2009 г. у паўночнай частцы вул. Ф. Міронавай, не выявіў у траншэях культурнага пласта XI–XIII стст. (мал. 2: *7*). Гэта частка вул. Ф. Міронавай патрабуе дадатковых доследаў, бо побач з вынікамі І. Магалінскага існуюць вынікі А. Салаўёва па 2004 г. На адным з аб'ектаў назірання былі знойдзены фрагменты кафлі і фрагмент керамічнага посуду XVII ст. (мал. 2: *8*; мал. 17: *7*). Адсутнасць культурнага пласта і керамікі XI–XIII стст. у кропках назірання 2009 г. нам падаецца не выпадковай, што дазваляе папярэдне абмежаваць плошчу развіцця паўночна-усходняй часткі Запалоцкага пасада (мал. 2).

Такім чынам, праведзеныя працы дазволілі ўдакладніць храналогію існавання дадзенай часткі пасада. Як магчыма меркаваць на аснове вышэйвыкладзеных матэрыялаў, паўночна-усходняя частка Запалоцкага пасада фарміравалася ўздоўж надпоплаўнай тэрасы правага берага р. Палаты (мал. 2). Плошча паўночна-усходняй часткі Запалоцкага пасада вагалася ў залежнасці ад перыяду, мела найбольшае пашырэнне ў канцы XI – першай палове XIII ст. і складала каля 12 га (па папярэдніх даных), што дазваляе павялічыць агульную плошчу Полацка ў адзначаны перыяд.

[1] Прыносім удзячнасць А. Салаўёву і І. Магалінскаму за магчымасць карыстацца матэрыяламі іх доследаў.

Літаратура

1. Алексеев, Л. В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн. / Л. В. Алексеев; Ин-т археологии РАН. – М.: Наука, 2006. – Кн. 1. – 289 с.

2. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. /рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш]. – Мінск: БелЭн, 1993. – 702 с.: іл.

3. Бектинеев, Ш. И. Интеграционные процессы в формировании денежных систем X – начала XV вв. государств Восточной Европы / Ш. И. Бектинеев // Інтэграцыйныя працэсы ў гісторыі краін Усходняй Еўропы: матэрыялы навук. канф., Мінск, 19–20 ліст. 2008. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – С. 147–162.

4. Древняя Русь: Быт и культура / Д. А. Беленькая [и др.]; отв. ред. Б. А. Колчин, Т. И. Макарова. – М.: Наука, 1997. – 367 с.: ил.

5. Дук, Д. У. Археалагічная разведка на Запалоцкім пасадзе Полацка ў 2003 г. / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2006. – Вып. 11. – С. 104–113.

6. Дук, Д. У. Гісторыя Полацка: па матэрыялах археалагічных даследаванняў: вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў / Д. У. Дук; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, ПДУ. – Наваполацк: УА «ПДУ», 2006. – 112 с.

7. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007 – 268 с.: іл.

8. Дучыц, Л. У. Браслаўскае Паазер'е ў IX–XIV стст. / Л. У. Дучыц – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 120 с.: іл.

9. Журухина, Е. Ю. Стеклянные бусы Киевского Подола / Е. Ю. Журухина // Тверской археологический сборник. – Тверь, 2007. – Вып. 6. – Т. 2. – С. 256–259.

10. Загорульский, Э. М. Возникновение Минска / Э. М. Загорульский. – Минск: Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1982. – 358 с.: ил.

11. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц. – Минск: Наука и техника, 1995. – 207 с.: ил.

12. Звяруга, Я. Г. Рэчавы інвентар / Я. Г. Звяруга // Археалогія Беларусі: у 4 т. – Мінск: Беларус. навука. – Т. 3. – 2000. – С. 370–423.

13. Іоў, А. В. Асноўныя тыпы керамічнага посуду X–XI ст. на Беларускім Палессі / А. В. Іоў. // Древняя история Восточной Европы: сб. науч. ст., посвящ. 80-летию проф. Э. М. Загорульского / науч. ред. А. А. Егорейченко. – Минск: БГУ, 2009. – С. 68–78.

14. Кирпичников, А. Н. Снаряжение всадника и верхового коня на Руси IX–XIII вв. / А. Н. Кирпичников // М.: Наука, 1973. – 140 с.: ил.

15. Клімаў, М. В. Справаздача пра археалагічныя даследаванні ў г. Полацку ў 2008 г. / М. В. Клімаў // Архіў Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Спр. 2596. – 131 с.: іл.

16. Колчин, Б. А. Хронология новгородских древностей / Б. А. Колчин // Новгородский сборник: 50 лет раскопок Новгорода. – М.: Наука, 1982. – С. 156–177.

17. Корзухина, Г. Ф. Древнерусские энколпионы. Кресты-реликварии XI–XIII вв. / Г. Ф. Корзухина, А. А. Пескова. – СПб.: Петербургское Востоковедение, 2003. – 432 с.

18. Лавыш, К. А. Художественные традиции восточной и византийской культуры в искусстве средневековых городов Беларуси (X–XIV вв.) / К. А. Лавыш. – Минск: Беларус. наука. – 208 с.: ил.

19. Медведев, А. Ф. Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) / А. Ф. Медведев. – М.: Наука, 1966. – 184 с.: ил.

20. Петрашенко, В. А. Древнерусское село (по материалам оселений у с. Григоровка) / В. А. Петрашенко. – Киев, 2005. – 264 с.: 130 ил.

21. Седова, М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода (X–XV вв.) / М. В. Седова. – М.: Наука, 1981. – 198 с.

22. Сергеева, З. О распространении находок из волынского шифера в памятниках X–XIII вв. Беларуси / З. Сергеева // Час, помнікі, людзі: памяці рэпрасаваных археолагаў: тэз. дакл. Міжнар. канф., Мінск, 27–30 кастр. 1993 г. / уклад.: В. Вяргей, Г. Штыхаў. – Мінск, 1993. – С. 121–123.

23. Тарасаў, С. В. Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С. В. Тарасаў. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 183 с.: іл.

24. Финно-угры и балты в эпоху средневековья / Л. А. Голубева [и др.]; отв. ред. Б. А. Рыбаков. – М: Наука, 1987. – 509 с.: ил.

25. Шпилев, А. Г. Фибулы с зооморфными окончаниями с Курской области / А. Г. Шпилев // Случайные находки: хронология, атрибуция, историко-культурный контекст: материалы тематической науч. конф., Санкт-Петербург, 16–19 дек. 2008 г. / редкол.: Д. Г. Савинов (отв. ред.) [и др.]. – СПб., 2008. – С. 205–210.

26. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк / Г. В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 135 с.: ил.

27. Штыхаў, Г. В. Гарады Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі / Г. В. Штыхаў // Археалогія Беларусі: у 4 т. – Мінск: Беларус. навука. – Т. 3. – С. 171–228.

Резюме

М. В. Климов

Новые данные о Заполотском посаде в г. Полоцке (по результатам раскопок 2008 г.)

В статье приводится анализ основных результатов археологического исследования северо-восточной части Заполоцкого посада. В 2008 г. был исследован раскоп площадью 72 м^2. В результате были получены материалы, которые свидетельствовали о развитии данной части посада, начиная с XI в. Большинство матералов датируется XII – первой половиной XIII в. и представлено в основном бытовыми вещами (ножами, замками, ключами и др.), фрагментами ке-

рамической посуды и украшениями. В раскопе находилось много предметов культового предназначения, среди которых были крестики-тельники, крестики-энколпионы и привеска-иконка. В раскопе зафиксирована прослойка пожара, в которой встречаются и наконечники стрел. Прекращение жизнедеятельности в месте раскопок необходимо датировать в широких хронологических границах: с конца XII по первую половину XIII в., и связывать с военным катаклизмом. В более позднее время данная часть Заполоцкого посада заселялась не полностью и периодически. В результате сопоставления результатов раскопок, полученных в 2008 г. А. Соловьевым и И. Магалинским, была очерчена примерная площадь северо-восточной части Запалоцкого посада, которая составила около 12 га.

Summary

M. Klimov

The new materials concerning the suburb of Zapolot'e in Polotsk (results of the archaeological excavation in 2008)

The article presents the results of archaeological excavation of north-eastern part the suburb of Zapolot'e. The trench by the area 72 sq.m. was researched in 2008. As a result materials which testified to development of the given part of suburb since the 11th century had been received. The majority of artefacts is dated back to the 12th – first half of the 13th century and presented, basically, household things (knives, locks, keys, etc.) and some ornaments and pottery. There were many subjects of religious applicability in the trench among which were crosses, pendant-icons and encolpia. Some arrow-heads were fixed in the layer of fire. The termination of ability to live there is to date in wide chronological periods: from the late 12th to the first half 13th century and to connect with military cataclysm. During later time the presented part of Polotsk was occupied periodically and not completely. As a result of comparison with archaeological supervision by A. Solovev and I. Magalinsky the rough area of north-eastern part the suburb of Zapolot'e which had been outlined as 12 hectares.

Паступіў 04.04.2011

Д. У. Дук, *Полацкі дзяржаўны універсітэт, загадчык кафедры айчыннай і усеагульнай гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Наваполацк)*

Экімань у сацыятапаграфічнай структуры Полацка XV–XVIII стст.[1]

Размяшчэнне і гісторыя пасялення. Вёска Экімань Полацкага раёна размешчана на левым беразе Дзвіны насупраць правабярэжнага запалоцкага мікрараёна Полацка. Адлегласць ад Верхняга замка Полацка складае 0,6 км.

Вядома, што ў XVI ст. пасяленне на месцы Экімані мела статус полацкага пасада разам з трыма левабярэжнымі пасадамі: Востраўскім, Крыўцовым і Слабадскім.

Назва «Экімань» паходзіць ад назвы храма Іаакіма і Ганны (згаданага ў полацкай рэвізіі 1552 г.) [12, с. 22, 26]. Аналагічная карціна з паходжаннем назвы Якіманскай (Экіманскай, Акіманскай) вуліцы Пскова ад назвы манастырскага храма [8, с. 51]. У полацкай рэвізіі 1552 г. Экімань згадваецца як пасяленне з развітай тапаграфічнай структурай, уласна пасад. На тэрыторыі пасада ў 1552 г. было размешчана 269 двароў, і Экімань з'яўлялася другім па значнасці пасяленнем у тапаграфічнай структуры горада, саступаючы толькі Вялікаму пасаду (769 двароў).

У дачыненні да Экімані ў сярэдзіне XVI ст. ужываецца адначасова назва «пасад» і «прадмесце», у XVII ст. выкарыстоўваецца назва «мястэчка» і «факторыя». Гэта далёка не выпадкова. Экімань была перададзена Стэфанам Баторыем езуіцкаму калегіуму, з'яўлялася разам з Востравам яго найбуйнейшай юрыдыкай і, паводле земскіх кніг, з канца XVI ст. мела статус полацкага прадмесця, аднак жыхары Экімані ў XVII ст. па-ранейшаму лічыліся мяшчанамі [3, с. 33–38].

Гісторыя археалагічнага вывучэння. Археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Экіманскага пасада практычна не праводзіліся. Гісторыя археалагічных даследаванняў на яго тэрыторыі пачынаецца з 1976 г.

Так, падчас археалагічнай разведкі П. А. Рапапорта ў Экімані на месцы размяшчэння праваслаўнай царквы быў закладзены шурф (памеры не пазначаны) на адлегласці 10 м на паўночны-захад ад брацкай магілы 1944 г. Знойдзены фрагменты цэглы, якія даследчык вызначыў як слабаабпаленую плінфу і на падставе гэтага выказаў меркаванне аб размяшчэнні ў Экімані печаў для абпалу плінфы [14, с. 24–25].

У 1987 г. С. В. Тарасаў праводзіў археалагічны нагляд за катлаванам ў зоне будаўніцтва аўтамабільнага моста праз Дзвіну ў раёне Экімані. Знойдзены кавалкі керамікі, якія можна аднесці не пазней як да XII ст., аднак асноўная колькасць сабранай керамікі датуецца XV–XVIII стст. Кераміка XI–XIII стст. у вялікай колькасці была знойдзена як пад'ёмны матэрыял на ворыўных палях паміж тагачаснай Экіманню і Востравам, на поўдзень ад кургана Бессмяротнасці. Аднак вызначыць магутнасць і характар культурнага пласта Экіманскага пасада ў той час не ўдалося [17, с. 21].

У 1996 г. М. В. Клімавым у Экімані зроблены шурф плошчай 2 м^2 (300 м на захад ад моста праз Дзвіну на першай надпоплаўнай тэрасе). Глыбіня культурнага пласта дасягала 2 м. Знойдзена кераміка XIV–XV стст. [7, с. 9].

У выніку археалагічнага нагляду за пракладаннем у 2000 г. праз Экімань цеплатрасы Д. У. Дукам былі адкрыты мураваныя падмуркі і пахаванні каля іх [4].

На тэрыторыі Экімані на агародзе каля дома № 24 Баравік Неляй Станіславаўнай быў знойдзены крыж-энкалпіён XII ст. (захоўваецца ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку).

У 2002 г. пракладалася траншэя пад водаправод па вул. Набярэжнай. Звесткі пра стратыграфію культурнага пласта захаваліся ў палявым дзённіку А. А. Салаўёва. Так, культурны пласт дасягаў глыбіні 1,2 м (у сярэднім 1 м) і прадстаўляў сабой аднародную зямлю цёмна-шэрага колеру. Практычна на ўсёй працягласці траншэі на глыбіні каля 1 м была выяўлена драўляная маставая з круглых бярвенняў, дыяметрам каля 15–17 см, якая пачыналася ад вул. Садовай і вяла да разгалінавання гэтай вуліцы на вул. Перамогі. Пад'ёмны матэрыял прадстаўлены пераважна фрагментамі керамічных вырабаў XVII–XVIII стст. Відавочна, што ўскрыты насціл вулічнай маставой паўтарае трасіроўку сённяшняй вуліцы, што сведчыць пра пераемнасць у размяшчэнні старажытнай і сучаснай забудовы на тэрыторыі старой часткі Экіманскага пасада.

Такім чынам, надзейных археалагічных даных аб плошчы былога Экіманскага пасада, ні тым больш пра стратыграфію і час утварэння культурнага пласта да сёння практычна не існавала.

Вёска Экімань шчыльна забудавана. Гэтаму спрыяе яе размяшчэнне паміж гарадамі Полацкам і Наваполацкам. Для археалагічных раскопак з дазволу ўладальнікаў намі былі абраны асобныя агароды заселеных сядзіб.

Мэтай археалагічных разведак і раскопак у 2009 г. з'яўлялася высвятленне часу ўзнікнення, плошчы

[1] Работа выканана ў межах рэгіянальнай праграмы «Полацк–2009» (грант Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў).



Мал. 1. Размяшчэнне шурфаў у Экімані і Крыўцовым пасадзе. 2009 г.

і характару культурных напластаванняў Экіманскага пасада. Дзеля гэтага на тэрыторыі сучаснай Экімані Полацкага раёна было зроблена 7 шурфоў і зачышчана сценка гранічнай траншэі пад водаадвод (мал. 1), агульная раскапаная плошча склала 42 м^2.

Шурфоўка ва ўсходняй частцы Экімані. Усходняя частка Экімані прадстаўляе свайго роду мыс, які ўзвышаецца з поўдня над Дзвіной, а з усходу над ровам, які вядзе да Дзвіны. З гэтай кропкі добра праглядаецца Запалоцкі пасад і Верхні замак. Вышыня над узроўнем першай надпоплаўнай тэрасы складае каля 7 м. Крайняя ўсходняя частка гэтага мыса была часткова перакапана падчас будаўніцтва моста праз Дзвіну ў 1990-х гадах і падчас пракладання траншэі цеплатрасы ў 2000 г.

Усяго на ўсходнім мысе Экімані было зроблена чатыры шурфы і зачышчана сценка гранічнай траншэі пад водаадвод. Шурфы 1–3 былі размешчаны на агародзе дома № 7 па вул. Перамогі (мал. 2) з дазволу ўладальніка сядзібы Мікалая Аляксеевіча Папкова.

Адзнакі ўзроўню размяшчэння шурфоў прывадзяцца па балтыйскай шкале.

Шурф 1 мае памер 1 × 2 м, выцягнуты па накірунку поўдзень–поўнач (мал. 3). Шурф разбіраўся на глыбіню 0,8 м. Культурны пласт – цёмна-шэры аднародны супесак, камкаваты, адносна сухі. У структуры пласта трапляліся каменьчыкі дыяметрам да 0,05 м.

У паўднёвай частцы шурфа зафіксаваны падмурак, які размешчаны на глыбіні 0,4 м ад паверхні зямлі. Падмурак зроблены з бутавага каменю на вапнавай рошчыне. У верхняй яго частцы зафіксавана цагліна памерам (31 × 15 × 4,5) см. Цэгла такога памеру, максімальна прыбліжаная да памеру плінфы, знойдзена ў Полацку ўпершыню.

Падмурак мае вышыню каля 0,45 м і арыентаваны па накірунку паўднёвы ўсход–паўночны захад. Шырыня падмурка перавышае 0,6 м (падмурак выходзіць за межы шурфа).

У шурфе зафіксаваны тры пахаванні. Пахаванне 1 размешчана у цэнтральнай частцы шурфа, на адлегласці 0,4 м на поўнач ад падмурка. Захаваліся пераадкладзеныя косткі на глыбіні 0,3 м (скапленне № 2), якія належалі немаўляці (антрапалагічная экспертыза зроблена В. А. Емяльянчык). Скапленне костак № 1 належала дзіцяці ва ўзросце 8 гадоў. Косткі пазваночніка і ног ў анатамічным парадку былі выяўлены на глыбіні 0,4 м, даўжыня захаванай часткі касцяка складае 0,6 м. Пахаванне арыентавана на паўночны захад. Захаваліся рэшткі труны ў выглядзе асобных напаўспарахнелых валокнаў дрэва, разам з якімі знойдзены жалезны цвік.

Пахаванне 2 выяўлена на глыбіні 0,6 м у паўночна-ўсходнім вугле шурфа. Зафіксаваны косткі ног, астатняя частка выходзіла па-за межы шурфа. Размяшчэнне ног ўказвае на аналагічную пахаванню 1



Мал. 2. План размяшчэння шурфаў 1–4 і траншэі 8. Экімань



Мал. 3. Стратыграфія культурных напластаванняў шурфа 1. Экімань

паўночна-заходнюю арыенціроўку касцяка. Каля костак ног зафіксаваны жалезны цвік.

Пахаванне 3 – дзіцяці ва ўзросце 6 месяцаў. Сабраны шкілетныя рэшткі. Акрамя дзіцячых костак у скапленні касцей знойдзены два фрагменты касцей дарослага чалавека, што сведчыць пра часткова пераадкладзены характар пахавання. Пахаванне было размешчана на адлегласці 0,1 м ад падмурка. Косткі чэрапа былі афарбаваны зялёным колерам з-за вокіслу медзі. Галава немаўля судакраналася з тканінай, у якую была ўплецена ніць з каляровага металу (бронзы). Каля скроні было размешчана кальцо дыяметрам 2,3 см, шырынёй 0,5 см, зробленае з бяросты. Рэшткаў труны не зафіксавана, акрамя цвіка даўжынёй 3 см з рэшткамі дрэва (мал. 4).

Пад пахаваннем 1 былі выяўлены косці іншага пахавання, аднак з-за невялікай плошчы шурфа раскопкі вырашана было спыніць на ўзроўні 0,8 м ад паверхні зямлі. Шурф засыпаны.

Археалагічныя знаходкі прадстаўлены кавалкамі керамічных начыняў, сярод якіх зафіксаваны тры венцы, тыповыя для XVI–XVII стст. (мал. 5: *1–3*).

Шурф 2 мае памер 2 × 2 м, разбіты па баках свету. Шурф разбіраўся да мацерыка на глыбіню 0,8 м. Культурны пласт – цёмна-шэрая аднародная супесь, камкаватая, адносна сухая. У структуры пласта трапляліся каменьчыкі дыяметрам да 0,05 м.

Мацярык – жоўты аднародны зярністы пясок. На паверхні мацерыка зафіксаваны спарадычна размешчаныя лінзы круглай формы дыяметрам 0,03 м ад слупкоў агароджы.

Археалагічныя знаходкі з шурфа 2 прадстаўлены фрагментамі керамічнага начыння, якое датуецца XVI–XIX стст. Знойдзены некалькі венцаў, якія датуюцца канцом XV – XVI ст. (мал. 5: *4–7*) і адно венца XIV–XV стст. (мал. 5: *8*).

Шурф 3 мае памер 2 × 2 м, разбіты па баках свету. Шурф разбіраўся да мацерыка на глыбіню 1,0–1,2 м. Магутнасць культурнага пласта складае ў паўднёва-ўсходняй частцы 0,6 м, ў паўночна-заходняй – 1,2 м. Фактычна ў паўднёва-ўсходнім куце

Мал. 4. Скроневае берасцяное кальцо (*1*), жалезны цвік (*2*) і тканіна з бронзавым дротам (*3, 4*). Пахаванне № 3. Шурф 1. Экімань

выяўлена мацерыковая яма, якая выходзіць за межы шурфа і займае тры чацвёртых усёй яго плошчы. Сценкі ямы паката нахіленыя, дно плоскае. Культурны пласт – цёмна-шэры аднародны супесак, камкаваты, адносна сухі, з глыбіні 0,8 м – вельмі вільготны. У структуры пласта трапляліся каменьчыкі дыяметрам да 0,05 м, кавалкі вугалю, цэгла. Мацерыковая яма запоўнена згаданым цёмна-шэрым супескам з вялікай колькасцю цаглянага друзу і вуголля.

Мацярык зафіксаваны ва ўсходняй частцы на глыбіні 1 м, ў заходняй – на глыбіні 1,2 м. У структуры пласта знойдзена больш 20 венцаў гаршкоў XVII–XVIII стст., а у межах мацерыковай ямы – 205 фрагментаў тэракотавай кафлі канца XVIII – першай паловы XIX ст., пераважна карнізнай, а таксама некалькі фрагментаў кафлі XVII ст. Відавочна, што кафля і цэгла, а таксама вугаль у структуры пласта вызначалі яму-сметніцу, у якую трапілі рэшткі разбуранай печы. Пра гэта ж сведчыць адносна вялікая магутнасць культурнага пласта. Найбольш характэрнымі знаходкамі з шурфа з'яўляюцца фрагменты керамічных цацак XVIII–XIX стст., керамічнага посуду. Сярод рэшткаў кафлі XVII ст. асаблівай увагі заслугоўвае фрагмент паліванай пласціны з выявай сімволікі ордэна езуітаў. Гэтая кафля вызначае канфесійную прыналежнасць гаспадара таго дома, у якім пабудавана печ. Розначасовы набор кафлі сведчыць пра тое, што печ неаднаразова рамантавалася і падчас рамонтаў выкарыстоўваліся асобныя пласціны папярэдняга кафлянога набору.

Шурф 4 мае памер 2 × 1 м, доўгім бокам арыентаваны па накірунку поўдзень–поўнач. Разбіты на перасячэнні вул. Перамогі і ўсходняга завулка да гэтай вуліцы. Шурф разбіраўся на глыбіню 0,6 м. Культурны пласт уяўляў сабой цёмна-шэрую, камкаватую зямлю з кавалкамі гліны, камянямі дыяметрам да 0,2 м, цагляным друзам. Сярод цаглянага друзу знойдзена звыш 300 фрагментаў керамічных вырабаў XIX ст. (кавалкі кафлі (мал. 6: *1*), посуд, дзіцячая цацка (мал. 6: *2*), грузік ад сеці (мал. 6: *3*) і інш.). Па сведчанні уладара сядзібы № 24 па вул. Перамогі, на месцы шурфа да Вялікай Айчыннай вайны размяшчаўся дом, дзе спадкаемна на працягу многіх пакаленняў жылі ганчары. На глыбіні 0,6 м капаць было немагчыма па прычыне суцэльнага развалу камянёў вялікіх памераў (да 0,4 м), верагодна, ад падмурка дома.

Таксама была зачышчана паўднёва-ўсходняя сценка гранічнай траншэі каля прысядзібнага ўчастка дома № 15. Даўжыня траншэі склала 10 м, шырыня – 1 м. Глыбіня выбаркі культурнага пласта – 1 м. Мацярык (гліна чырвонага колеру) на глыбіні 0,8 м зафіксаваны толькі ў паўднёва-заходняй частцы траншэі. Выбраць культурны пласт да мацерыка перашкаджалі карані дрэў і грунтавая вада (траншэя пракапана мясцовымі жыхарамі для адводу вады з агародаў).

Пласт аднародны па структуры і прадстаўляе сабой зямлю цёмна-шэрага колеру з кавалкамі вугалю, керамічным друзам, камянямі дыяметрам



Мал. 5. Венцы гаршкоў з шурфа 1 (*1–3*) і шурфа 2 (*4–8*). Экімань



Мал. 6. Кафля (*1*), дзіцячая цацка (*2*) і керамічны грузік ад сеці XVIII ст. (*3*). Шурф 4. Экімань

да 0,1 м. У верхняй частцы да глыбіні 0,4 м зафіксавана шмат бытавога смецця XX ст.

Археалагічныя знаходкі прадстаўлены кавалкамі керамічнага начыння XV–XX стст. (мал. 7), аднак асаблівую цікавасць прадстаўляюць знойдзеныя фрагменты і адна цэлая пласціна каробкавай кафлі. Так, фрагменты каробкавай кафлі датуюцца сярэдзінай – другой паловай XVII ст. (кафля з раслінным арнаментам (мал. 8: *1*) і выявай арла ў геральдычнай паставе (мал. 8: *2*). Знойдзена адна цэлая пласціна з выявай манаграмы у выглядзе дзвюх лацінскіх літар «A» і «S», змешчаных у вянку (мал. 9). Кафля з такой манаграмай знойдзена ўпершыню, манаграма расшыфроўваецца па пачатковых літарах імя ўладальніка печы: Антоній Сялява (з 1624 па 1639 г. – полацкі архіепіскап, з 1641 па 1655 г. – уніяцкі мітрапаліт з захаваннем пасады полацкага архіепіскапа) [6, с. 649].

Шурфоўка ў заходняй і паўднёвай частцы Экімані. Шурф 5 мае памеры 4 × 2 м, доўгім бокам арыентаваны па накірунку ўсход–захад. Размешчаны на агародзе на адлегласці 37 м на поўнач ад дома № 42 па вул. Набярэжнай.

Культурны пласт мае магутнасць 0,4 м. Пласт аднародны па структуры, прадстаўляе сабой зямлю цёмна-шэрага колеру, вельмі вільготную, камкаватую. Перадмацерыковая прапластка 0,05 м – жвір жоўтага колеру з камянямі дыяметрам да 0,1 м. Мацярык – чырвоная аднародная гліна. Паверхня мацерыка роўная.



Мал. 7. Керамічны посуд XV–XVIII стст. (*1, 3–6*) і бронзавы грузік ад сеці (*2*). Траншэя 8. Экімань

У шурфе знойдзены фрагменты непаліванай і паліванай керамікі (гаршкі і міскі) XV–XIX стст. (мал. 11: *1, 2, 5–13*), фрагменты сценавай кафлі XVIII ст. (мал. 11: *14*). Два венцы больш старажытныя (тып V па Г. В. Штыхаву) і датуюцца XIV–XVI стст. (мал. 11: *3, 4*) [18, с. 82].

Шурф 6 мае памеры 4 × 2 м, доўгім бокам арыентаваны па лініі ўсход–захад. Размешчаны на полі на адлегласці 5 м на захад ад плоту дома № 14 па вул. Садовай.

Культурны пласт мае магутнасць 0,4 м. Пласт аднародны па структуры, прадстаўляе з сябе зямлю карычневага колеру, вельмі вільготную, камкаватую. У структуры зямлі зафіксаваны камяні дыяметрам да 0,1 м. Мацярык – чырвоная аднародная гліна. Паверхня мацерыка роўная.

У шурфе знойдзены венцы гаршкоў XVI–XVII стст. (мал. 10: *1–4*), венца паліванага збана XVII ст. (мал. 10: *5*) і кавалак карнізнай кафлі XVII ст. (мал. 10: *6*).

Шурф 7 мае памеры 4 × 1 м, доўгім бокам арыентаваны па накірунку ўсход–захад. Размешчаны на агародзе на адлегласці 17 м на поўнач ад лазні сядзібы № 36.

Культурны пласт мае магутнасць 0,4 м. Пласт аднародны па структуры, прадстаўляе сабой суглінак карычневага колеру, вельмі вільготны, камкаваты. У структуры зямлі зафіксаваны камяні дыяметрам да 0,1 м. Мацярык – чырвоная аднародная гліна. Паверхня мацерыка роўная.

У шурфе знойдзены венца гаршка XVI ст. і донца паліванага начыння XVII ст. (мал. 10: *7, 8*).

Акрамя шурфоўкі было праведзена візуальнае даследаванне тэрыторыі ворыўных палей вакол Экімані і збор пад'ёмнага матэрыялу на агародах. Было высветлена, што па-за межамі вул. Садовай



Мал. 8. Сценавая кафля (*1, 2*). Сярэдзіна XVII ст. Траншэя 8. Экімань

(заходняй ускраіны вёскі) на месцы размяшчэння яблыневага саду культурны пласт адсутнічае (шурф 6 маркіруе яго заходнія межы). На першай надпоплаўнай тэрасе знойдзены пераважна посуд XIX ст., менавіта сюды па сведчанні мясцовых жыхароў скідвалася керамічнае смецце ад ганчарных майстэрняў таго ж часу (шурф № 4). Шурф № 7, у якім практычна не было археалагічных знаходак, вызначае паўднёвую мяжу распаўсюджвання культурнага пласта. Асноўная колькасць артэфактаў была знойдзена ў раёне вул. Перамогі і Набярэжнай.

Сярэдняя магутнасць культурнага пласта на тэрыторыі былога Экіманскага пасада роўная 0,4–0,6 м. Максімальная глыбіня культурнага пласта 1,2 м і больш зафіксавана ва ўсходняй частцы Экімані, у раёне перакрыжавання вул. Перамогі і Набярэжнай. Пры гэтым вул. Набярэжная захавала свой напрамак з часоў уладкавання на ёй драўлянага насцілу, верагодна, у межах XVII–XVIII стст., тое ж магчыма

Мал. 9. Кафля з выявай манаграмы Антонія Сялявы. Сярэдзіна XVII ст. Траншэя 8. Экімань



Мал. 10. Керамічныя вырабы XV–XVIII стст. (*1–14*). Шурф 5. Экімань

сказаць і пра размяшчэнне драўляных дамоў, якія традыцыйна, прынамсі на працягу XX ст., будавалі непасрэдна ўздоўж згаданых вуліц.

Культурны пласт XVI–XVIII стст. аднародны, без стратыграфічных разрываў, што сведчыць пра адносна невялікую інтэнсіўнасць жыцця і будаўнічай дзейнасці ў параўнанні з сінхроннымі па часе напластаваннямі правабярэжных пасадаў Полацка. Найбольш раннія артэфакты з Экімані (керамічны посуд, цэгла) сведчаць пра пачатак засялення яе тэрыторыі ў межах XV ст.

Такім чынам, межы старажытнага Экіманскага пасада абмежаваны сядзібамі, размешчанымі на сучасных вул. Перамогі, Набярэжнай і Садовай. Тэрыторыя распаўсюджвання культурнага пласта ахоплівае каля 7 га.

Археалагічныя знаходкі. Знойдзеная ў шурфе 1 цагліна памерам (31 × 15 × 4,5) см, максімальна прыбліжаная да памеру плінфы, папярэдне можа датавацца XVI ст. і з'яўляецца самай ранняй з выяўленых у Полацку. Раней у Запалоцці была даследавана печ, зробленая з цэглы і гаршковай кафлі, якая датуецца XV ст. Цэгла з гэтай печы мае памер, блізкі да знойдзенага ў Экімані: шырыня да 20 см, таўшчыня ад 3 да 4 см [2]. Па ўсёй верагоднасці кавалкі падобнай цэглы П. А. Рапапорт пры-



Мал. 11. Керамічныя вырабы XV–XVIII стст.: *1–6* – шурф 6; *7, 8* – шурф 7. Экімань

няў за плінфу падчас пошукаў падмуркаў царквы св. Георгія.

Найбольш раннія керамічныя гаршкі, выяўленыя падчас археалагічных даследаванняў, належаць да тыпу V паводле Г. В. Штыхава і датаваны XIV–XVI стст. (мал. 11: *3, 4*) [18, с. 82]. Большасць венцаў гаршкоў датаваны ў межах канца XV – XVII ст. і належаць да груп 1 і 2 [3, с. 103–104].

Таксама знойдзены сталовы посуд: талеркі (мал. 11: *5*) і паўміскі (мал. 7: *6*) XVII ст., паліваны посуд XVII–XIX стст. (мал. 11: *11, 12*).

Кафля з выявай манаграмы полацкага архіепіскапа і ўніяцкага мітрапаліта Антонія Сялявы знойдзена ў адзінкавым экзэмпляры і прадстаўляе вялікую цікавасць. Кафля мае памер 17 × 17 см, пакрыта зялёнай палівай са слядамі пазнейшай вапнавай тынкоўкі. Выява перададзена невысокім рэльефам (мал. 9).

Выява манаграмы – лацінскія літары «A» і «S» – змешчана ў полі вянка. Рамка зялёнапаліванай кафлі з адным уступам, што сведчыць пра час яе вырабу ў межах другой чвэрці–сярэдзіны XVII ст. (вядома, што Антоній Сялява памёр у 1655 г.). Разам з гэтай кафляй была знойдзена выраблена ў межах трэцяй чвэрці XVII ст. рамачная кафля з выявай арла ў геральдычнай пастаце (сімвал велічы дзяржавы) і кафля з выявай гронак вінаграду (мал. 8). Рэзідэнцыя полацкага архіепіскапа размяшчалася на Верхнім

замку, таму, магчыма, што кафля з выявай манаграмы належала прызначанаму Сялявай у 1646 г. настаяцелю храма св. Георгія Васілію Нікіфаровічу, пра што гаворка пойдзе ніжэй.

Прадукцыю полацкіх ганчароў XVIII–XIX стст. магчыма вызначыць па артэфактах з шурфа № 4 (кафля, керамічныя грузік ад сеці і дзіцячая цацка) (мал. 6).

Прыкладам пахавальнага адзення дзяўчынкі-немаўля з пахавання 3 шурфа 1 з'яўляюцца рэшткі тканіны (галаўнога ўбору?), у якую была ўплецена ніць з каляровага металу (бронзы) (мал. 4: *3, 4*). Кальцо дыяметрам 2,3 см, шырынёй 0,5 см, зробленае з бяросты, сведчыць пра апрананне дзяўчынкі ва ўбор маладой (мал. 4: *1*). Рэшткаў труны не зафіксавана, акрамя цвіка даўжынёй 3 см з кавалкамі дрэва (мал. 4: *2*).

Такім чынам, самыя раннія адзінкавыя фрагменты венцаў гаршкоў, знойдзеныя падчас шурфоўкі і збору пад'ёмнага матэрыялу ў Экімані, датуюцца XIV–XVI стст. Найбольш верагодная ніжняя дата знойдзеных венцаў гаршкоў па сукупнасці артэфактаў – XV ст. Асноўная група артэфактаў мае датаванне ў межах XVI–XVIII стст.

Выключэннем з'яўляецца крыж-энкалпіён XII ст. (згаданая выпадковая знаходка Н. С. Баравік) (мал. 12). Аднак размяшчэнне побач з месцам знаходкі царквы св. Георгія сведчыць, што крыж належаў сям'і святара і перадаваўся па спадчыне на працягу многіх стагоддзяў, пакуль не быў згублены.

Месца Экімані ў сацыятапаграфічнай структуры Полацка. Такім чынам, у выніку археалагічных даследаванняў у 2009 г. былі вызначаны час утварэння культурнага пласта на тэрыторыі былога Экіманскага пасада (другая палова XV – XIX ст.) і тэрыторыя яго залягання (7 га). Асобныя катэгорыі выяўленых археалагічных аб'ектаў (пахаванні, падмуркі, нерухомыя артэфакты) дазваляюць высветліць сацыятапаграфічную структуру пасада. Атрыманыя падчас раскопак даныя стала магчыма супаставіць з пісьмовымі крыніцамі па гісторыі Экіманскага пасада.

У полацкай рэвізіі 1552 г. Экімань згадваецца як пасяленне з развітай тапаграфічнай структурай, уласна пасад. Такім чынам, з моманту заснавання пасялення (пра гэта ўпэўнена сведчаць даныя археалогіі) да сярэдзіны XVI ст. прайшло не больш за 50–80 гадоў. Гэта значыць, што засяленне дадзенай тэрыторыі магло адбыцца не іначай як цэнтралізавана і, відаць, працэс перасялення быў добра арганізаваны.

Што заставіла людзей перасяліцца ў Экімань? Адказ знаходзім у пісьмовых крыніцах. У маі і жніўні 1518 г. маскоўскія войскі ў чарговы раз спалілі Вялікі і Запалоцкі пасады і паркан [15, с. 192–196] (дагэтуль пасад выпальваўся ў 1508 і 1513 г.). Пасля

Мал. 12. Крыж-энкалпіён XII ст. Экімань

гэтых падзей насельніцтва пасадаў, якое было пад уладай баяр і духавенства, вымушана было *пакінуць свае дворышчы ў горадзе і разысціся*. Месцы, куды яны разышліся, у крыніцах не пазначаны, аднак ёсць усе падставы сцвярджаць, што іх шлях быў накіраваны на левабярэжжа Дзвіны, а мяжа рассялення ахоплівала Экіманскі і Крыўцоў пасады (па-за межамі мястэчка Слабады і Вострава). Юрыдычная залежнасць гэтых людзей ад баярства адлюстравана ў тапонімах Экімані – Баяршчызна, вул. Баярская. Пазней, з канца XVI ст., насельніцтва Экімані заставалася пад юрыдыкай езуіцкага калегіума. Выгоднае размяшчэнне Экіманскага пасада на левым беразе Дзвіны на значным аддаленні ад Верхняга замка (асноўнай мэты частых захопніцкіх паходаў на Полацк у XVI–XVII стст.) рабіла пасад вельмі прыцягальным для жыцця.

Пачатак гэтага перасялення таксама магчыма вызначыць дастаткова ўпэўнена. У прывілеі Полацку на магдэбургскае права 7 кастрычніка 1498 г. Аляксандра Ягелончыка вызначаны катэгорыі баярскіх, мяшчанскіх і «папоўскіх» людзей, якія «живут(ь) за Двиною, так и тые, *которые з другое стороны*

реки Двины и на острове мешкают(ь)» (тут і далей вылучана аўтарам. – *Д. Д.*). У тэксце другога прывілея на магдэбургскае права Жыгімонта Старога 27 жніўня 1509 г. (датуецца паводле Г. Л. Харашкевіч) называюцца «вси мещане, и чорные люди, и всякие закладни, так тые, которые мешкають в замъку, и около замъку, *так теж и тые за Двиною* и на всяких местъцох в мести нашом Полоцъком, за вл(а)д(ы)кою, и за игуменью, и за кн(я)зи и за бояры, и за игумены и за попы, на всих местцох ц(е)рк(о)в(н)ых и кн(я)зьских и бояръских» [13, с. 57]. Такім чынам, у 1498 і 1509 г. згадваюцца людзі, якія былі падначалены баярам і духавенству, і пражывалі на тэрыторыі левабярэжнай часткі Полацка. У 1552 г. залежныя ад Васілея Карценя трыццаць мяшчан, якія «з местом тягнуть», складаюць усё насельніцтва Крыўцовага пасада [12, с. 148].

Паводле рэвізіі 1552 г. на ўласных землях у Экімані жылі толькі два мешчаніны, на мяшчанскай зямлі – адзін, на шляхецкіх – чатырнаццаць, астатнія сяліліся на царкоўных землях [12, с. 26].

У 1650-я гады меў разгалінаваную вулічную сетку. Тут размяшчаліся вул. Баярская, Віленская, Езеньская, а таксама мясцовасць Баяршчына з вул. Вялікай [10]. Да таго ж Экіманскі пасад меў уласны рынак. Назва вул. Віленскай сведчыць пра наяўнасць аднайменнай дарогі па-за межамі пасада. Пра аналагічную дарогу паведамляецца ў апісанні пахода Івана IV на Полацк 1563 г. «за Двиною же рекою на Виленскои дороге… против Якиманские слободы» [9, с. 306].

У 1774 г. на езуіцкім фальварку Экімані разам з Востравам быў размешчаны 121 дом (на 726 чалавек), мястэчка цягнулася ўздоўж Дзвіны на дзве мілі, а ўшырыню на адну мілю «а месцамі болей ці меней… ляжыць тое мястэчка ад слабады Бельчыцкай у ¼ мілі». У Экімані было чатыры карчмы: Пятніцкая, Хоцевічская і Палюдавічская [20, с. 2–3, 24–25], а чацвёртая карчма была прыватная, альбо вольная [16, с. 55].

Паводле даных пісьмовых крыніц XVII–XVIII стст. вядома, што на тэрыторыі Экіманскага пасада размяшчаліся касцёл і царква. Так, у 1646 г. мітрапаліт Антоній Сялява прызначыў настаяцелем царквы св. Георгія *за горадам* Васілія Нікіфаровіча [1, с. 208–209]. Паводле «Люстрацыі 1774 г.» Экімань з'яўлялася полацкім мястэчкам (такі ж статус меў і Востраў), але разглядаецца разам з дзевяццю фальваркамі полацкіх езуітаў [20, с. 2]. Экіманскія мяшчане былі прыпісаны да езуіцкага калегіума. На тэрыторыі Экіманскага пасада размяшчаўся «драўляны касцёл без рэзідэнцыі для ксяндза», была і прыходская царква з вялікім заезджым домам. Гэты дом меў «пакой» і мураваныя скляпы, каля дома размяшчаліся «спустошаныя» стадолы з прычыны ўтрымання ў іх расійскага лазарэта. Адзначаецца, што Экімань «пры абразцовым расійскага салдата абыходжанні прыйшло да цалкам мізэрнага стану» і ў параўнанні з іншымі фальваркамі была не самай густанаселенай і прыбытковай [20, с. 3].

У пісьмовых крыніцах не пазначаецца назва касцёла і цэркваў XVII–XVIII стст. Сучасныя насельнікі Экімані не памятаюць назвы царквы, якая была напаўразбурана падчас баявых дзеянняў 1944 г. і канчаткова знішчана пасля вайны. У «Даведцы аддзела аховы помнікаў архітэктуры ўпраўлення па справах архітэктуры пры СНК БССР аб разбурэнні і рабаванні гітлераўскімі акупантамі гістарычных помнікаў архітэктуры на тэрыторыі Беларусі ў 1941–44 гг.» экіманскі храм згадваецца як «выстроенный в 1737 г. и являющийся древнейшим деревянным сооружением города» [11, с. 488]. П. А. Рапапорт у справаздачы аб археалагічных даследаваннях згадвае Георгіеўскую царкву, каля якой ён іх і праводзіў [14, с. 24].

З тэксту копіі інвентару Экіманскай праваслаўнай царквы, зробленай Вікенціем Мяніцкім у пачатку XX ст., вынікае, што царква ў мястэчку Экіманія мела назву ў гонар св. Георгія. У 1853 г. гэтая царква была перабудавана[1] з каталіцкага касцёла, узведзенага ў 1736 г. [19, арк. 114]. Гэты касцёл, відаць, быў пабудаваны на месцы аднайменнай уніяцкай царквы, згаданай ў дакуменце 1646 г. і, магчыма, разбуранага падчас вайны 1654–1667 гг.

Царква ўяўляла сабой крыжова-купальны драўляны храм на каменным падмурку з адным купалам і званіцай. Пабудавана ў візантыйскім стылі, дах крыты гонтай [19, арк. 114]. У царкве над царскімі варотамі знаходзіўся абраз Казанскай Божай Маці, які шанаваўся мясцовымі жыхарамі як цудадзейны. Абраз утрымліваў надпіс «Образъ Казанскія Божія Матери, 1637 года, октября 29 дня». У царкве размяшчаліся на правай сцяне абраз св. Георгія, на левай – св. Мікалая, абодва зробленыя «ў вялікіх памерах, са срэбранымі шатамі, старажытнага малявання» [19, арк. 114].

У копіі інвентару Мяніцкага згадваецца таксама старажытная уніяцкая царква св. Мікалая, якая знаходзілася непадалёк ад царквы св. Георгія і была зруйнавана ў сярэдзіне XIX ст. Царква мела 4 званы: два вялікія, адлітыя ў 1776 і 1881 г., два малыя, недатаваныя. Яны былі без надпісаў. Звон, які адліты ў 1776 г., утрымліваў два надпісы: «Me fecit Johann August hetzel anno 1766 in Riga» і «Roku 1766 ten dzwon odlowani z bractwa do cerkwi Ekimanskiey Swientego Mikolaia» [19, арк. 114]. Гэты звон відавочна паходзіў з былой уніяцкай царквы св. Мікалая і быў адліты за кошт экіманскага мікалаеўскага брацтва.

Да парафіі мікалаеўскай царквы належалі шматлікія прыходы, частка якіх у 1778 г. была аддадзена

[1] Перабудова адбылася за кошт купца Кудрашова з г. Санкт-Пецярбургу.

полацкай Барысаглебскай (у тэксце інвентару памылкова вызначана «Багаяўленскай») царкве на Кабаку [19, арк. 114, 114адв.].

Такім чынам, магчыма вызначыць, што выяўленыя падчас археалагічнага вывучэння 2000 і 2009 г. падмуркі і цвінтар належалі драўлянай уніяцкай царкве св. Мікалая, якая была разбурана ў сярэдзіне XIX ст. Час яе будаўніцтва застаецца не высветленым, аднак магчыма меркаваць, што яно адбылося пасля Інфлянцкай вайны, магчыма, на падмурку царквы св. Іаакіма і Ганны (аб гэтай царкве існуе толькі адна згадка ў полацкай рэвізіі 1552 г.). Уніяцкая царква св. Георгія, згаданая ў пісьмовых крыніцах сярэдзіны XVII ст., у 1736 г. перабудаваная ў касцёл, а ў 1863 г. – ў праваслаўную царкву, праіснавала да 1944 г.

Рэшткі пахаванняў, ускрытых непасрэдна каля падмуркаў былой Мікалаеўскай царквы, уладкаваны аналагічна могілкам на полацкім гарадзішчы і належалі каталіцкаму (ці уніяцкаму?) насельніцтву XVII–XVIII стст. (арыенціроўка касцякоў галавой на паўночны захад, наяўнасць розначасовых пахаванняў у межах адной магілы). Полацкі краязнавец І. П. Дэйніс сведчыць пра існаванне на экіманскім цвінтары «нізкіх каменных крыжоў», ад якіх сёння захаваўся толькі малюнак [5, с. 11].

Кафля з выявай манаграмы полацкага архіепіскапа і уніяцкага мітрапаліта Антонія Сялявы, знойдзеная каля разбуранай у 1944 г. царквы ў адзінкавым экзэмпляры, прадстаўляе вялікую цікавасць. Рэзідэнцыя полацкага архіепіскапа размяшчалася на Верхнім замку, таму кафля з выявай манаграмы належала прызначанаму Сялявай у 1646 г. настаяцелю храма св. Георгія Васілію Нікіфаровічу.

Такім чынам, Экіманскі пасад пачаў фарміравацца напрыканцы XV ст. за кошт перасяленцаў з Вялікага і Запалоцкага пасадаў Полацка. Гэта пацвярджаюць археалагічныя даныя і звесткі пісьмовых крыніц. З канца XVI ст. Экімань з'яўляецца найбуйнейшай юрыдыкай езуітаў, згаданай у люстрацыі 1774 г. як фальварак. Экіманскі пасад меў разгалінаваную вулічную сетку, уласны рынак, элементы гарадской інфраструктуры і адыгрываў важную ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці Полацка XVI–XVIII стст.

Літаратура

1. Витебская старина / сост. А. Сапунов, 1888. – Т. V: Витебск. – 670 с. + 40 л. ил.

2. Дук, Д. У. Археалагічная разведка на Запалоцкім пасадзе Полацка ў 2003 г. / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – № 11. – 2006. – С. 104–113.

3. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.: іл.

4. Дук, Д. У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у Полацку ў 2000 г. / Д. У. Дук, С. В. Тарасаў // Архіў Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 1880.

5. Дэйніс, І. П. Полацкая даўніна / І. П. Дэйніс; уклад., прад. і камент. М. Баўтовіча; пер. з руск. мовы М. Ермалаева. – Мінск: Медисонт, 2007. – 330 с.

6. Казуля, С. Сялява Антоній / С. Казуля // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2006. – Т. 2: Кадэцкі корпус–Яцкевіч / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; мастак З. Э. Герасімовіч.– С. 649.

7. Клімаў, М. В. Справаздача за 1996 г. аб археалагічных даследаваннях у г. Полацку і Полацкім раёне / М. В. Клімаў // Архіў Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 1622.

8. Колосова, И. О. Улицы Полонища: XV–XVIII вв. / И. О. Колосова // Археология и история Пскова и Псковской земли: материалы 50-го научного семинара: сб. статей / под ред. В. В. Седова. – Псков, 2004. – С. 39–60.

9. Лебедевская летопись / отв. ред. М. Н. Тихомиров // Полное собрание русских летописей. – М.: Наука, 1965. – Т. 29. – С. 224–314.

10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1823. – Воп. 1. – Спр. 1.

11. Памяць: гіст.-дак. хроніка Полацка / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2002. – 912 с.: іл.

12. Полоцкая ревизия 1552 г. К изданию подготовил И. И. Лаппо. – М.: Университетская типография, Страстной бульвар, 1905. – 237 с.

13. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в.: в 6 вып. / Акад. наук СССР. Ин-т истории СССР. – М., 1977–1989. – Вып. 3 / сост. А. Л. Хорошкевич. – 1980. – 214 с.

14. Раппопорт, П. А. Отчет об археологических раскопках 1976 г. / П. А. Раппопорт // Архіў Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 527.

15. Справы полацкага гродзскага суда 1533–1539 гг. // Беларускі архіў. – Мінск, 1928. – Т. 2. – 344 с.

16. Сяргеенка, Н. А. Люстрацыя паезуіцкіх маёнткаў 1774 года – каштоўная малавядомая крыніца па гісторыі Полаччыны другой паловы XVIII ст. / Н. А. Сяргеенка // Матэрыялы навук.-практ. канф. (па выніках навукова-даследчай работы ў 2002 г.). – Полацк: НПГКМЗ, 2003. – С. 50–59.

17. Тарасов, С. В. Отчет о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 г. / С. В. Тарасов // Архіў Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 1014.

18. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Мінск: Наука и техника, 1975. – 136 с.: ил.

19. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – Ф. 599. – Воп. 1. – Спр. 3.

20. Lustrator Połocki z Dobr Ex – Iezuickich, ad Archivum J. O. Xcia, Jmci. Radziwiłła, Mar. Gener. Konf.: WXL. C. D., рукапіс, 1774 г. // Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. – Кніга паступленняў-17, № 20222.

Резюме

Д. В. Дук

Экимань в социотопографической структуре Полоцка XV–XVIII вв.

Статья посвящена историко-археологическому исследованию бывшего полоцкого посада и юридики полоцких иезуитов – Экимани. Территория левобережных Экиманского и Кривцового посадов Полоцка является наименее изученной в археологическом плане. Хронологические рамки исследования охватывают XV–XVIII в. Впервые представлены итоги археологического изучения на территории Экимани. Сделан аргументированный вывод о времени (конец XV в.) и причинах заселения Экимани (переселение зависимого от бояр населения Великого и Заполоцкого посада вследствие частых войн и разрушений основной территории посада возле Верхнего Замка). На основании данных археологических и письменных источников представлены новые данные о социотопографической структуре посада, размещении памятников культового зодчества.

Summary

D. Duk

Eciman as a part of social and topography structure of Polotsk in the 15th–18th centuries

Article is devoted to historical and archaeological studying the former suburb of Polotsk and ownership of Polotsk Jesuits – Eciman. The territories of such left-bank suburbs of Polotsk as Eciman and Krivtsov are the least archeologically investigated. Chronological frameworks of research cover the 15th–18th centuries. For the first time results of archaeological studying on the territory of Eciman are presented. It is drawn the given reason conclusion on time (late 15th century) and the reasons of settling of Eciman (resettlement of the dependent population of the suburbs of Great Zapolot'e owing to frequent wars and destructions the main territories near the Upper Custle). On the basis of the given archaeological and written sources new data are presented as about social and topography structure of suburbs as accommodation of monuments of religious architecture.

Пастуніў 24.02.2011

І. У. Магалінскі, *Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, старшы навуковы супрацоўнік навукова-рэстаўрацыйнага аддзела (г. Полацк)*

Вытворчыя ювелірныя комплексы старажытнага Полацка (X–XVII стст.)

Уводзіны. Шматгадовыя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Полацка далі багаты матэрыял для рэканструкцыі розных бакоў матэрыяльнай культуры палачан. У межах старажытнага горада былі выяўлены рэшткі развітой ювелірнай вытворчасці. Высокая канцэнтрацыя артэфактаў, звязаных з дадзеным відам рамеснай дзейнасці, дазваляе аднесіць Полацк да ліку буйнейшых ювелірных цэнтраў беларускіх зямель эпохі Сярэдневякоўя.

У кантэксце вывучэння гісторыі старажытнага ювелірнага рамяства асаблівае значенне мае аналіз вытворчых ювелірных комплексаў, якія былі знойдзены у межах горада і адлюстроўваюць асноўныя заканамернасці развіцця дадзенага накірунку рамеснай дзейнасці. За перыяд археалагічнага вывучэння Полацка на яго тэрыторыі было знойдзена пяць такіх комплексаў. Матэрыялы, атрыманыя падчас іх вывучэння, дазваляюць рэканструяваць асноўныя этапы вытворчасці вырабаў з каляровых металаў, выявіць адметныя рысы старажытнага полацкага рамяства, прасачыць дынаміку змянення асартыменту ювелірных вырабаў.

Пад тэрмінам «вытворчы комплекс» мы разумеем сукупнасць адначасовых храналагічных і тэрытарыяльна блізка размешчаных пабудоў, а таксама прастору, што іх акружае, характар знаходак на якой указвае на існаванне на дадзеным участку вытворчай дзейнасці [11]. У гэтым сэнсе аб'ём паняцця «вытворчы комплекс» роўны аб'ёму тэрміна «майстэрня». Такім чынам, гэтыя два паняцці будзем выкарыстоўваць у якасці сінонімаў.

Пытанні вылучэння крытэрыяў вытворчых ювелірных комплексаў не раз узнімаліся ў спецыяльнай літаратуры [4, с. 25; 9; 10; 12, с. 377; 13; 14; 16, с. 448; 17, с. 213]. У сувязі з гэтым абмяжуемся простым пералічэннем асноўных маркёраў ювелірных майстэрняў, якія дазваляюць надзейна атаясамліваць той ці іншы комплекс пабудоў з падобным вытворчым аб'ектам. Да ліку найбольш важных характарыстык ювелірных майстэрняў варта аднесці наступныя: 1) спецыяльны набор інструментаў (ліцейныя формы, тыглі, льячкі, металічны інструментарый); 2) гатовыя рэчы і адыходы вытворчасці; 3) сыравіна для вырабу прадметаў з каляровых металаў.

Сярэдневяковыя ювелірныя майстэрні былі выяўлены ў многіх беларускіх гарадах. Іх аб'ядноўвае прысутнасць у межах адной сядзібы комплексу артэфактаў, якія ўказваюць на характар заняткаў яе жыхароў. Так, у Віцебску былі выяўлены сляды існавання дзвюх ювелірных майстэрняў, якія функцыянавалі на тэрыторыі горада ў XIII ст. У іх знойдзены фрагменты тыгляў з нацёкамі каляровага металу, ювелірныя упрыгажэнні, бракаваныя вырабы [3, с. 122].

Відавочна, што наяўнасць усяго набору характэрных прыкмет у межах аднаго комплексу пабудоў фіксуецца дастаткова рэдка. У сувязі з гэтым на існаванне ювелірнай майстэрні можа ўказваць камбінацыя толькі некаторых найбольш значных прыкмет (напрыклад, выяўленне на тэрыторыі адной сядзібы ліцейных форм і адыходаў вытворчасці, ці тыгляў і металічных інструментаў – пінцэта, ювелірных абцугоў і інш.).

У матэрыялах археалагічных раскопак Полацка дастаткова часта сустракаюцца сляды вытворчасці вырабаў з каляровых металаў (тыглі, сыравіна, металічны рамесны інструментарый, адходы вытворчасці). Між тым лакалізацыя асобных майстэрняў на аснове некалькіх знаходак, не звязаных з канкрэтнымі комплексамі пабудоў, да якіх яны адносяцца, не зусім апраўдана [7, мал. 59]. У сувязі з гэтым у дадзеным артыкуле прыводзіцца характарыстыка толькі сядзібных комплексаў, у межах якіх быў выяўлены неабходны набор артэфактаў, які ўказвае на існаванне на дадзеным участку вытворчай дзейнасці па вырабу прадметаў з каляровых металаў.

Асноўная частка. На падставе матэрыялаў археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Полацка ў межах горада можна лакалізаваць не менш пяці вытворчых ювелірных комплексаў (табліца).

У 1961–1962 гг. у Полацку на тэрыторыі Верхняга замка праводзіліся археалагічныя даследаванні пад кіраўніцтвам В. Р. Тарасенкі і Г. В. Штыхава. Раскоп III (агульная плошча 320 м^2), які быў прывязаны да раскопа II (1959–1960 гг.), размяшчаўся ва ўсходняй частцы Верхняга замка ў двары Полацкай міжраённай бальніцы [20, с. 1; 21, с. 1]. Усяго ў межах так званага усходняга раскопу (агульная назва раскопу II і раскопу III) было выяўлена XIV будаўнічых гарызонтаў, якія адлюстроўвалі асноўныя заканамернасці развіцця полацкага драўлянага будаўніцтва ў сярэдневяковы перыяд [26, с. 37].

У кантэксце нашага даследавання асаблівую цікавасць выклікаюць пабудовы VI і IX будаўнічых гарызонтаў, у межах якіх ўяўляецца магчымым лакалізаваць асобныя вытворчыя ювелірныя комплексы.

Характарыстыка вытворчых ювелірных комплексаў з тэрыторыі Полацка X–XVII ст.

№	Месца, час выяўлення	Дата	Інструменты вытворчасці		Сыравіна, нарыхтоўкі і адходы вытворчасці	Гатовыя вырабы
			для ліцейнай справы	для механічнай апрацоўкі		
1.	Верхні замак, 1961–1962 гг.	II палова XIII ст.	2 ліцейныя формы, тыглі для плаўкі каляровых металаў	–	Злітак свінца, 2 асобныя кавалкі свінца, медны выраб	Фрагмент пярсцёнка
2.	Верхні замак, 1961–1962 гг.	Сярэдзіна XIII ст.	Фрагмент ліцейнай формы, тыглі для плаўкі каляровых металаў	–	2 фрагменты дроту, нарыхтоўка з латуні, бронзавая пласцінка, літы бронзавы выраб, нарыхтоўка наверша свінцовай булавы	Віты бранзалет з петлепадобнымі канцамі, трайны металічны бранзалет, бронзавы пярсцёнак, круглая медная бляшка
3.	Вялікі пасад, 1987–1988 гг.	XII–XIII стст.	2 ліцейныя формы, тыглі, соплы горна	Пінцэт, ювелірныя вагі, гіркі-разнавагі	Металічны шлак, дрот, зліткі свінца, нарыхтоўка грыўні і інш.	Ліравідныя спражкі (4 экз.), падковападобныя фібулы, шматпацеркавае скроневае кальцо, бранзалеты, зашпількі і інш.
4.	Ніжні замак, 1989–1990 гг.	X–XI стст.	Больш за 80 фрагментаў тыгляў	2 пінцэты, кавадлачка, фрагмент ювелірных вагаў, гіркі-разнавагі	–	Крыж-цельнік з грубай выявай Ісуса, спражкі, падковападобныя фібулы і інш.
5.	Вялікі пасад, 2005 г.	I палова XVII ст.	Больш за 50 фрагментаў плавільных тыгляў	Ювелірны малаточак-цвікадзёр	Металічны дрот, нарыхтоўкі «пус епі» (20 экз.), бронзавы злітак і інш.	Пус епі (32 цэлых экз.), 5 кручкоў ад кафтана, 10 іголак, 2 мініяцюрныя іголачкі, таварная пломба і інш.

Пабудовы VI будаўнічага гарызонту загінулі ў моцным пажары. Аснову планіроўкі гарызонту складала вуліца, ці скрыжаванне дарог. Менавіта гэтаму гарызонту адпавядае верхні насціл маставой. У яго межах асаблівую цікавасць выклікае пабудова 6К (№ 6 паводле палявой дакументацыі) і спадарожныя ёй канструкцыі 6Л і 6М. Сукупнасць матэрыялаў, выяўленых падчас іх расчысткі, дае падставы для атрыбуцыі сядзібы ў якасці вытворчага ювелірнага комплексу.

Пабудова 6К (4 × 4 м) з'яўлялася жылой і паўночным фасадам выходзіла на вуліцу. Увесь комплекс ўяўляў сабой трохчленную структуру, выцягнутую ўздоўж восі поўнач–поўдзень. Непасрэдна на вуліцу выходзіла амаль квадратнае ў плане жылое памяшканне, ад якога захаваўся толькі вянок зруба, які размешчаны на чурбанах (с усходняга боку іх сем). Пасярэдзіне зруба ў напрамку поўнач–поўдзень памяшканне падзелена лагай з рэшткамі падлогі на ёй. У вуглу пабудовы знойдзены дзве каменныя ліцейныя формы.

З паўднёвага боку ад гэтай канструкцыі захаваўся насціл з абгарэўшых круглых бярвенняў (сені). Бярвенні былі пакладзены на лагі, якія ляжалі на зямлі. На захад ад канструкцыі знаходзіліся рэшткі невялікага насцілу (рэшткі ганка).

Да сеняў з поўдня прымыкала клець. Захаванасць яе рэшткаў дрэнная. Пабудова рублена «ў абло», захавалася частка насціла падлогі. У межах дадзенай канструкцыі знойдзены злітак свінца. Каля заходняй сцяны жылога дома выяўлены рэшткі варот (шырыня – 1,7 м). Ушчыльную да ўсходняй сцяны праходзіў востракол, які аддзяляў комплекс ад суседняй сядзібы. Парубачная дата аднаго са слупоў варот – 1276 г. На думку Г. В. Штыхава, гэтыя пабудовы ўяўляюць сабой узаемазвязаны комплекс хата–сені–клець [26, с. 41].

Вялікую цікавасць выклікае набор артэфактаў, выяўленых на тэрыторыі сядзібнага комплексу. Акрамя ўжо адзначаных вышэй дзвюх ліцейных форм (пабудова 6К) і злітка свінца (пабудова 6М) у межах гэтага комплексу былі выяўлены яшчэ два кавалкі свінца, два тыглі для плаўкі каляровых металаў, медны выраб і фрагмент пярсцёнка [21, с. 9]. Такі набор знаходак дазваляе з упэўненасцю суадносіць дадзеную сукупнасць пабудоў з вытворчым ювелірным комплексам, які існаваў на месцы раскопу ў другой палове XIII ст.

Майстр-ювелір спецыялізаваўся на адліўке ювелірных упрыгажэнняў з каляровых металаў у каменных ліцейных формах. Відавочна, што пасля вялікага пажару, які вынішчыў пабудовы ўсяго гарызонту, рэшткі згарэўшага комплексу не расчышчаліся, што дазволіла ў культурным слоі выявіць матэрыялы, якія ўказвалі на характар заняткаў жыхароў дадзенай сядзібы.

Вялікае значэнне для аналізу вытворчасці вырабаў з каляровых металаў мае выяўленне ў межах «усходняга раскопу» яшчэ адной ювелірнай майстэрні, з якой можна суаднесці пабудову 7М (№ 14 паводле палявой дакументацыі), якая пачала функцыянаваць у IX будаўнічым гарызонце, а загінула ў пажары ў межах VII гарызонта [21, с. 18].

Жылая пабудова 7М – адна з найбольш добраўпарадкаваных канструкцый, выяўленых у Полацку. Яе памеры – 4,7 × 4,7 м. Ад зруба захавалася шэсць ніжніх вянкоў агульнай вышынёй каля 1 м. У выніку дэндрахраналагічнага даследавання пяці выпілаў з розных бярвенняў канструкцыі былі ўстаноўлены іх парубачныя даты – 1243–1245 гг. Паводле назіранняў Г. В. Штыхава, пабудова 7М існавала каля 20 гадоў, што падцвярджаецца дадзенымі дэндрахраналагічнага датавання канструкцый 6С і 6І VI будаўнічага гарызонту, якія перакрывалі сядзібу 7М. Падрабязнае апісанне канструктыўных асаблівасцей гэтай пабудовы прыведзена ў манаграфіі Г. В. Штыхава «Древний Полоцк» [26, с. 45].

У 4 м на захад ад азначанай канструкцыі у межах кв. 105 і 113 быў выяўлены развал вугляў і ліцейных шлакаў з нацёкамі сіняга і карычневага колеру. Разам са шлакамі выяўлены фрагмент тыгля. Верагодна, на гэтым месцы адбываўся працэс выплаўкі каляровых металаў у адкрытых тыглях. Размяшчэнне печы наводдаль ад сядзібы тлумачылася патрэбамі пажарнай бяспекі [21, с. 21].

У межах пабудовы 7М і побач ад яе быў выяўлены характэрны набор прадметаў, якія дазваляюць атаясамліваць дадзеную канструкцыю з вытворчым ювелірным комплексам, які існаваў на гэтай тэрыторыі ў сярэдзіне XIII ст.

Сярод знаходак асабліва трэба адзначыць інструменты ліцейшчыка – 12 тыгляў (з іх 3 – цэлыя) з нацёкамі метала на ўнутранай паверхні, абломак імітацыйнай ліцейнай формы; нарыхтоўкі і брак вытворчасці – 2 фрагменты дроту (меднага і бронзавага), нарыхтоўка з латуні ў выглядзе вузкай доўгай паласы, бронзавая пласцінка, алавянны выраб (метал, які застыў у літніку), літы бронзавы выраб у выглядзе трохвугольніка, побач з канструкцыяй выяўлена нарыхтоўка наверша свінцовай булавы; гатовыя вырабы – віты бранзалет з петлепадобнымі канцамі, трайны металічны бранзалет з петлепадобнымі канцамі, бронзавы пярсцёнак, круглая медная бляшка з арнаментам [26, с. 45].

Акрамя слядоў існавання на дадзенай тэрыторыі ювелірнай вытворчасці ў межах сядзібы былі выяўлены сведчанні заняцця яе жыхароў і іншымі відамі рамёстваў, у прыватнасці апрацоўкай скуры.

Можна дапусціць, што майстэрня, якая была выяўлена ў межах шостага будаўнічага гарызонту і дэндрахраналагічна датуецца 1276 г., генетычна звязана з пабудовай 7М, якая знікла ў выніку пажара на ўзроўні сёмага гарызонту (пабудовы 6С і 6І, якія перакрываюць канструкцыю 7М, маюць парубачную дату 1265 г.). Такім чынам, верагодна, ювелірны вытворчы комплекс, які складаецца з пабудоў 6К, 6Л і 6М, з'яўляецца працягам існавання на новым месцы пабудовы 7М. На гэта ўказвае і набор знаходак, які выразна характарызуе заняткі жыхароў абедзвюх сядзіб (фрагменты ліцейных форм, тыглі, сыравіна і адходы вытворчасці).

Вельмі цікавы вытворчы ювелірны комплекс, які існаваў у XII–XIII стст., быў выяўлены на тэрыторыі Вялікага пасада падчас археалагічных даследаванняў пад кіраўніцтвам С. В. Тарасава ў 1987–1988 гг. Раскопкі далі вялікі матэрыял для вывучэння матэрыяльнай культуры старажытных палачан. На даследаванай тэрыторыі ў межах другога будаўнічага гарызонту быў выяўлены вялікі сядзібны комплекс, які складаўся з сямі пабудоў, размешчаных на плошчы 1500 м^2 [24, с. 11]. Агульная характарыстыка комплексу была дадзена С. В. Тарасавым у спецыяльным даследаванні [19].

На тэрыторыі сядзібы знойдзена значная колькасць артэфактаў, якія ўказваюць на характар заняткаў яе жыхароў. Сярод слядоў ювелірнай вытворчасці можна адзначыць роўнаплечныя вагі, гіркі-разнавагі, ювелірны пінцэт, тыглі для плаўкі каляровых металаў, ліцейныя формы, нарыхтоўкі і гатовыя вырабы. Акрамя выразных сведчанняў існавання вытворчасці па апрацоўцы каляровых металаў у межах комплексу былі выяўлены сляды апрацоўкі бурштыну (у 13 пласце знойдзена 640 кавалкаў бурштыну), якая не патрабуе спецыяльнага абсталявання [25]. На думку С. В. Тарасава, у дадзенай майстэрні мог ажыццяўляцца выраб шкляных упрыгажэнняў [19; 22, с. 13].

Верагодна, да азначанай сядзібы меў дачыненне развал плінфы другаснага выкарыстання, які быў выяўлены ў непасрэднай блізкасці ад яе разам са значнай колькасцю фрагментаў тыгляў, металургічных шлакаў і соплаў горнаў. Дадзены комплекс можа быць атрыбутаваны як рэшткі горна для плаўкі каляровых металаў, які ў старажытнасці быў разбураны і перанесены ў дадзенае месца.

Вялікую цікавасць выклікае ювелірная майстэрня, якая была выяўлена С. В. Тарасавым на Ніжнім замке ў 1989–1990 гг. На тэрыторыі раскопу былі знойдзены сляды існавання найбольш ранняга вытворчага ювелірнага комплексу, які датуецца аўта-

рам раскопак X–XI стст. [18, с. 3]. Акрамя яго падчас шурфоўкі на Ніжнім замке былі выяўлены і іншыя сведчанні існавання ювелірнай майстэрні. Так, падчас шурфоўкі на «стрэлцы» Ніжняга замка, С. В. Тарасавым на мацерыку была знойдзена ліцейная форма для адліўкі манетападобных прывесак, імітуючая арабскія дырхемы. Верагодна, дадзеная знаходка магла адносіцца да яшчэ аднаго вытворчага ювелірнага комплексу, сляды якога захаваліся толькі ў выглядзе мацерыковых ям [23, с. 14].

Магутнасць культурнага слою на раскопе агульнай плошчай 400 м^2 складала 1,0 м. Культурныя напластаванні былі значна перамешаны, а «заўважныя стратыграфічныя асаблівасці пачаліся толькі з глыбіні 0,6–0,8 м, а часам і ў перадмацерыку». Сляды існавання на тэрыторыі раскопу вытворчага ювелірнага комплексу былі зафіксаваны ў межах рэшткаў наземнай каркасна-слупавой пабудовы і звязаных з ёй мацерыковых ям [23, с. 4].

Пабудова размяшчалася непасрэдна на мацерыку ў межах кв. 29, 38 і 39 і была даследавана часткова. Яна ўяўляла сабой наземную, каркасна-слупавую канструкцыю з даўжынёй адной са сценак 2,8 м. Пабудова загінула ў пажары, на што ўказвае праслойка вугалю магутнасцю да 5 см. У паўднёва-заходняй частцы кв. 39 былі выяўлены рэшткі печы-каменкі (дыяметр 1,1 м), выкладзенай з камянёў дыяметрам 10 см. Побач з развалам печы былі выяўлены фрагменты тыгляў для плаўкі каляровых металаў, а таксама шкляныя пацеркі і бурштын [23, с. 8].

Усяго на месцы раскопу было знойдзена каля 80 тыгляў (цэлых і фрагментаў), два ювелірныя пінцэты, ювелірная кавадлачка, фрагмент роўнаплечных вагаў і гірка-разнавага, сыравіна і гатовыя вырабы. Між тым асноўная частка ювелірнага інструментарыю, які быў выяўлены на месцы раскопу, паходзіць з вышэйшых перамешаных слаёў, што не дазваляе адназначна суадносіць іх з пабудовай, знойдзенай на мацерыку. Аднак, калі прыняць да ўвагі той факт, што культурны слой у межах даследаванай тэрыторыі быў моцна пашкоджаны карэннямі дрэў, а таксама адноснае тыпалагічнае датаванне большасці інструментаў, можна лічыць дадзены комплекс знаходак наборам інструментаў мясцовага ювеліра.

Складаным застаецца пытанне адносна агульнай спецыялізацыі дадзенай майстэрні. На думку С. В. Тарасава, яна была арыентавана на выраб шкляных упрыгажэнняў (у прыватнасці пацерак) [19]. Між тым падобная вытворчасць патрабавала існавання спецыяльнага абсталявання, а таксама адмысловага інструментарыю.

Шкларобчае рамяство на тэрыторыі старажытнай Русі з'явілася не раней канца X ст. і было прадстаўлена работамі грэчаскіх майстроў, якія працавалі ў Кіеве. Толькі пачынаючы з сярэдзіны XI ст. дадзены від рамеснай дзейнасці пачынае развівацца больш актыўна, аднак па-ранейшаму ў межах грэчаскіх майстэрняў [2, с. 145].

Некаторыя сучаныя даследчыкі ўвогуле адмаўляюць магчымасць існавання на тэрыторыі старажытнай Русі ўласнай шкловытворчаці, аргументуючы свае высновы адсутнасцю археалагічна выяўленых майстэрняў, якія б спецыялізаваліся на вырабе шкла [15].

На тэрыторыі раскопу 1989–1990 гг. і побач з пабудовай адсутнічаюць сляды існавання самастойнай шклоробчай вытворчасці (не былі выяўлены рэшткі адмысловых печаў, шклошлакаў, інструментарыю, значнай колькасці бракаваных вырабаў і нарыхтовак). Адсутнасць пералічаных вышэй прыкмет не дазваляе атаясамліваць дадзены комплекс і з майстэрняй па другаснай апрацоўцы шкла з мэтай вырабу з яго спецыяльных упрыгажэнняў. Такім чынам, значную колькасць выяўленых разам з пабудовай пацерак можна лічыць скарбам шкляных вырабаў, які быў схаваны ў момант небяспекі, падчас якой, верагодна, канструкцыя і была знішчана.

Вялікая колькасць пацерак, а таксама керамічны матэрыял дазваляюць датаваць комплекс X–XI стст. Такое датаванне характэрна і для рамеснага інструментарыю, выяўленага на месцы раскопу (шырокагубы арнаментаваны пінцэт, роўнаплечныя вагі).

Падчас выратаваўчых раскопак на тэрыторыі Вялікага пасада ў г. Полацку ў 2005 г. былі выяўлены рэшткі яшчэ аднаго вытворчага ювелірнага комплексу. Культурны пласт у раскопе меў агульную магутнасць 3 м, пры максімальнай магутнасці ў паўночна-заходняй частцы (3,06 м), складаўся з трох стратыграфічных гарызонтаў. Ювелірная майстэрня была выяўлена ў сярэднім стратыграфічным гарызонце (0,8–1,0 м) са значнай колькасцю рэчаў пераважна XVII–XVIII стст. [5].

У межах кв. 17–21 былі выяўлены рэшткі востракола, які размяшчаўся па лініі поўнач–поўдзень і складаўся з калкоў невялікага дыяметра (да 0,1 м), завостраных у ніжняй частцы. Верагодна, дадзеная канструкцыя ўяўляла сабой рэшткі агароджы дзвюх сядзіб. У гэтым жа стратыграфічным гарызонце (кв. 11) знойдзены рэшткі апечка, ад якога захаваўся пласт гліны магутнасцю 0,1–0,15 м пры агульных памерах 1,0 × 1,2 м з кавалкамі керамічнага друзу і вапны. Па ўмоўнай лініі заходняй сценкі кв. 11 выяўлены чатыры слупы дыяметрам 0,2 м, якія размешчаны ўшчыльную на адлегласці 0,5 см ад апечка. На гэтым жа ўзроўні ў межах кв. 21–22, зафіксаваны рэшткі драўлянага насціла, зробленага з дошак таўшчынёй каля 0,05 м [8, с. 6].

Характар выяўленых канструкцый дазваляе аднесці іх да адной сядзібы, а выяўленыя ў яго межах знаходкі даюць падставы для атрыбуцыі пабудовы ў якасці вытворчага ювелірнага комплексу, які існаваў

на дадзеным месцы ў першай палове XVII ст. Такое датаванне пацвярджаецца керамічным матэрыялам, выяўленым на месцы размяшчэння канструкцый.

Асаблівую цікавасць выклікае асартымент рэчаў, якія былі знойдзены ў межах вытворчага комплексу і маюць непасрэднае дачыненне да ювелірнага рамяства. Сярод інструментаў ювеліраў варта адзначыць знаходку малаточка і 50 фрагментаў плавільных тыгляў.

Акрамя набору інструментаў вялікае значэнне мае выяўленне вялікай колькасці гатовых вырабаў і нарыхтовак з металічнага сплаву (на аснове медзі з невялікамі дамешкамі серабра). Усяго знойдзена 96 прадметаў. Сярод іх 32 цэлыя пус епі, 20 нарыхтовак, 5 кручкоў ад кафтана, 10 іголак, 2 мініяцюрныя іголачкі і інш. Высокая канцэнтрацыя на дадзеным месцы вырабаў, які валодаюць аналагічнымі фізічнымі і хімічнымі характарыстыкамі, дазваляе з упэўненасцю казаць пра іх выраб у межах знойдзенай падчас раскопак сядзібы [6, с. 173].

Матэрыялы археалагічных даследаванняў дазваляюць выказаць меркаванне адносна спецыялізацыі азначанага комплексу на вырабе функцыянальных рэчаў – дэталяў адзення (засцежкі пус епі, кручкі ад кафтана), а таксама бытавых рэчаў (іголкі, напарстак). Рэшткі тыгляў указваюць на ліцейны спосаб вытворчасці прадметаў. Між тым агульны характар артэфактаў, а таксама адсутнасць у межах раскопу адмысловых ліцейных форм, указвае на той факт, што тыглі маглі выкарыстоўвацца толькі для вырабу сплаву (з якога зроблена большасць прадметаў) і выплаўкі сыравіннага матэрыялу, у той час як асноўным тэхналагічным прыёмам мясцовых ювеліраў была механічная апрацоўка каляровых металаў.

Комплекс канструкцый, выяўленых на тэрыторыі Вялікага пасада ў 2005 г., можна лічыць слядамі ювелірнай майстэрні, якая існавала на гэтай тэрыторыі ў першай палове XVII ст. Майстар-ювелір спецыялізаваўся на вырабе дэталяў адзення і шэрагу пабытовых рэчаў, выкарыстоўваючы для іх вырабу абмежаванае кола рамесных аперацый (перадусім прыёмы для механічнай апрацоўкі каляровых металаў).

У актавай кнізе Полацкага магістрата 1650 г. у сувязі з маёмаснымі справамі два разы сустракаецца імя толькі аднаго полацкага злотніка Стэфана Мандрыкі. У справе ад 15 лютага 1650 г. дадзены майстар набываў агарод «в месте Полоцъкомъ, за паръканомъ месъкимъ … на улицы, назъванои Великой» [1, с. 127]. Падобная лакалізацыя агарода можа ўказваць на той факт, што сядзіба ювеліра размяшчалася ў непасрэднай блізкасці ад яго, на Вялікім пасадзе. Гэта можна лічыць ускосным доказам таго, што выяўленая ў 2005 г. майстэрня належала менавіта гэтаму злотніку.

Заключэнне. За перыяд археалагічнага вывучэння Полацка на яго тэрыторыі былі выяўлены бясспрэчныя сведчанні існавання ювелірнай вытворчасці, арыентаванай на апрацоўку каляровых металаў. У межах гістарычнай часткі горада знойдзена 5 вытворчых рамесных ювелірных комплексаў, якія абслугоўвалі патрэбы гарадскога насельніцтва, пачынаючы з X ст.

Рамесныя майстэрні адносяцца да трох храналагічных груп, якія адлюстроўваюць асноўныя заканамернасці развіцця дадзенага накірунку рамеснай дзейнасці на тэрыторыі горада: 1) X–XI стст.; 2) XII–XIII стст.; 3) XVII ст.

Ювелірная майстэрня X–XI стст. уяўляла сабой прыклад сядзібна-дваравой забудовы, якая ўтрымлівала як жылыя, так і вытворча-гаспадарчыя пабудовы агульнай плошчай каля 100 м². Асноўнымі інструментамі злотнікаў у гэты час з'яўляліся плавільныя тыглі, пінцэты, роўнаплечныя вагі. На вялікі жаль, фрагментарная захаванасць канструкцыі майстэрні, а таксама перамешаны характар культурнага слою не дазваляе выказаць адназначнага меркавання адносна яе спецыялізацыі. Між тым, зыходзячы з асобных знаходак, выяўленых на ўсёй плошчы раскопу, можна лічыць, што вытворчы комплекс спецыялізаваўся выключна на апрацоўцы каляровых металаў. Відавочна, што галоўным тэхналагічным прыёмам было ліццё, якое, верагодна, ажыццяўлялася ў гліняных ліцейных формах, зробленых па воскавай мадэлі, ці з дапамогай адбіткаў гатовых рэчаў ў сырой гліне.

У XII–XIII стст. павышаецца інтэнсіўнасць ювелірнай вытворчасці, на што ўказвае выяўленне на тэрыторыі горада трох вытворчых комплексаў, якія адносяцца да дадзенага храналагічнага адрэзку. Вытворчыя сядзібныя комплексы гэтага часу арыентаваліся пераважна адносна вуліц і складаліся з некалькіх пабудоў. Пры гэтым ювелірная майстэрня на тэрыторыі Вялікага пасада адрозніавалася сваімі вялікімі памерамі ад канструкцый майстэрняў, якія размяшчаліся на Верхнім замку. Верагодна, такую акалічнасць трэба тлумачыць не толькі статусам саміх рамеснікаў, але і абмежаванасцю тэрыторыі Верхняга замка.

У азначаны перыяд з'яўляюцца новыя рамесныя прыёмы і пашыраецца асартымент ювелірных вырабаў. У межах усіх трох комплексаў былі выяўлены ліцейныя формы (каменныя і касцяныя), якія прызначаліся для адліўкі шырокага кола ювелірных упрыгажэнняў. З'яўленне падобнай тэхналогіі трэба тлумачыць неабходнасцю вырабу значнай колькасці серыйных вырабаў, выкананых з танных матэрыялаў, якія знешне былі падобныя да прадметаў з каштоўных металаў (перадусім серабра). Такім чынам, з'яўленне ліцейных форм шматразовага выкарыстання трэба разглядаць у якасці сведчання таварнас-

ці полацкай ювелірнай вытворчасці ў XII–XIII стст. У межах сядзібы ювеліра на Вялікім пасадзе, верагодна, існавала і апрацоўка бурштыну, якая не патрабуе значнай колькасці спецыялізаванага інструментарыю і адмысловага абсталявання.

Матэрыялы археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Полацка не даюць падстаў для лакалізацыі ніводнага вытворчага ювелірнага комплексу XIV–XVI стст. Дадзеную акалічнасць можна патлумачыць адсутнасцю на працягу доўгага перыяду сярод беларускіх археолагаў належнай увагі да познасярэдневяковых культурных слаёў, якія маглі ўтрымліваць рэшткі падобнай вытворчасці на тэрыторыі горада.

Акрамя таго, у выніку шматгадовых назіранняў за культурным слоем Полацка была адзначана складанасць вылучэння пластоў, якія б утрымлівалі выразныя матэрыялы XIV–XV стст. Гэтыя асаблівасці культурнага слою горада значна ўскладняюць працэс выяўлення і датавання рэштак ювелірнай вытворчасці, якія адносяцца да дадзенага храналагічнага адрэзка.

Асобна варта спыніцца на вытворчым ювелірным комплексе першай паловы XVII ст., які вылучаецца не толькі характэрным наборам інструментаў, але і асартыментам вырабаў. Дадзеная майстэрня ўяўляе сабой узор вузкаспецыялізаванага вытворчага комплексу, арыентаванага на выраб дастаткова абмежаванага набору прадметаў, якія насілі ўтылітарны характар. У сувязі з гэтым дадзены рамесны комплекс з'яўляецца яркім прыкладам эвалюцыі ювелірнай вытворчасці па шляху яе большай спецыялізацыі і арыентацыі на выраб найбольш запатрабаванай групы рэчаў, якія насілі функцыянальнае прызначэнне. На прыкладзе рамеснага інструментарыю, выяўленага ў межах майстэрні, можна выказаць пэўнае меркаванне і адносна змянення тэхналогіі апрацоўкі рэчаў з каляровых металаў. Тыглі у гэты час выкарыстоўваюцца пераважна для прыгатавання адмысловага сплаву, з якога зроблена абсалютная большасць рэчаў, выяўленых у сярэднім стратыграфічным гарызонце, а выраб гатовых рэчаў быў звязаны з механічнымі прыёмамі апрацоўкі прадметаў з каляровых металаў.

Такім чынам, значная колькасць вытворчых ювелірных комплексаў, якія былі выяўлены на тэрыторыі Полацка, сведчаць пра высокі ўзровень развіцця дадзенага віду рамеснай дзейнасці ў межах горада. Высокая канцэнтрацыя слядоў апрацоўкі каляровых металаў ставіць Полацк у шэраг буйнейшых ювелірных цэнтраў старажытных беларускіх зямель, а разгледжаныя ў рабоце вытворчыя комплексы даюць падставы для вывучэння асноўных этапаў эвалюцыі старажытнага полацкага златарства.

Літаратура

1. Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г.: зб. дакументаў / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; склад. і падрыхт. да друку М. Ю. Гардзееў. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – 270 с.: іл.

2. Безбородов, М. А. Стеклоделие в Древней Руси. Химико-технологическое исследование древнерусских стекол и огнеупоров / М. А. Безбородов. – Минск: Академия наук БССР, 1956. – 307 с.

3. Бубенько, Т. С. Средневековый Витебск: Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.) / Т. С. Бубенько. – Витебск: ВГУ им. П. М. Машерова, 2004. – 276 с.

4. Гуревич, Ф. Д. Древний Новогрудок (посад – окольный город) / Ф. Д. Гуревич. – Л.: Наука, 1981. – 160 с.

5. Дук, Д. У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе / Д. У. Дук // Весн. «ПДУ». Сер. А, Гуманітарныя навукі.– 2007. – № 1. – С. 5–23

6. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.

7. Дук, Д. У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2010. – 180 с.

8. Дук, Д. У. Справаздача аб археалагічных раскопках і наглядзе ў горадзе Полацку ў 2005 годзе / Д. У. Дук // ААНД Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Спр. 2284.

9. Ениосова, Н. В. Литейные формы Гнёздова / Н. В. Ениосова // Историческая археология. Традиции и перспективы (к 80-летию со дня рождения Даниила Антоновича Авдусина). – М.: «Памятники исторической мысли», 1998. – С. 67–81.

10. Ениосова, Н. В. Ювелирный производственный комплекс из «Ветчаного города» домонгольского Владимира / Н. В. Ениосова, Ю. Э. Жаров // Российская археология. – 2006. – № 2.– С. 64–80.

11. Зайцева, И. Е. Производственные ювелирные комплексы Серенского детинца и их место в системе застройки (XII–XV вв.) / И. Е. Зайцева // Тр. VI Междунар. конгр. славянской археологии. – М.: Наука, 1998. – Т. 2: Славянский средневековый город. – С. 100–113.

12. Каргер, М. К. Древний Киев / М. К. Каргер // Очерки по истории материальной культуры древнерусского города: в 2 т. – М.; Л.: Изд-во АН СССР, 1958. – Т. 1. – 579 с.

13. Коваленко, В. П. Майстерня ювеліра XIII ст. на дитинці Любеча / В. П. Коваленко // Старожитності Русі-України. – Київ, 1994. – С. 21–32.

14. Никольская, Т. Н. Кузнецы железу, меди и серебру от вятич / Т. Н. Никольская // Славяне и Русь. – М.: Наука, 1968.– С. 122–132.

15. Олейников, О. М. Стеклодельные мастерские в древности (К вопросу о существовании древнерусского стеклоделия) / О. М. Олейников // Новгород и Новгородская земля. История и археология. – 1997. – Вып. 11. – С. 51–73.

16. Рыбаков, Б. А. Ремесло древней Руси / Б. А. Рыбаков. – М.: Изд-во АН СССР, 1948. – 784 с.

17. Рындина, Н. В. Технология производства новгородских ювелиров X–XV вв. / Н. В. Рындина // Тр. нов-

городской археологической экспедиции. – М., 1959. – № 65: Материалы и исследования по археологии СССР. – С. 200–247.

18. Тарасаў, С. В. Справаздача аб археалагічных доследах у Полацку і полацкай акрузе ў 1990 г. / С. В. Тарасаў // ААНД Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Спр. 1205.

19. Тарасаў, С. В. Сядзіба полацкіх ювеліраў XII–XIII стст. / С. В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнар. навук. канф. – Полацк: НПГКМЗ, 2003. – С. 267–272.

20. Тарасенко, В. Р. Отчет о раскопках Полоцкого отряда белорусской археологической экспедиции в 1962 г. / В. Р. Тарасенко, Г. В. Штыхов // ААНД Ин-та истории Нац. акад. наук Беларуси. – Дело 130.

21. Тарасенко, В. Р. Отчет о раскопках Полоцой археологической экспедиции Института истории АН БССР в 1961 г. / В. Р. Тарасенко, Г. В. Штыхов // ААНД Ин-та истории Нац. акад. наук Беларуси. – Дело 114.

22. Тарасов, С. В. Отчет о раскопках в Полоцке в 1988 г. / С. В. Тарасов // ААНД Ин-та истории Нац. акад. навук Беларуси. – Дело 1084.

23. Тарасов, С. В. Отчет о раскопках в Полоцке в 1989 г. / С. В. Тарасов // ААНД Ин-та истории Нац. акад. наук Беларуси. – Дело 1165.

24. Тарасов, С. В. Отчет о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 г. / С. В. Тарасов // ААНД Ин-та истории Нац. акад. наук Беларуси. – Дело 1014.

25. Шаповалов, Р. Г. Обработка янтаря в средневековом Новгороде / Р. Г. Шаповалов // Новгород и Новгородская земля. История и археология. – 1998. – Вып. 12.– С. 109–120.

26. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк IX–XIII вв. / Г. В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.

Резюме

И. В. Магалинский

Производственные ювелирные комплексы древнего Полоцка (X–XVII стст.)

Дана характеристика производственных ювелирных комплексов, открытых на территории Полоцка. Автор локализирует пять ювелирных мастерских, которые относятся к трем хронологическим группам: 1) X–XI вв.; 2) XII–XIII вв.; 3) XVII в. На основе анализа археологических материалов делаются выводы относительно характерного для каждой хронологической группы ассортимента изделий, особенностей производственного процесса, а также планировки и размеров усадеб.

Summary

I. Mahalinski

Jewelry production complexes on the territory of ancient Polotsk (Xth–XVIIth cc.)

In the article the author defines jewelry production complexes that were open on the territory of Polotsk. The author localizes 5 jewelry workshops that refer to 3 chronological periods 1) Xth–XIth cc.; 2) XIIth–XIIIth cc.; 3) XVIIth c. According to the analysis of archaeological materials they draw a conclusion about range of goods that is typical to each chronological period, about peculiarities of production process, and about the size and planning of constructions.

Паступіў 24.02.2011

О. Н. Левко, *Институт истории НАН Беларуси, заведующая Центром истории доиндустриального общества, доктор исторических наук, профессор (г. Минск);*
А. В. Войтехович, *Институт истории НАН Беларуси, научный сотрудник отдела сохранения и использования археологического наследия (г. Минск);*
П. М. Кенько, *Институт истории НАН Беларуси, младший научный сотрудник отдела сохранения и использования археологического наследия (г. Минск)*

Археологические исследования Друцка в 2008–2009 гг.

В 2008–2009 гг. на территории агрогородка Друцк были возобновлены археологические исследования посада, начатые под научным руководством О. Н. Левко в 1999–2000 гг. при подготовке к празднованию 1000-летия древнего города [1]. В исследованиях принимали участие научные сотрудники Института истории НАН Беларуси А. В. Войтехович, П. М. Кенько, а также студенты Витебского государственного университета в рамках проведения археологической практики.

Цель исследования – продолжить изучение средневекового посада Друцка и выявить новые археологические объекты (селища и курганы) на территории агрогородка. В качестве подосновы для привязки шурфов, раскопов VI, VII на территории посада, курганов 1–3 вновь выявленной группы IV, селища-2 использовался современный план агрогородка Друцк в масштабе 1 : 5000 (рис. 1).

Раскоп VI был заложен в 2008 г. на территории посада с западной стороны от Окольного города (рис. 1). Он ориентирован по сторонам света и вытянут с севера на юг, его площадь 48 м^2. Дневная поверхность в раскопе VI, как показала нивелировка, имела небольшой уклон с севера на юг на 0,1 м. Стратиграфически прослежены три слоя: 1) серого цвета, имеющий среднюю толщину 0,4 м; 2) темный слой с включением углей, вкраплений кирпичного боя, имеющий толщину 0,2–0,3 м; 3) светло-серый слой толщиной 0,20–0,25 м, в котором также отмечены скопления углей (рис. 2). Общая мощность культурных напластований раскопа равна 0,8 м. Только с южной стороны в кв. 11 и частично кв. 12 глубина раскопа достигала 2,2 м в связи с тем, что здесь была выявлена яма, проходящая с запада на восток и заполненная серым слоем до материка. В ней наряду с материалами, характеризующими культурный слой раскопа, выявлены современные предметы.

На уровне пл. 2, 3 в кв. 3, 4 (рис. 2) были выявлены фрагменты *каменных вымосток.* Они не имели определенной формы и невозможно было установить их назначение. На уровне расчистки вымостки и под ней в данных квадратах (пл. 3) найдено значительное количество керамики, среди которой встречены венчики, датируемые XII–XIII вв. с линейным рифлением и волнистым рельефным орнаментом. Есть одно днище (пл. 3, кв. 4) с клеймом в виде треугольника с заходящими концами (рис. 3: *1*).

При зачистке материка в раскопе VI были выявлены материковые ямы, которые имели округлую форму и их диаметр достигал 0,25–0,60 м. При выборке заполнения ям оказалось, что все они имели форму столбов с тупым окончанием, заполнены светло-серым слоем и связаны с нижним горизонтом культурных отложений. Глубина ям с диаметром 0,4–0,6 м достигала 0,20–0,35 м, с диаметром 0,25–0,35 м глубина достигала 0,11–0,35 м. Особо выделяются две ямы у стен кв. 10–12. Одна из них была заполнена серым слоем. Однако в кв. 12 эта яма выходит за пределы раскопа в южном направлении, ее размеры, заполнение и сложность конфигурации допускают, что здесь имел место подклет XVI–XVII вв., который вторично использован в качестве мусорной ямы в XX в. Вторая яма выявлена на границе кв. 10–12 и выходит за пределы раскопа в восточном направлении. Ее размеры в пределах раскопа 1,46 × 0,47 см при глубине 0,3–0,4 м (яма имеет уступ). Заполнение ямы нижним светло-серым слоем позволяет предполагать, что она имеет хозяйственное назначение.

Вещевой материал, выявленный в раскопе VI, показывает, что, несмотря на видимую сохранность стратиграфии слоев, внутри них имелись перекопы. Это неизбежно при небольшой мощности слоя в целом. Некоторые вещи более раннего происхождения оказывались ниже, чем вещи более поздние. Главным образом, вещевой состав не выходил хронологически за пределы древнерусского времени. К изделиям из цветного металла относятся фрагмент бронзового проволочного браслета с круглым сечением, полутораоборотное височное кольцо, фрагмент подвески с ушком, одежная застежка, свинцовая пломба и др. (рис. 4: *1–4, 7*). Изделия из железа представлены ключом, пинцетом, двумя фрагментами



Рис. 1. Ситуационный план размещения исследуемых объектов



Рис. 2. План и профили раскопа VI. Территория посада. 2008 г.



Рис. 3. Изделия из глины (раскоп VI, 2008 г.): *1–3* – клейма на днищах сосудов; *4* – фрагмент крышки; *5* – фрагмент ручки; *6, 7* – венчики горшков



Рис. 4. Изделия из цветных металлов (раскоп VI, 2008 г.): *1* – фрагмент браслета; *2* – кольцо; *3* – фрагмент подвески; *4* – пломба; *5* – фрагмент пластинки; *6* – фрагмент накладки; *7* – застежка одежды

серпа, ножами с широкой спинкой (рис. 5: *1–4, 10–13*). К верхнему слою (позднее XIII в.) относятся фрагменты цепочки, язычок пряжки и фрагмент шпоры (рис. 5: *6–8, 14*). Особый интерес представляют изделия из глины. К ним относится амфорка киевского типа с клеймом на днище, ручка большой амфоры, датируемые XIII в. (рис. 6: *1, 3*), а также фрагменты горшков, крышки XII в. и днища с различными клеймами (рис. 6: *2, 3*). Среди клейм есть одно с трезубцем (рис. 3: *2*).

После завершения работ на раскопе VI, располагавшемся с западной стороны площадки автостоянки, с ее южной стороны в 2008 г. был заложен *шурф 13*, цель закладки которого – проверить перспективность разбивки раскопа на данном участке. Шурф 13 находился за канавой, проходившей вдоль южного ограждения площадки автостоянки, был ориентирован с севера на юг, его площадь составляла 12 м^2. С южной стороны площадка, где был расположен шурф 13, ограничивалась забором усадьбы. Стратиграфически шурф 13 включал два слоя. Первый слой темного цвета с углями и вкраплениями кирпича, либо фрагментов кирпичной кладки имел толщину в среднем 0,4 м и начинался сразу от дневной поверхности под травой. Ниже него располагался второй светло-серый слой толщиной до 0,2 м. За ним шел материк из светлого песка.

В кв. 2 на глубине 0,6 м при зачистке материка была обнаружена яма. По характеру ямы (скопление углей, камней и керамики), она определялась как очаг. Зафиксированный на границе кв. 2, 3 очаг имел округлую форму, и в его верхней части с восточной и южной сторон были прослежены мелкие и средней величины камни, между которыми и рядом с ними с наружной стороны очага собрано большое количество керамики, а также зубы коровы и мелкие кости животных. Помимо этих находок в верхней части очага и рядом с ним встречены обмазка, иголки, пряслице из розового шифера, железное кольцо, днище с клеймом в виде треугольника с закругленными углами (рис. 5: *9*, *15–17*; 7: *5*). Очаговая яма имела размеры 1,4 м по линии север–юг и 1,1 м по линии запад–восток. Ее глубина 0,27 м.

Раскоп VII был прирезан в 2009 г. к шурфу 13 с южной стороны площадки автостоянки. Площадь раскопа VII составляла 24 м^2. Основная часть раскопа имела мощность культурных напластований 0,40–0,55 м (рис. 8). Стратиграфически он включал верхний слой серого цвета толщиной до 0,2 м, под которым залегал второй слой темного цвета с вкраплениями битого кирпича. Его мощность составляла 0,2–0,3 м. Этот слой подстилался светло-серым слоем толщиной 0,1–0,2 м. Однако в кв. 5, 6 и кв. 6, 7 на уровне материка стали вырисовываться две



Рис. 5. Изделия из железа: (раскоп VI, 2008 г.): *1* – ключ; *2* – пинцет; *3, 4* – фрагменты серпа; *5* – изделие; *6, 14* – фрагменты цепочки; *7* – язычок пряжки; *8* – фрагмент шпоры; *10–13* – ножи; (шурф 13, 2008 г.) *9* – кольцо; *15–17* – иглы

большие ямы, уходящие за пределы раскопа (яма 1 в восточном направлении и яма 2 в южном направлении). Выборка слоя в этих ямах показала, что их глубина достигает 1,40 м (яма 1) и 1,75 м (яма 2). Стены ям имели уступы. Профиль ямы 2 по линии кв. 6, 7 имел подпрямоугольные очертания (рис. 8, разрез А-А') шириной 3,2 м. Заполнение ям 1, 2 представлено смешанным темным и светло-серым слоем, насыщенным углями с линзами красной прокаленной глины. Этот слой четко отделяется от вышележащего темного слоя прослойкой угля. Стратиграфические наблюдения позволили предположить, что ямы 1, 2 являются впущенными в материк подклетами строений XVI–XVII вв., которые сгорели. После выборки слоя из ямы 2 в кв. 8, 9 стали видны очертания подклета, имевшего размеры примерно



Рис. 6. Изделия из глины (раскоп VI, 2008 г.): *1* – амфорка с клеймом; *2* – клеймо на днище сосуда; *3* – ручка амфоры

3,2 × 3,2 м и ориентированного вдоль улицы, проходившей за замковым рвом. Как показали южный профиль по линии кв. 8, 9 и план подклета П-2 (яма 2), его стены были укреплены вертикально поставленными бревнами, глиной, и, возможно, обшиты деревом, от которого остались угли. Боковые стены (восточная и западная) имели уступы (возможно ступени для спуска с западной стороны. Уступ прослежен и в подклете П-1 (яма 1).

При зачистке материка в раскопе VII (кв. 4, частично кв. 5, 6, 7) прослежены ямы разной конфигурации с заполнением светло-серым слоем. В кв. 4 выявлены кольевые ямки 1–5, три из которых имели прямоугольную форму (1–3) и две (4–5) круглые. Их глубина достигала 6 см. Яма в кв. 5 имела размеры 0,65 × 0,85 м и глубину 0,62 м. Назначение ее не известно, возможно, это хозяйственная яма (рис. 8). Яма на границе кв. 5 и 7 диаметром 0,22 м имела глубину 0,05 м. Это след от столба с ровным окончанием. Ямы неправильной вытянутой формы вплотную примыкают к П-1 и П-2 (рис. 8). Глубина их составляет 0,25–0,30 м и 0,50–0,65 м. Назначение данных ям не определено. Все остальные ямы представляют собой следы вертикально поставленных бревен диаметром 0,2–0,3 м внутри П-2, либо уступы вдоль ее стен. Заполнение ям и уступов в ямах 1, 2 (П-1, П-2) было темным слоем с углями.

В раскопе VII так же, как и в раскопе VI, были выявлены материалы древнерусского времени. К ним относятся шиферные пряслица (рис. 9: *7, 8*), целые формы и фрагменты ножей XI–XII вв. (рис. 10: *1, 3, 4*), стеклянные браслеты (рис. 11: *3*), многочисленная керамика (рис. 12: *12, 16*), среди которой выделяются корчага с двумя ручками (рис. 7: *1*) и днища с клеймами (рис. 7: *3, 4*). Однако, в отличие от раскопа VI, в раскопе VII найдено гораздо больше предметов, которые можно датировать XIV–XVII вв. К ним относятся нож и бритва (рис. 10: *2*, 6), фрагмент замка (рис. 10: *9*), бронзовая пуговица (рис. 13: *11*), ружейный кремень (рис. 9: *5*, 6), горшок (рис. 7: *2*), пули (рис. 13: *8*), а также фрагменты бытовой керамики (рис. 12: *13, 14*).

Разведки на территории Друцка. На территории агрогородка Друцк находится комплекс разновременных памятников: селища, курганные могильники, городище (детинец), окольный город и неук-



Рис. 7. Изделия из глины: (раскоп VII, 2009 г.): *1* – фрагмент амфорки; *2* – горшок; *3, 4* – клейма на днищах сосудов; (шурф 13) *5* – клеймо на днище сосуда

репленный городской посад. Часть этих объектов в большей или меньшей степени изучалась археологически, иные только условно обозначены. Причем открытие некоторых памятников (курганных могильников и селищ) было совершено в 1930-е годы или даже раньше, и сегодня они уже не соответствуют первоначальному описанию. Кроме того, осталось много неясного из упоминаний Л. В. Алексеевым о выявленных (и даже исследовавшихся) грунтовых могильниках и курганах на территории Друцка [2]. Все это побудило исследовательскую группу в 2008–2009 гг. провести разведку на территории агрогородка Друцк. Для уточнения хронологии посадской территории, определения ее границ в древнерусскую эпоху был обследован участок в районе ул. Школьной (сама территория современного школьного двора, а также участок за церковью-новоделом, построенным в 2000 г. на месте старого кладбища XIX в.). Кроме того, разведкой охвачены участки, расположенные западнее раскопов VI, VII (современный выгон) до дороги, ведущей в д. Дубовое и за фермой в северо-западном направлении, где в настоящее время находятся поля. В результате полученных подъемных материалов установлено, что территория древнерусского посада охватывала в южном направлении всю зону застройки ул. Школьной вплоть до ее поворота за школой к ул. Центральной. Западная часть выгона от хоздвора до дороги на д. Дубовое также была заселена еще в древнерусское время. Территория посада



Рис. 8. План и профили раскопа VII. Территория посада. 2009 г.

Рис. 9. Изделия из камня (раскоп VII, 2009 г.): *1–4* – точильные бруски; *5, 6* – оружейные кремни; *7, 8* – шиферные пряслица



Рис. 10. Изделия из железа (раскоп VII, 2009 г.): *1–5, 7, 8* – ножи; *6* – бритва; *9* – фрагмент замка; *10* – наконечник стрелы; *11* – игла



Рис. 11. Изделия из стекла (*1–3*), кости (*4–6*). Раскопы VI, VII

XII–XIII вв. находится за фермой, где она накладывается на селище VII–X вв. (селище-2). Размеры селища пока установить не удается в связи с отсутствием к нему доступа (из-за засеянного зерновыми поля).

При обследовании территории в направлении д. Дубовое и карьера, расположенного за Окольным городом (рис. 1) были выявлены остатки курганных могильников, которые, возможно, имеют место в описаниях 1930–60-х годов.

Могильник 3 расположен на правом берегу Друти в направлении д. Дубовое (на северо-запад от городища). В 1930-е годы насчитывалось 20 насыпей. По данным, которые привел Г. В. Штыхов, курганы были распаханы в те же 1930-е годы. По сведениям Л. В. Алексеева, три из них были повреждены колодцами, но еще существовали в 1950–60-е годы. Как установлено в 2009 г. О. Н. Левко и П. М. Кенько, два кургана находятся на поле и один в лесу. Их высота более 2 м при диаметре около 12–14 м. Сохранность удовлетворительная.

Могильник 4 выявлен О. Н. Левко и П. М. Кенько в 2008 г. на север от укреплений городища и окольного города Друцка (рис. 1). Один курган наполовину снесен карьером. Его высота около 0,7 м, диаметр приблизительно 3 м. В карьере найдены железный нож, фрагменты костей. В срезе кургана видна прослойка пепла. Еще один курган тех же размеров находится на краю возвышенности возле карьера. Третий курган размерами 18,5 × 11,5 м при высоте около 2 м имел в центральной части яму, при зачистке которой выявлен угол каменной плиты. Курган был раскопан экспедицией Института истории НАН Беларуси в 2008–2009 гг. (исследовали его О. Н. Левко, А. В. Войтехович, П. М. Кенько).

Неизвестно, с какими из существующих могильников нужно соотносить упомянутые в работах Л. В. Алексеева «достаточно высокие насыпи» возле Старого и Нового Друцка, так как сейчас на месте этих деревень находится агрогородок.

Общая характеристика вещевого материала посада. Выявленный во время разведок и раскопок



Рис. 12. Венчики горшков XI–XVI вв. (*1–16*). Раскопы VI–VII



Рис. 13. Изделия из цветных металлов (раскоп VII, 2009 г.): *1–7* – пломбы; *8* – пуля; *9, 11* – пуговицы

2008–2009 гг. археологический материал позволяет утверждать, что территория посада средневекового Друцка развивалась с X по XVII в. Она имела площадь, превышающую 10 га, причем часть этой площади ранее занимали селища племенной поры. Об этом свидетельствуют находки фрагмента бронзового браслета с расширенными концами (рис. 14: *10*), фрагмента шейной гривны (рис. 14: *9*), находки отходов бронзолитейного дела на селище-2 за фермой. К ранним предметам с территории посада относятся: накладка на пояс или одежду (рис. 14: *6*), бронзовая подвеска (рис. 15: *11*), фрагмент бронзового пластинчатого орнаментированного браслета (рис. 14: *1*), пряжки (рис. 14: *7*, 15: *3*), сошник (рис. 6: *1*) и др. Многочисленные пломбы древнерусского времени (рис. 13: *1–7*), гирька-разновес (рис. 17: *12*), стеклянные браслеты (рис. 11: *1–3*), фрагменты амфор (рис. 6: *3*) и целые экземпляры (рис. 16: *1*), древнерусская керамика (рис. 12), костяной гребень (рис. 11: *6*), предметы вооружения (рис. 10: *10*), хозяйственный инвентарь (ножи, косы, серпы, точильные бруски) – вот перечень предметов, показывающих разнообразие жизни в древнем Друцке, в том числе развитие торговли и культурного обмена. К более позднему времени относятся предметы, связанные с периодом существования Друцкого замка. Это детали панцирей (рис. 15: *7–9*), ружейный кремень (рис. 9: *5*, 6), свинцовые пули (рис. 13: *8*), фрагменты бронзовых чаш (рис. 14: *8*; 15: *13*), перстень с монограммой (рис. 15: *2*), пуговицы (рис. 13: *11*) и даже деталь амуниции 1812 г. (рис. 15: *1*).

Описание раскопок кургана 1 из курганной группы IV. В 2008–2009 г. был исследован один из вновь выявленных курганов группы IV [3]. Курган располагался в 0,4 км на северо-запад от Друцкого укрепленного комплекса: городища и окольного города. Он находился на достаточно крутой возвышенности, большая часть которой уничтожена карьером. По словам местных жителей, во время разработки карьера встречалось много человеческих костей. Возможно, что этот курган относится к некрополю древнего Друцка.

Насыпь имела форму удлиненной полусферы со следующими пропорциями: длина по линии запад–восток 18,5 м, ширина по линии север–юг 11,5 м, высота 2,0 м (рис. 18).



Рис. 14. Изделия из цветного металла (территория западного посада возле кургана 1): *1* – фрагмент пластинчатого орнаментированного браслета; *2, 7* – пряжки; *3* – гирька-разновес; *4* – пломба; *5* – фрагмент пуговицы; *6* – накладка; *8* – фрагмент сосуда; *9* – застежка шейной гривны; *10* – фрагмент браслета

В восточной части насыпи была прослежена яма, оставленная самовольными раскопками (как выяснилось позже, местные дети сделали здесь землянку). Размеры ямы: по линии север–юг 2,0 м, по линии запад–восток 3,6 м. Глубина 0,8–1,0 м.

Общая характеристика стратиграфии насыпи. Для изучения структуры насыпи были оставлены бровки шириной 0,5 м. Одна бровка по длине кургана (линия запад–восток) и две по его ширине (линия север-юг). Таким образом, получилось шесть секторов: северо-западный, северо-восточный, юго-западный, юго-восточный и два центральных – северный и южный. Раскопки велись по секторам и слоям с фиксацией и разборкой выявленных конструкций и погребений. Все они имели свои нивелировочные отметки, привязка которых осуществлялась к основному реперу – высшей точке в центре кургана.

В результате изучения установлено, что насыпь кургана имеет следующую структуру. Под дерном прослеживается темно-серая гумусовая прослойка толщиной 0,2–0,4 м. Она переходит в слой светло-серого цвета, насыщенный археологическим материалом (фрагменты керамической посуды, изделия из железа, цветного металла, стекла), мощность которого колеблется от 0,2 до 0,5 м. На глубине 0,7–0,9 м от поверхности кургана прослеживается зольно-угольная прослойка толщиной 0,1–0,3 м, местами достигающая 0,4 м. В северо-восточной части насыпи она имеет колодцеобразное понижение до 1,8 м. По линии запад–восток прослойка имеет длину 15,6 м, по линии север–юг – 4,8–6,5 м (рис. 18).

Нижележащая часть насыпи состоит из плотного светлого суглинка, в котором встречаются угольные вкрапления. В этом слое были обнаружены многочисленные погребения, совершенные по способу ингумации. Всего установлено 38 захоронений.

Описание погребальных уровней. В результате нивелировки каждого скелета или его остатков удалось выяснить, что погребения совершались группами и залегают в нескольких уровнях. Выделены четыре погребальных уровня. На основе этих данных можно произвести реконструкцию погребального обряда с последовательностью захоронений в кургане.

Первый погребальный уровень фиксируется ниже первоначальной дневной поверхности, расположенной



Рис. 15. Изделия из цветного металла (территория восточного посада): *1* – деталь амуниции 1812 г.; *2* – перстень с монограммой; *3* – пряжка; *4* – перстень со щитком; *5, 11* – подвески; *6* – накладка; *7–9* – детали доспехов; *10* – кольцо; *11* – венчик чаши; *12* – фрагмент застежки



Рис. 16. Изделия из железа (территория восточного посада): *1* – наральник; *2, 3* – нож и его костяная рукоять



Рис. 17. Изделия из металла (территория восточного посада): *1–3, 9* – пряжки; *4–8* – ножи; *10* – гвоздь; *12* – гирька; *13* – кольцо



Рис. 18. План и профили кургана 1

на глубине 2 м от высшей точки на поверхности центра насыпи. Здесь выявлено погребение № 35, которое было совершено в могильной яме северо-западного сектора кургана (рис. 18). Размеры ямы: 1,8 м по линии запад–восток и 1,2 м по линии север–юг. Ее глубина 0,5 м. На дне прослеживались контуры истлевшего гроба прямоугольной формы размером 1,3 × 0,4 м. В пределах этих контуров обнаружены части детского черепа и фрагмент лучевой кости руки. Как установлено антропологически (исследование проведено О. А. Сорокиной), погребение № 35 принадлежит ребенку в возрасте 6–7 лет. Возле челюсти найдена бронзовая шаровидная полая позолоченная пуговица размером 8 × 8 мм. Над засыпанной могильной ямой на два торцевых основания была положена каменная плита (рис. 19: *1*). Под основания подложены валуны средних размеров (рис. 19: *2, 3*). Под восточным основанием, на глубине 2,17 м от дневной поверхности, находился один валун, а под западным основанием (в изголовье) – три валуна на глубине 2 м от дневной поверхности. Еще один камень был выявлен возле северного края основания на этой же глубине. Размеры западного (изголовье) основания по линии север–юг составляют 0,98 м, по линии запад–восток – 0,48 м, толщина 0,20 м. В основании имелась выемка размером 0,8 × 0,24 м, при глубине 5 см для установки крышки. Размеры восточного основания по линии север–юг составляют 0,86 м, по линии запад–восток 0,52 м, толщина 0,2 м. В нем также имелась выемка размером 0,67 × 0,15 м при глубине 5 см. Расстояние между внутренними краями оснований по линии запад–восток составило 1,04 м. В пазы была вложена плита, имеющая длину по линии запад–восток 1,55 м, ширину по линии север–юг 0,66 м, толщину 0,12 м. Внешняя сторона плиты, как и углубления в основаниях, были тщательно обработаны. По центральной продольной оси плиты имелся выступ шириной 8 см, высотой 4 см. Плита и основания были изготовлены из песчаника. Таким образом, с учетом наклона плиты, толщины торцевых оснований и подкладки под них камней, внешняя сторона плиты оказалась на уровне 0,58–0,20 м над древней дневной поверхностью, т. е. на глубине 1,4–1,8 м от современной поверхности.

Второй погребальный уровень. I группа захоронений. Залегала на глубине 2,0–1,6 м от современной дневной поверхности и включала в себя двенадцать погребений (№ 15, 17, 21, 25, 27, 30, 32–34, 36–38). Останки погребенных располагались на спине в вытянутом положении на спине. Все они непосредственно связаны с погребением № 35, находящимся в могильной яме.

В северо-западном секторе рядом с плитой над погребением № 35 на расстоянии 0,2 м на юго-восток от северного края западного основания надгробья обнаружены два захоронения: № 15 и 37.

«…каля вёскі і возера Крывец, я выявіў адну дзіўную рэч, якую не магу ўразумець. Справа ў наступным: курганы ў ліку дванаццаці ляжаць на плоскім узвышшы, побач з імі знаходзяцца старыя закінутыя могілкі хрысціянскія, на якіх у цяперашні час не хаваюць і нават няма ні аднаго крыжа на іх, а толькі бачныя невялікія магільныя насыпы, абкладзеныя камянямі, як гэта робіцца і зараз. Раскапаўшы адзін з найблізкіх да старых могілак курганаў, я знайшоў жаночы касцяк, на ілбу якога ляжала сярэбраная манета, гэтак званы патрыгрошны грош літоўскі Жыгімонта Аўгуста 1569 года, на нябожчыцы быў скураны пояс, упрыгожаны шпількамі (?), цалкам такімі, як цяперашнія. У іншым кургане знойдзены жалезны трохграневы напільнік і абломкі крэменю. Адным словам, усе рэчы даказвалі, што курганы адносяцца да XVI стагоддзя; значыць за 300 гадоў выконваўся яшчэ месцамі паганскі пахавальны абрад, г. зн. што нябожчыка клалі на зямлі і над ім сыпалі курган».	«Пераходжу, нарэшце, да пытання: ці доўгі час захаваўся паганскі абрад пахавання ў курганах, каб не закапваючы у вырытай у зямлі магіле, пакласці нябожчыка на паверхні зямлі і насыпаць над ім больш або менш высокі курган. Што гэты абрад доўга захоўваўся ў Лепельскім павеце, магу даказаць наступным фактам. У 1879 г. я раскопваў курганы на зямлі маёнтка Забалоцце Пышнянскай воласці, над возерам, што завецца Доўгае. Курганоў было каля 10, размешчаных у адну прамую лінію. Апошні курган прылягаў да старых хрысціянскіх могілак, на якіх ужо з даўніх часоў нікога не хаваюць, так што нават усе крыжы згнілі і паваліліся. Заўважны толькі малыя магільныя насыпы доўгай формы, абнесеныя невялікімі камянямі. Раскапаны былі 2 кургана, бліжэйшыя да могілак; у адным пахавана жанчына, на ёй быў скураны пояс, напаўспарахнелы, з меднымі шпількамі з галоўкамі, падобнымі на цяперашнія, даўжынёй у 1 вяршок: іх было штук каля 40; на руках 2 пярсцёнкі. Выраб медных шпілей ніяк не раней XV або XVI ст. У другім, бліжэйшым да могілак, быў мужчынскі шкілет; каля яго ляжалі абломкі крэменю і стальны трохгранны напільнік, які служыў, верагодна, як крэсіва; на лобнай костцы чэрапа пакладзена сярэбраная манета, – гэта літоўскі паўгрош Жыгімонта Аўгуста 1562 г.; на лобнай костцы, на якой ляжала манета, застаўся зялёны вокіс метала. Чаму пакладзена манета, растлумачыць не магу; у любым выпадку яскравы доказ таго, што ў Лепельскім павеце і ў XVI ст. існаваў абрад язычніцкага пахавання».



Карта Лепельскага раёна (фрагмент)

Такім чынам, А. М. Семянтоўскі паведамляе аб раскопках М. Ф. Кусцінскага, спасылаючыся на яго ліст ад 16 сакавіка 1885 г. Нягледзячы на адсутнасць двухкосся, тэкст падаецца ад першай асобы («я выявіў», «я знайшоў») [6, с. 27–28]. Гэта ўказвае на тое, што ліст М. Ф. Кусцінскага цытуецца А. М. Семянтоўскім дакладна і літаральна. Паводле гэтага паведамлення, у Пышнянскай воласці, на адлегласці прыкладна ў 15 вёрст ад Лепеля, каля вёскі і возера Крывец, М. Ф. Кусцінскі выявіў 12 курганоў побач са старымі закінутымі хрысціянскімі могілкамі. Крыжоў на хрысціянскіх могілках не захавалася, невялікія магільныя насыпы абкладзены камянямі. Раскопкі двух бліжэйшых да старых могілак курганоў выявілі ў адным жаночы шкілет з сярэбраным патрыгрошным грошам Жыгімонта Аўгуста 1569 г. на лобнай костцы. На касцяку захаваўся скураны пояс, упрыгожаны шпількамі («булавкамі»), «гэткімі ж, як і цяперашнія». У другім кургане быў знойдзены жалезны трохгранны напільнік і кавалкі крэменю [6, с. 27–28].

Аб другім выпадку знаходжання манеты ў познесярэдневяковым курганным пахаванні піша сам М. Ф. Кусцінскі. У адпаведнасці з гэтым паведамленнем, у 1879 г. археолаг праводзіў раскопкі курганоў над возерам Доўгае, на зямлі, якая адносілася да маёнтка Забалоцце Пышнянскай воласці. Курганоў было каля 10. Яны размяшчаліся ў адну лінію. Апошні курган прымыкаў да старых хрысціянскіх могілак, на якіх даўно не хавалі. Усе крыжы згнілі. Былі заўважаны малыя насыпы, абкладзеныя невялікімі камянямі. У ходзе раскопак двух бліжэйшых да могілак курганоў у адным быў знойдзены жаночы, а ў другім – мужчынскі касцяк. На жанчыне быў скураны пояс, упрыгожаны прыблізна сарака меднымі шпількамі («булавкамі») з галоўкамі накшталт сучасных. Каля мужчынскага шкілета ляжалі кавалкі крэменю і стальны трохгранны напільнік, відаць, крэсіва. На лобнай костцы чэрапа ляжала сярэбраная манета – паўгрош Жыгімонта Аўгуста 1562 г. [5, с. 235].

Апісанні гэтых курганных пахаванняў настолькі падобныя, што ўзнікае пытанне, ці не ідзе

размова аб адным і тым жа даследаваным аб'екце [7, с. 272–273]. Канечне, адрозніваецца намінал і дата манеты, яе прыналежнасць да жаночага або мужчынскага пахавання, назва возера, каля якога праводзіліся раскопкі. З іншага боку, супадае мясцовасць, від пахавальнага збудавання, асаблівасці курганнага магільніка і яго размяшчэння, колькасць даследаваных курганоў, пол пахаваных, факт наяўнасці манеты на лобнай костцы, іншыя знаходкі. У абодвух выпадках курганны абрад пахавання звязваецца з перажыткамі паганства.

Звернемся да карты Генеральнага штаба СССР 1936 г. маштабам 1 : 50 000 (малюнак). На ёй пазначана возера Доўгае, на беразе якога знаходзіцца вёска Крыўцы, а непадалёк – Забалоцце. Такім чынам, карта сведчыць аб тым, што вёска Крывец (Крыўцы) і возера Доўгае знаходзяцца побач. Гэта пацвярджае меркаванне аб тым, што А. М. Семянтоўскі і М. Ф. Кусцінскі апісваюць адзін і той жа даследаваны аб'ект.

Параўнаўчы аналіз паведамленняў А. М. Семянтоўскага і М. Ф. Кусцінскага аб раскопках апошніх курганоў XVI ст. у Лепельскім павеце сведчыць аб тым, што яны апісваюць адны і тыя ж раскопкі. Нягледзячы на пэўныя разыходжанні ў апісаннях, падобныя моманты ў апісаннях, дастатковая рэдкасць выяўлення курганнага пахавання XVI ст. з манетай і той факт, што ў абодвух выпадках апісваюцца толькі адны раскопкі без згадвання другіх, сведчаць аб тым, што М. Ф. Кусцінскім у Лепельскім павеце даследаваліся адны курганныя могілкі з манетай XVI ст. Што датычыцца разыходжанняў у паведамленнях, яны могуць тлумачыцца працяглым перыядам (24 гады) паміж правядзеннем раскопак і ажыццяўленнем публікацыі. Цалкам магчыма, што некаторыя дэталі раскопак 73-гадовы даследчык узгадаў недакладна.

З іншага боку, нельга выключаць, што якраз публікацыя самога М. Ф. Кусцінскага найбольш дакладная. Напрыклад, толькі ў ёй падаюцца звесткі аб наяўнасці ў жаночым пахаванні пярсцёнкаў.

У любым выпадку, даследаванае М. Ф. Кусцінскім курганнае пахаванне датуецца паводле манеты 1560-мі гадамі. Параўнаўчы аналіз паведамленняў А. М. Семянтоўскага і М. Ф. Кусцінскага прыводзіць да высновы, што размова ідзе аб раскопках на адным і тым жа аб'екце. Такім чынам, агульная колькасць вядомых курганных пахаванняў позняга сярэднявечча і ранняга новага часу з манетамі – не сем, а шэсць, у тым ліку не тры, а два такіх помніка знаходзяцца на тэрыторыі Беларускага Падзвіння.

Літаратура

1. Археалогія Беларусі: у 4 т. – Мінск: Беларус. навука, 1998–2001. – Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.]; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. – 2001. – 597 с.: іл.

2. Багамольнікаў, У. Пахавальны абрад / У. Багамольнікаў, Я. Рыер // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 5: М – Пуд / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд. [і інш.]). – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 450–451.

3. Вайцяховіч, А. В. Пахавальны абрад / А. В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі: энцыкл.: у 4 т. – Т. 2: Л – Я / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2011. – С. 177–178.

4. Каробушкіна, Т. М. Кусцінскі Міхаіл Францавіч / Т. М. Каробушкіна, Г. А. Каханоўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 359.

5. Кусцинский, М. Ф. Из заметок о курганах Лепельского уезда / М. Ф. Кусцинский // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1903. – № 7. – С. 232–235.

6. Сементовский, А. М. Белорусские древности / А. М. Сементовский. Вып. 1. – СПб.: [Б.и.], 1890. – 136 с.: ил.

7. Чараўко, В. У. Вывучэнне пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. у дарэвалюцыйны перыяд / В. У. Чараўко // ГАЗ. – 2010. – № 25. – С. 271–275.

Резюме

В. В. Черевко

К вопросу о раскопках М. Ф. Кусцинским позднесредневековых курганных погребений в Лепельском уезде

Позднесредневековые курганные погребения с монетами – довольно редкое для Белорусского Подвинья явление. В специальной литературе сообщается о том, что известный археолог XIX в. М. Ф. Кусцинский во время археологических раскопок на территории Лепельского уезда дважды выявлял и исследовал подобные погребения.

Источником информации в одном случае служит статья самого М. Ф. Кусцинского, во втором – сообщение о его раскопках археологом и краеведом А. М. Сементовским (со ссылкой на письмо Кусцинского). Однако анализ приводимых М. Ф. Кусцинским и А. М. Сементовским сведений дает основание утверждать, что речь, на самом деле, идет об одних и тех же раскопках.

Summary

V. Charauko

To the question of excavations of the late medieval burials in Lepel district made by M. Kunstinski

Late medieval barrows with coins are an extremely rare phenomenon at Belarusian Podvinie. In specialized literature it is reported that the famous archaeologist of the XIX century M. Kustinski elicited and investigated barrows of this kind twice during the archeological excavations in Lepel district.

The source of information in the first case is the article written by M. Kustinski, and in the second case – the report about Kustinski's excavations made by archaeologist and local historian A. Sementovski (with reference to the Kustinski's letter). Hovewer, the analysis of the information provided by M. Kustinski and A. Sementovski allows us to assert that we are actually talking about one and the same excavations.

Пастуніў 29.04.2011

Г. В. Штыхаў, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду, доктар гістарычных навук, прафесар (г. Мінск)*

Старажытны Лагойск у святле археалагічных раскопак

Лагойск з'яўляецца адным са старажытнейшых гарадоў Беларусі. У перыяд ранняга сярэдневякоўя ён уваходзіў у склад Полацкай зямлі. «Полацкая зямля» – летапіская назва самастойнага дзяржаўнага ўтварэння, якое гісторыкі лічаць Полацкім княствам, таму што на чале яго стаялі князі, названыя ў летапісе «крывіцкімі».

Полацкая зямля (цяпер паўночная і цэнтральная часткі Беларусі) некаторы час знаходзілася ў складзе агульнай усходнеславянскай дзяржавы Кіеўскай Русі і адна з першых вылучылася як незалежная ў самым пачатку палітычнай раздробленасці. Полацкаму княству наканавана было стаць калыскай беларускай дзяржаўнасці.

Палітычнае жыццё старажытнага Лагожска (Логожеска), як ён тады называўся, было цесна звязана з падзеямі, што адбываліся ў Полацкай зямлі-княстве. Аднак непасрэдных звестак пра Лагойск у летапісах нямнога – толькі зрэдку згадваюцца яго князі ў сувязі з войнамі. Лагожск упершыню названы ў «Павучанні» князя Уладзіміра Манамаха, дзе ён прыгадаў, як «ваяваў» горад ў 1078 г. Няма ніякіх звестак у пісьмовых крыніцах, якім чынам узнік Лагойск, якой была яго гаспадарка, чым займаліся жыхары горада, якім быў іх побыт. Высветліць гэта дапамагаюць матэрыялы археалагічных даследаванняў у Лагойску і яго наваколлі.

У 1925 г. Лагойскае замчышча на беразе Гайны абследаваў вядомы археолаг А. М. Ляўданскі. Ён адзначыў, што на пляцоўцы зусім не прыкметны культурны пласт, толькі дзе-нідзе ўдалося знайсці невялікую колькасць чарапкоў ад гліняных пасудзін з добра адмучанай гліны без палівы. А. М. Ляўданскі датаваў гарадзішча «часам не раней XII ст.», кіруючыся пераважна летапіснымі данымі [14, с. 193–194]. У публікацыі А. М. Ляўданскага змешчана схема плана «замка».

У 60–70 гады XX ст. паводле праграмы Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР для тэмы, прысвечанай старажытным гарадам Полацкай зямлі, аўтару дадзенага артыкула давялося правесці стацыянарныя раскопкі на Лагойскім замчышчы. Быў выяўлены культурны слой таўшчынёй да 1 м, сабрана значная калекцыя старажытных вырабаў.

Аб выніках гэтых раскопак паведамлялася ў артыкулах і навукова-папулярных публікацыях. Некаторыя даныя змешчаны ў гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць: Лагойскі раён».

Даследаванні на Лагойшчыне, працягнутыя аўтарам дадзенага артыкула ў 2004–2007 гг., дазваляюць выказаць новую версію ўзнікнення горада на Гайне.

Умацаваны цэнтр Лагожска. Дзядзінец старажытнага горада размяшчаўся на правым беразе Гайны ў цяперашнім Лагойскім парку, які выкарыстоўваецца як гарадскі парк культуры і адпачынку. Замчышча сярэднявечнага Лагожска ў народзе мае назву «замкавая гара», ці «замак». Паводле плана Лагойскага замчышча, знятага А. М. Ляўданскім у 1925 г., памеры пляцоўкі складаюць 170 × 90 м.

Выгінам вала пляцоўка замчышча быццам падзяляецца на дзве амаль роўныя часткі (пляцоўкі) – паўночную і паўднёвую (мал. 1). На схематычным плане А. М. Ляўданскага каля замчышча паказаны два ўваходы: першы (галоўны) – з паўднёвага боку, другі (у выглядзе сцежкі) – з паўночна-ўсходняга боку.

Высветлім, да якога тыпу старажытных гарадзішчаў можна аднесці ўмацаваны цэнтр горада на Гайне. Усе гарадзішчы Беларусі даследчыкі падзяляюць на мысавыя, узгоркавыя, балотныя. Спецыяліст па гісторыі ўсходнеславянскага ваеннага дойлідства П. А. Рапапорт адносіць Лагойскае замчышча («замак») да тыпу мысавых гарадзішчаў з планіроўкай умацаванняў, якія падпарадкаваны рэльефу мясцовасці. Пляцоўка размешчана не на заканчэнні мыса, а на ўзвышшы-астанцы, якое аддзелена ад плато з трох бакоў ярамі, а чацвёрты яго бок узвышаецца над нізінай і поплавам берага ракі. У сапраўднасці гэтыя яры, што аддзяляюць гарадзішча ад плато, што да яго прымыкае, не з'яўляюцца цалкам прыроднымі, а ў пэўнай ступені, верагодна, часткова ўяўляюць сабой аплыўшыя равы [23, с. 34–35].



Мал. 1. План Лагойскага замчышча 60-х гадоў XX ст. з абазначэннем месцаў раскопак (па Г. В. Штыхаву): *1* – раскоп; *2–4* – шурфы



Мал. 2. План і разрэзы (AB, CD) Лагойскага замка канца XIX ст. (па М. А. Ткачову)



Мал. 3. Асноўны раскоп-1 на Лагойскім замчышчы з лічбавым абазначэннем квадратаў (2 × 2 м)

Калі наша меркаванне пра дзве пляцоўкі Лагойскага замчышча правільнае, то плошча паўночнай пляцоўкі была прыблізна 0,86 га (115 × 75 м), а паўднёвая пляцоўка мела плошчу 0,6 га (50 × 120 м). Агульная плошча замчышча складала 1,46 га.

У вуглу паўночнай пляцоўкі гарадзішча на плане А. М. Ляўданскага паказана значная па плошчы западзіна акруглай формы. Яна зафіксавана намі таксама на плане ў пачатку раскопак 1966 г. (мал. 1). У паўднёвай частцы замчышча А. М. Ляўданскім абазначаны сад. Царкоўнай пабудовы тут ужо не было. У кнізе М. А. Ткачова «Замкі і людзі» надрукаваны «План Лагойскага замчышча», на якім зафіксавана сітуацыя больш ранняга часу. На паўночнай пляцоўцы абазначана западзіна, якая мае вугал (мал. 2). На паўднёвай пляцоўцы паказана царква і недалёка ад яе пабудова [29, с. 128]. Уезд толькі адзін – з паўднёвага боку.

Разглядаючы больш пільна два планы, можна весці размову пра дзве пляцоўкі замчышча. Верагодна, першапачаткова дзядзінец Лагожска размяшчаўся на паўднёвай пляцоўцы, пазней умацаваны цэнтр горада быў пашыраны амаль у 2 разы.

У канцы XIV – пачатку XV ст. Лагойск належаў вялікаму князю Вітаўту і з 1413 г. знаходзіўся ў складзе Віленскага ваяводства. Знаўца гісторыі Беларусі А. П. Сапуноў пісаў па невядомай нам крыніцы, што Вітаўт, валодаючы Лагойскам, у горадзе «пашырыў умацаванне» [24, с. 410]. Відаць, была пашырана пляцоўка і перабудаваны валы. Па краі павялічанай пляцоўкі дзядзінца-замка быў насыпаны земляны вал, пастаўлены драўляныя абарончыя сцены, вежы і ўязная брама.

Дзядзінец Лагойска і замак больш позніх часоў на яго месцы шмат разоў разбураліся і спальваліся, але затым зноў адбудоўваліся на сваім месцы. Цяпер захоўваецца пляцоўка з культурным слоем і магутны земляны вал з двух яе бакоў. Вялікі земляны вал меў звонку вышыню 6–8 м, шырыню ў аснове 16–18 м. Абарона ўзмацнялася ровам глыбінёй да 4–5 м і шырынёй да 20 м [29, с. 128]. Падчас археалагічных даследаванняў 1966 г. намі была зроблена спроба зачысткі агалення вала з унутранага боку на глыбіню звыш 1 м пры яго вышыні ў дадзеным месцы 2,5 м (мал. 1: *4*). У насыпе вала выяўлены фрагменты паліванай кафлі і бытавой керамікі XVI–XVIII стст. разам з абломкамі пасудзін XII–XIII стст. часоў Полацкага княства. Вал падсыпаўся на працягу многіх стагоддзяў, прычым, напэўна, зрываўся культурны пласт.

Культурны слой, размяшчэнне знаходак, датаванне. Пачатковае археалагічнае вывучэнне Лагойскага замчышча (замкавая гара, замак, замчышча) пачалося ў 1966 г. археалагічным атрадам Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР пад кіраўніцтвам Г. В. Штыхава.



Мал. 4. Вырабы з жалеза XI–XIII стст.: *1–4* – наканечнікі стрэл; *5* – гарпун; *6–12* – нажы; *13* – шыла; *14* – фрагмент стрэмя; *15* – ключ; *16, 18* – фрагмент замка́; *17, 20* – лічыны замкоў; *19* – цвік; *21* – цуглі; *22* – скаба. Лагойск. Раскопкі 1966 г.



Мал. 5. Вырабы XII–XIII стст.: *1* – грэбень (косць); *2* – колца; *3, 13* – тачыльны брусок; *4–6* – праселкі (камень); *7, 8* – фрагменты бранзалетаў (шкло); *9, 10* – дротавыя вырабы (каляровы метал); *11* – сашнік; *12* – гіра (жалеза). Раскопкі 1966 і 1968 г.

Раскопкі праводзіліся звычайнай методыкай даследавання старажытных гарадоў. Раскоп разбіваўся на квадраты (кв.) памерам 2 × 2 м, ускрыццё культурнага слоя рабілася пластамі таўшчынёй 20 см. Спачатку было распрацавана ў розных месцах замчышча – тры невялікія раскопы агульнай плошчай 68 м^2 і зроблена зачыстка агалення вала, пра якую гаварылася вышэй. Усе раскопы былі арыентаваны па краінах свету і нумераваліся ў парадку іх распрацоўкі. Парадкавай была лічбавая нумарацыя квадратаў (мал. 3).

Раскоп-1 памерам 6 × 6 м (кв. 1–9) закладзены за 14 м ад абрыву Гайны. Усе наступныя раскопы ўшчыльную прывязваліся да гэтага пачатковага раскопу (мал. 3). У раскопе магутнасць культурных адкладаў складае 0,8–1,1 м. Тры верхнія пласты (50–60 см) уяўлялі сабой шэрую зямлю. Ніжэй ішлі два ці месцамі амаль тры пласты чорнай зямлі. Паміж слаямі шэрай і чорнай зямлі праходзіла невялікая праслойка пяску.

У трох верхніх пластах сустракаліся абломкі пасудзін з зялёнай палівай і паліваная пячная кафля. Гэтыя пласты датуюцца XVI–XVIII стст. і больш познім часам. У іх пераважае позняя кераміка – пячныя гаршкі з нізкай шыйкай. У пластах (пл.) 4–6 відавочна кераміка часоў Полацкага княства. Тут выяўлены сярэднявяковыя артэфакты: 2 оўруцкія каменныя прасліцы для верацёнаў, 2 фрагменты шкляных бранзалетаў (карычневага і зялёнага колеру), зроблены з рога трапецападобны грэбень, фрагменты ад плоскіх пружын нутранога замка́, пашкоджаная шпора, жалезныя наканечнікі стрэл. Важнае значэнне мае выяўленне жалезнага ключа на мацерыку (прыродным грунце) ранняга тыпу з прамавугольнай «лапатачкай» X–XI стст. (мал. 4: *15*).

Раскоп-3 (кв. 14–17) быў закладзены за 18 м ад раскопа-1. Адзін са старажылаў пераконваў нас, што на гэтым месцы калісьці знаходзілася драўляная царква. Сапраўды, на старым плане Лагойска прыкладна тут абазначана царкоўная пабудова (мал. 2). Магутнасць культурнага слою ў раскопе-3 складае 1,2 м (6 умоўных пластоў).

У пл. 1 і 2 сустракаліся кавалкі позняй цэглы. Шырыня цаглін 13 см, таўшчыня 7 см. Выяўлена бервяно, якое праходзіла праз увесь раскоп. У пл. 2 і 3 знойдзена шмат кафлі з зялёнай палівай XVI ст. У ніжніх пластах раскопу-3, таксама як у раскопе-1, пераважае кераміка перыяду сярэдневяковай раздробленасці. Знойдзены оўруцкае прасліца, другі фрагмент пружыны ад нутранога замка́, лічына замка́ (мал. 4: *20*), вялікі тачыльны брусок (мал. 5: *13*).

Цалкам захаваўся плецены з меднага дроту бранзалет з петлепадобнымі канцамі (мал. 5: *10*). Знойдзена шмат кухоннай керамікі, а таксама некалькі абломкаў паўднёвых амфар.

Раскоп-2 распрацаваны ў паўночна-ўсходняй частцы Лагойскага замчышча на месцы значнай западзіны ў самым большым яе паніжэнні (мал. 1: *2*). Памеры раскопу 4 × 4 м (кв. 10–13). Культурны слой тут быў своеасаблівы. Да глыбіні 1,2 м ішоў шэры слой зямлі са знаходкамі паліванай кафлі і бытавой керамікі XVII–XVIII стст. Няма ніякіх рэштак пабудоў. Ствараецца ўражанне, што гэта насыпаны слой. Тут зямлёй засыпалі паніжэнне. На глыбіні 1,2 м – слой гравію таўшчынёй 0,2 м, пад якім знаходзіцца чорны слой. Яго таўшчыня ў паўночна-заходнім вугле раскопу складае 20 см, а ў паўднёва-заходнім – каля 1 м. У кв. 10 на мацерыку выяўлены слой пажарышча таўшчынёй да 20 см. У ім шмат касцей жывёл, знойдзены абломкі кругавой керамікі. Некалькі буйных фрагментаў верхніх частак пасудзін дазваляюць датаваць слой XII ст. Амаль на мацерыку знойдзены добра захаваныя жалезныя цуглі (мал. 4: *21*).

У часы Полацкага княства ў гэтай частцы існавала забудова. Мацярык быў моцна паніжаны ў паўднёвай палове раскопу. Магутнасць культурнага адклада ў паўночна-заходнім вугле раскопу складала 1,4 м, а ў супрацьлеглым паўднёва-заходнім вугле яна дасягала 2,5 м (мал. 6), што сведчыць аб пачатковай (прыроднай) няроўнай паверхні. На пляцоўцы Лагойскага замчышча рэшткі драўлянай забудовы не захаваліся. У яго культурным слоі не захавалася вырабаў з дрэва, скуры і іншых арганічных матэрыялаў, але было знойдзена шмат жалезных і іншых вырабаў (мал. 4, 5, 7).

У 1968 г. раскопкі на Лагойскім замчышчы бы-лі працягнуты. Даследавана 128 м^2 (кв. 18–49) (мал. 3). Новы раскоп шчыльна прымыкаў да раскопаў 1966 г. Магутнасць культурнага слою ў сярэднім 0,8 м, месцамі яна дасягала 1,2 м. У двух верхніх пластах знаходак мала. Сустракалася кераміка XVII–XVIII стст., фрагменты кафлі. Адкапана позняя вы-кладка з булыжных камянёў без рошчыны (мал. 6).

Выяўлена значная колькасць жалезных вырабаў: наканечнікі стрэл, восці, авальнае крэсіва, стрэмя, абломак ляза сякеры, дэталі нутраных замкоў,



Мал. 6. Профіль раскопу-2 (*а*, раскопкі 1966 г.) і раскоп з выкладкай камянёў (*б*)



Мал. 7. Вырабы з жалеза: *1, 4, 5* – нажніцы; *2, 3* – цвікі; *6, 7, 9, 11, 15* – нявызначаныя знаходкі; *8* – дужка вядра; *10* – іголка; *12* – лыжкар; *13* – камертон; *14, 19, 20* – колцы; *16* – фрагмент сашніка; *17, 18* – нажы. Лагойскае замчышча. Раскопкі 1968 г.

абломак шпоры, серыя ключоў (мал. 8: *17–23*). Знойдзены тры экзэмпляры пружынных нажніц, фігурны разец (лыжкар), нажы, цвікі, гіра для важання (мал. 5: *12*). Захаваліся жалезны сашнік, кавалак неапрацаванага жалеза, магчыма, крыцы дыяметрам 9 см, таўшчынёй 6 см.

У ніжнім пласце замчышча былі дзве керамічныя маёлікавыя пліткі памерамі 8,5 × 8,5 × 2,0 і 8,0 × 8,0 × 1,8 см. Адна дэкаратыўная плітка пакрыта тоўстым слоем пашкоджанай агнём палівы, які мацуецца на керамічнай аснове (мал. 9: *2*). Другая плітка з палівай карычневага колеру (мал. 10: *1*). Такія пліткі выяўлены пры раскопках у Друцку і Мінску. Цікава, што пліткі з трох гарадоў XII–XIII стст. не маюць слядоў рошчыны і пабывалі ў пажары. Магчыма, яны аздаблялі падлогі драўляных пабудоў. Відаць, на Лагойскім замчышчы была пабудавана старажытная драўляная царква, падлога якой выкладвалася маёлікавай дэкаратыўнай пліткай. Факт выкарыстання маёлікавых плітак у драўляных храмах зафіксаваны даследчыкамі: пліткі клалі на слой сырой гліны. Не выключана, што рабілася насцілка плітак на сухую пясчаную падсыпку.



Мал. 8. Вырабы з жалеза XI–XIV стст.: *1–5, 8* – наканечнікі стрэл; *6* – гарпун; *7* – крэсіва; *9, 13, 15* – дэталі замкоў; *10* – нявызначаны прадмет; *11* – стрэмя; *12* – фрагмент цугляў; *14* – фрагмент сякеры; *16* – фрагмент шпоры; *17–23* – ключы. Лагойскае замчышча



Мал. 9. Знаходкі з Лагойскага замчышча: *1* – абломак глінянай амфары; *2* – плітка керамічная; *3–5* – вырабы з жалеза



Мал. 10. Вырабы з каменю і іншай сыравіны: *1* – плітка падлогі; *2, 3* – сякеры; *4, 5* – тачыльныя брусочкі; *6* – загатоўка; *7* – праселка; *2–5, 7* – камень; *6* – косць. Раскопкі 1968 г.



Мал. 11. Вырабы з гліны (*1–4*) і каляровых металаў (*5–7*). Лагойск



Мал. 12. Прадметы з раскопак Лагойскага замчышча: *1–8, 15–25* – жалеза; *9* – каляровы метал; *10–12, 14* – косць; *13* – шкло (бранзалет)

Знойдзены адзінкавыя вырабы з каляровых металаў: бронзавы конік, звычайна датаваны XI ст. (мал. 11: *7*) і падковападобная фібула-шпілька для аддзення, якая мае патоўшчаныя канцы (мал. 11: *5*). У другой падковападобнай фібулы (верагодна XI ст.), на канцах змешчана стылізаваная зааморфная выява (мал. 12: *9*).

На ўчастку культурнага слою 124 м^2, распрацаванага ў 1968 г., пл. 3–5 утрымліваюць знаходкі сярэдневяковага часу. Сярод бытавой керамікі пераважаюць абломкі гаршкоў, тыповых па форме для Полацкай зямлі канца X – XIII ст. Гаршкі падзяляюцца на чатыры групы (11: *1–4*), аб тыпах і датаванні якіх будзе сказана ніжэй (мал. 13).

На плошчы, распрацаванай у 1971 г., магутнасць культурнага слою па лініі кв. 50, 52, 54, 56 складала ад 0,6 да 1 м (мал. 3). Зверху ляжыць «пусты» слой, пазбаўлены старых знаходак. Ніжэй ідзе слой чорнай зямлі. Па напрамку кв. 85–91 каля заходняга краю магутнасць слою 0,9 м, а з усходняга яна дасягае 1,4 м. Характар культурных адкладаў істотна не змяняецца, калі няма перакопаў. Зверху – слой баласта, а ніжэй ляжыць пласт чорнай зямлі са старажытнымі знаходкамі.

Была выяўлена значная колькасць артэфактаў. Яны з'яўляюцца рэчавымі крыніцамі для вывучэння заняткаў гараджан рамяством, гандлем, земляробствам, даюць магчымасць уявіць побыт людзей, якім ён быў амаль тысячу гадоў таму.

У невялікім раскопе-3 (кв. 14–17) (1966 г.) знойдзена шмат кафлі з зялёнай палівай. Каб удак-



Мал. 13. Групы керамікі (I–IV) з абазначэннем іх колькасці. Лагойск. Раскопкі 1966 і 1968 г.

ладніць месца размяшчэння мураванай пабудовы, у 1980 г. Г. В. Штыхавым, пры ўдзеле спецыялістаў па вывучэнні познасярэдневяковай даўніны А. А. Трусава і У. В. Угрыновіча, была зроблена прырэзка да раскопу-3 (кв. 106–110). Пл. 1 уяўляў сабой шэры слой. Тут сустракалася шмат кавалкаў цэглы. У пл. 2 на глыбіні 0,3 м выяўлены рэшткі фундамента пабудовы першай паловы XVI ст. Падлога вымашчана пліткамі, якія захаваліся ў невялікай колькасці ў кв. 106 (мал. 14). Памеры цэглы складалі (32,5 × 16 × 6,5) см. Знойдзены фрагменты кафлі з зялёнай палівай. На адным фрагменце – адлюстраванне сонца з абліччам чалавека. Побач было шмат керамікі XIV–XVIII стст. Пласт эпохі Полацкага княства тут моцна пашкоджаны перакопам XVI ст. у сувязі з пабудовай гэтага памяшкання. Матэрыялаў XI–XIII стст. знойдзена мала – некалькі абломкаў керамікі і цыліндрычны замок.

Прыгадаем, што ў 1966 г. на Лагойскім замчышчы даследавана 68 м^2, у 1968 г. – 126 м^2 (кв. 18–49). У чэрвені 1971 г. вывучана 112 м^2, а ў верасні гэтага ж года – яшчэ 112 м^2. У 1980 г. раскапана 20 м^2 (кв. 106–110). Усяго за чатыры гады даследавана 440 м^2 культурных напластаванняў (мал. 3). Было выяўлена некалькі тысяч знаходак. Больш за тысячу адзінак перададзена ў Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей імя Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў.

Такім чынам, на Лагойскім замчышчы магутнасць культурных адкладаў у асноўным складае 0,8–1,1 м. Тры верхнія археалагічныя пласты (па 20 см) да глыбіні 50–60 см уяўляюць шэрую зямлю, дзе сустракаюцца знаходкі розных часоў, але часцей XVI–XIX стст. У наступных пластах выяўлена значная колькасць знаходак XI–XIII стст. і некалькі абломкаў керамікі больш ранняга часу. Характар культурных адкладаў істотна не змяняецца (калі няма перакопаў). Зверху – слой баласта, ніжэй – слой чорнай зямлі са старажытнымі знаходкамі. Выяўлены асобныя артэфакты, якія маюць вузкае датаванне (XI – пачатак XII ст.): гэта жалезныя ключы (тып А, па Б. А. Колчыну), конік-амулет XI ст. [25], масіўны шып ад шпоры канца X – XI ст., раннекругавая кераміка. Час пабудовы першапачатковага вала застаецца невядомым.

Восенню 1968 г. Г. В. Штыхавым была зроблена спроба даследаваць культурны слой на месцы мяркуемага пасада (мал. 1). На поўдзень ад замчышча, недалёка ад абрыву рова (насупраць будынка пажарнай), быў закладзены шурф памерам 2 × 2 м. Слой вельмі цвёрды, насычаны бітай цэглай, кавалкамі бляхі, шкла, іншымі сучаснымі рэчамі і так да мацерыка. Таўшчыня слою не перавышала 1 м. У другім месцы (недалёка ад музычнай школы) школьнік знайшоў у глебе ўтульчаты наканечнік стралы часоў Полацкага княства.

У 1980 г. падчас назірання за земляными работамі за 150 м на захад ад уваходу ў замчышча



Мал. 14. Размяшчэнне квадратаў 106–110, даследаваных у 1980 г.

Г. В. Штыхавым зафіксавана таўшчыня культурнага слою 1,4 м. Зверху быў жоўты пясок, ніжэй – культурны пласт чорнага колеру. На глыбіні 0,9 м знойдзены венчык гаршка XVI ст. Пасад сярэдневяковага горада прымыкаў да замчышча з паўднёвага боку і пачынаўся ад берага Гайны, дзе знаходзіцца царква.

У 2009 г. краязнавец М. М. Рудзевіч падчас земляных работ па вул. Заазерскай на глыбіні 0,25–0,75 м выявіў у культурным напластаванні абломкі глінянага посуду, сярод якіх былі два венчыкі, верагодна, XI ст. (мал. 15: *1, 2*). Месца размяшчэння керамікі знаходзіцца на адлегласці 600 м на поўдзень ад Лагойскага замчышча. Тут працякае ручай Лапенец. Гэта знаходка з культурнага пласта дазваляе гаварыць пра даволі значны па плошчы пасад Лагойска ў XI ст.

Можна меркаваць, што сучасная галоўная вуліца горада, сапраўды, з'яўляецца адрэзкам старога тракта ад Мінска на Полацк і яна заўсёды служыла стрыжнем яго планіровачнай структуры, як лічаць некаторыя гісторыкі горадабудаўніцтва [32, с. 66].

Узбраенне дружыннікаў. Пры археалагічных даследаваннях Лагойскага замчышча выяўлены прадметы ўзбраення воіна і амуніцыі баявога каня. Знойдзены жалезны наканечнік дзіды (мал. 9: *3*). Наканечнік такога тыпу датуецца ў Заслаўі X – першай паловай XI ст.

Да зброі бліжняга бою адносяцца сякеры. У калекцыйным вопісе знаходак з Лагойскага замчышча



Мал. 15. Кругавая кераміка: *1, 2* – са старажытнага паселішча па вул. Заазерская ў Лагойску; *3–6* – з курганоў у наваколлі Лагойска, раскапаных К. і Я. Тышкевічамі

за 1971 г. абазначаны «абломак сякеры (абух)». Цяжка сказаць да якой сякеры, баявой ці рабочай, ён належаў. Гэта ж самае можна сказаць пра знойдзенае лязо сякеры (мал. 8: *14*).

Да асноўнага віду зброі далёкага бою належалі лук і стрэлы. У Лагойску знойдзены 21 жалезны наканечнік стрэл. Паводле прымацавання да дрэўка, наканечнікі стрэл падзяляюцца на чарэшкавыя і ўтульчатыя. Чарэшкавыя маюць знізу завостраны стрыжань (мал. 12: *1, 2*), утульчатыя – металічную трубку для насаджвання на канец дрэўка стралы (мал. 4: *3, 4*). Сярод наканечнікаў з Лагойска пераважаюць па колькасці чарэшкавыя наканечнікі. Выяўлены двухшыпны наканечнік з кароткімі шыпамі (мал. 12: *2*). Такі наканечнік, знойдзены ў Заслаўі і датуецца другой паловай XII – першай паловай XIII ст. [7, с. 64].

Чатыры наканечнікі з Лагойска маюць ромбападобнае плоскае пяро. Іх агульныя памеры 7–10 см. Звычайна датуюцца XI – пачаткам XIII ст. Знойдзена пяць шылападобных наканечнікаў стрэл, якія маюць рамбічнае сячэнне (мал. 8: *2, 3*). Падобныя наканечнікі датуюцца ад X да XIV ст. уключна. Наканечнік з Заслаўя мае больш вузкае датаванне – X–XI стст. [7, с. 64, рис. 40: *14*].

Дружыннікі хадзілі ў паход на конях. Часткай вупражы верхавога каня служыла вуздэчка і цуглі, прымацаваныя да яе. На Лагойскім замчышчы знойдзены жалезныя цуглі, якія цалкам захаваліся (мал. 4: *21*). Выяўлены яны ў раскопе-2 у пласце пажарышча на мацерыку. Акрамя таго, у раскопе-1 знойдзена дэталь цугляў, якая ў археалогіі завецца «псалія» (мал. 12: *24*).

З прадметаў амуніцыі конніка ў Лагойску сустрэта стрэмя (мал. 8: *11*). Яно ўяўляла сабой дужку з вушкам для ўпору нагі конніка. Стрэмя падвешвалася да сядла пры дапамозе рэменя шырынёй 1,6 см. Такія страмёны рабіліся з шырокай пласцінкі і мелі шырэйшую ўдвая паўкруглую падножку, зручную для мяккага раннесярэдневяковага абутку, у тым ліку для ботаў. Такія страмёны былі тыповымі для XII–XIII стст. [18, с. 186].

Абавязковай прыналежнасцю конных воінаў з'яўлялася жалезная шпора. У Лагойску знойдзены абломкі трох шпор. Лепш захавалася шпора, зробленая з жалезнага дроту паўкруглага сячэння з шыпам, павернутым уніз амаль пад прамым вуглом (мал. 12: *21*). Шпора мела па дзве пятлі з двух бакоў для прымацавання рэменем. У шпоры быў шарападобны шып, мяркуючы па аналогіях, выяўленых у Ваўкавыску. Датуюцца шпоры такога тыпу XII–XIII стст. Ад другой шпоры захавалася толькі невялікая частка.

Асаблівае значэнне мае адзінкавая знаходка адламанага ад шпоры масіўнага шыпа. Яго даўжыня 6 см, таўшчыня 1,1 см (мал. 16: *8*). Выраблялiся такія шпоры з паўкруглага ці блізкага да квадрата дроту. У 1965 г. у Ваўкавыску на Муравельніку ў пласце канца X – пачатку XI ст. знойдзены разам тры добра захаваныя шпоры такога тыпу. Адна з іх была інкруставаная тонкім медным дротам. Шпоры выкарыстоўваліся ў Ваўкавыску з X да XII ст. Падобныя шпоры былі распаўсюджаны ў Наваградку ў XI–XII стст. і ў Гародні ў XI–XIII стст. У Польшчы такія прадметы амуніцыі конніка выкарыстоўваліся ў X–XI стст. [8, с. 114]. Шпора з Лагойска – адна з ранніх знаходак канца X – XI ст. Лагойскага замчышча, дзе яна была выяўлена амаль на мацерыку.

Прадметы ўзбраення воіна і амуніцыі баявога каня сведчаць, што ў Лагойску знаходзілася дружына, якую ўзначальваў князь, і яна мела зброю, неабходную для баявых дзеянняў.

Рамесніцкая вытворчасць. Вядучай галіной рамесніцкай вытворчасці ў сярэдневяковых гарадах на тэрыторыі Беларусі з'яўлялася апрацоўка чорнага металу. З яго выраблялiся шматлікія рэчы – рамесніцкія інструменты, земляробчыя прылады працы,

зброя, прадметы хатняга ўжытку, якія знойдзены падчас археалагічных раскопак. Зыходным матэрыялам для кавальскай справы было жалеза.

Лагойшчына мела значныя, у маштабах вытворчасці сярэдневяковага часу, запасы руды. Буры жалязняк выходзіць на значнай адлегласці ў адкладах поплава, а таксама ў самім рэчышчы ракі Ілля ў Лагойскім раёне. Як устанавілі даследчыкі, гэты жалязняк даволі плотны, паводле хімічнага аналізу ўтрымлівае да 58,8% жалеза [2, с. 142].

Рэшткі глінабітных печаў-дамніц і жалезны шлак былі выяўлены ў 1915 г. маладым археолагам, тады студэнтам Петраградскага універсітэта, М. В. Шавельскім на гарадзішчы Замкавая гара (Замкавішча), размешчаным у лесе за 1 км на паўднёвы-захад ад Лагойска. А. М. Ляўданскі ў 1923 г. пры раскопках гарадзішча каля вёскі Свідна на правым беразе Гайны выявіў жалезны шлак і рэшткі гліняных жалезаапрацоўчых печаў ранняга жалезнага веку. Археалагічныя даныя сведчаць, што за тысячу гадоў да з'яўлення Лагойска абарыгеннае насельніцтва на Лагойшчыне было знаёма з жалезам і яго апрацоўкай. Наогул у Лагойску знойдзена некалькі соцен жалезных вырабаў XI–XIII стст. Можна не сумнявацца, што большасць з іх зроблены мясцовымі рамеснікамі.

Для вывучэння кавальскай апрацоўкі жалеза ў Лагойску быў прыменены металаграфічны аналіз, які выканаў прафесар М. Ф. Гурын [4, с. 49]. Гарадскія рамеснікі ў XI–XIII стст. выкарыстоўвалі складаныя тэхнічныя прыёмы. На рабочыя часткі прылад працы – нажоў, нажніц, сякер і іншых, наварваліся сталёвыя палосы.

З жалеза і сталі кавалі выраблялі інструменты для розных рамёстваў, сельскагаспадарчыя прылады, прадметы ўзбраення, шматлікія бытавыя рэчы. Тыповай прыладай працы з'яўляецца жалезная скобля, знойдзеная ў Лагойску. Гэты выраб выкарыстоўвалі для здзірання кары з бярвення і грубага яго струганя.

У розных відах рамяства знаходзіць ужытак свідраванне – прыём нанясення адтулін у цвёрдых матэрыялах. У Лагойску знойдзены абломак ніжняй часткі жалезнага свердла ці яго пяро (мал. 12: *16*). Свердзел меў металічны стрыжань, а рабочая частка – лыжкападобную форму з дзвюма рэжучымі гранямі.

Жалезны разец – даволі рэдкая знаходка. Рабочая частка інструмента – тонкая, вострая з абодвух бакоў, крута загнутая пласціна (мал. 7: *12*). Разцамі карысталіся каўшэчнікі для апрацоўкі ўнутранай часткі каўшоў і лыжак. На думку вядомага даследчыка Б. А. Колчына, галоўным прызначэннем такіх інструментаў было іх выкарыстанне токарамі па дрэве [10, с. 42]. У сярэднявечным Лагожску існавала такарная справа.



Мал. 16. Вырабы: *1–13, 16–25* – з жалеза; *14, 15* – з валынскага сланца

Цікавай знаходкай з Лагойска з'яўляецца жалезная лыжка (мал. 9: *5*). Яе памеры 5 × 5 см, глыбіня 1,5 см. Магчыма, лыжка выкарыстоўвалася як прылада працы і выконвала ролю тыгля для плаўкі металла, неабходнага ў ювелірнай справе.

Прадукцыяй ганчарнага рамяства была бытавая кераміка, сярод якой у Лагойску пераважаў кухонны посуд. Калекцыя керамікі служыць каштоўнай крыніцай для вывучэння ўзроўню ганчарства ў розныя перыяды гісторыі горада. Вывучэнне керамікі з раскопак Полацка, Віцебска, Лукомля прывяло нас да высновы, што ганчарны круг з'явіўся каля сярэдзіны X ст. У другой палове гэтага стагоддзя ва ўсіх гарадах выкарыстоўваўся ганчарны круг для вырабу кухонных гаршкоў. Адбыліся якасныя змены ў ганчарнай справе. Яна вылучылася ў важную галіну сярэдневяковай рамеснай вытворчасці. У гэтым сэнсе Лагойск не мог быць выключэннем сярод іншых гарадоў Полацкай зямлі.

У Лагойску знойдзены адзінкавыя абломкі гліняного посуду, зробленага ад рукі, сярод якіх два венчыкі: адзін амаль прамы (мал. 11: *1*), другі крыху адагнуты і мае арнамент (мал. 11: *2*). Уся астатняя кераміка зроблена на ганчарным крузе. Калекцыя кругавой керамікі з раскопак Лагойска налічвае многія сотні фрагментаў. У 1968 г. была класіфікавана

кругавая кераміка з раскопаў-1, 3 агульнай плошчай 194 м^2 (мал. 13).

Тып I уключае кераміку з простым адагнутым венчыкам і пакатымі плечукамі. Тут вылучаецца тры віды посуду. У першым край венчыка коса зрэзаны, у трэцім – венчык мае паглыбленне. Гэта група ранняй кругавой керамікі. У Полацку такі матэрыял адносіцца да другой паловы X – XI ст. [38, с. 81, рис. 40]. Прыкладна так яна датуецца ў Заслаўі [7, с. 190].

Тып II асноўны, найбольш распаўсюджаны ў гарадах Полацкай зямлі XII–XIII ст. Гаршкі маюць выгнутую мякка прафіляваную шыйку. У віду 2 венчык скошаны ўсярэдзіну і нагадвае спецыфічны полацкі тып керамікі [38, рис. 40]. Від 3 мае акруглы край венчыка, які загнуты ўсярэдзіну і добра прыстасаваны для прылягання крышкі.

Тып III зусім нешматлікі, у пасудзіны рэзка адагнуты верхні край з венчыкам.

Тып IV аб'ядноўвае гаршкі з вельмі кароткай шыйкай. У віду 1 край венчыка зрэзаны, у віду 2 край венчыка акруглены. Гаршкі гэтага тыпу характэрны для другой паловы XVI – XVII ст.

У раннесярэдневяковым Лагожску існавалі розныя рамёствы (жалезаапрацоўчае, ганчарнае, дрэваапрацоўчае і інш.). Каб дасягнуць пэўнага поспеху, рамесніку неабходна было ведаць сакрэты цяжкага рамяства, валодаць навыкамі майстэрства, мець умелых памочнікаў, якімі з'яўляліся члены яго сям'і.

Сваё сталае месца ў гаспадарчым жыцці горада займалі прадзенне і ткацтва. Гэта былі заняткі кожнай жанчыны не толькі ў вёсцы, аднак таксама і ў горадзе: пралі лён, авечую воўну, пяньку (валакно з каноплі). Гэтымі вельмі працаёмкімі заняткамі займаліся выключна жанчыны.

Сведчанні гандлёвых і культурных сувязей. У раннім сярэдневякоўі былі шырока распаўсюджаны праселкі з ружовага і шэрага сланцу («оўруцкага шыферу»), радовішчы якога знаходзяцца каля г. Оўруча Жытомірскай вобласці (Украіна), дзе вырабляласа асноўная колькасць праселкаў. Адтуль яны траплялі ва ўсходнеславянскія (старажытнарускія) гарады ў вялікай колькасці. У Лагойску выяўлена 16 такіх вырабаў (мал. 5: *4–6*; 16: *14, 15*).

Шмат у якіх гарадах XII – першай паловы XIII ст. вельмі папулярным упрыгажэннем з'яўляліся шкляныя бранзалеты ў выглядзе кольцаў са шкла, як насілі на руцэ вышэй кісці. Бранзалеты вырабляліся са шкла розных колераў: ад празрыстых да цёмных адценняў. У Мінску на замчышчы выяўлена больш за тысячу фрагментаў гэтых ломкіх вырабаў. Адзін бранзалет аказаўся цэлым. Колер бранзалетаў: сіні, блакітны, зялёны, карычневы. Большасць бранзалетаў выраблена ў Кіеве, як засведчана спецыяльнымі аналізамі.

У Лагойску знойдзены толькі тры фрагменты шкляных бранзалетаў (мал. 5: *7, 8*; 12: *13*) карычневага, зялёнага, сіняга колеру. Варта прыгадаць, што ў Заслаўі, дзе даследавана значная частка культурных напластаванняў сярэдневяковага горада, знойдзены чатыры фрагменты шкляных бранзалетаў. Цяжка знайсці здавальняючы адказ на пытанне, чаму ў Лагойску, Заслаўі, а таксама ў Браславе практычна не ўжываліся шкляныя бранзалеты, вельмі распаўсюджаныя ў іншых гарадах Полацкай зямлі (Полацку, Мінску, Віцебску, Лукомлі, Оршы, Копысі, Друцку, Барысаве).

На Лагойскім замчышчы выяўлена 17 абломкаў паўднёвых амфар XII – першай паловы XIII ст. Адзін абломак даволі буйны. Таўшчыня сценак амфары складала 2 см, яе паверхня была пакрыта рыфленнем (мал. 9: *1*). Амфары – гліняныя пасудзіны з высокім горлам і дзвюма вертыкальнымі ручкамі. У іх трымалі і перавозілі вадкія прадукты. Фрагменты амфар знойдзены амаль ва ўсіх беларускіх гарадах, найбольшая колькасць у Навагрудку – 2202 фрагменты ад пяці тыпаў. Вышыня некаторых амфар дасягае 50 см, дыяметр тулава – 24 см [16, с. 185].

Амфары добра вядомы ў шматлікіх гарадах Кіеўскай Русі. Іх прывозілі з візантыйскіх гарадоў паўночнага і заходняга ўзбярэжжа Чорнага мора, дзе выраблялі тару для перавозкі віна, аліўкавага масла і іншых вадкасцей. Разам са сваім змесцівам амфары імпартаваліся ў цэнтры Усходняй Еўропы. Трэба сказаць, што імпартныя тавары не траплялі ў Лагойск непасрэдна з цэнтраў іх вырабу, а дастаўляліся шляхам транзіту праз буйныя гарады: Кіеў, Ноўгарад, Полацк, Смаленск і інш.

Сярод разнастайных імпартных вырабаў даследчыкі вылучаюць групу прадметаў, якія называюць «падковападобныя фібулы з патоўшчанымі канцамі». Падковападобная фібула мае амаль круглую форму ды іголку ў выглядзе стрыжня. Выраблялiся яны з бронзы, некаторыя былі арнаментаваныя. Такі выраб трапіўся ў Лагойску. Ён авальны ў сячэнні, мае арнамент са спіраляў і завіткоў (мал. 11: *5*). Памеры фібулы – 4 × 4 см. Датаваны яны XII – пачаткам XIII ст.

На тэрыторыі Усходняй Еўропы такіх фібул знойдзена 48. У Беларусі яны выяўлены ў Засвіры, Наўрах, Стара-Барысаве, Лукомлі, Браславе, Гродне, Навагрудку, Слоніме, Ваўкавыску, Мсціславе, Турыйску, Мінску, Суляцічах [28]. Большасць фібул належыць тэрыторыі паўднёва-ўсходняй Прыбалтыцы, адкуль такія ўпрыгажэнні пранікалі ў славянскія гарады і паселішчы.

Трапілася ў Лагойску яшчэ другая шпілька, зробленая з каляровага металу, іголка ў ёй не захавалася. У сячэнні шпілька круглая, на яе канцах праглядаюцца стылізаваныя выявы (мал. 12: *9*). Падобная фібула знойдзена пры раскопках курганоў XI ст. каля вёскі Захарнічы Полацкага раёна [34,

мал. 45: *13*]. Блізкія аналогіі вядомы ў старажытнасцях усходняй Прыбалтыкі.

Вырабаў з каляровых металаў на Лагойскім замчышчы мала. Адзіным экзэмплярам прадстаўлена літая паясная спражка з авальнай пярэдняй часткай і прамавугольным прыёмнікам для рэменя (мал. 11: *6*). Спражка раздзелена воссю для замацавання язычка, які не захаваўся і, відаць, быў жалезным. Блізкі па форме варыянт ліпападобнай спражкі сустрэты ў Ноўгарадзе ў пласце XII–XIII стст. [27, рис. 56: *8*].

У Лагойску знойдзена стылізаваная плоская падвеска-конік з загнутым уверх хвастом і выцягнутымі вушамі. Ён дэталёва выраблены, на паверхні нанесены кружковы пуансонны арнамент, характэрны для дадзенай групы вырабаў (мал. 11: *7*). На капытах коніка адтуліны, у якія ўстаўляліся металічныя кольцы для прымацавання іншых падвесак. Конік адліты ў каменнай форме. Арэал падвесак-канікаў ахоплівае паўночную частку ўсходнеславянскай тэрыторыі (Бранскую, Калужскую, Смаленскую, Маскоўскую, Пскоўскую і іншыя вобласці) [31, с. 91].

Аднак найбольш сканцэнтраваны падвескі-конікі на прасторы рассялення смаленска-полацкіх крывічоў. Падвескі-конікі выяўлены на тэрыторыі Полацкай зямлі ў Віцебску (3 экз.), Лукомлі, Мінску, Браславе, Усвяце, на Менцы, Маскавічах. В. В. Сядоў лічыць, што з'яўленне такіх амулетаў звязана з балцкім субстратам смаленска-полацкіх крывічоў [25, с. 28].

На Лагойскім замчышчы знойдзены бранзалет з чатырох бронзавых дратоў (мал. 5: *10*). Выраб мае петлепадобныя канцы. Гэтакі бракаваны бранзалет вядомы ў Полацку [38, рис. 33: *25*]. На Лагойшчыне здаўна былі распаўсюджаны вітыя бранзалеты з канцамі, завязанымі двайным вузлом [37, с. 194]. Менавіта такі тып упрыгажэнняў маглі вырабляць мясцовыя рамеснікі.

Асаблівай увагі заслугоўвае жалезная гіра ад бязмена, без якога не абысціся пры гандлі. Такія гіры выкарыстоўваліся ў якасці меры пры важанні. Яе вышыня 11 см, дыяметр каля 9,5 см, вага 2250 г. У ніжняй частцы ёсць паглыбленне (мал. 5: *12*). Паводле формы, памераў і вазе Лагойская знаходка блізкая да гіры з Ноўгарада [10, с. 97]. Падобная знаходка вядома з Кукенойса – полацкай крэпасці ва ўсходняй Прыбалтыцы на Заходняй Дзвіне.

Варта прыгадаць, што ў 1902 г. у былой вёсцы Слабодка Лагойскага раёна знойдзены манетны скарб. Ён складаўся з 24 цэлых і 7 фрагментаваных сярэбраных плацёжных зліткаў наўгародскага і літоўскага тыпаў у выглядзе палачак (агульнай масай 3,3 кг). На двух наўгародскіх злітках графіці «птрва» (Пятрова). Скарб датуецца XIII–XIV стст. [21, с. 567].

Да гандлю мае адносіны шкляная знаходка. У верхнім пласце адкладаў на Лагойскім замчышчы выяўлены шкляны выраб «кварта». Гэта закрытая



Мал. 17. Знаходкі з Лагойскага замчышча: *1, 2* – кераміка; *3* – жалеза; *4* – шкло

пасудзіна – бутэлька з квадратным ці прамавугольным у плане донцам, якая мае завяршэнне кароткай шыйкай з вузкім рыльцам (мал. 17: *4*). Яе прыкладная вышыня 21 см, памеры донца 4,6 × 6,3 см. Кварта была разам з кафляй XVI ст. У Вялікім Княстве Літоўскім квартай называлася пасудзіна і адначасова мера вадкасці [41, с. 318].

Рэчы хатняга выкарыстання. У Лагойску знойдзены розныя прадметы паўсядзённага побыту і сярод іх шмат вырабаў з жалеза. Універсальным прадметам, які ўжываўся ў побыце і рамёствах з'яўляўся нож (24 экз.). Нажы XII–XIII стст. мелі вузкія клінкі даўжынёй ад 5 да 15 см (мал. 4: *6–10*; 7: *17, 18*), аддзеленыя ад дзяржання ўступамі. Лязо нажоў заканчвалася плаўным закругленнем.

Нажы насаджваліся звычайна на масіўнае драўлянае дзяржанне (тронкі). Разам з тым у Лагойску выяўлена дзяржанне, упрыгожанае цыркульным і лінейным арнаментам (мал. 12: *14*). Невялікая касцяная муфтачка для дзяржання нажа мае «ёлачны» арнамент (мал. 12: *10*). Большасць нажоў былі гаспадарчымі (кухоннымі), некаторыя маглі служыць для апрацоўкі дрэва і косці, а іншыя выкарыстоўваліся ў якасці зброі.

Нажніцы, як і нажы, – універсальныя інструменты і шырока ўжываліся ў побыце і рамястве

для рэзання і стрыжкі. У Лагойску знойдзены тры экзэмпляры нажніц (мал. 7: *1, 4, 5*). Яны спружынныя, названыя цяпер «авечымі». У сярэднія вякі іх выкарыстоўвалі не толькі для стрыжкі авечак, але і ў кравецкай справе.

На Лагойскім замчышчы знойдзены дзве іголкі з завостраным канцом і вушкам для ніткі: адна касцяная, другая жалезная. Касцяная іголка ў сячэнні авальная, даўжынёй 7,5 см, сярэдняя таўшчыня 3 мм, дыяметр вушка 1,5 мм. Напэўна, такія іголкі выкарыстоўваліся для сшывання конскай вупражы (мал. 12: *11*). Жалезная іголка нагадвае сучасныя вырабы, яе даўжыня 4 см, вушка не захавалася (мал. 7: *10*).

Крэсівы – жалезныя вырабы для высякання іскры і здабывання агню пры ўдары пласцінкі аб крэмень. На Лагойшчыне ў курганах каля вёскі Ізбішча знойдзена 14 крэсіваў. Амаль у кожным пахаванні з крэсівамі быў кавалак крэменю. У Ноўгарадзе Вялікім такія «калачападобныя» крэсівы выкарыстоўваліся з пачатку X – да апошняй чвэрці XII ст. У XII–XIII стст. ужываліся крэсівы двухлязовыя, авальныя па форме. У Лагойску знойдзена крэсіва такога тыпу (мал. 8: *7*). Крэсівы насілі ў мяшэчку разам з крэменем і кнотам каля пояса з левага боку.

У сярэдневякоўі вельмі распаўсюджанымі сталі замкі́ – прыстасаванні для запірання чаго-небудзь на ключ. Звязана гэта было з усталяваннем прыватнай уласнасці. На беларускіх землях засведчана ўжыванне замкоў з другой паловы X – пачатку XI ст. Ключ гэтага часу знойдзены ў кургане з трупаспаленнем каля вёскі Экімань Полацкага раёна [34, с. 120, мал. 67: *11*]. Выкарыстоўваліся замкі для замыкання дзвярэй жылых і гаспадарчых пабудоў, крышак куфраў, скрыняў, шкатулак і інш.

Усходнеславянскія замкі́ па форме корпуса і адпавядаючага ёй ключа падзяляюцца на нерухомыя (нутраныя) і навясныя (здымныя). У лагойскай калекцыі прысутнічаюць ад нерухомых замкоў 3 ключы, ад навясных – 12.

Найбольш раннім і адзіным у Кіеўскай Русі X–XI стст. быў навясны замок тыпу А. У замкў кубічнай формы ключ меў прамавугольную ці квадратную лапатачку з некалькімі адтулінамі, якія сціскалі спружыны на верхняй дужцы, і яна свабодна вынімалася з корпуса замка́. Такі ключ, у лапатачцы якога змешчаны чатыры квадратныя адтуліны, знойдзены ў Лагойску (мал. 4: *15*). Яго агульная даўжыня – 12 см, памеры лапатачкі 4 × 4 см. Аналагічныя ключы ў Ноўгарадзе датуюцца другой паловай X – XI ст. [10, с. 80]. Ключ з круглай лапатачкай ад замка цыліндрычнай формы, які датуецца тым жа часам (мал. 8: *17*).

Далейшым развіццём апісанага замка́ быў замок тыпу Б. Ключ ад яго змяніўся. Лапатачка (лопасць) была адагнута пад прамым вуглом да стрыжня. Ключ стаў каленчатым. Такіх ключоў у Лагойску знойдзена чатыры (мал. 8: *22, 23*). Новы цыліндрычны замок (тып В) меў ключ каленчатай формы з плоскім стрыжнем (мал. 8: *21*).

Сярод нерухомых (нутраных) замкоў налічваецца некалькі відаў. Жалезны ключ ад зусім простага нерухомага замка́ знойдзены ў Лагойску (мал. 12: *15*), чатыры ключы выяўлены ў Мінску [6, с. 330]. Замком служыла падоўжаная гладкая дошчачка-планка ці засаўка, якая рухалася паміж двума скобамі. Ключ устаўляўся ў адтуліну і пры павароце ўправа ці ўлева адсоўваў засаўку. Такімі ключамі карысталіся ў вёсках да XX ст. Былі яшчэ замкі з драўлянай засаўкай крыху іншай канструкцыі. Каленчаты ключ ад такога замка выяўлены ў Лагойску (мал. 16: *1*).

Больш складанымі з'яўляліся нерухомыя жалезныя замкі. Ключ XI–XII стст. меў пустацелы стрыжань і прамавугольную бародку з пяццю кантралюючымі круглымі адтулінамі (мал. 16: *3*). Ключ ад другога варыянта нерухомага жалезнага замка XII–XIII стст. меў востры выступ (цыпель) (мал. 12: *19*). На яго бародцы было пяць адтулін, прычым сярэдняя ў выглядзе крыжа. Выяўлена некалькі дэталяў ад замкоў (мал. 16: *18, 19*). Амаль цалкам захавалася плоская спружына ад нерухомага замка (мал. 8: *15*). Пласціны ад нерухомых нутраных замкоў знойдзены ў Гродне, Лукомлі, Брэсце [13, с. 241].

З нерухомымі замкамі для дзвярэй была звязана яшчэ адна распаўсюджаная знаходка – замочныя лічыны і накладкі пад дзвярныя ручкі (мал. 4: *17, 20*). Дзвярная ручка ўяўляла сабой жалезнае кальцо, якое прымацоўвалася вузкай жалезнай скабой (мал. 5: *2*).

Рэдкай знаходкай з'яўляецца мініяцюрны ключык, даўжынёй усяго 3,9 см. Мусіць, ён быў амулетам – сімвалам багацця і яго зберажэння. Па сваёй форме нагадвае найбольш распаўсюджаны тып ключоў XI–XII стст. (мал. 16: *2*). Насіліся яны таксама ў складзе другіх амулетаў [30, с. 288; 31, с. 96].

Не выклікае сумнення існаванне ў Лагойску бандарнай справы. Хваёвыя і ліставыя лясы на Лагойшчыне садзейнічалі рамёствам па апрацоўцы дрэва. З драўніны выраблялiся шматлікія прадметы хатняга ўжытку, у тым ліку вёдры, бочкі, кубкі, місы і інш. Дрэва ў культурных напластаваннях Лагойска не захоўваецца. Але знойдзены фрагменты жалезных дужак ад вядра, а таксама рэшткі жалезных абручоў ад іх. Абруч выглядаў вузкім жалезным вобадам, які набіваўся на кадушку, бочку, вядро ці кубак, складзены з драўляных дошчачак – клёпак.

Для расчэсвання валасоў служылі грабяні, выраблены з рога лася. У Лагойску карысталіся цэльнымі двухбаковымі грабянямі з рэдкімі зубамі на адным баку і частымі на другім (мал. 5: *1*; 12: *12*).

Самым архаічным элементам культуры, выяўленай на Лагойскім замчышчы, з'яўляюцца каменныя сякеры (мал. 10: *2, 3*). Шліфаваныя крамянёвыя сякеры-кліны з'явіліся ва ўжытку насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў канцы новага каменнага веку (неаліту). Найбольшае значэнне яны набывалі ў бронзавым веку (II тысячагоддзе да н. э.). Медзь і волава, сплаў якіх утварае бронзу, траплялі з поўдня (Каўказа і Прыкарпацця). Паступова на землях нашых продкаў узнікла бронзаліцейная справа. Адсутнасць уласнай сыравіны стрымлівала шырокае ўкараненне металічных вырабаў на тэрыторыі Беларусі.

Сякера выступае ў славянскай міфалогіі як сімвал бога Перуна, узброенага каменным молатам ці сякерай, які адбіваў варожыя навалы Чарнабога. Пярун разбіваў чорныя хмары і вада лілася на зямлю. Шырока распаўсюджана павер'е – хто мае каменную сякеру, таго мінуе маланка, не кране д'ябал [11, с. 10–11].

Каменныя сякеры бронзавага веку часта знаходзяць пры раскопках гарадоў. Так, у Полацку ў культурных напластаваннях XIII–XVII стст. іх выяўлена 16 (1969–1967 гг.). Большасць сякер мае клінападобную форму, як у Лагойску. Верагодна, з гэтымі каменнымі вырабамі ў жыхароў горада, якія недзе выпадкова знайшлі іх, былі звязаны рэлігійныя вераванні.

Паколькі ў культурным пласце Лагойскага замчышча дрэнна захоўваюцца арганічныя рэчывы раслiннага і жывёльнага паходжання, у ім не захаваліся рэшткі адзення і абутку. Уяўленне пра касцюм і абутак жыхароў раннесярэдневяковага гарадоў можна атрымаць па выніках раскопак у Полацку, Мінску, Віцебску, а таксама карыстаючыся этнаграфічнымі данымі, дачыненне да якіх мелі Канстанцін і Яўфімій Тышкевічы [1].

Даследаванне паселішча на Лагазінцы. Паходжанне назвы горада Лагожск працягвае цікавіць даследчыкаў. Меркаванне выклаў гісторык В. Л. Насевіч, які са спасылкай на мовазнаўцу В. П. Лемцюгову, пісаў: «Лагойск, як вядома, стаіць на рацэ Гайне. Аднак за 9 км вышэй па цячэнні ў яе ўпадае рачулка Лагазінка, на якой стаіць вёска Лагаза. Гэта наводзіць на думку, што некалі Лагазой называлася сама рэчка, а назву "Лагожск" магло атрымаць паселішча, якое першапачаткова існавала недзе ля яе ўпадзення ў Гайну. Пазней гэта паселішча магло быць перанесена на новае, больш зручнае месца, захаваўшы пры гэтым старую назву (такая практыка пераносу гарадоў была даволі звыклай у той час). Праўда, ніякіх археалагічных доказаў на карысць гэтай гіпотэзы мы пакуль не маем, але не выключана, што яны могуць з'явіцца ў будучым» [19, с. 49].

Паводле «Карты рэк», выдадзенай былым Інстытутам энергетыкі Беларускай акадэміі навук у 1959 г.,



Мал. 18. Схематычны план археалагічнага комплексу «Лагазінка» каля в. Старое Гарадзішча Лагойскага раёна

рэчка мае назву «Логозинка» (Лагазінка), з'яўляецца правым прытокам Гайны. Даўжыня Лагазінкі каля 10 км, у яе сярэднім цячэнні знаходзіцца вёска Лагаза, цэнтр Лагазінскага сельскага савета Лагойскага раёна.

Недалёка ад вытокаў Лагазінкі на левым яе беразе, на высокай (пануючай) гары знаходзіцца гарадзішча. Яго мясцовая назва «Замкавая гара» (мал. 18). У 1963 г. гэтыя месцы абследаваў вядомы археолаг Л. Д. Побаль. У сваёй справаздачы, а затым у публікацыі ён упамінае рэчку «Замкавую», відаць, бытавую мясцовую назву [20, с. 329].

Гарадзішча размешчана за 0,3 км на паўднёвы захад ад вёскі Старое Гарадзішча. Недалёка, на супрацьлеглым правым беразе ракі знаходзіцца вёска Новае Гарадзішча. Л. Д. Побаль зняў план археалагічнага помніка – гарадзішча. Яго пляцоўка авальнай формы мае памеры 65 × 32 м і вышыню 40 м над узроўнем вады ў рэчцы. Гарадзішча было ўмацавана валамі і равамі. Вал праходзіў па краі пляцоўкі. Былі яшчэ два кальцавыя валы і равы. Бліжэйшы да пляцоўкі роў і знешні вал добра прасочваюцца. Іншыя знешнія валы моцна разбураны, і равы апынуліся засыпанымі. Л. Д. Побаль адзначыў, што ўся пляцоўка гарадзішча, а ў некаторых месцах і схілы заняты сучаснымі сельскімі могілкамі. Л. Д. Побаль пісаў у справаздачы, што куль-



Мал. 19. Кераміка: *а* – з гарадзішча; *б* – з селішча-2. Комплекс «Лагазінка»

турны слой гарадзішча мае чорную і шэрую афарбоўку. У ім знойдзены два абломкі грубаляпных пасудзін. Адзін гладкасценны шэра-чорнага колеру, другі – чырвоны звонку і шэры з другога боку, акрамя таго, з гэтага боку ёсць штрыхоўка.

З паўночна-заходняга боку да гарадзішча прылягае селішча, адкрытае Л. Д. Побалем у 1963 г. Тады яно разворвалася і мела плошчу да 1,5 га. У некаторых месцах былі бачны чорныя плямы, дзе знойдзены абломкі ляпной і ганчарнай керамікі. Выяўленую кераміку Л. Д. Побаль датаваў другой паловай I тысячагоддзя н. э. Даследчык меркаваў, што тут былі пабудаваны паўзямлянкавыя жытлы. Знойдзена каменная зерняцёрка, глінянае біканічнае праселка з вялікай адтулінай, два каменныя брускі, фрагмент глінянага грузіка, жалезны нож, вялікая колькасць жалезных шлакаў і ганчарная кераміка розных тыпаў [20, с. 329].

У 2004 г. мне давялося абследаваць берагі Лагазінкі. Гара і яе схілы каля вёскі Старое Гарадзішча ўся была занята сучаснымі могілкамі. Яны ўзніклі таксама на селішчы, адкрытым Л. Д. Побалем у 1963 г.

У 2006 г. Г. В. Штыхаў разам з настаўнікам гісторыі У. У. Хартановічам больш дэталёва абследавалі гарадзішча ў надзеі знайсці якія-небудзь старажытныя матэрыялы. Варта адзначыць, што ў паўночнай частцы яго пляцоўкі каля схілу захаваліся рэшткі вала вышынёй не менш 2 м, што сведчыць аб магутных умацаваннях гарадзішча. Уся пляцоўка цяпер вельмі шчыльна занята магіламі. Адна з іх адносіцца да 1900 г., як сведчыць надпіс на каменным помніку. Некаторыя магілы вырыты зусім нядаўна. Правесці тут нават невялікія раскопкі няма магчымасці.

Даследчыкі абышлі гэтыя мясціны некалькі разоў і ім пашчасціла выявіць 12 кавалкаў ад гліняных пасудзін, з іх 10 кавалкаў ад ляпнога посуду. Два невялікія кавалкі са штрыхоўкай. Штрыхі зроблены не толькі са знешняга боку, але таксама з унутранага. Таўшчыня такой керамікі 0,6 см. Знойдзены больш значны па памерах фрагмент ад прыдоннай часткі таўшчынёй 1,1 см. Ён мае шмат жарствы, паверхня шурпатая без арнаменту, колер цёмны, амаль чорны, верагодна, адносіцца да VI–VIII стст. Сем невялікіх кавалкаў ад ляпнога посуду гладкасценныя, маюць таўшчыню да 0,8 см.

Намі выяўлена чатыры абломкі керамікі ад кругавога посуду з лінейным арнаментам (мал. 19, *а*). Па выгляду і тэхніцы выканання арнамент ідэнтычны з арнаментам гаршкоў XI ст., знойдзеных у значнай колькасці на селішчы-2, аб чым будзе сказана ніжэй. Прасочаныя на Лагазінскім гарадзішчы матэрыялы (кераміка) належаць тром эпохам: культуры штрыхаванай керамікі, банцараўскай культуры і ўсходнеславянскай культуры X–XI стст. часоў Полацка-Менскага княства.

З супрацьлеглага, паўднёва-ўсходняга, боку гарадзішча аўтарам дадзенага артыкула было выяўлена паселішча-2. У канцы XX ст. будаўнічыя арганізацыі тут пачалі браць гравій і ўзнік значны кар'ер глыбінёй 3–4 м. На абрэзах кар'ера бачны культурныя напластаванні. На працягу трох сезонаў (2005–2007 гг.) намі рабіліся зачысткі абрэзаў кар'ера (мал. 18). У рабоце ўдзельнічаў настаўнік У. У. Хартановіч з групай школьнікаў.

На схілах кар'ера закладваліся траншэі звычайна памерамі 2 × 8 м. Іх распрацоўка вялася па квадратах 2 × 2 м, глыбінёй 20 см. Была даследавана плошча 70 м^2. Магутнасць культурных адкладаў складала 0,4–1,1 м. Выяўлена паглыбленне ў мацерыку, з улікам чаго таўшчыня слоя дасягала 1,4 м.

Чаргаванне напластаванняў на селішчы наступнае: пад дзірваном – шэры слой амаль пазбаўлены знаходак. Ніжэй залягаў чорны слой. У перадмацерыковым пласце на глыбіні 1,4 м знойдзена верхняя частка ляпнога слабапрафіляванага гаршка банцараўскай культуры (мал. 20: *7*). На глыбіні 1,2 м – фрагменты вылепленай ад рукі патэльні (мал. 20: *6*). Яе вышыня 1,5 см. На глыбіні 0,7–1,1 м знойдзена раннекругавая кераміка з патоўшчаным венчыкам XI ст.

У 2006 г., таксама як у 2005 г., сярод знаходак выяўлена толькі кераміка і косці жывёл (дрэнна захаваныя). Абломкаў керамікі, прыгоднай для класіфікацыі, каля 250 экз. Сярод яе 20 абломкаў ад ляпных



Мал. 20. Кераміка: *1, 2, 4–7* – з селішча-2; *3* – знаходка з пляцоўкі гарадзішча. Комплекс «Лагазінка»



Мал. 21. Ляпная кераміка банцараўскай культуры (*1–6*). Селішча-2. Комплекс «Лагазінка»

пасудзін банцараўскай культуры (мал. 21). Адзінкавыя абломкі ад пасудзін з плечыкамі тыпу полацкіх і смаленскіх доўгіх курганоў канца VIII – пачатку X ст. (мал. 22: *1*; 23: *1*; 24: *1*).

Асобную цікавасць уяўляе знаходка посуду, на плечуку якой прасочваецца арнамент у выглядзе ломанай лініі, нанесенай касой насечкай зубчатым чаканам ці палачкай, абмотанай шнурком (мал. 23: *1*). Падобны арнамент вядомы на славянскай кераміцы з паселішчаў роменскай і боршаўскай культур на вялікай тэрыторыі ва Усходняй Еўропе – ад Ладагі да берага Азоўскага і Чорнага мораў. Найбольш яна распаўсюджана ў вобласці на ўсход ад Дняпра, паміж Дняпром і Донам [15, с. 34, 41, рис. 23: *5*].



Мал. 22. Кераміка: *1, 2* – ляпная, падпраўленая на ганчарным крузе; *3–6* – кругавая (XI ст.). Селішча-2. Комплекс «Лагазінка»



Мал. 23. Кераміка (*1–5*). Паселішча-2. Комплекс «Лагазінка»



Мал. 24. Гліняны посуд (*1–4*). Паселішча-2. Комплекс «Лагазінка»



Мал. 25. Вырабы з жалеза (*1, 2*) і гліны (*3–9*): *1* – фібула; *2* – вушка ад вядра; *3* – праселка; *4–9* – фрагменты посуду. Селішча-2. Комплекс «Лагазінка». Раскопкі Г. В. Штыхава. 2007 г.

На тэрыторыі Беларусі такая кераміка выяўлена на Мазырскім гарадзішчы Кімбараўка, Чачэрскім гарадзішчы, паселішчах на Менцы, на гарадзішчы Жужлянка ў ніжнім цячэнні Свіслачы, у старажытных гарадах Полацка-Менскага княства – Полацку, Віцебску, Лукомлі.

Выяўлены буйны фрагмент кругавога гаршка з вертыкальным горлам (мал. 23: *2*). Такая ганчарная кераміка ў невялікай колькасці знойдзена ў паселішчы на Менцы, у Наваградку, Клецку. На некаторых фрагментах гаршкоў можна заўважыць налепачную тэхніку, з дапамогай якой яны рабіліся (мал. 24: *3*). Сярод кругавой керамікі значная колькасць гаршкоў мае так званы карнізік (мал. 22: *3–6*). Знойдзены буйныя фрагменты посуду, арнаментаванага хвалістым і лінейным арнаментам (мал. 23: *3*; 24: *4*). Мусіць, вялікія па памерах пасудзіны выкарыстоўваліся ў якасці тарнай керамікі. Посуд з карнізікам (манжэтай) на тэрыторыі Беларусі датуецца XI ст. [34, мал. 52: *12, 13*].

У 2007 г. намі была распрацавана яшчэ 20 м^2 культурнага напластавання. Як звычайна, на гэтым помніку першы пласт уяўляў сабой шэрую зямлю, у якой не было знаходак. Другі пласт глыбінёй ад 20 да 40 см быў культурным слоем чорнага колеру. Праслежваліся прыкметы паглыбленай у мацярык пабудовы. На глыбіні 35 см была першая жалезная знаходка – падковападобная, спіралеканцовая з рамбічным сячэннем фібула (мал. 25: *1*). Яе дыяметр 4,6 см, іголка фібулы моцна каразіравана. Такія фібулы датуюцца X – пачаткам XI ст. [17, с. 156]. Знаходка дапамагае датаваць значную частку напластаванняў у дадзеным месцы.

Другая знаходка – глінянае біканічнае праселка (мал. 25: *3*). Яго дыяметр 2,9 см, памеры адтуліны 1,1 см. Падобныя гліняныя праселкі добра вядомы па раскопках паселішча на Менцы, дзе яны датуюцца X – пачаткам XI ст. Праселка было на глыбіні 45 см ад дзённай паверхні, дзе шмат бытавой керамікі. Верагодна, на гэтым месцы знаходзілася жылая пабудова, менавіта тут зафіксавана паніжэнне, яма ў мацерыку памерам 6 м. Знойдзена жалезная рэч, якая нагадвае вушка для вядра (мал. 25: *2*).

Амаль на мацерыку быў маленькі «гаршчочак», вылеплены рукамі з аднаго кавалка гліны. Вышыня вырабу 4 см, мяркуемы дыяметр па венчыку 10 см. Магчыма, гэта місачка (мал. 26: *4*). Па профілю з'яўляецца тыповай керамікай культуры доўгіх курганоў Полацкай зямлі IX – пачатку X ст. Знойдзены фрагменты паўляпных гаршкоў, у цесце якіх шмат жарствы (мал. 26: *1*). Знойдзены венчык ад гаршка з высокай гарлавінай (мал. 26: *3*), фрагмент донца ляпнога гаршка, у гліне якога шмат жарствы (мал. 26: *2*).

Шмат буйных абломкаў кругавой керамікі і гаршчок, які захаваўся цалкам (мал. 24: *3*). Гэта прысадзістая (місападобная) пасудзіна зроблена на руч-

ным ганчарным крузе. У ніжняй прыдоннай яе частцы прасочваецца мадэліраванне, якое вялося з дапамогай кальцавога налепа, шырыня кольцаў складала 1,5–2 см. Пры фармаванні ніжняй часткі выкарыстоўваўся «донны начын», як гэта звычайна рабілася.

Знойдзены буйныя кавалкі ад ганчарных гаршкоў, якія мелі ў верхняй частцы венчык з карнізікам (манжэтай) (мал. 22: *3–6*; 23: *3–5*). Гаршкі з такім наружным выступам па верхнім краі мелі распаўсюджванне ў паселішчах на Менцы, у Заслаўі і іншых месцах Беларусі, дзе датуюцца XI ст.

Пры зачыстцы абрэзаў кар'ера трапіліся два венчыкі, якія адрозніваюцца ад вышэйапісанай керамікі: край венчыка загнуты ў сярэдзіну пасудзіны, што характэрна для гаршкоў XII–XIII стст. На селішчы-2 знойдзена звыш 280 касцей жывёл. У большасці яны малыя і неазначальныя. Гэта, несумненна, кухонныя рэшткі.

У наваколлі гарадзішча на беразе Лагазінкі існавала яшчэ вялікае селішча-3. Л. Д. Побаль пісаў у справаздачы за 1963 г., што мясцовыя жыхары на агародах каля берага ракі знаходзяць старажытныя рэчы. Яны перадалі археолагу тры праселкі (два з ружовага шыферу і адно з шэра-жоўтага порыстага вапняковага каменю), а таксама дзве плоскія цёмнасінія пацеркі. У 2007 г. мы абследавалі левы бераг ракі і ўпэўніліся ў існаванні тут значнага па памерах селішча. Несумненна, што каля гарадзішча існавала не менш трох селішчаў.

Недалёка ад гарадзішча і селішча-1 захаваліся курганы. У кнізе «Памяць: Лагойскі раён» [19] адзначаны каля вёскі Старое Гарадзішча «курганны могільнік за 0,3 км на паўднёвы-захад ад гарадзішча». У 2007 г. мы наведалі гэта месца. Сярод сучаснага поля здалёк бачны два зараснікі кустоў. Курганы зараслі хмызняком, дзякуючы чаму і захаваліся.

Курган-1 мае вышыню 1,6 м, дыяметр 12 м, яго вышыня плоская, пасярэдзіне скарбашукальнікамі выкапана яма памерам 4 × 6 м, глыбінёй 0,8 м. Курган насыпаны з пяску, ніякіх праслоек у насыпе не прасочваецца. Відаць, скарбашукальнікі нічога не знайшлі, да мацерыка не дайшлі. Курган-2 размешчаны за 30 м ад першага. Яго вышыня 1,3 м, дыяметр 9 м, вяршыня плоская, захаванасць добрая. Увесь зарослы хмызняком. Верагодна, тут існаваў значны па памерах могільнік і ўсе насыпы меншых памераў былі зрыты і развораны.

Такім чынам, на Лагазінцы (Лагазе) існаваў родаплемянны цэнтр, як мінімум на працягу тысячагоддзя да таго, як з'явілася першая звестка пісьмовай крыніцы пра ўмацаваны пункт Лагожск. У раннім сярэднявеччы цэнтр на Лагазе меў акрамя гарадзішча тры паселішчы і курганны могільнік. У канцы X–XI стст. пункт на Лагазе існаваў сінхронна з паселішчам на Гайне.



Мал. 26. Кераміка: *1–6* – ляпная, *7, 8* – кругавая. Селішча-2. Комплекс «Лагазінка». Раскопкі 2007 г.

Горад і яго назва. Вызначаючы прычыны і час узнікнення горада, неабходна мець на ўвазе, што гістарычнымі перадумовамі ўтварэння сярэдневяковых гарадоў было павелічэнне сельскагаспадарчай прадукцыі і паляпшэнне тэхнікі апрацоўкі зямлі, аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі, развіццё шматукладнай эканомікі і адпаведнага грамадскага ладу [35, с. 238–239].

У раннім сярэдневякоўі на беларускіх землях існавалі перадумовы для ўзнікнення гарадскіх селішчаў. Доказам прагрэсу земляробства служаць знаходкі земляробчых прылад працы, выяўленыя пры археалагічных раскопках, у тым ліку ў Лагойску. Узнікалі і развіваліся рамёствы: кавальскае, ганчарнае, дрэваапрацоўчае і іншыя, аб чым сведчаць даныя археалагічных раскопак. Распаўсюджваліся гандлёвыя сувязі, што мы таксама назіраем у Лагойску. Гандаль і рамёствы ўсё больш канцэнтраваліся ў населеных пунктах са зручным геаграфічным размяшчэннем. Горад не мог быць ізаляваным ад свайго наваколля, яго гаспадарчая роля адчувалася ў межах адпаведнай воласці.

Паходжанне гарадоў Полацкай зямлі можна ўявіць наступным чынам. Зародкамі найстаражыт-

нейшых з гарадоў былі ўмацаваныя пункты славян, што ўзніклі пры рассяленні апошніх. Сярод іх найперш вылучаецца Полацк як галоўны племянны цэнтр полацкіх крывічоў. На прыкладзе Полацка можна прасачыць, што зародак горада ў IX – пачатку X ст. меў гарадзішча, паселішча (перадгорад), выконваў адміністрацыйныя функцыі ў воласці [38, с. 21, 130].

У сувязі з каланізацыяй навакольнай тэрыторыі і ўстанаўленнем даніны ў Падзвінні, а затым ў Падняпроўі адначасова з Полацкам ствараліся іншыя ўмацаваныя пункты (Віцебск, Лукомль, Заслаўе, крыху пазней Друцк, Мінск (на Свіслачы), Лагойск (на Гайне)), якія падпарадкоўваліся Полацку ў адміністрацыйных і ваенных адносінах, з'яўляючыся правобразам будучых, залежных ад старэйшага, малодшых гарадоў [39].

Раннесярэдневяковы горад у адрозненне ад вёскі з'яўляўся паступова ўскладняючымся пры сваім развіцці сацыяльным арганізмам з уласцівымі яму рознымі функцыямі – гандлёва-рамеснымі, ваенна-абарончымі, адміністрацыйнымі, культурнымі, рэлігійнымі [39, с. 18].

Мае значэнне сама назва населенага пункта. Ва ўсходнеславянскай тапаніміцы суфікс -ск у назве пункта лічыцца «гарадскім». У старажытнасці ён стаў прыкметай «гарадской» мадэлі наймення. Для негарадскіх пунктаў – пагостаў, сёлаў, вёсак – тыповымі лічацца назвы на -ічы, іцы (Батаровічы, Дзядзілавічы).

Вучоны археолаг-славіст В. В. Сядоў разгледзеў пытанне пра паходжанне назваў найбольш старажытных гарадоў на «беларускай этнічнай тэрыторыі» і сярод іх пунктаў, якія маюць суфікс -ск. Даследчык сцвярджае, што ў тапаніміі беларускіх зямель гэты суфікс з'яўляецца ўжо ў IX–X стст.

Такі суфікс прысутнічае ў назве гарадоў: Полацк (Полтеск), па назве ракі По́латы (Палаты), Віцебск ад Віцьбы, Друцк (Дрютьск) ад Друці, Пінск ад Піны, Слуцк (Случеск) ад Случы і г. д. [26]. Для афармлення тапонімаў з суфіксам -ск выкарыстоўваўся, галоўным чынам, мясцовы матэрыял. Пагэтаму ў асновах тапонімаў на -ск часта былі гідронімы з неславянскімі (балцкімі) апелятывамі (асновамі).

Вялікі працэнт на́званых старажытных гарадоў з суфіксам -ск складае спецыфічную асаблівасць беларускай тэрыторыі. Па-за беларускім этналінгвістычным арэалам такія тапанімічныя ўтварэнні IX–XIV стст. нешматлікія і большасць з іх размешчана па-суседску з вывучаемай тэрыторыяй. Амаль адсутнічае суфікс -ск у старажытнай тапаніміі паўночна-заходняй і паўночна-ўсходняй зямель Кіеўскай Русі. У Наўгародска-Пскоўскай зямлі, як сцвярджае вучоны, ёсць толькі адна назва гэтага старажытнага тыпу – Ізборск.

Паспрабуем растлумачыць своеасаблівасць тапаніміі беларускай этналінгвістычнай тэрыторыі ў перыяд IX–XIV стст. В. В. Сядоў дае верагодны адказ. Спецыфічны характар старажытнай тапаніміі беларускай тэрыторыі абумоўлены этнічнай гісторыяй гэтай зямлі – ўздзеяннем на славян культуры балтаў. Але дадзеная спецыфіка не з'яўляецца запазычаннем. Не можа быць размовы, што суфікс -ск запазычаны славянамі ў балтаў. Суфікс, несумненна, славянскі, але ён атрымаў у старажытнасці распаўсюджванне толькі ў тых абласцях славянскай тэрыторыі, дзе славяне змешваліся з балцкім насельніцтвам (Беларусь і часткова Польшча). Пазней тапонім на -ск шырока распаўсюджваецца шмат у якіх славянскіх рэгіёнах [26].

Выклікае цікавасць паходжанне назвы горада Лагойска. У Лаўрэнцьеўскім і Іпацьеўскім летапісных зводах горад названы Логожьск, Ложьск, Логажеск. У Радзівілаўскім летапісе – Логожескь, Логожск. У сучаснасці Лагойск размешчаны на раце Гайне, а за 7 км ад Лагойскага замчышча ў гэту раку ўпадае яе правы прыток Лагазінка (Лагаза).

П. М. Шпілеўскі (1823–1861), папулярызатар этнаграфіі, фальклору і гісторыі Беларусі, выказаў меркаванне, што, магчыма, горад атрымаў сваю назву ад слова «лог», «логовье», таму што Лагойск ляжыць у даліне паміж гор [33, с. 170]. Географ В. А. Жучкевіч згодны з такой гіпотэзай [5, с. 207]. Гэтай думкі прытрымліваецца таксама сучасны аўтар П. А. Каралёў [9, с. 32].

Аднак вядомы лінгвіст В. П. Лемцюгова выказала думку, што назва Логожск магла ўзнікнуць на аснове гідроніма Лагаза [12, с. 92]. Другі лінгвіст М. А. Ююкін пацвярджае, што назва горада, мусіць, сапраўды паходзіць ад назвы ракі [40, с. 20].

Вышэй намі быў ахарактарызаваны археалагічны комплекс V–XI стст. (гарадзішча, селішчы, курганы) у вярхоўі рэчкі Лагазінкі (Лагазы) за 7–8 км ад Лагойскага замчышча на Гайне. На Лагойскім замчышчы пры раскопках знойдзена ў невялікай колькасці ляпная кераміка X ст. Тут існавала селішча ў XI ст., верагодна, той населены пункт, які названы ў «Павучанні» Уладзіміра Манамаха. Значыць, на працягу XI ст. селішчы на Лагазе і на Гайне суіснавалі сінхронна.

Населены пункт на Лагазе можна лічыць папярэднікам горада, які потым быў пабудаваны на Гайне. Назва родаплемяннога цэнтра на Лагазе паўтарала найменне ракі. Новы пабудаваны цэнтр, падпарадкаваны Полацку, атрымаў назву Лагожск, відаць, па рацэ Лагаза, паколькі першапачатковы цэнтр на ёй страціў значэнне і наогул заняпаў.

Заключэнне. Лагойск з'яўляецца адным са старажытнейшых гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Першая згадка пра гэты горад Полацкай зямлі-княства змешчана ў «Павучанні» Уладзіміра Манамаха ў сувязі з падзеямі, якія адбыліся ў 1078 г.

За 7–8 км ад Лагойска знаходзіцца цэнтр сельсавета Лагаза, размешчаны на невялікай рацэ Лагазінка. У 1963 г. археолаг Л. Д. Поболь знайшоў у вярхоўі гэтай ракі селішча каля падножжа старажытнейшага гарадзішча. У 2004–2007 гг. Г. В. Штыхавым было адкрыта і даследавана другое селішча і знойдзены матэрыялы V–XI стст.

Такім чынам, было ўстаноўлена, што на Лагазінцы (Лагазе) на рубяжы нашай эры існавала гарадзішча балтаў (культура штрыхаванай керамікі), у V–VIII стст. побач узнікла паселішча носьбітаў банцараўскай культуры (змешанага насельніцтва з балтаў і славян). Гарадзішча выкарыстоўвалася як сховішча ў выпадку небяспекі. У IX–X стст. сюды праніклі крывічы. У XI ст. матэрыяльная культура насельніцтва, мяркуючы па кераміцы, была ўсходнеславянскай (старажытнарускай). На беразе Лагазы (Лагазінкі) ўзнікла трэцяе селішча.

У канцы X – XI ст. за 8 км ад гэтага населенага пункта (цяпер в. Старое Гарадзішча) на правым беразе ракі Гайны ўзнікае ўсходнеславянскае паселішча, якое было ўмацаваным. Такім чынам, у XI ст. сінхронна існавалі паселішчы на Лагазе (Лагазінцы) і на Гайне. Цэнтр воласці родаплемяннога часу на Лагазе (археалагічны комплекс «Лагазінка») прыйшоў у заняпад. Новы цэнтр воласці, узведзены на Гайне нейкім полацкім князем (магчыма Брачыславам), атрымаў назву Лагожск на аснове гідраніма Лагаза. Магчыма, Уладзімір Манамах браў Лагожск у 1078 г., размешчаны на Гайне, у час вайны з полацкім князем Усяславам. Сярэдневяковы Лагожск з'яўляўся ўмацаваным пунктам на паўднёвых рубяжах Полацкай зямлі, а ў XII ст. стаў цэнтрам удзельнага княства.

Літаратура

1. Акуліч, С. Лагойск: Гісторыка-эканамічны нарыс / С. Акуліч, Б. Сасноўскі. – Мінск, 1979.

2. Блиодухо, Н. Ф. Сборник трудов по геологии и полезным ископаемым БССР / Н. Ф. Блиодухо. – М., 1952.

3. Гуревич, Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья / Ф. Д. Гуревич – М., 1962.

4. Гурин, М. Ф. Кузнечное ремесло Полоцкой земли IX–XIII вв. / М. Ф. Гурин. – Минск, 1987.

5. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск, 1974.

6. Загорульский, Э. М. Возникновение Минска / Э. М. Загорульский. – Минск, 1982.

7. Заяц, Ю. А. Заславль в эпоху феодализма / Ю. А. Заяц. – Минск, 1995.

8. Зверуго, Я. Г. Древний Волковыск X–XIV вв. / Я. Г. Зверуго. – Минск, 1975.

9. Каралёў, П. А. Лагойск Тышкевічаў / П. А. Каралёў // Другія Тышкевіцкія чытанні, Лагойск, 15 кастр. 2009 г. – Мінск, 2009. – С. 32.

10. Колчин, Б. А. Железообрабатывающее ремесло Новгорода Великого / Б. А. Колчин // Материалы и исследования по археологии СССР. – 1959. – № 65.

11. Крывальцэвіч, М. М. Культ каменных сякер на Беларусі / М. М. Крывальцэвіч // Старонкі гісторыі Беларусі. – Мінск, 1992.

12. Лемцюгова, В. Н. Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці / В. Н. Лемцюгова. – Мінск, 1970.

13. Лысенко, П. Ф. Берестье / П. Ф. Лысенко. – Минск, 1985.

14. Лявданский, А. Н. Некоторые данные о городищах Смоленской губернии / А. Н. Лявданский. – Смоленск, 1926.

15. Ляпушкин, И. И. Городище Новотроицкое. О культуре восточных славян в период сложения Киевского государства / И. И. Ляпушкин. – М., 1958.

16. Малеўская, М. В. Амфоры Новагрудка XII–XIII вв. / М. В. Малеўская // Тез. докл. к конф. по археологии Белоруссии. – Минск, 1969.

17. Мальм, В. А. Подковообразные и кольцевые застежки-фибулы / В. А. Мальм // Очерки по истории русской деревни X–XIII вв. – М., 1967.

18. Медведев, А. Ф. Оружие Новгорода Великого / А. Ф. Медведев // Материалы и исследования по археологии СССР. – 1959. – № 65.

19. Насевіч, В. Л. Старонкі мінулага Лагойшчыны / В. Л. Насевіч // Памяць. Лагойскі раён. – Мінск, 2003. – Кн. 1.

20. Поболь, Л. Д. Славянские древности Белоруссии / Л. Д. Поболь. – Минск, 1974.

21. Рабцэвіч, В. Н. Слабодкаўскі манетны скарб / В. Н. Рабцэвіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. – Мінск, 1993.

22. Радзивиловская летопись // Полное собрание русских летописей. – Ленинград, 1989. – Т. 38.

23. Раппопорт, П. А. Очерки по истории русского военного зодчества X–XIII вв. / П. А. Раппопорт. – М., 1956.

24. Россия. Верхнее Поднепровье и Белоруссия. – СПб., 1905. – Т. 9.

25. Седов, В. В. Амулеты-коньки из древнерусских курганов / В. В. Седов // Славяне и Русь. – М., 1966.

26. Седов, В. В. Древнерусская топонимия на белорусской территории / В. В. Седов // Пытанні беларускай тапанімікі. – Мінск, 1970.

27. Седова, М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода (X–XV вв.) / М. В. Седова. – М., 1981.

28. Сергеева, З. М. О подковообразных фибулах с утолщенными концами на территории древней Руси / З. М. Сергеева // Краткие сообщения Института археологии. – 1977. – № 150.

29. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі / М. А. Ткачоў. – Мінск, 1991.

30. Томашевич, И. В. Языческие привески в виде миниатюрных хозяйственно-бытовых предметов с территории Беларуси / И. В. Томашевич // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2008. – Вып. 15.

31. Успенская, А. В. Нагрудные и поясные привески / А. В. Успенская // Очерки по истории русской деревни X–XIII вв. – М., 1967.

32. Чантурия, В. А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск, 1986.

33. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю по тексту журнала «Современник» 1853–1855 / П. М. Шпилевский. – Минск, 1992.

34. Штыхаў, Г. В. Крывічы па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі / Г. В. Штыхаў. – Мінск, 1992.

35. Штыхаў, Г. В. Эканамічныя ўклады – факты і меркаванні / Г. В. Штыхаў // Гісторыя Беларусі. – Мінск, 2000. – Т. 1.

36. Штыхаў, Г. В. Археалагічны комплекс Ізбішча-Дзвінаса на Лагойшчыне / Г. В. Штыхаў // Acta Archaeologica Albaruthenica. – Мінск, 2007. – Vol. II.

37. Штыхаў, Г. В. Курганны могільнік Ізбішча-Дзвінаса // Матэрыялы па археалогіі Беларусі / Г. В. Штыхаў. – Мінск, 2008. – Вып. 16.

38. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк IX–XIII вв. / Г. В. Штыхов. – Минск, 1975.

39. Штыхов, Г. В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск, 1978.

40. Ююкин, М. А. Логожьскъ (к 925-летию первого упоминания) / М. А. Ююкин // Acta Baltico-Slavica 27. – Warszawa, 2003.

41. Яніцкая, М. М. Кварта / М. М. Яніцкая // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. – Мінск, 1993.

Резюме

Г. В. Штыхов

Древний Логойск в свете археологических раскопок

Логойск, ныне центр Логойского района Минской области (в древности Логожск, Логожеск) является древнейшим восточнославянским городом на территории Беларуси. В ранних древнерусских летописях сведений о Логойске очень мало. Первое упоминание об этом городе Полоцкой земли-княжестве имеется в «Поучении» Владимира Всеволодовича Мономаха, где Логожеск назван вместе с Лукомлем и Друцком, когда они были разрушены этим князем в ответ на нападение воинственного полоцкого князя Всеслава Брячиславича на Смоленск. Исследователи установили, что эти печальные события происходили в 1078 г.

В 1925 г. Логойское замчище на берегу Гайны обследовал белорусский археолог А. Н. Лявданский. Он отметил, что «на площадке почти не заметен культурный слой» и датировал городище «временем не ранее XII в.», руководствуясь преимущественно летописными сведениями. В 60–70-е годы XX века, в соответствии с научными планами Института истории Академии наук БССР, на Лагойском замчище были произведены стационарные археологические раскопки (руководитель Г. В. Штыхов).

Площадка Логойского замчища имеет около 1,5 га. Мощность культурного слоя 0,8–1,2 м. В ходе раскопок изучено 440 м^2. Дерево в культурных отложениях не сохраняется вовсе. Среди находок наиболее многочисленны изделия из глины и железа. Ведущей отраслью ремесленного производства в средневековом городе была обработка черного металла.

В Логойске найдены многочисленные железные предметы – ремесленные инструменты, железообрабатывающие орудия труда, оружие дружинников, предметы домашнего обихода.

О торговых и культурных связях свидетельствуют находки волынских каменных пряслиц, обломков южных амфор XII – первой половины XIII в. Подковоподобные фибулы (застежки) говорят о связях с землями восточной части Прибалтики. Обнаружена железная гиря от безмена, который необходим в торговле.

В логойской коллекции представлены материалы XI–XIII вв., типичные для восточнославянского города эпохи Киевской Руси. Предметами, имеющими более узкую датировку (XI – начала XII в.), являются два железных ключа (тип А, по Б. А. Колчину), бронзовый конек-амулет, массивный шип от шпоры конца X – XI в. Имеется несколько обломков лепной керамики ранее середины X в.

Обнаружен угол фундамента кирпичной постройки XVI в. и изразцы с зеленой поливой и типичными для времен Ренессанса изображениями.

Оставался неясным вопрос относительно происхождения названия города. В 1970 г. В. В. Седов привел доводы в пользу того, что названия городов с суффиксом -ск X–XI в. «на белорусской территории» происходят от наименований рек, на которых они были основаны. Логожска среди них В. В. Седов не упомянул. Лингвист В. П. Лемтюгова более определенно высказала мысль, что название Логожска могло возникнуть на основе гидронима Логоза.

В 7–8 км от Логойска находится центр сельсовета Логоза, расположенный на небольшой реке Логозинка (длиной 10 км). В 1963 г. археолог Л. Д. Поболь нашел в верховьях этой реки селище у подножия древнейшего городища. В 2004–2007 гг. Г. В. Штыховым было открыто и исследовано второе селище возле городища, где обнаружены материалы VI–XI в.

Таким образом, было установлено, что на Логозинке (Логозе) на рубеже нашей эры существовало городище балтов (культура штрихованной керамики) в V–VIII вв. рядом возникло селище носителей банцеровской культуры, вероятно, смешанного населения из балтов и славян. Городище использовалось как убежище в случае опасности. В IX–X вв. сюда проникли кривичи. В XI в. материальная культура населения, судя по керамике, была восточнославянской (древнерусской). На берегу Логозы (Логозинке) размещалось и третье селище.

В конце X – XI в. в 8 км от этого населенного пункта (теперь д. Старое Городище) на правом берегу Гайны возникало восточнославянское поселение, которое, вероятно, вскоре было укреплено. Итак, в XI в. синхронно существовали поселения на Логозе (Логозинке) и на Гайне. Центр волости родоплеменной поры на Логозе пришел в упадок. Новый центр волости, возведенный на Гайне кем-то из полоцких князей (возможно Брячиславом), получил название Логожск по гидрониму Логоза. Вероятнее всего, Владимир Мономах, действительно, в 1078 г. брал Логожск, расположенный на Гайне, когда воевал с полоцким князем Всеславом. Средневековый Логожск являлся укрепленным пунктом на южных рубежах Полоцкой земли и в XII в. стал центром Логожского удельного княжества.

Summary

G. Shtykhov

The Ancient Logoisk in a view of archaeological excavations

Nowadays Logoisk is the centre of Logoisk district, Minsk area. It was known as Logozhsk or Logozhesk in the past, one of the most ancient Slavonic towns on the territory of Belarus. This place was firstly mentioned in 1078 with Lukoml and Drutsk in «Lectures» by Vladimir Vsevolodovich Monomakh when they were destroyed in reply to an attack of the warlike Polotsk prince Vseslav Bryachislavich to Smolensk.

The castle place of Logoisk on the bank of the river of Gaina was surveyed in 1925 by Belarusian archaeologist A. N. Lyavdansky who dated this site «to time not earlier the 12th century». The stationary archaeological excavations were performed by G. V. Shtykhov in 1960–1970s.

The plateau of the castle of Logoisk is about 1,5 hectares. Thickness of the cultural layers are 0,8–1,2 m. 440 sq. m. were investigated by excavations. Wood in cultural layers was not kept at all. Among artefacts pottery and iron were most numerous. Leading branch of craft in medieval town was production of ferrous metal. Tools, weapons and household objects were found there.

Finds which could testify the trading and cultural connections with Volyn region (stone spindle whorls), the Black sea region (fragments of amphoras of the 12th – the first half 13th century) and the grounds of East Baltic (brooches) were recovered. The iron weight as a part of spring-balance was found out, too.

The artefacts dated back to the 11th – early 12th century were two iron keys (type A according to B. A. Kolchin), a bronze horse-amulet, a massive spike of the late 10th–11th century. There were some fragments handmade potteries before middle of the 10th century were presented.

There was not clear a question concerning an origin of the name of place. Linguist V. P. Lemtyugova has definitely stated an idea that name of town could be connected with the name of the river of Logozinka. L. D. Pobol located the open settlement near the hill-fort in the upper part of this river in 1963. G. V. Shtykhov found and investigated the second settlement near hill-fort, too. Artefacts of the 6th–11th centuries were discovered in 2004–2007.

Thus, it has been established that on the river of Logozinka (Logoza) at the turn of the era there was a place of the Baltic ancient hill-fort (culture of the shaded ceramics). Then the open settlement of the 5th–8th centuries with mixed population of the Bantserovscha culture had arisen. The hill-fort could be used as a refuge in case of danger. The Krivichy was known here in the 9th–10th centuries. The character of the material culture in the 11th century in accordance with pottery was the Eastern Slavs or the Old Russian.

Next settlement with Eastern Slavonic population was fixed since late 10th–11th century on the bank of the river Gaina not far from the village of Staroe Gorodische.

So, there were synchronously settlements on the rivers of Logoza and Gaina in the 11th century. The centre of volost of the tribal time on the river of Logoza had fallen into decay. The new centre of volost formed on the river of Gaina by someone from Polotsk princes (it might be Bryachyslav), had received the name of Logozhsk. Most likely, Vladimir Monomakh, really destroyed Logozhsk in 1078 located on the river of Logoza when he was at war with Polotsk prince Vseslav. Medieval Logozhsk was the fortification point on southern boundaries of the Polotsk ground and in the 12th century became the centre of Logozhsk princedom.

Пастуніў 20.04.2011

МАТЭРЫЯЛЫ

І. У. Магалінскі, *Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, старшы навуковы супрацоўнік навукова-рэстаўрацыйнага аддзела (г. Полацк)*

Ліцейныя формы і тыглі для плаўкі каляровых металаў з тэрыторыі Полацка (X–XVII стст.)

Асобнае месца ў сістэме старажытнага рамяства займала ювелірная справа. Апрацоўка каляровых металаў і выраб упрыгажэнняў патрабавалі ад ювеліра наяўнасці мастацкага густу, высокага ўзроўню валодання рознымі рамеснымі тэхнікамі і прыёмамі, а таксама добрага ведання фізічных, хімічных і тэхналагічных уласцівасцей сыравіны. Ад ступені авалодання майстрам ўсім арсеналам неабходных навыкаў залежала якасць выніковага прадукту.

На тэрыторыі Полацка выяўлены сляды развітога ювелірнага рамяства. Сярод інструментаў ювеліра ў полацкай калекцыі найбольш поўна прадстаўлены прылады, якія былі звязаны з ліцейнай справай. Асноўнымі прыстасаваннямі ліцейшчыкаў з'яўляліся тыглі і ліцейныя формы. Гэтая катэгорыя знаходак здаўна прыцягвала ўвагу навукоўцаў.

Вывучэннем інструментаў ювеліраў плённа займаліся Б. А. Рыбакоў, Н. В. Рындзіна, М. К. Каргер, Н. В. Еніосава, І. В. Дайга і інш. [1–6].

Шэраг спецыяльных даследаванняў, прысвечаных усебаковаму аналізу прыстасаванняў ліцейшчыкаў старажытнага Полацка, належыць Г. В. Штыхаву [7, 8]. Навуковец адным з першых у айчыннай археалогіі адзначыў вялікае значэнне дадзенай групы прадметаў для аналізу развіцця ювелірнай вытворчасці. Для рэалізацыі сваіх навуковых інтарэсаў даследчык актыўна карыстаўся міждысцыплінарнай метадалогіяй і сумесна з іншымі падраздзяленнямі АН БССР правёў шэраг вельмі каштоўных аналізаў асобных інструментаў з арсеналу полацкіх ювеліраў.

Вялікую цікавасць мае таксама праца Д. В. Навумава, прысвечаная хімічным і структурным даследаванням асобных знаходак з Полацка [9].

Большая частка інструментаў і прыстасаванняў ювеліраў, якія паходзяць з раскопак на тэрыторыі Полацка, захоўваецца ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (далей – НПГКМЗ). Пэўная колькасць матэрыялаў знаходзіцца таксама ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (далей – НГМРБ) і археалагічнай навукова-музейнай экспазіцыі НАН Беларусі.

Ліцейныя формы. Формы для адліўкі ювелірных упрыгажэнняў з'яўляліся вельмі важнымі прыстасаваннямі ліцейшчыкаў. Іх рабілі з розных парод каменю, гліны, дрэва, бронзы ці рога [10]. Дадзеная катэгорыя знаходак адрозніваецца складанай канструкцыяй і ўтрымлівае інфармацыю аб ліцейнай тэхніцы, прыёмах апрацоўкі металаў і прафесійным узроўні майстроў [4].

Паводле нашых падлікаў на тэрыторыі Полацка падчас археалагічных даследаванняў было выяўлена не менш 28 ліцейных форм. Сярод іх не толькі цэлыя экзэмпляры, але фрагменты, нарыхтоўкі і бракаваныя вырабы. У дадзеным артыкуле аналізуецца 21 ліцейная форма. Дадзеная выбарка дастаткова поўна адлюстроўвае асноўныя тыпы прадметаў дадзенага віду, якія выкарыстоўвалі мясцовыя рамеснікі.

Вывучэнне форм праводзілася намі метадам візуальнага агляду. Даныя адносна фізічных і хімічных ўласцівасцей прадметаў мы бяром з працы Г. В. Штыхава. Нягледзячы на тое што работа была напісана ў пачатку 1960-ых гадоў, яна не страціла актуальнасці, а серыя аналізаў матэрыялу форм і нацёкаў металу на іх сценках і літніках да гэтага часу з'яўляецца самай прадстаўнічай [8].

Даследаванні Г. В. Штыхава паказалі, што большасць знаходак адносіцца да адной пароды каменю. Яе колер шэры ці светла-шэры з жоўтым адценнем. Гэта мікразярністая, а месцамі дробназярністая карбанатная парода, нераўнамерна раскрышталізаваная з адзінкавымі дробнымі зернямі кварцу [8, с. 130]. Такім чынам, полацкія майстры-ювеліры рабілі ліцейныя формы з даламіцізіраваных вапнякоў. Выбар гэтай пароды каменю тлумачыўся яе фізічнымі ўласцівасцямі: мяккасцю і прыдатнасцю для тонкай апрацоўкі. Акрамя гэтага, у Полацку былі знойдзены формы, зробленыя з рога і гліны. У сувязі з асаблівым значэннем ліцейных форм для аналізу ювелірнага рамяства старажытнага горада ў дадзенай рабоце мы падрабязна спынімся на характарыстыцы кожнага асобнага вырабу.

1. Нарыхтоўка ліцейнай формы (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 7,0 × 5,8 × 2,3 см). На прадмеце прысутнічае палявы нумар, а таксама датаванне – XII ст. У адпаведнасці з подпісам, форма была знойдзена ў 1961 г. на тэрыторыі Верхняга замка (у межах траншэі?). Знаходка адзначана ў справаздачы Г. В. Штыхава аб археалагічных раскопках у Полацку ў 1961 г. Між тым менавіта ў работы выраб не згадваецца [11, мал. 21: *3*]. Форма была апублікавана ў манаграфіі даследчыка, аднак там яе датаванне зменена на XIII ст. [7, мал. 32: *9*].

Прадмет зроблены з мяккай пароды каменю, на вонкавым апрацаваным баку разцом абазнача-

ны контуры будучай адліўкі – гэта васьміплёсткавая разетка.

2. Ліцейная форма (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 4,4 × 3,9 × 2,4 см). Форма двухбаковая, зроблена з мяккай пароды каменю, выкарыстоўвалася для адліўкі гузікаў. На адным баку размешчаны выявы трох гузікаў (сярэднія памеры – 1,4 × 0,9 см) з літнікамі, а таксама нескразная адтуліна, у якой павінен быў знаходзіцца металічны штыфт для мацавання вонкавай створкі формы. На цэнтральную выяву гузіка нанесены лінейны арнамент. Вушкі вырабаў адліваліся разам з асноўным корпусам прадметаў. На адваротным баку таксама размешчаны выявы адлівак трох гузікаў, але ўжо значна меншага памеру, а таксама скразная адтуліна для мацавання вонкавай створкі. Між тым тут адсутнічаюць літнікі, што не дазволіла б выкарыстоўваць формы па прызначэнні. Акрамя таго, на выяве вушка сярэдняга гузіка адсутнічае характэрная дэталь – рэльефнае акруглае ўзвышэнне, якое было неабходна для адліўкі гатовай рэчы разам з вушкам. Усе пазначаныя факты ўказваюць, што адваротны бок ліцейнай формы не выкарыстоўваўся для адлівак і ўяўляе сабой брак вытворчасці.

Прадмет апублікаваны ў манаграфіі Г. В. Штыхава, дзе датаваны XIII ст. [7, мал. 32: *17*]. Выраб знойдзены падчас археалагічных даследаванняў А. Г. Мітрафанава на тэрыторыі Верхняга замка ў 1959 г. у межах раскопу II на ўзроўні восьмага будаўнічага гарызонту [12, с. 13].

3. Ліцейная форма (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 3,9 × 2,5 × 0,9 см). Форма зроблена з гліны і прызначана для адліўкі імітацыі пярсцёнка з плеценай сярэдняй часткай. Выява адліўкі ўтворана праз адбітак гатовай рэчы ў сырой гліне. Форма мела другую створку, на што ўказвае наяўнасць паловы варонкападобнага літніка (даўжынёй 1,4 см). На вырабе адсутнічаюць сляды мацавальных штыфтаў, якія б прызначаліся для спалучэння дзвюх створак, што сведчыць аб іх мацаванні іншым спосабам (верагодна, вяроўкай).

Дадзены прадмет быў знойдзены Г. В. Штыхавым падчас даследаванняў на тэрыторыі Верхняга замка ў межах раскопу III (1961 г.) на глыбіні 2,6 м разам з характэрнымі прадметамі старажытнарускага часу (шыферныя прасліцы, шкляныя бранзалеты і інш.) [13, с. 116]. Выраб выяўлены ў непасрэднай блізкасці ад пабудовы 6К, якая разам з канструкцыямі 6Л і 6М складала адзіны вытворчы ювелірны комплекс [7, с. 41]. Такім чынам, дадзеная ліцейная форма магла мець непасрэднае дачыненне да гэтай майстэрні.

Вытворчы ювелірны комплекс датуецца другой паловай XIII ст. Пацвярджае датаванне храналогія пярсцёнкаў з плеценай сярэдняй часткай, якія на тэрыторыі Ноўгарада бытуюць у другой палове XII – першай палове XIV ст. [14, с. 127].

4. Ліцейная форма (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 3,5 × 1,8 × 2,2 см). Прадмет зроблены з дробназярністага вапняку і моцна фрагментаваны. Ён прызначаны для адліўкі ўпрыгажэння з імітацыяй зерні. Падобныя ліцейныя формы ў літаратуры атрымалі назву «імітацыйных» [3, с. 381].

На адваротным баку размешчаны амаль паралельныя неглыбокія каналы, якія, верагодна, з'яўляліся літнікамі. На жаль, значная фрагментаванасць формы не дазваляе адназначна казаць пра від упрыгажэння, для адліўкі якога яна прызначалася.

Форма была выяўлена у раскопе III у 1961 г. на тэрыторыі Верхняга замка на глыбіні 3,89 м падчас даследаванняў канструкцый IX будаўнічага гарызонту [11, мал. 21: *2*; 13, с. 143]. Выраб знойдзены каля драўлянай канструкцыі № 21, якая была размешчана недалёка ад пабудовы 7М (№ 14 паводле палявой дакументацыі). Знаходкі з сядзібы 7М указваюць на той факт, што ў ёй жыў і працаваў майстар-ювелір. Пабудова 7М датуецца сярэдзінай XIII ст. [7, с. 45]. Гэтым жа часам (40-мі гадамі XIII ст.) паводле дадзеных дэндрахраналогіі аўтар раскопак Г. В. Штыхаў датуе і саму форму.

5. Ліцейная форма (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 2,3 × 2,1 × 1,7 см). Прадмет зроблены з мяккай пароды каменю. У сувязі са значнай фрагментаванасцю вырабу не ўяўляецца магчымым устанавіць від упрыгажэння, якое ў ёй адлівалася.

Ліцейная форма апублікавана ў манаграфіі Г. В. Штыхава, дзе датуецца XIII ст. [7, мал. 32: *18*]. Палявы нумар, размешчаны на прадмеце, ўказвае, што выраб быў знойдзены падчас даследаванняў 1959 г. на тэрыторыі Верхняга замка (у двары бальніцы ці каля Сафійскага сабора). Больш дакладная лакалізацыя знаходкі не ўяўляецца магчымым.

6. Нарыхтоўка ліцейнай формы (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 2,8 × 2,3 × 1,1 см). Выраб аднабаковы, прамавугольнай формы, зроблены з мяккага каменю, які добра адшліфаваны з усіх бакоў. На тарцы размешчана сегментападобная выемка (нарыхтоўка варонкі літніка), аднак адсутнічае канал, які павінен быў служыць для запаўнення формы расплаўленым металам, што не дазваляе разглядаць прадмет у якасці гатовай ліцейнай формы. На вонкавым баку – скразная адтуліна для мацавання створкі штыфтам, а таксама незакончаная апрацоўкай выява будучай адліўкі. Скразная адтуліна ў сярэдняй частцы выявы дазваляе лічыць яе нарыхтоўкай вушка будучага ўпрыгажэння, верагодна манетападобнай прывескі.

Гэты выраб быў знойдзены ў 1962 г. у раскопе III на глыбіні 4,64 м [13, с. 175]. Разам з формай выяўлены матэрыялы старажытнарускага часу – прасліцы, шкляныя бранзалеты, плінфа і інш. Прадмет апублікаваны ў манаграфіі Г. В. Штыхава, дзе датуецца XIII ст. [7, мал. 32: *11*].

7. Нарыхтоўка ліцейнай формы (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 5,8 × 3,5 × 2,2 см). Выраб уяўляе сабой невялікі брусок амаль прамавугольнай формы, выкананы з мяккага каменю, адшліфаванага з аднаго боку.

Прадмет быў знойдзены ў 1960 г. падчас даследаванняў на тэрыторыі Верхняга замка ў межах раскопу II (кіраўнік – А. Г. Мітрафанаў). Дакладна лакалізаваць і ўстанавіць храналогію прадмета не ўяўляецца магчымым.

8. Ліцейная форма (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 6,5 × 4,6 × 2,3 см). Выраб зроблены з адшліфаванага з усіх бакоў мяккага каменю. Відавочна, што гэта нарыхтоўка двухбаковай формы для адліўкі манетападобных прывесак. На гэта ўказвае незакончаная апрацоўкай выява будучай адліўкі, якая захавалася на адным баку. Яна ўяўляе сабой амаль правільны, урэзаны ўнутр круг (дыяметрам 2,7 см) з невялікім каналам па краі, які злучаны з варонкападобным літнікам. Падвеска павінна была быць адлітая разам з вушкам. Для гэтай мэты майстар разцом акрэсліў адмысловы канал, размешчаны перпендыкулярна літніку. Сюды павінен быў устаўляцца металічны стрыжань, які служыў для адліўкі вушка. На незавершанасць рэчы ўказвае і характар адтулін, з дапамогай якіх павінна была мацавацца яшчэ адна створка формы. На адным баку іх дзве, а на другім – толькі невялікая выемка, якая ўтварылася ад працы свердлам. Ад выявы на адваротным баку нарыхтоўкі захаваўся толькі фрагмент літніка.

Такім чынам, дадзены выраб нельга лічыць гатовай ліцейнай формай. Верагодна, перад намі не проста нарыхтоўка, а брак вытворчасці ювеліра. Прадмет быў апублікаваны ў манаграфіі Г. В. Штыхава і датаваны ім XIII ст. [7, мал. 32: *15*].

9. Ліцейная форма (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 13,2 × 4,6 × 1,6 см). Прадмет зроблены з мяккага каменю і добра адшліфаваны. З двух бакоў на форме размешчаны варонкападобныя літнікі з двума каналамі, якія злучаюцца з выявай будучай адліўкі. Верагодна, форма прызначалася для вырабу літых колцаў невялікага дыяметру.

Прадмет быў знойдзены Г. В. Штыхавым у 1961 г. падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Верхняга замка (раскоп III). Згодна вопісу знаходак, дадзеная ліцейная форма была выяўлена падчас вывучэння драўлянай канструкцыі 6К (№ 6 паводле палявой дакументацыі), якая з'яўлялася складанай часткай вытворчага ювелірнага комплексу. Знаходка датуецца 70-мі гадамі XIII ст. [7, мал. 32: *12*; 13, с. 123].

10. Ліцейная форма (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 8,9 × 6,8 × 1,6 см). Прадмет зроблены з добра апрацаванага мяккага каменю прамавугольнай формы. На адным яго баку размешчана выява будучай адліўкі – гэта манетападобная прывеска з раслінным арнаментам. Да адліўкі вядзе варонкападобны літнік, які пад прамым вуглом перасякаецца з адмысловым жалабком. Ён выкарыстоўваўся для вырабу прывескі разам з вушкам са скразной адтулінай. Акрамя выявы будучай адліўкі на гэтым жа баку формы размешчаны яшчэ адзін літнік (выява адліўкі адсутнічае), а таксама дзве скразныя адтуліны для ўмацавання верхняй створкі формы. У адной адтуліне захаваўся металічны штыфт, які, верагодна, не з'яўляецца аўтэнтычным, а быў устаўлены падчас эксперыментальнай адліўкі, якая праводзілася ў 1961 г.

Прадмет быў выяўлены Г. В. Штыхавым у 1961 г. на тэрыторыі Верхняга замка (раскоп III). Паводле калекцыйнага вопісу знаходак, выраб знойдзены ў межах канструкцыі 6К, якую можна разглядаць як ювелірную майстэрню. Датуецца форма 70-мі гадамі XIII ст. [13, с. 124].

11. Ліцейная форма (захоўваецца ў НГМРБ, памеры 3,4 × 2,3 × 0,9 см). Прадмет зроблены з мяккай пароды каменю і мае амаль прамавугольную форму. На адным баку вырабу размешчана выява будучай адліўкі – гэта пацерка. На вонкавым баку, а таксама на тарцы прадмета знаходзяцца адтуліны для мацавання створак формы. У дзвюх з іх захаваліся фрагменты металічных штыфтаў.

Наяўнасць двух супрацьлеглых літнікаў указвае на той факт, што адліўка ўпрыгажэння адбывалася ў тэхніцы «навыплеск», якая дазваляла атрымліваць полыя вырабы, на паверхні якіх імітаваліся такія працаёмкія рамесныя прыёмы, як зернь і філігрань [7, с. 64].

Прадмет быў выяўлены ў 1959 г. падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Верхняга замка, якія праводзіліся А. Г. Мітрафанавым. Форма знойдзена на ўзроўні XI будаўнічага гарызонту на глыбіні 4,15 м разам з характэрнымі матэрыяламі старажытнарускага часу [12, с. 13]. Г. В. Штыхаў датуе прадмет XIII ст. [7, мал. 32: *3*].

12. Ліцейная форма (захоўваецца ў НГМРБ, памеры 7,2 × 3,3 × 2,4 см). Прадмет зроблены з мяккай пароды каменю, аднабаковы. На адным баку формы размешчана выява чатырохканцовага крыжа з трохвугольным завяршэннем перакладзін і ромбападобнай сярэдняй часткай. Адзін канец выявы злучаны з варонкападобным літнікам, а на другім размешчана выемка для фармавання вушка крыжа. Адсутнасць на форме адтулін для штыфтаў указвае на той факт, што верхняя створка была плоскай і не мела выявы. На думку А. А. Башкова, дадзенае прыстасаванне прызначалася для адліўкі крыжоў «з прафіляванымі шарападобнымі канцамі тонкіх круглых у сячэнні прамянёў і блізкім да ромбападобнай формы сяродкрыжжам» (аддзел аб'ёмныя, тып VII), якія датуюцца XII – першай паловай XIII ст. [15, с. 30, мал. 11: *3*].

Выраб знойдзены ў 1959 г. падчас даследаванняў на тэрыторыі Верхняга замка. Форма была выяўлена ў межах Х будаўнічага гарызонту на глыбіні 3,95 м разам з характэрнымі матэрыяламі старажытнарускага часу [12, с. 13]. Г. В. Штыхаў, які ўпершыню апублікаваў знаходку, датуе яе XIII ст. [7, мал. 34: *3*].

13. Нарыхтоўка ліцейнай формы (захоўваецца ў НГМРБ, памеры 7,0 × 6,2 × 2,3 см). Прадмет зроблены з кавалка, прыдатнага для дробнай апрацоўкі мяккага каменю няправільнай формы. На адным баку прадмета размешчана незакончаная апрацоўкай выява адліўкі (манетападобная прывеска ці накладка), упрыгожаная геаметрычным арнаментам.

Форма знойдзена ў 1959 г. падчас даследаванняў на тэрыторыі Верхняга замка. Выраб выяўлены ў межах будаўнічага гарызонту Ха на глыбіні 3,9 м [12, с. 13]. Г. В. Штыхаў датуе гэтую нарыхтоўку ліцейнай формы XIII ст. [7, мал. 32: *1*].

14. Ліцейная форма (захоўваецца ў НГМРБ, памеры 4,7 × 3,7 × 3,0 см). Прадмет мае амаль прамавугольную форму і моцна фрагментаваны. На вонкавым баку формы выразана будучая адліўка – гэта абразок з выявай святога (захавалася толькі ніжняя частка). Форма была знойдзена ў 1960 г. на тэрыторыі Верхняга замка. Г. В. Штыхаў датаваў выраб XIII ст. [7, мал. 34: *28*].

15. Ліцейная форма (захоўваецца ў НГМРБ, памеры 6,7 × 5,2 × 2,4 см). Прадмет зроблены з мяккай пароды каменю і мае трапецападобную форму. Выраб прызначаўся для адліўкі манетападобнай прывескі з салярным арнаментам (дванаццаціпялёсткавая разетка, якую акружаюць два арнаментальныя паяскі (ілжэвіты і ілжэзярнёны)). На вонкавым баку прадмета выразаны варонкападобны літнік, выемка для адліўкі вушка прывескі, а таксама дзве адтуліны для штыфтаў (у іх захаваліся сляды металу).

Выраб паходзіць з матэрыялаў археалагічных даследаванняў 1960 г. на тэрыторыі Верхняга замка. Больш дакладная лакалізацыя знаходкі ў межах раскопу не ўяўляецца магчымай. Г. В. Штыхаў датуе выраб XIII ст. [7, с. 69, мал. 34: *1*].

16. Ліцейная форма (захоўваецца ў НГМРБ, памеры 3,5 × 2,6 × 1,9 см). Прадмет двухбаковы, зроблены з мяккай пароды каменю і добра апрацаваны. На адным баку формы размешчана выява пацеркі з імітацыяй зерні, а таксама нескразная адтуліна для мацавання вонкавай створкі. Фрагментаванасць прадмета не дазваляе адназначна гаварыць аб спосабе ліцця, які выкарыстоўваўся майстрам для адліўкі дадзенага ўпрыгажэння, але найбольш верагодна, што пацерка адлівалася метадам «навыплеск». На адваротным баку размешчана выява яшчэ аднаго вырабу – крынападобнай прывескі. Хутчэй за ўсё гэтая частка формы з'яўлялася бракам вытворчасці і не выкарыстоўвалася па прызначэнні. На гэта ўказвае частковае несупадзенне варонкі літніка з выемкай для фармавання вушка прывескі.

Выраб быў выяўлены ў 1962 г. падчас даследаванняў Г. В. Штыхава на тэрыторыі Верхняга замка ў слаях XIII ст. (глыбіня 4,14 м) [13, с. 153; 7, мал. 34: *2*].

17. Ліцейная форма (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 7,2 × 2,8 × 1,3 см). Прадмет зроблены з распілаванага ўздоўж і добра апрацаванага шчыльнага рога. На вонкавай паверхні вырабу размешчаны невялікі варонкападобны літнік з двума каналамі, а таксама выявы будучых адлівак – гэта чатыры пацеркі. На трох з іх павінна была быць размешчана імітацыя зерні, а на чацвёртай – цыркульны арнамент. Рогавыя формы з'яўляюцца вельмі рэдкай знаходкай. Падобныя вырабы былі выяўлены ў Бірке, Хэдэбю, Ноўгарадзе і Пскове[1].

Зыходзячы з фізічных характарыстык матэрыялу, можна дапусціць, што такія прыстасаванні маглі ўжывацца для вырабу васковых мадэляў, якія служылі асновай для вырабу аднаразовых ліцейных форм. Між тым у матэрыялах раскопак старажытнага Ноўгарада сустракаюцца таксама і драўляныя ліцейныя формы, ужыванне якіх для адліўкі металічных упрыгажэнняў з алавяніста-свінцовых сплаваў з невысокай тэмпературай плаўлення не выклікае сумненняў. У сувязі з гэтым нельга выключаць магчымасці выкарыстання і дадзенай рогавай формы для непасрэднай адліўкі ўпрыгажэнняў [2, с. 220].

Прадмет быў знойдзены С. В. Тарасавым падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Вялікага пасада ў 1987 г. Верагодна, дадзены артэфакт трэба атаясамліваць з выяўленай у межах раскопу ювелірнай майстэрняй XII–XIII стст. [16; 17, мал. 63: *18*].

18. Ліцейная форма (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 4,9 × 4,3 × 1,4 см). Прадмет аднабаковы, прамавугольнай формы, зроблены з мяккай пароды каменю, добра апрацаваны і адшліфаваны. На адным баку размешчаны выявы будучых адлівак, якія ўяўляюць сабой невялікія паўсферы (1,2 × 1,2 см), злучаныя з варонкападобным літнікам трыма канальцамі (мал. 1: *2*). На думку Д. У. Дука, магчымае прызначэнне адлівак – накладка на рамяні [18, с. 12].

Прадмет быў знойдзены падчас археалагічных даследаванняў у 2010 г. на тэрыторыі Запалоцкага пасада. Выраб выяўлены ў слоі баласту, аднак аўтарам раскопак датуецца XI–XII стст. [18, с. 12].

19. Брак ліцейнай формы (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 4,1 × 2,7 × 1,7 см). Прадмет зроблены з надзвычай мяккай і крохкай пароды каменю. Выраб мае форму прамавугольнага бруска і апрацаваны з усіх бакоў. На іх размешчаны некалькі выемак правільнай формы: на шырэйшым баку – паўсферычная, а на тарцы – конусападобная. Побач з паўсфе-

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку Н. В. Еніосавай за ўказанне аналогій.



Мал. 1. Ліцейныя формы з Полацка: *1, 2* – знаходкі Д. У. Дука; *3* – знаходка А. А. Салаўёва

рычнай выемкай знаходзіцца нескразная прасвідраваная адтуліна, край якой сколаты. Фрагментаванасць выяў не дазваляе адназначна меркаваць аб характары будучай адліўкі. Дадзены артэфакт варта разглядаць у якасці бракаванай ліцейнай формы ці яе нарыхтоўкі.

Выраб знойдзены ў 2010 г. падчас даследаванняў Д. У. Дука на тэрыторыі Запалоцкага пасада. Прадмет быў выяўлены ў верхнім баластным слоі і аўтарам раскопак датуецца XI–XII стст. [18, с. 12, мал. 38: *8*].

20. Ліцейная форма (захоўваецца ў археалагічнай навукова-музейнай экспазіцыі НАН Беларусі, памеры 4,9 × 2,0 × 1,6 см). Прадмет зроблены з мяккай пароды каменю і добра апрацаваны. На адным баку формы захаваўся фрагмент выявы будучай адліўкі, які, аднак, не дае магчымасці поўнасцю рэканструяваць яе выгляд. Найбольш верагодна, што гэта частка трох- ці чатырохчасткавай ліцейнай формы, якая выкарыстоўвалася для адліўкі складанага прадмету. Характар арнаменту дазваляе меркаваць, што форма прызначалася для адліўкі полых вырабаў тэхнікай «навыплеск» (мал. 1: *1*).

Дадзены артэфакт выяўлены падчас археалагічных даследаванняў 2009 г., якія праводзіліся пад кіраўніцтвам Д. У. Дука на тэрыторыі Вялікага пасада. Прадмет быў знойдзены ў перамешаным слоі XIII–XVII стст. [19, с. 10].

21. Нарыхтоўка ліцейнай формы (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры 7,8 × 5,4 × 2,0 см). Прадмет зроблены з мяккай пароды каменю, амаль прамавугольнай формы, добра апрацаваны. На абодвух баках вырабу размешчаны незакончаныя апрацоўкай выявы будучых адлівак, а таксама па чатыры нескразныя адтуліны, якія, верагодна, прызначаліся для злучэння створак формы. На адным баку, акрамя невыразных драпін, знаходзяцца дзве цыркульныя выявы, злучаныя паміж сабой невялікім канальцам. Малюнак, верагодна, з'яўляецца часткай разметкі, якая наносілася майстрам на камень для будучай дапрацоўкі разцом. Выява падобнага характару размешчана і на адваротным баку формы. Між тым малюнак разметкі тут больш складаны і мае раслінна-геаметрычны характар (мал. 1: *3*). Верагодна, у форме планавалася адліваць упрыгажэнні з перагародкамі для запаўнення іх эмаллю.

Выраб з'яўляецца выпадковай знаходкай і паходзіць з прыватнай калекцыі А. А. Салаўёва. Прадмет знойдзены ў 2000 г. на тэрыторыі Вялікага пасада (вул. Леніна, д. 14) падчас нагляду за землянымі работамі. Верагоднае датаванне формы – XII–XIII стст.

Такім чынам, ліцейныя формы, знойдзеныя на тэрыторыі Полацка, з'яўляюцца выдатным адлюстраваннем высокага прафесійнага ўзроўню старажытных полацкіх ювеліраў. Большая іх частка зроблена з прыдатнага для тонкай апрацоўкі дробназярністага вапняку. Пашырэнне іх выкарыстання трэба звязваць з павышэннем таварнасці ювелірнага рамяства, арыентацыі яго прадукцыі на рынак. Гэтым можна патлумачыць і ўжыванне для вырабу ліцейных форм на першы погляд не прыдатных для гэтых мэт матэрыялаў (рог), якія паводле сваіх фізічных уласцівасцей былі прызначаныя для адлівак упрыгажэнняў з алавяніста-свінцовых сплаваў з нізкай тэмпературай плаўлення.

Ювелірныя вырабы, зробленыя з такой сыравіны, знешне вельмі нагадвалі дарагія сярэбраныя ўпрыгажэнні, якія былі не даступны для простых гараджан. На арыентацыю прадукцыі мясцовых ювеліраў на масавага спажыўца ўказвае і з'яўленне так званых імітацыйных форм, з дапамогай якіх на паверхні літых упрыгажэнняў імітаваліся вельмі працаёмкія дэкаратыўныя прыёмы – зярненне і філіграні. На тэрыторыі Ноўгарада падобныя формы з'яўляюцца ў XII ст., а ў Полацку, паводле Г. В. Штыхава, толькі ў 20-ыя гады XIII ст. [2, с. 218; 8, с. 139]. Між тым нельга адмаўляць магчымасці існавання такой тэхнікі і ў больш ранні час, пра што можа

сведчыць знаходка рогавай ліцейнай формы, якая датуецца больш шырока – XII–XIII стст.

Не выклікае сумнення, што ліцейныя формы рабілі самі майстры-ювеліры. На гэта ўказваюць знаходкі нарыхтовак, а таксама браку вытворчасці. Акрамя таго, толькі злотнікі ведалі фізічныя характарыстыкі каляровых металаў і іх сплаваў, а таксама іх паводзіны пад ўздзеяннем высокіх тэмператур, што дазваляла разлічыць неабходныя памеры літніка, а таксама аб'ём металу, патрэбны для адліўкі ўпрыгажэнняў. Такім чынам, ювелір павінен быў не толькі валодаць адмысловымі прыёмамі апрацоўкі сыравіны, але таксама ўмець працаваць з каменем, глінай, рогам і іншымі матэрыяламі.

Пэўную цікавасць выклікае таксама датаванне і лакалізацыя ліцейных форм, знойдзеных на тэрыторыі Полацка. Асноўная іх частка датуецца XIII ст. і была знойдзена падчас археалагічных даследаванняў на Верхнім замку. У межах «усходняга раскопу» мы вылучаем два вытворчыя ювелірныя комплексы, якія актыўна дзейнічалі ў XIII ст. З вялікага раскопу 1987–1988 гг. на тэрыторыі Вялікага пасада ў фондах НПГКМЗ на сённяшні момант захоўваецца толькі адна ліцейная форма, зробленая з рогу. Яна, верагодна, мела дачыненне да ювелірнай майстэрні, якая функцыянавала на дадзеным месцы ў XII–XIII стст. Яшчэ адзін фрагмент ліцейнай формы, знойдзенай на Вялікім пасадзе ў 2009 г., датуецца больш познім часам – XIII–XVII стст.

Дзве формы былі выяўлены на тэрыторыі Запалоцкага пасада падчас раскопак 2010 г. Прадметы знойдзены ў баластным верхнім слоі. На месцы раскопак не было зафіксавана іншых сведчанняў ювелірнай вытворчасці, што не дазваляе атаясамліваць дадзеныя знаходкі з пэўным вытворчым комплексам. Таксама цяжка датаваць і нарыхтоўку ліцейнай формы, якая паходзіць з прыватнай калекцыі А. А. Салаўёва.

Тыглі. Важным прыстасаваннем старажытных ліцейшчыкаў былі тыглі – керамічныя ёмістасці для плаўкі каляровых металаў і разліву яго ў формы [20]. Тыглі ўяўляюць асаблівую цікавасць для даследавання ювелірнай вытворчасці не толькі таму, што з'яўляюцца яе індыкатарам. Форма і памеры гэтых керамічных пасудзін, склад і ўласцівасці глінянага цеста залежаць ад умоў плаўкі пэўных металаў і сплаваў, канструкцыі вогнішча і печы, ад здольнасцей ліцейшчыкаў кантраляваць металургічныя працэсы, якія адбываюцца ў тыглях [5].

У літаратуры дастаткова часта згадваецца яшчэ адзін тып керамічных пасудзін, якія мелі дачыненне да ліцейнай справы – льячкі. Існуе меркаванне, што дадзеныя вырабы выкарыстоўваліся для разліву расплаўленага металу ў формы. Аднак у даследаваннях апошняга часу прыводзяцца пераканаўчыя доказы немэтазгоднасці вылучэння гэтай групы ёмістасцей у асобны від [5]. У дадзенай рабоце мы прытрымліваемся падобнай кропкі гледжання і ўсе керамічныя пасудзіны, якія маюць дачыненне да гарачай апрацоўкі каляровых металаў, будзем адносіць да тыгляў.

Паводле нашых падлікаў, на тэрыторыі Полацка за час археалагічных даследаванняў было выяўлена звыш 200 тыгляў. Сёння ў фондах НПГКМЗ захоўваецца 107 тыгляў (11 цэлых і 96 фрагментаў), асобныя артэфакты знаходзяцца таксама ў Археалагічнай навукова-музейнай экспазіцыі НАН Беларусі, а таксама ў НГМРБ. Фрагменты пасудзін для плаўкі каляровых металаў дастаткова часта сустракаюцца падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Полацка, аднак найбольшая іх канцэнтрацыя была зафіксавана ў тых месцах, дзе знойдзены сляды існавання вытворчых ювелірных комплексаў.

Як ужо адзначалася, спецыяльным даследаваннем полацкіх тыгляў займаліся Г. В. Штыхаў і Д. В. Навумаў (класіфікацыя і фізіка-хімічныя даследаванні). Апошні прывёў хімічны аналіз аднаго тыгля з раскопак 1960–1961 гг. на тэрыторыі Верхняга замка. У выніку было ўстаноўлена, што прадмет зроблены з матэрыялу, які адпавядае паўкіслым вогнеўпорам, на зломе мае шэравата-малочны колер і дробназярністую структуру. Аналіз нацёкаў металу на ўнутранай паверхні ёмістасці паказаў, што ў тыглі плавілася бронза [9].

Вялікую цікавасць уяўляюць работы Г. В. Штыхава, які займаўся комплексным вывучэннем пасудзін для плаўкі каляровых металаў з раскопак на Верхнім замку («усходні раскоп»). Паводле яго даследаванняў, полацкія тыглі зроблены са светлай тугаплаўкай гліны з дамешкамі буйназярністага пяску. Усе знойдзеныя падчас раскопак 1959–1961 гг. прадметы дадзенай катэгорыі навуковец аднёс да «кругладонных, пірамідальнай формы». Даследчык адзначыў, што ўсе ёмістасці мелі носік-зліў, які дазваляў разліваць расплаўлены метал непасрэдна ў форму [8, с. 135–136].

У іншых публікацыях, прысвечаных вынікам археалагічны даследаванняў на тэрыторыі Полацка, прыводзяцца, як правіла, толькі самыя агульныя звесткі адносна колькасці, формы і памераў выяўленых пасудзін для плаўкі каляровых металаў [16; 22, с. 172].

Дадзенае даследаванне ў асноўным заснавана на дастаткова прадстаўнічай калекцыі полацкіх тыгляў са збору НПГКМЗ. Са 107 тыгляў прыдатным для класіфікацыйнага аналізу з'яўляецца 61. Дадзеная група прадметаў поўнасцю ці часткова захавала свой першапачатковы выгляд.

Паводле формы намі вылучаны тры тыпы ёмістасцей: 1) цыліндрычныя (26 экзэмпляраў); 2) конусападобныя (35 экзэмпляраў); 3) тыглі-купелі (1 экзэмпляр). Конусападобныя тыглі, у сваю чаргу, падзяля-



Мал. 2. Тыглі для плаўкі каляровых металаў з Полацка: *1*, *4* – раскопкі Д. У. Дука; *2* – раскопкі С. В. Тарасава; *3* – раскопкі М. В. Клімава

юцца на два падтыпы паводле формы дна: 1) з акруглым дном; 2) з плоскім дном.

Цыліндрычныя тыглі зроблены са светлай, аднаслойнай, добра вымучанай гліны, якая амаль не ўтрымлівае ў сваёй структуры ўключэнняў буйных каменьчыкаў. Як правіла, вонкавая паверхня тыгляў моцна ашлакаваная, што ўказвае на шматразовае выкарыстанне ёмістасці для плаўкі каляровых металаў. Пераважаюць шлакі чырвонага і чорнага колеру (мал. 2: *1, 2*).

Вонкавае ашлакоўванне з'яўляецца вынікам хімічнай рэакцыі паміж крэменязёмам, які ўтрымліваецца ў фармовачнай масе, драўляным попелам у печы і металам, падчас яго ўцечкі з ёмістасці. Чырвоныя плямы на шклопадобнай паверхні – гэта сілікат медзі, чорныя – сілікат жалеза [5].

Цыліндрычныя тыглі маюць розныя памеры. Можна вылучыць вялікія (вышыня 7–9 см) і маленькія тыглі (вышыня 3–4 см). Сярэдняя таўшчыня сценак такіх тыгляў – 0,7–0,8 см, а дыяметр вусця вагаецца ад 2,6 да 3,9 см.

Аб'ём вялікіх цыліндрычных тыгляў, паводле падлікаў Н. В. Рындзінай, складаў 25–30 см^3. У іх магло змясціцца 200–210 г бронзы ці 250–270 г серабра. Аб'ём маленькіх цыліндрычных тыгляў вагаецца ад 2 да 8 см^3, што адпавядае 20–70 г бронзы ці 20–80 г серабра [5].

Падобныя вырабы атрымалі дастаткова шырокае распаўсюджванне на вялікай тэрыторыі, што не дае магчымасці звязваць іх паходжанне і распаўсюджванне з пэўным рэгіёнам ці этнасам.

У межах Полацка знаходкі цыліндрычных тыгляў у асноўным канцэнтруюцца ў двух пунктах: на Вялікім пасадзе (раскопкі С. В. Тарасава, 1987–1988 гг.) і Ніжнім замку (раскопкі С. В. Тарасава, 1989 г.) [23, мал. 45: *1*; 24, мал. 20: *1–6*]. Падчас даследаванняў на гэтых аб'ектах былі выяўлены рэшткі вытворчых ювелірных комплексаў, да дзейнасці якіх адносіліся знойдзеныя тыглі. Майстэрня на Ніжнім замку датуецца X–XI стст., а на Вялікім пасадзе – XII–XIII стст. [16].

Акрамя гэтых двух цэнтраў, цыліндрычныя тыглі былі выяўлены падчас археалагічных даследаванняў на полацкім селішчы (раскопкі Г. В. Штыхава, 1979 г.), а таксама на Вялікім пасадзе (вул. Ніжне-Пакроўская, д. 35; плошча Свабоды) (раскопкі Н. І. Здановіч, 1991–1992 гг.; Д. У. Дука, 2009 г.) [25, с. 6; 19, с. 10].

Група конусападобных тыгляў самая шматлікая і колькасна пераважае сярод полацкіх артэфактаў (35 экзэмпляраў). Дадзены тып ёмістасцей для плаўкі каляровых металаў адрозніваецца паводле характарыстык фармовачнай масы, памераў і іншых параметраў (мал. 2: *3*).

Кругладонныя конусападобныя тыглі найбольш шырока прадстаўлены ў полацкай калекцыі (31 экзэмпляр). Падобная форма найбольш мэтазгодна для тыгляў: вузкія, невысокія ёмістасці з нешырокім вусцем да мінімуму абмяжоўвалі доступ паветра да расплаўленага металу і не дазвалялі яму акісліцца [2, с. 214].

Выразна вылучаюцца дзве рэцэптуры, паводле якіх прыгатаваны фармовачныя масы такіх тыгляў: 1) светлая, аднаслойная гліна з дамешкамі буйной жарствы (сярэднія памеры ўключэнняў – 0,3 × 0,3 см); 2) светлая, аднаслойная, добравымучаная гліна без уключэнняў. Структура фармовачнай масы, відавочна, уплывала на вогнеўпорныя ўласцівасці тыгляў, а таксама на тэрмін іх выкарыстання для плаўкі каляровых металаў.

Як правіла, вонкавая паверхня кругладонных конусападобных тыгляў слабаашлакаваная. Пераважаюць шлакі чырвонага і чорнага колеру. Слабая ашлакаванасць ўказвае на той факт, што падобныя ёмістасці выкарыстоўваліся ліцейшчыкамі не больш аднаго-двух разоў.

Паводле сваіх памераў тыглі гэтага тыпу падзяляюцца на вялікія (сярэдняя вышыня 7,2–7,8 см пры таўшчыні сценак 0,6–0,8 см) і маленькія (сярэдняя вышыня 3,5–4,5 см пры таўшчыні 3,5–4,5 см). Сярэднія памеры вусцяў вялікіх сасудаў – 6,0 × 7,0 см, а маленькіх – 4,5 × 4,0 см.

Як можна меркаваць па вядомых артэфактах, конусападобныя тыглі мелі адмысловы носік-зліў, які выкарыстоўваўся для разліву расплаўленага металу ў ліцейныя формы.

Пэўную цікавасць уяўляюць таксама і пласкадонныя конусападобныя тыглі, якіх у полацкай калекцыі налічваецца чатыры экзэмпляры. На вялікі жаль, усе яны з'яўляюцца выпадковымі знаходкамі, што не дазваляе з упэўненасцю датаваць прадметы. Вырабы зроблены з добравымучанай аднаслойнай светлай гліны і паводле асноўных параметраў адпавядаюць вялікім кругладонным конусападобным тыглям. Дыяметр донцаў трох такіх ёмістасцей (выпадковыя знаходкі А. А. Салаўёва на тэрыторыі Экімані) без слядоў выкарыстання на знешняй і ўнутранай паверхні ў сярэднім роўны 1,8 см. Такое донца не забяспечвала пасудзіне ўстойлівасць на плоскай паверхні, і, верагодна, не несла значнай функцыянальнай нагрузкі. Цікавасць уяўляе пласкадонны тыгель для плаўкі каляровых металаў з дыяметрам донца 3,6 см (выпадковая знаходка А. А. Салаўёва на тэрыторыі Ніжняга замка). Прадмет танкасценны (0,4 см), зроблены з добравымучанай гліны, на ўнутранай і вонкавай паверхні – сляды ўжывання. З'яўленне ўстойлівых пласкадонных тыгляў, верагодна, трэба звязваць са змяненнем канструкцыі плавільных печаў і павелічэннем аб'ёмаў сыравіны, якая трапляла ў рукі гарадскіх майстроў. На думку Н. В. Рындзінай, падобныя ёмістасці з'явіліся ў XIV–XV стст. [2, с. 214].

Паводле назіранняў Г. В. Штыхава, аб'ём конусападобных тыгляў вагаецца ад 30 да 75 см^3. У ёмістасці падобнага аб'ёму можна было расплаўляць 100–300 г волава [8, с. 136].

Конусападобныя тыглі дастаткова часта сустракаюцца ў матэрыялах археалагічных даследаванняў старажытнага Полацка, аднак найбольшая іх колькасць фіксуецца на Верхнім замку (раскопкі А. Г. Мітрафанава і Г. В. Штыхава, 1959–1962 гг.) і Вялікім пасадзе (раскопкі Д. У. Дука, 2005 г.) [7, с. 64, мал. 34: *26*; 21]. Падчас раскопак на гэтай частцы тэрыторыі горада было выяўлена не менш трох вытворчых ювелірных комплексаў [26].

Майстэрні на Верхнім замку датуюцца сярэдзінай–другой паловай XIII ст. [7, с. 41, 46]. Тыглі, якія адносяцца да дадзеных вытворчых комплексаў, зроблены з выкарыстаннем першай рэцэптуры, а таму ўтрымліваюць у сваёй структуры значныя дамешкі буйной жарствы. Трэба адзначыць, што выкарыстанне ёмістасцей з падобнай фармовачнай масай не было зафіксавана ў іншых месцах Полацка.

Падчас выратавальных раскопак на Вялікім пасадзе ў 2005 г. былі ўскрыты рэшткі вытворчага ювелірнага комплексу, які дзейнічаў у першай палове XVII ст. У межах раскопу знойдзена звыш 50 тыгляў [22, с. 172]. Усе прыдатныя для класіфікацыйнага аналізу экзэмпляры адносяцца да тыпу кругладонных конусападобных. Фармовачная маса большасці гэтых ёмістасцей зроблена па другому рэцэпту і амаль не ўтрымлівае ў сваёй структуры дамешак буйной жарствы. Акрамя таго, дадзеная група тыгляў мае больш тонкія сценкі і вузкае дно ў параўнанні з пасудзінамі з майстэрняў на тэрыторыі Верхняга замка.

Конусападобныя тыглі былі знойдзены таксама ў Экімані (2001 г., А. А. Салаўёў, выпадковыя знаходкі разам з матэрыяламі XVII–XVIII стст.), на Вялікім пасадзе (2006 г., выпадковыя знаходкі А. А. Салаўёва) і інш.

Яшчэ адзін артэфакт, выяўлены на тэрыторыі Полацка, адносіцца да тыпу тыгляў-талерачак (ці тыгляў-купеляў) (захоўваецца ў НПГКМЗ, памеры фрагмента 5,9 × 3,7 × 0,7 см) (мал. 2: *4*). Падобныя пасудзіны выкарыстоўваліся ў працэсе купеляцыі (аддзялення каштоўных металаў ад дамешкаў), а таксама пры вызначэнні чысціні серабра ці золата [5]. Гэта быў вельмі складаны працэс, які патрабаваў пэўных тэхнічных навыкаў і матэматычных ведаў, што ўказвае на высокі ўзровень мясцовых ювеліраў.

Гэты прадмет знойдзены ў 2005 г. падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Вялікага пасада сярод рэшткаў вытворчага ювелірнага комплексу першай паловы XVII ст. [21]. Тыгель моцна фрагментаваны, зроблены з добравымучанай, аднароднай гліны, якая не ўтрымлівае ў сваёй структуры буйных дамешкаў жарствы ці шамоту. Унутраная і знешняя паверхня слаба ашлакаваная. На вонкавай паверхні пераважаюць шлакі чырвонага колеру, на ўнутранай – чорнага і чырвонага. Існуе думка, што метал у такіх пасудзінах награваўся зверху пры дапамозе паяльніка і адмысловай трубкі-феўкі [5]. Менавіта гэтым можна патлумачыць наяўнасць шлакаў не толькі на вонкавым, але і на ўнутраным баку.

Н. В. Еніосава мяркуе, што тыглі-купелі маюць скандынаўскае паходжанне. На думку даследчыцы, менавіта майстры-скандынавы з'яўляліся на Русі носьбітамі тэхнікі купеляцыі [5]. Між тым археалагічны кантэкст полацкай знаходкі, дазваляе з упэўненасцю меркаваць, што тыглі-купелі ўжываліся мясцовымі ювелірамі і ў першай палове XVII ст. Верагодна, падобная тэхналагічная аперацыя з'яўлялася вельмі ўдалым сродкам ачысткі каштоўных металаў, а таму не страчвала сваёй актуальнасці на працягу многіх стагоддзяў.

Такім чынам, тыглі, якія выкарыстоўвалі полацкія ліцейшчыкі, з'яўляюцца выдатным адлюстраваннем высокага ўзроўню развіцця ювелірнага ра-

мяства на тэрыторыі горада на працягу X–XVII стст. У іх канструкцыі ўвасобіліся глыбокія веды полацкіх майстроў адносна фізічных і хімічных уласцівасцей каляровых металаў і іх сплаваў.

У ходзе даследавання намі было выяўлена, што полацкія ліцейшчыкі карысталіся не менш чым трыма тыпамі пасудзін для плаўкі металаў: 1) цыліндрычныя; 2) конусападобныя; 3) тыглі-купелі. Цыліндрычныя тыглі атрымалі найбольшае распаўсюджванне ў X–XIII стст. і надзейна атаясамліваюцца з двума вытворчымі ювелірнымі комплексамі, якія функцыянавалі на тэрыторыі Ніжняга замка (X–XI стст.) і Вялікага пасада (XII–XIII стст.). Фармовачная маса гэтых тыгляў выканана па аднаму рэцэпту. Падобныя ёмістасці выкарыстоўваліся некалькі разоў, на што ўказвае вялікая ступень ашлакованасці паверхні.

Конусападобныя тыглі найбольш шырока прадстаўлены ў полацкай калекцыі. У прыгатаванні фармовачнай масы для іх вырабу выразна вылучаюцца два рэцэпты. Конусападобныя тыглі з вялікімі дамешкамі буйной жарствы лакалізуюцца ў межах Верхняга замку («усходні раскоп»), дзе было выяўлена не менш дзвюх ювелірных майстэрняў сярэдзіны–другой паловы XIII ст. Пасудзіны з добра вымучанага глінянага цеста канцэнтруюцца ў межах знойдзенай ў 2005 г. на тэрыторыі Вялікага пасада ювелірнай майстэрні першай паловы XVII ст. Адзіны экзэмпляр тыгля-талерачкі таксама адносіцца да гэтага рамеснага комплексу.

У полацкіх майстроў-ліцейшчыкаў вялікую папулярнасць атрымаў тып кругладонных конусападобных тыгляў, якія выкарыстоўваліся мясцовымі рамеснікамі з XIII па XVII ст. У той жа час цыліндрычныя тыглі, папулярныя ў X–XIII стст., не атрымалі распаўсюджвання ў наступны час. Тлумачыць гэтую акалічнасць можна па-рознаму. Магчыма, выбар быў абумоўлены канструкцыйнымі асаблівасцямі плавільнай печы. Акрамя таго, як ужо адзначалася, менавіта конусападобная форма з'яўлялася найбольш прыдатнай для плавільных пасудзін з функцыянальнай кропкі гледжання. Аднак нельга выключаць магчымасці не аўтахтоннасці традыцыі ўжывання цыліндрычных тыгляў, што і праявілася ў хуткім яе знікненні, у той час як конусападобныя пасудзіны трывала ўвайшлі ў арсенал полацкіх ліцейшчыкаў і ўжываліся імі на працягу некалькіх стагоддзяў.

Такім чынам, полацкія майстры-ювеліры валодалі найбольш прагрэсіўнымі для свайго часу рамеснымі прыёмамі апрацоўкі каляровых металаў. Наяўнасць у полацкай калекцыі значнай колькасці прыстасаванняў для ліцейнай справы сведчыць аб вялікім значэнні дадзенага накірунку рамяства ў асяроддзі мясцовых ювеліраў.

Літаратура

1. Рыбаков, Б. А. Ремесло древней Руси / Б. А. Рыбаков. – М.: Изд-во АН СССР, 1948. – 784 с.

2. Рындина, Н. В. Технология производства новгородских ювелиров X–XV вв. / Н. В. Рындина // Тр. новгородской археолог. экспедиции. – М., 1959. – № 65: Материалы и исследования по археологии СССР. – С. 200–247.

3. Каргер, М. К. Древний Киев / М. К. Каргер // Очерки по истории материальной культуры древнерусского города: в 2 т. – М.; Л.: Изд-во АН СССР, 1958. – Т. 1. – 579 с.

4. Ениосова, Н. В. Литейные формы Гнёздова / Н. В. Ениосова // Историческая археология. Традиции и перспективы (к 80-летию со дня рождения Даниила Антоновича Авдусина). – М.: Памятники исторической мысли, 1998. – С. 67–81.

5. Ениосова, Н. В. Тигли Гнёздовского поселения / Н. В. Ениосова, Р. А. Митоян // Археолог. сб., посв. памяти Марии Васильевны Фехнер. Тр. ГИМ. – М.: ГИМ, 1999. – Вып. 111. – С. 54–63.

6. Дайга, И. В. К вопросу о литейных формах и литейном деле на территории Латвии (до XIII в.) / И. В. Дайга // Сов. археология. – 1960. – № 3. – С. 78–92.

7. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк IX–XIII вв. / Г. В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.

8. Митрофанов, А. Г. Древний Полоцк (по археологическим данным) / А. Г. Митрофанов, Г. В. Штыхов, В. Р. Тарасенко // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі. – Спр. 124.

9. Наумов, Д. В. Химическое и структурное исследование некоторых предметов из Полоцка XII–XIII стст. / Д. В. Наумов // Белорусские древности: докл. к конф. по археологии Белоруссии (январь-февраль 1968 г.). – Минск: Отпечатано на ротапринте Фундаментальной библиотеки им. В. Г. Белинского АН БССР. – С. 298–306.

10. Сингх, В. К. Инструменты новгородских ювелиров / В. К. Сингх // Родина. – 2009. – № 9. – С. 72–79.

11. Тарасенко, В. Р. Отчет о раскопках Полоцой археологической экспедиции Института истории АН БССР в 1961 г. / В. Р. Тарасенко, Г. В. Штыхов // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі. – Спр. 114.

12. Полоцк. Коллекционные описи археологических раскопок на Верхнем замке в 1959 году // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі. – Спр. 164а.

13. Полоцк. Коллекционные описи находок из раскопок Верхнего замка в 1960, 1961, 1962 гг. // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі. – Спр. 114а.

14. Седова, М. В. Ювелирные изделия Древнего Новгорода (X–XV вв.) / М. В. Седова. – М.: Наука, 1981. – 196 с.

15. Башков, А. А. Христианские древности Беларуси конца X – XIV в. (предметы христианского культа индивидуального использования) / А. А. Башков. – Минск: ИП Логвинов И. П., 2011. – 194 с.

16. Тарасаў, С. В. Сядзіба полацкіх ювеліраў XII–XIII стст. / С. В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнар. навук. канф. – Полацк: НПГКМЗ, 2003. – С. 267–272.

17. Тарасаў, С. В. Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С. В. Тарасаў. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 183 с.

18. Дук, Д. У. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Запалоцкага пасада г. Полацка ў 2010 г. / Д. У. Дук // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі (на зацвярджэнні ў палявым камітэце).

19. Дук, Д. У. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на аб'екце «Узвядзенне помніка героям вайны 1812 г. » у г. Полацку у 2009 г. / Д. У. Дук // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі. – Спр. 2647.

20. Лашанкоў, М. І. Тыгель / М. І. Лашанкоў // Археалогія Беларусі: энцыкл.: у 2 т. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2: Л–Я / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 360.

21. Дук, Д. У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе / Д. У. Дук // Весн. «ПДУ». Сер. А, Гуманітарныя навукі. – № 1. – 2007. – С. 5–23.

22. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.

23. Тарасов, С. В. Отчет о раскопках в Полоцке в 1988 г. / С. В. Тарасов // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі. – Спр. 1084.

24. Тарасов, С. В. Отчет о раскопках в Полоцке в 1989 г. / С. В. Тарасов // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі. – Спр. 1165.

25. Штыхов, Г. В. Отчет о работах в 1979 г. в окрестностях Минска и других местах Полоцкой земли / Г. В. Штыхов // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі. – Спр. 635.

26. Тарасаў, С. В. Полацкая ювелірна вытворчасць / С. В. Тарасаў // Археалогія Беларусі: энцыкл.: у 2 т. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л–Я / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 205–206.

Резюме

И. В. Магалинский

Литейные формы и тигли для плавки цветных металлов с территории Полоцка (X–XVII вв.)

В статье представлены результаты исследования наиболее распространенных приспособлений древних литейщиков: литейных форм и тиглей для плавки цветных металлов. В результате изучения литейных форм, найденных на территории Полоцка, автор приходит к заключению, что основная их часть изготовлялась из мелкозернистого известняка местными ювелирами. Кроме того, в полоцкой коллекции хранятся изделия из глины и рога. Отдельные находки свидетельствуют о том, что полоцким мастерам были известны имитационные формы, а также передовые техники литья. В ходе изучения тиглей для плавки цветных металлов на основании их морфологических харктеристик было выделено три типа изделий (цилиндрические, конусообразные и тигли-купели), выявлены определенные закономерности в технологии их изготовления, хронологии и локализации отдельных типов сосудов на территории города.

Summary

I. Mahalinski

Casting molds and crucibles for melting nonferrous metals from the territory of Polotsk (Xth–XVIIth cc.)

The article is about the research of the most widespread devices of ancient casters: casting molds and crucibles for melting nonferrous metals. After the research of casting molds, that were found on the territory of Polotsk, the author draws the conclusion that the main part of them was made from limestone by local jewelers. In addition to this, in the collection of Polotsk, articles from clay and horn are kept. Some findings give evidence of the fact that masters from Polotsk knew about imitating forms and leading techniques of casting. In the course of the study of crucibles for melting nonferrous metals, 3 types of items were singled out: cylindrical, conical, and that in the form of a small plate. There were revealed definite patterns of manufacturing techniques, chronology and localization of some types of vessels on the territory of the town.

Паступіў 24.02.2011

М. В. Клімаў, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск);*
П. М. Кенько, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны (г. Мінск)*

Элементы паяснога набору з г. Полацка (па выніках раскопак 2008–2009 гг.)

У 2008–2009 гг. у г. Полацку згодна з дзяржаўнай праграмай даследавання горада экспедыцыяй Інстытута гісторыі НАН Беларусі пад кіраўніцтвам М. В. Клімава праводзіліся дадатковыя археалагічныя работы, якія закранулі Запалоцкі пасад, Вялікі пасад (вул. Ф. Скарыны) і гарадзішча (2-гі завулак Фрунзе).

У 2008 г. было праведзена ўдакладненне тапаграфіі Запалоцкага пасада, археалагічны раскоп быў даследаваны па правым беразе р. Палаты, насупраць паўночнай аканечнасці (машны) Верхняга замка (мал. 1: *1*). Раскоп плошчай 72 м^2 выявіў матэрыялы, якія ў асноўным датаваліся XI–XVII стст. Было вызначана, што даследаваная частка пасада пачала фарміравацца з XI ст. і актыўна развівалася ў XII – першай палове XIII ст. [9, с. 3].

У лютым-красавіку 2009 г. пры археалагічных выратавальных работах на перакрыжаванні вуліц Ф. Скарыны і Сака і Ванцэці было праведзена археалагічнае назіранне катлавана, які капаўся пад будынак, плошчай 1045 м^2 і выратавальныя археалагічныя раскопкі на плошчы 180 м^2 (мал. 1: *3*). У выніку гэтых работ быў выяўлены змястоўны археалагічны матэрыял, які сведчыў аб пачатку фарміравання дадзенай часткі Вялікага пасада ў XI ст.

У ліпені 2009 г. было ажыццёўлена дадатковае абследаванне ўсходняй часткі гарадзішча і закладзены шурф, памерам 8 м^2 (мал. 1: *2*). Ніжні слой шурфа вызначаўся наяўнасцю фрагментаў керамікі X ст., дзірхемаў.

На кожным з вышэйзгаданых помнікаў было сукупна выяўлена 10 элементаў паясной гарнітуры. Звернемся да аналізу вышэйпамянёных артэфактаў.

У раскопе на Запалоцкім пасадзе была выяўлена унікальная для тэрыторыі Беларусі бронзавая акоўка пояса, выкананая ў звярыным стылі (мал. 2: *1*). Яна служыла для мацавання раздзяляльных кольцаў і спражак [19, p. 34] да скураной асновы рэменя. Па стратыграфічнай сітуацыі накладка знаходзілася на глыбіні 0,70–0,72 м ад дзённай паверхні ў кв. 16 (магутнасць культурнага пласта ў дадзенай частцы раскопу складала 1,25 м). Неабходна адзначыць, што накладка паходзіла з чорна-шэрага слоя, які ўтрымліваў вуголле. У гэтым жа квадраце, за 0,45 м ад накладкі, быў выяўлены крыж-энкалпіён, які меў след уздзеяння высокай тэмпературы. Не выключаны падобныя сляды і на накладцы, што прывяло да яе істотнага акіслення. Асноўны склад матэрыялаў на глыбіні 0,70–0,72 м ад дзённай паверхні суадносіўся з XII – першай паловай XIII ст. Аналагічныя акоўкі былі знойдзены на помніках латгалаў – гарадзішча Кокнес (мал. 2: *2, 3*) [18, с. 232, табл. 60: *13–16*], сёлаў – селішча Ступелі (мал. 2: *4*) [17, с. 173], ліваў – селішча Кабелес (мал. 2: *5*) [14, с. 31, табл. IX: *35*] і эстаў – гарадзішча Уніпіха (мал. 2: *6*) [1, с. 70, рис. 21: *4*]. Датуюцца XI–XII стст. [1, с. 70; 17, с. 173].

У гэтым жа раскопе былі знойдзены два кальцы, адно з якіх магчыма аднесці да паясных, другое, па функцыянальным прызначэнні, блізкае да спражкі. Першае (мал. 3: *1*) з іх выяўлена ў мацерыковай яме № 2 на глыбіні 1,9 м ад дзённай паверхні. Асноўная колькасць матэрыялаў з ямы № 2 датуецца ў межах канца XI – XIII ст. Сярод матэрыялаў з ямы сустрэты шыферныя праселкі, шкляныя бранзалеты, капавушка з выявай сабачкі і інш. Другое кальцо (мал. 3: *2*) не мела прывязкі па слоі помніка. Подобныя паясныя кольцы былі шырока распаўсюджаны ва ўсіх усходнеславянскіх старажытнасцях. Яны маюць шырокае датаванне: X–XV стст. [15, с. 152].

Сярод паясной гарнітуры з Полацка вылучаюцца дзве лірападобныя спражкі з авальнай завостранай на канцы рамкай, непасрэдна пераходзячай у прамавугольную аснову. Яны арнаментаваны насечкамі. Спражка з раскопу 1 (мал. 3: *3*) з Запалоцця мела пашкоджанне ад уздзеяння высокай тэмпературы. Спражка была выяўлена ў перадмацерыковым слоі, на глыбіні 1,6 м ад дзённай паверхні. Другая спражка (рис. 3: *4*) паходзіла з раскопу, які даследаваўся на вул. Ф. Скарыны ў пласце (кв. Е1) і змяшчаў матэрыялы пачатку XI – XII ст. Аналагічныя спражкі на тэрыторыі Беларусі былі знойдзены ў Полацку [16, с. 34, мал. 54], Кублішана [2, с. 63], Гальшанах [4, с. 113, рис. 6: *1*; 8, с. 14, рис. 12: *9, 10*] і датаваны XI–XII стст. У Ноўгарадзе падобныя спражкі датаваны канцом XI – канцом XII ст. у Прыкам'і і Саркеле ў комплексах X–XI стст. [15, с. 144, рис. 56: *5*].

У суседнім квадраце раскопу па вул. Ф. Скарыны (кв. Ж1) у пласце, які датаваны пачаткам XI – XII ст., была выяўлена білонавая спражка, з авальнай рамкай, якая пераходзіць у прамавугольны нерухомы шчыток (мал. 3: *5*), арнаментавана трылістнікам у абрамленні двух пабегаў. З адваротнага бо-



Мал. 1. Раскоп 2008 г. на Запалоцкім пасадзе (*1*, план Полацка XI–XIII стст. па Г. В. Штыхаву); размяшчэнне шурфа 2009 г. на плане гарадзішча (*2*); зона археалагічных прац па вул. Ф. Скарыны ў 2009 г. (*3*)

ку 4 штыфты для мацавання да рэменя. Спражкі з нерухомым шчытком – досыць рэдкая знаходка для Беларусі. Аналагічныя спражкі былі знойдзены на наступных помніках: Ваўкавыск [5, с. 46, рис. 14: *5*], Ворань [6, с. 9, рис. 1: *f*], Гальшаны [7, с. 20, рис. 12: *8*]. Знаходкі датаваны X ст.

У заходняй частцы раскопу па вул. Ф. Скарыны ў перамяшаным слоі была выяўлена бронзавая ліпападобная спражка з авальнай рамкай, якая пераходзіць у прамавугольную аснову (мал. 3: *6*). Ідэнтычная спражка была знойдзена ў Ашмянцы [3, с. 184, мал. 9: *14*]. Датуецца XIII ст.

Пры археалагічным наглядзе на катлаване па вул. Ф. Скарыны ў ніжнім перамешаным пласце быў зафіксаваны фрагмент бронзавай спражкі (мал. 3: *7*). Захавалася толькі авальная рамка, арнаментаваная



Мал. 2. Акоўкі пояса: *1* – Полацк; *2, 3* – Кокнес; *4* – Ступелі; *5* – Кабелес; *6* – Уніпіха; *7* – Готланд

насечкамі. Памеры і форма фрагмента хутчэй за ўсё сведчаць на карысць таго, што дадзеная спражка адносіцца да абутковых, а не да паясных.

У выніку распрацоўкі шурфа на гарадзішчы г. Полацка было выяўлена 2 экзэмпляры пасавай гарнітуры. Адзін з іх паходзіў з перадмацерыковага слоя, які ўтрымліваў сляды пажару і дзірхемы, пашкоджаныя ў выніку пажару. Бронзавая ліраподобная спражка (мал. 3: *8*) з авальнай рамкай моцна пашкоджана агнём. На рамцы праглядаецца лінейны арнамент. Аналагічныя спражкі знойдзены ў курганных могільніках Мохаў [10, с. 144], Відагошч [12, с. 188–189] і Ясенец [11, с. 45]. Знаходкі датаваны X–XII стст.

Другі фрагмент бронзавай авальнай рамкі ад спражкі, моцна пашкоджанай агнём (мал. 3: *9*), вы-

яўлены на глыбіні 0,75–0,80 м ад дзённай паверхні ў пласце, які ў асноўным меў матэрыялы канца XI – XIII ст. Звернем увагу на тое, што прадстаўлены прадмет не знаходзіўся ў слаі *in situ*. На дадзеным узроўні ў шурфе прасочваўся істотны перакоп, звязаны з існаваннем на месцы гарадзішча могілак XVII–XVIII стст., былі зафіксаваны рэшткі пахаванняў.

Вышэйпералічаныя элементы паясной гарнітуры шырока прадстаўлены ў славянскіх старажытнасцях, за выключэннем бронзавай акоўкі, выкананай у звярыным стылі (мал. 2: *1*). Падобныя знаходкі, як і паясныя бляхі, з'яўляліся абавязковым атрыбутам наборнага паса дружынніка і пранікалі на тэрыторыю Латвіі і Эстоніі з Готланда (мал. 2: *7*), або выраблялiся па ўзору готландскіх на месцы [18, с. 232]. Яшчэ адной унікальнай знаходкай з'яўляецца білонавая спражка з нерухомым шчытком (мал. 3: *5*). Па вытворчым асаблівасцям і раслінай арнаментацыі гэтую спражку магчыма аднесці да волжска-балгарскай традыцыі [13, с. 93]. Падобныя рэчы ўсходняга стылю з'яўляліся спадарожнікамі дырхемаў, якія траплялі на ўсходнеславянскія землі па двух асноўных шляхах: паўднёва-ўсходняму (з Хазарыі) і ўсходняму (з тэрыторыі Волжскай Булгарыі).



Мал. 3. Паясное кальцо (*1*); спражки (*2–9*); *1–9* – Полацк

Літаратура

1. Аун, М. Археологические памятники второй половины 1-го тысячелетия н. э. в Юго-Восточной Эстонии / М. Аун; науч. ред. В. В. Седов. – Таллинн: ОЛИОН, 1992. – 200 с.

2. Дучыц, Л. У. Браслаўскае Паазер'е ў IX–XIV стст.: гісторыка-археалагічны нарыс / Л. У. Дучыц; пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 120 с.

3. Зайкоўскі, Э. М. Даследаванне культавага комплекса Ашмянец / Э. М. Зайкоўскі // ГАЗ / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі, 2002. – № 17. – С. 181–190.

4. Звяруга, Я. Г. Даследаванні ў Гальшанах і гарадку / Я. Г. Звяруга // Археалогія эпохі сярэдневякоўя: да 75-годдзя з дня нараджэння П. Ф. Лысенкі: матэрыялы па археалогіі Беларусі / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Мінск, 2006. – № 12. – С. 111–121.

5. Зверуго, Я. Г. Древний Волковыск: X–XIV вв. / Я. Г. Зверуго. – Минск: Академия Наук Белорусской ССР, Институт истории, 1975. – 143 с.

6. Кенько, П. М. Наборный пояс как деталь мужского костюма в Полоцком княжестве / П. М. Кенько // Лепельскія чытанні: другая навук.-практ. канф., Лепель, 2006 г. – Лепель: Установа культуры Лепельскі раённы краязнаўчы музей; склад. А. У. Стэльмах. – Лепель, 2006. – С. 7–10.

7. Кенько, П. М. Отчет о раскопках городища в д. Гольшаны Ошмянского района Гродненской области в 2007 г. / П. М. Кенько // Архив Ин-та истории Нац. акад. навук Беларуси. – Дело 2498.

8. Кенько, П. М. Отчет о раскопках селища в д. Гольшаны Ошмянского района Гродненской области в 2008 г. / П. М. Кенько // Архив Ин-та истории Нац. акад. навук Беларуси. – Дело 2583.

9. Клімаў, М. В. Справаздача пра археалагічныя даследаванні ў г. Полацку ў 2008 г. / М. В. Клімаў // Архіў Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Спр. 2596. – 131 с.: іл.

10. Лысенко, П. Ф. Дреговичи / П. Ф. Лысенко; под ред. В. В. Седова. – Минск: Наука и техника, 1991. – 244 с.

11. Лысенко, П. Ф. Ясенецкий курганный могильник / П. Ф. Лысенко; науч. ред. В. В. Седов // Вопросы истории: тез. докл. XII конф. молодых ученых Белорусской ССР, Минск, 1969 г. / Академия Наук БССР, Отд. общественных наук; под ред. Н. Е. Завалеева. – Минск, 1969. – С. 44–55.

12. Матэрыялы перыяду рымскіх уплываў сярэднявечча і новага часу з Беларусі у фондах Дзяржаўнага археалагічнага музея ў Варшаве / Яцэк Анджэёўскі [і інш.]; пад рэд. Анджэя Пятроўскага; Дзяржаўны археалагічны музей у Варшаве, Центр аховы археалагічнай спадчыны. – Варшава, 2005. – 263 с.

13. Мурашева, В. В. Древнерусские ременные наборные украшения (X–XIII вв.) / В. В. Мурашева – М.: Эдиториал УРСС, 2000. – 136 с.

14. Седов, В. В. Ливы / В. В. Седов // Финно-угры и балты в эпоху средневековья / отв. ред. Б. А. Рыбаков. – М., 1987. – С. 23–34.

15. Седова, М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода (X–XV вв.) / М. В. Седова. – М.: Наука, 1981. – 198 с.

16. Тарасаў, С. В. Полацк IX–XVII стст: гісторыя і тапаграфія / С. В. Тарасаў. – Мінск: Бел. навука, 1998. – 183 с.

17. Griciuvienė, E. Našiosena ir drabužiu puošyba / E. Griciuvienė, I. Zeiere // Seliai The Selonians; red. N. Devei-

kiene; Lietuvos nacionalinius muziejus. – Vilnius, 2007. – P. 167–175.

18. Latvijas PSR arheologija / J. Apals [i. к.]; red. A. Feldhūne; Izdevniecība «Zinātne». – Riga, 1974. – 374 p.

19. Östergren, M. Spillings – The Largest Viking Age Silver Hoard in the World // The Spillings Hoard – Gotland's Role in Viking Age World Trade. The Gotland Museum. – Visby, 2009. – P. 34.

Резюме

М. В. Климов, П. М. Кенько

Элементы поясного набора из г. Полоцка (по результатам раскопок 2008–2009 гг.)

43. Jaskanis, D. Sudauisches siedlungskomplex aus der spatrömischen periode und völkerwanderungszeit in Osowa, kreis Suwałki / D. Jaskanis, J. Jaskanis // Acta Baltico-Slavica. – Białystok, 1966. – T. IV. – S. 109–150.

44. Stubavs, A. Ķentes pilskalns un apmetne / A. Stubavs / Latvijas PSR Zinātnu akademija vestures institūts. – Riga: Zinatne, 1976. – 144 s.

45. Vaitkunskienė, L. Pagrybio kapinynas / L. Vaitkunskienė // LA. – Vilnius, 1995. – N 13. – 207 c.

Рэзюмэ

Э. А. Ляшкевіч

Аб знаходках рыбалоўнага інвентару ў сярэдневяковых могільніках Беларусі

Аналіз знаходак рыбалоўнага інвентару з 13 пахаванняў з крэмацыяй і інгумацыяй 7 сярэдневяковых могільнікаў Беларусі высветліў, што дадзеная пахавальная традыцыя існавала пераважна ў другой палове X – першай палове XI ст. на тэрыторыі пражывання крывічоў. Сярод прылад дамінавалі кручкі, радзей трапляліся восці, блешні і грузілы. Выкарыстанне рыбалоўных прылад у пахаваннях было распаўсюджана на шырокім абшары лясной зоны, адлюстроўваючы такім чынам сацыяльны і сакральны кантэкст абраду, а таксама ролю промыслу ў паўсядзённым жыцці.

Summary

E. Lyashkevich

About finds of fishing implement in medieval burials of Belarus

Finds of fishing implement in burials the majority dated to the second half of 10th – first half of 11th c. and they located mainly on the north of Belarus. These artifacts belong to area residing krivichi (13 graves, 7 cemeteries with cremation and ingumation). Fishing tools are basically presented by hooks of three types, then spears, spoon-baits and sinkers. The presenting tradition was widespread in the north of forest area of Eastern Europe. It reflects a social and sacral context of burials and a role of fishing.

Поступила 21.04.2011

А. А. Разлуцкая, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны (г. Мінск)*

Новыя даныя аб ахвярных жывёлах з курганоў Полацкай зямлі

Уводзіны. Пахавальныя звычаі курганнай абраднасці насельніцтва тэрыторыі Полацкай зямлі на працягу X–XII стст. адлюстроўваюць працэсы пераходу ад язычніцкіх звычаяў да прыняцця хрысціянства, усталяванне феадальных адносін у грамадстве, фарміраванне раннедзяржаўных утварэнняў. Адным з рытуальных элементаў пахавальнага абраду [4, с. 9] як крэмацый, так і інгумацый, з'яўляюцца ахвярапрынашэнні жывёл і птушак, адзінкава – рэптылій і малюскаў.

Мэта працы – высвятліць менавіта відавы склад, анатамічную і ўзроставую прыналежнасць костак ватыўных жывёл, вызначыць падыходы да методыкі збору і вызначэння згаданай катэгорыі матэрыялаў[1].

Матэрыялы і метады даследавання. Факталагічнай базай для прапануемага артыкула паслужылі археазаалагічныя матэрыялы (рэшткі костак жывёл і птушак) з курганных пахаванняў на могільніках Нябышына і Бірулі Докшыцкага раёна, Звязда і Вітунічы Лепельскага раёна, Пагошча Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці, Мілты Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. Вызначэнні праводзіла аўтар дадзенага артыкула. Косткі жывёл з інгумацый і з развалаў сасудаў, магчыма з берасцяных корабаў [3, с. 7] для захавання рэшткаў спаленых ахвяр, таксама з асобных пляцовак, ідэнтыфікаваліся згодна з іх прымеркаванасцю да выдзеленых з цягам раскопак аб'ектаў.

Выдзяленне рэшткаў жывёл з нагрувашчанняў крэміраваных касцей пахаваных пасля спальвання людзей патрабавала падрабязнай пераборкі крэмацый, нават неаднаразовай. Сабраныя марфалагічна выразныя рэшткі дазволілі ў большай ступені дакладна вызначыць для іх відавую разнастайнасць і анатамічны склад ахвяраваных істот. Трэба зазначыць, што, верагодна, засталіся неідэнтыфікаванымі марфалагічна невыразныя, ці ўшчэнт пашкоджаныя крэмацыяй рэшткі жывёл і птушак, якія немагчыма было ўпэўнена аддзяліць ад костак людзей. Ідэнтыфікацыя праводзілася па стандартных археазаалагічных методыках [8], улічваючы тыя змены, якія маглі адбыцца з рэшткамі ў выніку шматтэрміновага уздзеяння высокай тэмпературы [3, с. 6]. Далей прадстаўлены доследныя матэрыялы і краткія звесткі аб некропалях.

Курганны могільнік ***Звязда*** размешчаны на заходняй ускраіне в. Звязда (Аўгустова) Пышнянскага с/с Лепельскага раёна, на беразе возера Тэкліц, у лесе. Помнік вядомы з 1930-ых гадоў, у 1973 г. яго абследаваў А. Р. Мітрафанаў. У 2001–2003 гг. А. В. Вайцяховічам даследавана 13 курганаў, у трох з якіх знойдзены рэшткі ахвярных жывёл, якія былі часткай рытуалаў пахаванняў памерлых.

Курган № 17. У багатым упрыгажэннямі жаночым пахаванні, зробленым па абраду інгумацыі галавой на паўднёвы захад, каля паўднёвай броўкі, у развале ляпнога гаршка, выяўлены спаленыя рэшткі сабакі *Canis lupus familliaris* и авечки *Ovis aries*.

Курган № 26. Пахаванне мужчыны ва узросце 40–50 гадоў па абраду інгумацыі. У паўднёва-заходнім сектары падэшвы кургана, пад попельна-вугальнай плямай, у запаўненні ямы памерам 0,4 м^2 і глыбінёй 0,5 м^2 выяўленна важкое (каля 5 кг) нагрувашчанне рэшткаў спаленных хатніх жывёл: сабакі, казы *Capra hircus*, авечкі, быка *Bos taurus* br., каня *Equus caballus*. Гэтыя рэшткі паходзяць пераважна ад гастранамічна каштоўных, менавіта мясных, частак тушаў хатніх капытных і ад костак лап сабакі.

Курган № 34. Жаночае пахаванне па абраду інгумацыі, арыентаванае галавой на захад. Заходней чэрапа памерлай ў развале невялікага ляпнога гаршка выяўлены, як і ў кургане № 17, моцна перапаленыя рэшткі костак сабакі і авечкі, але разам з бронзавымі ўпрыгажэннямі.

Курганны могільнік канца X – XII стст. ***Вітунічы*** размешчаны каля эпанімнай вёскі Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. На ім прысутнічаюць пахаванні як з крэмацыяй, так і з інгумацыямі. Даследаваў яго А. В. Вайцяховіч. На думку аўтара раскопак, могільнік пакінула крывіцкае насельніцтва [1, с. 86–108].

Курган № 2. У багатым інвентаром пахаванні з крэмацыяй сярод перапаленых касцей чалавека былі выяўлены рэшткі костак сабакі, свінні хатняй, авечкі, балотнай чарапахі (рэптыліі) *Emys orbicularis*, птушкі *Aves* і лясной куніцы *Martes martes.*

Курган № 12. У жаночым пахаванні на адлегласці 1,6 м ад цэнтра кургана на поўнач, у паўночна-ўсходнім сектары на глыбіні 0,8 м, у вугальнай пляме дыяметрам 0,3 м знойдзены моцна спаленыя косткі хатніх капытных – казы і свінні.

Курган № 31. Інгумацыя. На узроўні мацерыка ў паўночна-ўсходнім і заходнім сектарах кургана выяўлены камяні, якія былі выкладзены колам. У тонкіх попельных плямах выкладкі расчышчаны дробныя, кальцыянаваныя жывёльныя косткі птушкі сямейства Курыныя *Galliformes*, свінні хатняй *Sus scrofa domestica*, драпежніка, сходнага з вы-

[1] Выказваю шчырую падзяку археолагам А. В. Вайцяховічу, А. М. Плавінскаму і М. А. Плавінскаму, светлай памяці В. Н. Рабцэвічу за рупліва сабраныя, прадстаўленыя да вывучэння і ўвядзення ў навуковы зварот археазаалагічныя знаходкі з раскапаных імі курганных пахаванняў.

драй, *Cf. Lutra lutra*. На костках выдры (?) назіраюцца сляды вокіслаў каляровага металу [1, с. 91].

Бірулі (Парэчча), курганы могільнік, размешчаны на высокім беразе возера Медзазол, каля аднайменнай вёскі Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. Даследавалі ў 1938–1939 гг. Галубовічы, у 1971 г. – А. Р. Мітрафанаў, з 2005 г. – А. В. Вайцяховіч. Помнік у сучасным стане налічвае 115 насыпаў, датуецца X–XII стст. Некропаль быў заснаваны насельніцтвам полацка-смаленскіх крывічоў, у канцы X – пачатку XI ст. фіксуецца пранікненне ў рэгіён хвалі славянскага рассялення [2, с. 223].

Рэшткі ахвярапрынашэнняў жывёл знойдзены ў сямі курганах (даследаванні А. В. Вайцяховіча). Для большай відавочнасці відавая разнастайнасць і статыстыка знойдзеных матэрыялаў паказана ў табл. 1. У падкурганным спаленні мужчыны, якое было даследавана ў 2007 г., знойдзены рэшткі костак рачнога бабра, куніцы, ліса і буйной рагатай жывёлы. У 2008 г. сярод рэшткаў няпоўнай крэмацыі адразу двух індывідаў ідэнтыфікаваны рэшткі дзвюх асобных птушак сямейства Курыных, косткі ніжняй часткі тушкі куніцы, фрагмент стапы ліса, косткі з розных аддзелаў шкілета свінні хатняй.

Табліца 1. **Рэшткі ахвярных жывёл і птушак з пахаванняў на курганным могільніку Бірулі Докшыцкага раёна. Раскопкі А. В. Вайцяховіча 2007–2011 гг. Вызначэнне А. А. Разлуцкай**

Від/год, курган косткі/асобіны анатамічны склад, дадаткі	2007 г., спаленне мужчыны пад курганам	2008 г., няпоўнае спаленне двух чалавек	2010 г., курган № 104, крэмацыя	2010 г., курган № 9, крэмацыя	2011 г., курган № 17	2011 г., курган № 68, інгумацыя	2011 г., курган № 112	Усяго
Птушка *Aves*	1 дробная	–	2 трубчатыя косткі, вадаплаўная	6 (лапатка, пазванкі, трубчастыя)	3 (плечавая, локцевая косткі)	–	–	12
Сямейства Курыныя *Galliformes*	–	3 асобіны	–	–	–	–	–	3
Заяц *Lepus lepus*	–	–	1 галёначная; дарослая асобіна	–	–	–	–	1
Рачны бабёр *Castor fiber*	–	1 плечавая; маладая асобіна	–	–	–	–	–	1
Куніца *Martes* sp.	5 (локцевая, прамянёвая, 2 вялікія галёначныя, фаланга)	3 (вялікая галёначная, тазавая, рабро)	–	–	–	–	–	8
Куніцавыя *Mustelidae*	–	–	1 пазванок хваставы	–	–	–	мех з адной асобіны	2
Ліс звычайны *Vulpes vulpes*	5 (пазванок шыйны, тазавая, I і III фалангі)	1 (плюсна III); асобіна, старэйшая за 1 год	–	–	–	–	–	6
Свіння хатняя *Sus scrofa domestica*	–	4 (сківіца ніжняя, рабро, вялікая галёначная)	23 (пазванкі, рэбры, тазавы пояс); паўдарослая асобіна*	3 (кут ніжняй сківіцы) слаба абпаленыя	–	–	–	30
Каза *Capra hircus*	–	–	–	4 (прамянёвая і вялікая, галёначная косткі, пазванок, заплюсна)	2 (сківіца, плюсна); дарослая асобіна	–	–	6
Авечка *Ovis aries*	–	–	6 (рэбры, зуб маладой асобіны, косці канечнасцей)**	3 (рабро IX, 2 фрагменты сцягновай косткі)	–	20 (галава, сківіцы, метаподыі астрагал, грудзіна, рэбры); бязрогая асобіна, рост у холцы 58,1 см	–	29

Заканчэнне табл. 1

Від/год, курган косткі/асобіны анатамічны склад, дадаткі	2007 г., спаленне мужчыны пад курганам	2008 г., няпоўнае спаленне двух чалавек	2010 г., курган № 104, крэмацыя	2010 г., курган № 9, крэмацыя	2011 г., курган № 17	2011 г., курган № 68, інгумацыя	2011 г., курган № 112	Усяго
Буйная рагатая жывёла *Bos taurus* br.	3 (зубы жавальныя); паўдарослая асобіна	–	19 (лапатка) слабы абпал!	6 (сківіца, зуб), 5–6 месяцаў	–	–	–	28
Конь *Equus caballus*	–	–	6 (задняя канечнасць з капытнай фалангай, пазванок); сярэднетонканогая асобіна	–	–	–	–	6
Разам:	16	12	56	22	5	20	1	132

* Неспаленыя косткі.

** Адна рабрына не спалена.

Курган № 9. У пахаванні па абраду крэмацыі знойдзены добра перапаленыя косткі птушак, казы, авечкі, буйной рагатай жывёлы.

Курган № 17. У 2011 г. сярод крэмацыі выяўлены рэшткі костак крыла птушкі, а таксама галавы і нагі казы.

Курган № 68. Раскапаны ў 2011 г. У пахаванні па абраду інгумацыі на аддаленні ад ног пахаванага зафіксаваны добра захаваныя рэшткі, верагодна бязрогай дарослай асобіны авечкі, у тым ліку косткі чэрапа з верхняй сківіцай, абедзьве ніжнія пашчэнкі, рэбры, пазванкі, грудзіна, косткі канечнасцей добрай захаванасці (мал. 1). Пясцевая поўная костка авечкі мае даўжыню 119 мм, згодна з каэфіцыентам 4,89 дзеля аднаўлення росту [8, s. 155–158], жывёла мела ў холцы 58,1 см.

Курган № 104. Вывучаны ў 2010 г. утрымліваў пахаванне па абраду крэмацыі. Сярод яе рэшткаў выяўлены фасіліі зайца, куніцы, птушкі, авечкі і каня хатняга. Акрамя таго, звярнулі на сябе ўвагу неабпаленыя шматлікія ў параўнанні з іншымі відамі рэшткі костак свінні хатняй (30 фрагментаў) і рабро авечкі. Таксама знойдзены слаба перапаленыя рэшткі свінні хатняй і 19 фрагментаў адной лапаткі буйной рагатай жывёлы.

Бачым, што ахвярапрынашэнне жывёл у гэтым выпадку рабілася двойчы: перад крэмацыяй і пасля яе змяшчэння на месцы пахавання памерлага.

Курган № 112. Даследаваны ў 2011 г. Археолагу трапілася ўнікальная для пахавальных сярэдневяковых помнікаў Полацкай зямлі знаходка: пад насыпам у пясчанай праслойцы знойдзена футра адной упаляванай жывёлы сямейства Куніцавых *Mustelidae*. Дакладнае відавое вызначэнне наперадзе, але можна сказаць, што па складу футра, яго якасці і колеры, гэта была куніца ці собаль. Кансультацыі праводзіў А. В. Вайцяховіч са спецыялістамі з Інстытута заалогіі НАН Беларусі і навукоўцамі з кафедры Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта. Захаванасць асцявых і пухавых валос добрая, нават яшчэ добра бачны насычаны цемна-руды колер футра.

Такім чынам, зафіксавана, што на дастаткова багатым пахаваннямі з ахвярапрынашэннямі могільніку Бірулі, у якасці рытуальных жывёл выкарыстоўвалі ўсіх хатніх капытных, прычым не толькі галовы і ногі, але і каштоўныя ў харчовых адносінах цэнныя мясныя часткі туш.

Птушкі браліся на ахвяры як вадаплаўныя *Anatidae*, так і Курыныя *Galliformes*, у асноўным іх крылы і ногі. Грызуны *Rodentia* (заяц, бабёр рачны) прадстаўлены косткамі канечнасцей, Куніцавыя *Mustelidae* і куніца часцей траплялі ў пахаванні ў выглядзе лапак, фрагментаў ног, упершыню атрымана футра з цэлай жывёлы.

Курганны могільнік ***Мілты*** Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. У 1992–1993 гг. даследаваўся раскопкамі В. Н. Рабцэвіча, А. Н. Плавінскага. Датаваны X – пачаткам XI ст. Могільнік складаецца з дзвюх груп [6, с. 122–123].

Першую групу выявіў Я. Г. Звяруга каля дарогі Нагаўкі–Дзягілы, за 1,5 км на поўдзень ад Нагавак. У гэтай групе налічваецца 36 насыпаў. З даследаваных курганоў патрэбны нам матэрыял знойдзены ў 1992 г. ў кургане № 13. Рэшткі ахвярных жывёл знойдзены шляхам пераборкі сярод крэміраваных касцей чалавека.

Другая курганная група могільніка Мілты, выяўленая экспедыцыяй БДУ, знаходзіцца на другім кіламетры дарогі з Нагавак у Мілты і налічвае 28 насыпаў. У 1993 г. у гэтай группе былі даследаваны 2 курганы, у калекцыі матэрыялаў з раскопак двух пахаванняў у кургане № 1, сярод крэміраваных рэшткаў людзей выяўлены разнастайны археазаалагічны матэрыял. Відавы і анатамічны склад ідэн-

Мал. 1. Рэшткі авечкі з раскопак інгумацыі: *1* – верхняя сківіца; *2, 3* – галіны ніжняй сківіцы; *4, 5* – метаподыі; *6* – астрагал. Курганны могільнік Бірулі-І. Працы А. В. Вайцяховіча. 2011 г.

тыфікаваных рэшткаў ахвярных жывёл могільніка Мілты прэзентаваны ў табл. 2.

Бачым, што згодна з прадстаўленымі данымі, да рытуальных ахвяр у працэсе пахавання памерлых трапілі заднія канечнасці зайца, амаль уся тушка рачнога бабра (курган № 1, пахаванне 1), таз і пярэдняя лапа куніцы (курган № 13). Птушак прыносілі ў ахвяры часцей у выглядзе крылаў, але ў пахаванні 1 кургана № 1 трапіліся і рэшткі грудзіны. У пахаванні 2 кургана № 1 могільніка ў 1993 г. сярод рэшткаў крэмацыі знойдзены фрагмент вялікай галёначнай косткі зайца, 4 рэшткі дарослага сабакі (пазванок, рэбра, два фрагменты плюсны), пазванок хатняй свінні і 3 косткі паўдарослай асобіны казы – верхняя сківіца, маляр і рабро.

Хатнія капытныя ў асноўным прадстаўлены косткамі тулава, сцягновымі, прамянёвымі, тазавымі, галёначнымі косткамі, рэбрамі. Толькі ад быка хатняга *Bos taurus* і каня ў пахаванні 1 кургана № 1 трапіліся ізаляваныя зубы.

Трэба зазначыць, што і ў ранней здабытых на тэрыторыі Полацкай зямлі археалагічных матэрыялах з доследаў сярэдневяковых курганных пахаванняў былі зафіксаваны рэшткі ахвярных жывёл. Так,

Табліца 2. **Рэшткі ахвярных жывёл і птушак з пахаванняў на курганным могільніку Мілты Мядзельскага раёна. X – пачатак XI ст. Раскопкі В. Н. Рабцэвіча, А. М. Плавінскага 1992–1993 гг. Вызначэнне А. А. Разлуцкай**

Від/год/курган/косткі асобіны, часткі шкілета, дадаткі	1992 г., курган № 13, спаленне	1993 г., курган № 1, пахаванне 1, спаленне	1993 г., курган № 1, пахаванне 2, спаленне	Усяго
Птушкі *Aves (Galliformes, Anatidae)* Курыныя, Качыныя	–	10 (крылы, грудзіна)	–	10
Заяц *Lepus sp.*	–	–	1 (вялікая галёначная костка; Tb)	1
Заяц-русак *Lepus europaeus*	–	6 (3 фрагменты галёначнай косткі, таз, рабро; Tb, Plv, Cos)	–	6
Рачны бабёр *Castor fiber*	–	12 (разцы,пазванки, рэбры; 3 Dent,Vert,Cos)	–	12
Куніцавыя *Mustelidae*	–	1 сцягновая; F	–	1
Куніца *Martes* sp.	4 (прамянёвыя косткі, таз; R, Plv)	–	–	4
Сабака *Canis lupus familliaris*	1 (сцягновая; F)	10 (сківіца ніжняя, рэбры, прамянёвая і галёначная косткі, фаланга; Md, Cos, R, Tb, Ph)	4 (рабро, пазванок, плюсны; Cos, Vert, Mtt)	15
Свіння хатняя *Sus scrofa domestica*	–	16 (рэбры,пазванкі, галёначная костка; Cos,Vert,Tb)	1 (пазва нок; Vert), паўдарослая асобіна	17
Каза *Capra hircus*	–	1 (рабро; Cos)	3 (верхняя і ніжняя сківіцы, рабро; Mx, Md, Cos)	4
Авечка *Ovis aries*	2 (пазванок, таз; Vert, Plv)	16 (косці галавы, тулава, таз, задняя нага; Cr, Dent, Cos, Plv, Tb)	–	18
Буйная рагатая жывёла *Bos taurus*	1 (сківіца ніжняя; Md)	3 (зубы, сцягно; D, F)	–	4
Конь *Equus caballus*	–	3 (разец ніжні, сківіца, прамянёвая костка; I_2, Md, R)	–	3
Разам:	8	78	9	95

З а ў в а г а. Cos, Cr, D, Dent, F, I_2, Md, Mtt, Mx, Plv, R, Tb, Vert – скарочаныя лацінскія назвы костак.

на знакамітым могільніку каля в. Ізбішча Лагойскага раёна Мінскай вобласці, які быў адкрыты М. І. Лашанковым ў 1980 г. і даследаваўся ў 1987–1989 гг. В. У. Казеям, а у 1990 г. – Г. В. Штыхавым, падчас вызначэння палеаантрапалагічнага матэрыялу польскім вучоным А. Маліноўскім згаданы без падрабязнага апісання рэшткі костак сабакі ў кургане № 36, косткі каня – ў курганах № 37, 68, а таксама косткі «ад тушы казла» – у кургане № 99 [7, с. 7–32].

Курганны могільнік ***Пагошча*** Браслаўскага раёна Мінскай вобл. знаходзіцца за 0,5 км на паўднёвы ўсход ад эпанімнай вёскі Опсаўскага с/с, на ўсходнім беразе воз. Бяржонка. Ён быў даследаваны М. А. Плавінскім у 2005–2008 гг. [5, с. 56–58]. Пачатак функцыянавання некропаля аўтар раскопак звязвае са з'яўленнем у Браслаўскім Паазер'і носьбітаў культуры пскоўскіх доўгіх курганоў, што прыпадае на першую чвэрць I тысячагоддзя н. э. Большасць насыпаў належыць да другой паловы–канца X – пачатку першай паловы XI ст. [5, с. 55].

У 2006 г. у кургане № 6 у мацерыковай яме было знойдзена пахаванне жанчыны (X ст.). Разам з памерлай знойдзены сціплыя рэшткі ахвяр жывёл. Так, вызначаны 7 костак птушак, у тым ліку адна ад прадстаўніка сямейства Курыных, і качка. Таксама знойдзены фрагмент птушынага чэрапа, які не быў перапалены, значыць, быў пакладзены пазней на спаленыя рэшткі пасля заканчэння абраду крэмацыі. Падобную з'яву мы згадвалі вышэй ў адносінах да рэшткаў свінні і авечкі ў кургане № 104 з раскопак А. В. Вайцяховіча у 2010 г. на могільніку Бірулі Докшыцкага раёна.

Дробная рагатая жывёла (каза-авечка без дзялення) прадстаўлена двума дыяфізамі прамянёвай косткі і рабром. Каза таксама была прынесена ў ахвяру кавалкам грудзіны, якая захаваліся ў выглядзе неперапаленых фрагментаў 5-га груднога рабра дарослай асобіны.

У кургане № 7 (раскопкі 2006 г.) выяўлена багатае ахвярапрынашэнне са стракатым наборам паляўнічых і хатніх відаў жывёл (табл. 3): вялікая вадаплаўная птушка – 6 рэшткаў, вавёрка звычайная *Sciurus vulgaris* – 2 тазавыя косткі, заяц *Lepus* sp. – 5 рэшткаў, у тым ліку сківіца ніжняя, рабро, прамянёвая і вялікая галёначная косткі, плюсна). Куніца *Martes* sp. прадстаўлена плечавой і 3-й фалангай. Свіння хатняя – 4 косткі ад асобіны старэй-

шай за 1 год, у тым ліку 2 рабрыны, пазванок, плюсна); каза – 6 костак (галава, таз, задняя канечнасць, уключаючы капытцавую фалангу); авечка шырока прадстаўлена – 16 рэшткаў ад дзвюх асобін, менавіта фрагментамі галоў, тазавых костак і канечнасцей); буйная рагатая жывёла – 1 рабро. Такім чынам, бачым, што ў кургане № 7 ад каштоўных, гастранамічна цікавых частак туш жывёл [8, s. 11, 46, 48, 195] ахвяравалі не толькі хатнюю жывёлу, але нават і частку ўпаляванага зайца.

Табліца 3. **Рэшткі ахвярных жывёл і птушак. Курганны могільнік Пагошча Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці. Другі культурна-храналагічны гарызонт. Другая палова X – першая палова XI ст.[1] Раскопкі М. А. Плавінскага. Вызначэнне А. А. Разлуцкай**

Від/курган, анатамічны склад	2006 г., курган № 6, жаночае пахаванне ў яме на мацерыку	2006 г., курган № 7	Усяго
Птушкі *Aves*	7 (1 курыца, 1 качка, 1 фрагмент чэрапа не перапалены!)	6 трубчастых костак	13
Вавёрка звычайная *Sciurus vulgaris*	–	2 тазавыя косткі (Plv)	2
Заяц *Lepus* sp.	–	5 (ніжняя сківіца, рабро, вялікая галёначная костка, плюсна; Md, Cos, Tb, Mtt)	5
Куніца *Martes* sp.	–	2 (плечавая костка, II фаланга – пярэдняя лапа; H, IIPh)	2
Свіння хатняя *Sus scrofa domestica*	–	4 (сківіца ніжняя, рэбры, пазванок; Md, Cos, Vert)	4
Каза *Capra hircus*	2 (рабро, пазванок груднога аддзела; Cos[2], Vert), неперапаленыя	6 (фрагмент чэрапа, рог; Cran, Corn)	8
Авечка *Ovis aries*	2 (прамянёвая костка, рабро; R, Cos)	16 (фрагмент ліцавога чэрапа, глазніца, сківіца ніжняя, прамянёвая костка, таз, галёначная костка; плюсна; Cran.viscer., Md, R, Plv, Tb, Mtt)	18
Каза-авечка (без дзялення) *Capra-Ovis*	2 (прамянёвая костка, рабро; R, Cos)	–	2
Буйная рагатая жывёла *Bos taurus* br.	–	1 (рабро; Cos)	1
Разам:	13	42	55

З а ў в а г і. [1] Corn, Cos, Cran, H, Md, Mtt, Ph, Plv, R, Tb, Vert – скарочаныя лацінскія назвы костак.

[2] На курганным могільніку Пагошча М. А. Плавінскім ў кургане № 9 выяўлены багатыя матэрыялы, датаваныя прыблізна VII ст. і аднесеныя да першага культурна-храналагічнага гарызонту існавання некропаля. Храналагічна матэрыялы кургана № 7 знаходзяцца па-за межамі прапанавай тэмы публікацыі, але ўсё ж такі трэба згадаць наступныя кароткія звесткі аб захаваных рэштках рытуалу, што адбыўся. У кургане № 9 былі крэміраваны косткі чатырох чалавек, крэмацыю суправаджалі ахвярапрынашэнні шырокага спектра дзікіх і хатніх відаў жывёл і іншых істот: двух птушак, вавёркі, куніцы, зайца, нават знойдзена ракавіна малюска, рэшткі сабакі, свінні, казы, не менеў дзвюх авечак і дзвюх кароў [5, с. 58–59].

Курганны могільнік ***Нябышына*** X–XI стст. знаходзіцца ў Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці. З 2007 г. ён вывучаецца А. В. Вайцяховічам.

У пахаванні па абраду крэмацыі, што даследавалася ў 2007 г., сярод не поўнасцю спаленых рэштак дарослага чалавека знойдзены 23 рэшткі ахвярных жывёл і птушак. Менавіта птушкам належала 12 костак ад дзвюх крылаў дзвюх розных асобін. Ідэнтыфікаваны 2 косткі вавёркі звычайнай *Sciurus vulgaris* (плечавая і прамяневая – ад пярэдняй лапкі), ікл і локцевая костка дарослай асобіны барсука *Meles meles*. Авечка *Ovis aries* прадстаўлена паловай верхняй правай сківіцы ад паўдарослай асобіны; свіння хатняя *Sus scrofa domestica*, асобіна ўзростам не болей за 3 месяцы, – ніжняй пашчэнкай, 2-мя кавалкамі плюсны і рабром; конь хатні *Equus caballus* – фрагментам прамянёвай косткі дарослай асобіны.

У кургане з крэмацыяй, даследаваным у 2011 г., сярод рэшткаў чалавека зноў трапілася костка задняй нагі зайца (вялікая галёначная), птушыная прамянёвая костка драпежніка сямейства Куніцавых *Mustelidae*, 2 плюсневых косткі (фрагменты задняй лапы) бурага мядзведзя *Ursus arctos*, рабро авечкі *Ovis aries,* 26 добра захаваных, у слабай ступені абпаленых рэшткаў каня *Equus caballus* (мал. 2). Сярод рэшткаў удалася вызначыць фрагменты



Мал. 2. Рэшткі ахвярных жывёл з крэмацыі: *1, 2* – мядзведзь буры; *3–5* – барсук; *6* – прамень плаўніка рыбы; *7, 8* – авечка; *9–11* – заяц; *12–18* – слаба абпаленыя косткі каня. Курганны могільнік Нябышына. Працы А. В. Вайцяховіча. 2011 г.

сківіцы дарослай–сталай асобіны, пазванкі, рэбры, лапатку, локцевую і вялікую галёначную косткі каня. У ахвяраванне трапіў нават і промень плаўніка рыбы (мал. 2).

Вынікі. На падставе прадстаўленых матэрыялаў індэфікаваных рэшткаў жывёл і птушак з раскопак курганаў на могільнікахх Бірулі, Нябышына, Звязда, Пагошча, Мілты бачым, што ў ахвяру падчас пахаванняў памерлых у курганах прыносілі птушак, грызуноў, разнастайных драпежнікаў і ўсе віды гадаваных у тыя часы хатніх жывёл. Трэба адзначыць, што на прапанаваным не вельмі шматлікім колькасна, але даволі шырокім тэрытарыяльна і разнесеным у часе археазаалагічным матэрыяле, што суправаджае рытуалы пахаванняў, бачна поўная адсутнасць рэшткаў дзікіх капытных. Менавіта рэшткамі капытных паляўнічых жывёл насычаны культурныя адклады сярэдневяковых гарадоў і феадальных замкаў, нават звычайных сельскіх паселішчаў. Удакладняць гэтую рысу пахавальнага абраду трэба будзе на працягу далейшых падрабязных даследаванняў матэрыялаў з крэмацый і інгумацый, што паходзяць з курганных могільнікаў. Нам здаецца магчымым патлумачыць адзначаную вышэй з'яву і разглядаць яе як ілюстрацыю ўстанаўлення да паляўнічых абмежаванняў і рэгламентацыі

на здабычу каштоўных і неабходных для жыццезабеспячэння відаў дзікіх капытных у працэсе ўсталявання адміністрацыйных, раннедзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі фарміравання Полацкай зямлі.

З цягам часу, па меры стварэння адміністрацыйнага і дзяржаўнага ўпарадкавання ладу жыцця насельніцтва, пранікнення хрысціянкай ідэалогіі ва ўсе сферы і выцяснення паганскіх рыс з пахавальных рытуалаў, ахвярапрынашэнні жывёл набываюць, відаць, рудыментарны характар. Пахаванні, якія датуюцца XI ст., утрымліваюць значна бяднейшы набор ахвярных жывёл і нават хатнія віды ўжо пачынаюць быць прадстаўлены некаштоўнымі, амаль неядомымі часткамі туш [8]. Ахвяраванні жывёл, верагодна, ужо пачынаюць прыносіць нібыта «хаваючыся», час ад часу, што паказвае на паступовы адыход рытуалу пакладання на пахвальны касцёр, ці ў магілу кавалкаў жывёл, птушак, рэптылій пад уздзеяннем паступовай, няўхільнай хрысціянізацыі земляў паўночнай Беларусі [4, с. 4]. Гэтыя зрухі адбіліся на складзе і відавой разнастайнасці археазаалагічнага матэрыялу з пахавальных комплексаў Полацкай зямлі.

Літаратура

1. Вайцяховіч, А. В. Пахавальны абрад курганнага могільніка канца X – XII стст. каля вёскі Вітунічы Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці / А. В. Вайцяховіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2007. – Вып. 14: Памятники эпохи железа и средневековья Беларусі. – С. 86–108.

2. Вайцяховіч, А. В. Асаблівасці пахавальнага абраду курганнага могільніка Бірулі (Парэчча) Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці / А. В. Вайцяховіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2008. – Вып. 15: Археалогія эпохі сярэднявечча. – С. 218–236.

3. Вайцяховіч, А. В. Рэканструкцыя пахавальнага абраду крэмацыі па даных раскопак курганных могільнікаў Полацкай зямлі / А. В. Вайцяховіч // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку): зб. навук. прац Рэспубл. навук.-практ. семінара. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 5–8.

4. Вайцяховіч, А. В. Развіццё форм і відаў пахавальнага абраду на тэрыторыі Полацкай зямлі ў X–XII стст. / А. В. Вайцяховіч: аўтарэф. дыс … канд. гіст. навук. – Мінск, 2011. – 27 с.

5. Плавінскі, М. А. Курганны могільнік Пагошча: асноўныя вынікі раскопак 2005–2008 гг. / М. А. Плавінскі // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку); зб. навук. прац Рэспубл. навук.-практ. семінара. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 55–70.

6. Раскопкі курганнага могільніка Мілты / М. Плавінскі [і інш.] // ГАЗ. – № 20. – Мінск: Ін-т гісторыі Нац. акад. навук. Беларусі, 2005. – С. 122–130.

7. Штыхаў, Г. В. Курганны могільнік Ізбішча–Дзвінаса / Г. В. Штыхаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2008. – Вып. 16. – С. 7–32.

8. Lasota-Moskalewska, A. Podstawy archeozoologii. Szcątki ssaków / A. Lasota-Moskalewska. – Warszawa: Widawnictwo Naukowe PWN, 1997. – 231 s.

Резюме

А. А. Разлуцкая

Новые данные о жертвенных животных из курганов Полоцкой земли

Освещены вопросы методики сбора, идентификации и интерпретации остатков жертвенных животных из раскопок курганов северной Беларуси.

Summary

A. Razlutskaya

New data on sacrificial animal in burial mounds of Polotsk land

The paper covers the procedure of collection, identification and approaches to interpretation of archeological materials which were obtained in recent years from burial mounds of the north-of Belarus.

Паступіў 29.04.2011

А. А. Салаўёў, *Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, навуковы супрацоўнік навукова-рэстаўрацыйнага аддзела (г. Полацк)*

Новыя знаходкі сюжэтных кафляў у Полацку

Падчас вывучэння корпуса «В» былога полацкага езуіцкага калегіума былі знойдзены фрагменты кафлі з незвычайным антрапаморфным малюнкам. Гэты корпус узведзены на рэштках «сціплага калегіума» апошняй трэці XVII – пачатку XVIII ст. Будаўніцтва адбывалася ў сярэдзіне XVIII ст. адначасова з узвядзеннем трохпавярховага будынка карпусоў «А», «Б», «Г», таму самі езуіты назвалі гэты корпус у памяць аб папярэдніх каменных пабудовах «стары калегіум» [1, с. 72; 2, с. 203].

Усе печы «сціплага калегіума» пры будаўніцтве сярэдзіны XVIII ст. былі разбураны, а кафля адной з печак скінута як засыпка скляпення падвала і памяшканняў першага паверха корпуса «В» [1, с. 75–76]. Усе знойдзеныя кафлі па стылі арнаментацыі былі папярэдне датаваны пачаткам–сярэдзінай XVII ст., бо яны паходзілі з яшчэ больш старажытных драўляных будынкаў калегіума, загінуўшых пры вялікім пажары 1643 г. [2, с. 203] і разбураных пазней падчас руска-польскай вайны 1654–1667 г. Рэшткі цагляных сутарэнняў гэтых даваенных пабудоў, верагодна, і былі прасочаны ў структуры падвалаў як «сціплага калегіума» апошняй трэці XVII – пачатку XVIII ст. [1, с. 72–75], так і ў структуры менавіта корпуса «В» (старога калегіума), узведзенага ў сярэдзіне XVIII ст. Вядома, што падчас руска-польскай вайны 1654–1667 гг. езуіцкія маёнткі былі разрабаваны і спалены, а саміх езуітаў адлоўлівалі і знішчалі як царскія ратнікі, так і праваслаўныя палачане, помсцячы за крыўды. Тыя з езуітаў, што прыйшлі пасля вяртання Полацка ў склад Рэчы Паспалітай, найперш пачалі збіраць на папялішчах для аднаўлення кляштара і калегіума ўвесь будаўнічы матэрыял, у тым ліку кафлю і цэглу. Гэтыя абставіны таксама тлумачаць і тое, чаму частка сцен «сціплага калегіума» пасля вайны была ўзведзена ў тэхніцы лускаватай двухпанцырнай муроўкі, якая выйшла з ужытку ўжо у сярэдзіне XVII ст. [3, с. 86]. Зразумела, што і печы «сціплага калегіума» будавалі з розначасовай і рознатыповай кафлі другаснага карыстання.

У выніку даследаванняў корпуса былі знойдзены два віды кафлі з выявамі людзей. Сабраныя фрагменты даволі дакладна і поўна дазволілі не толькі рэканструяваць памеры кафлі, але і практычна цалкам аднавіць выяву на ёй. Таксама стала магчымым і аднаўленне адной з кутніх кафляў. Нешматлікасць знойдзеных фрагментаў гэтай кафлі ў параўнанні з іншымі, аздобленымі раслінным і геаметрычным арнаментам, дазваляе лічыць, што ў аздабленні печы старога калегіума яны выкарыстоўваліся ў якасці ўставак ці адзінкавых радоў на галоўным фасадзе у спалучэнні з іншымі.

Першы від кафлі ўяўляе сабой блізкую да квадрата зялёнапаліваную пласціну каля 20,7 × 22,5 см, румпа была вышынёй каля 10 см (мал. 1). Выява заключана у аднаўступную рамку шырынёй 6–8 мм. Побач з ёй была дадатковая тонкая рамка. Выява уяўляла сабой добра вядомы Евангельскі сюжэт «Пакланенне вяшчуноў». Нягледзячы на невысокі рэльеф малюнка, мастак вельмі добра і падрабязна паказаў усю абстаноўку, у якой адбываецца падзея, і адзенне людзей, таксама аб'ём разнапланавых фігур і прадметаў. Усе выявы рэалістычныя. Майстар выразна перадаў экспрэсіўнасць і рух людзей. Так, на пярэднім плане знаходзяцца Божая Маці з Дзіцяці і св. Іосіф. Прачыстая сядзіць на лаве (?) і перадае каленапрыхіленаму Іосіфу-абручніку Дзіця, каб паказаць яго вяшчунам. Каля ног Божай Маці стаіць пасудзіна з вадой (?) для амавення. Іосіф апрануты ў доўгую туніку (?), на яго галаве добра бачны невысокі цыліндрычны капялюш (магерка?); падобныя капялюшы добра вядомы па гравюрах Ф. Скарыны. Дарэчы, выявы касцюмаў, вопраткі і іншых прадметаў і будынкаў спалучаюць ў сабе шмат гатычных і рэнесансных элементаў [4, с. 9, 13]. Рысы твару на выявах св. Сям'і невыразныя, бо кафля была пашкоджана як пры фармоўцы, так і падчас эксплуатацыі.

Крыху далей знаходзяцца тры вяшчуны, якія толькі ўвайшлі ў памяшканне. Найбольш добра бачна фігура за спіной св. Іосіфа. Мастак выдатна перадаў яго вопратку – плашчык да каленяў і абцягваючыя парты-панчохі (кальцэсы), з прышытымі скуранымі падэшвамі [5, с. 55, 71, 72]. Пад плашчом бачна кароткая куртка з раменьчыкам. Усе тры вяшчуны знялі для вітання галаўныя ўборы – невялікія паўсферычныя капялюшыкі з пампонамі і невялікай апушкай. Звычайна яны рабіліся з футра альбо тканіны іншага колеру. Шапкі падобнага кшталту добра вядомыя на працягу стагоддзяў. Такім чынам, гэтыя элементы вопраткі людзей больш уласцівы гатычнаму касцюму заможнага феадала ці князя XV ст. [5, с. 56], але падобныя віды вопраткі таксама часта сустракаюцца і на гравюрах Ф. Скарыны [4, с. 9, 13]. Вешчуны толькі ўвайшлі ў памяшканне і зараз ў глыбокай пашане стаяць каля самай сцяны. Рысы твараў вешчуноў вельмі падобныя адзін да аднаго – невялікія вусы і бародкі. Ад св. Сям'і іх аддзяляе плецены загон з жывёламі, каля якога сядзіць



Мал 1. Кафля з сюжэтам «Пакланенне вяшчуноў»

на лаве Божая Маці. Мастак выдатна паказаў малюнак пляцення верхняй часткі загародкі і саму сценку. Лёгка прызнаць і жывёлін – асла і карову.

Трэба некалькі слоў сказаць і аб інтэр'еры памяшкання. На заднім плане вельмі дэтальна паказана сцяна будынка, аркавы праём, дзверы, адхоны двух вакон з вузкім прасценкам паміж імі і цагляная муроўка. Размяшченне і характар выяў цаглін дазваляюць меркаваць, што мастак імкнуўся паказаць тычковую муроўку. Аднак найбольш дэталёва ён паказаў арнаментаваную пліткавую падлогу з квадратных і прамавугольных плітак, якія аздоблены кругамі. Выкарыстанне керамічных падлогавых плітак ў жылых пабудовах у XVI ст. Д. У. Дук лічыць адметнай з'явай ў матэрыяльнай культуры Полацка першай паловы XVI ст. [2, с. 97]. Такім чынам, можна меркаваць, што гэта інтэр'ер жылога дома гараджаніна сярэдняга дастатку. На карысць гэтага сведчаць як пліткавая керамічная падлога, так і загон для жывёлы. Трымаць маладую жывёлу ў доме, калі было вельмі холадна ўзімку, з'яўлялася звычайнай практыкай як для гараджан, так і для вяскоўцаў, для гэтага і будавалі часовую плеценую загародку. Гэта ж дэталь таксама падкрэслівала, што Хрыстос нарадзіўся ўзімку, значыць у вельмі складаных і неспрыяльных умовах.

Калі гаварыць менавіта пра кафлю, то адтуліны румпы знаходзяцца не толькі зверху і знізу, як звычайна ў кафлях, але і ў бакавых, больш кароткіх сценках румпы. Звычайна даследчыкі лічаць, што праз гэтыя адтуліны прапускалі дрот для мацавання кафлі пры будаўніцтве печы, але адтуліны часам бываюць толькі пазначаны паглыбленнямі, таму можна меркаваць, што яны былі неабходныя самім кафлярам, каб зручней было браць і выцягваць спецыяльнымі кляшчамі гарачыя вырабы з горна. Дарэчы, ў сувязі з гэтым трэба прыгадаць гравюру Ф. Скарыны з выявай будаўнічай пляцоўкі. Апрацаваныя каменныя блокі маюць невялікія паглыбленні у тарцах, якія вельмі падобны на адтуліны у кафлях. Таксама паказана, як падобныя каменныя блокі падымаюць на сцяну, зацісnуўшы з двух бакоў спецыяльнымі кляшчамі [4, с. 14]. Такім жа чынам, верагодна, выцягвалі пры абпале і кафлю з горна. Таксама з супрацьлеглых бакоў ёсць адтуліны, праколатыя трэскай, але прызначэнне іх невядома. Верагодна, ў іх сапраўды ўстаўляліся трэскі пры ўмуроўванні кафлі ў люстэрка печы, каб пры высыханні апошняй яна не зварухнулася з месца. Вышыня румпы каля 10 см дазваляла выкарыстоўваць кафлю як самастойны будаўнічы матэрыял для надстаўкі печы.

Не менш цікавай была наступная выява. Вонкавы бок кафлі ўяўляў сабой прамавугольную пласціну 21,0 × 18,5 см. Па яе краі была двухуступная масіўная рамка, далей – шырокая дэкаратыўная рамка, аздобленая вельмі вытанчаным геаметрычным арнаментам. Па кутах у квадратах знаходзіліся разеткі, якія нагадвалі металічныя заклёпкі. Сваім выглядам малюнак гэтай кафлі нагадвае шпалеру (мал. 2).



Мал. 2. Кафля з выявай «Маленне аб Чашы»

Галоўная выява займала цэнтральную частку пласціны. Гэта таксама вельмі вядомы па Евангеллі сюжэт «Маленне аб Чашы». Выява мае невысокі рэльеф, але фігуры вучняў і Хрыста, іх вопратка прапрацаваны вельмі дэталёва. Мастаку з дапамогай драпіроўкі адзення ўдалося вельмі экспрэсіўна перадаць напружаную атмасферу надыходзячай катастрофы. У правым куце, на ўзвышшы, на заднім плане бачны каленапрыхілены Хрыстос. Невялікія памеры фігуры Хрыста і палоска зямлі вылучаюць і аддаляюць яго ад вучняў. А тыя знясіленыя забыліся ў цяжкім сне. Адзін спіць ў абдымку з дрэвам. Другі сядзіць на камені, падпіраючы галаву рукой, змагаецца са сном. Трэці не вытрымаў і прыхіліўся да ўзвышша, на якім моліцца Хрыстос. Невялікія памеры выяў не дазволілі паказаць мастаку рысы іх твараў, але ў дзвюх фігур добра бачны бароды. З Евангелля ад Марка мы ведаем, што непасрэдна гэта былі Пётр, Марк і Іаан [6, с. 57, ст. 33, 37]. Дарэчы, апошні быў юнаком, самым малодшым з трох, таму ён на выяве без барады. Менавіта ён больш за ўсіх трымаўся, змагаючыся са сном.

Вельмі цікавым было аздабленне кутняй кафлі з выявай «Маленне аб Чашы». Яна складалася з паловы сюжэтнай пласціны і ўвагнутай нішы ў чвэрць круга. У ёй была скульптурная барэльефная выява сталага мужчыны ў рэнесансных строях. Мастак дасканальна папрацаваў. Высокія боты, кароткія штаны – марыналы і кароткая куртка з арнаментаванай тканіны, вялікія круглыя гузікі і ляжачы каўнер

сведчылі аб тым, што яго ўладальнік – вельмі заможны чалавек. Гэты касцюм цалкам адпавядаў заходнееўрапейскай модзе XVI–XVII стст. ад якой імкнуліся не адставаць і беларускія магнаты і шляхта. Да нас ён прыйшоў праз Галандыю і Нідэрланды, якія ў той час, натхнёныя ідэямі Рэфармацыі, перажывалі росквіт [7, с. 49]. Таксама вельмі падрабязна паказаны рысы твару. Невялікія вусы і барада, прычоска і карона. Дзіўна, але рук скульптура не мае, хаця месца для іх ў нішы было шмат. За плячыма мужчыны рыскамі пазначаны плашч.

Застаецца невядомым, як выглядалі запаўненні верхняй і ніжняй вуглавой кафлі, якія завяршалі вугал сценак печы.

Калі гаварыць пра кафлю, то адтуліны, зробленыя пальцамі, знаходзяцца ў бакавых сценках, а зверху і знізу яны былі праколаты трэскай. Вышыня румпы (каля 10 см) дазваляла выкарыстоўваць кафлю як самастойны будаўнічы матэрыял для надстаўкі печы. Таксама з супрацьлеглых бакоў ёсць адтуліны, праколатыя трэскай, але прызначэнне іх невядома. Верагодна, ў іх сапраўды ўстаўляліся трэскі пры ўмуроўванні кафлі, каб пры высыханні печы яна не зварухнулася з месца.

Назіранні і параўнанні выяў знойдзенай кафлі паказалі, што найбольш старэйшай з'яўляецца выява «Пакланенне вяшчуноў». Яна спалучае рысы готыкі і рэнесансу. Гатычныя элементы яскрава бачныя ў дэталях касцюма вяшчуноў – доўгім плашчы і панчохах – кальцэсах з прышыўнымі падэшвамі. Рэнесансныя – ў рэалістычнасці выяў, дынаміцы руху. Вядома, што нават ў першай палове XVII ст. працягваліся рэнесансныя традыцыі, нягледзячы на тое, што набірала моц контррэфармацыя, ударнай сілай якой былі езуіты. Такім чынам, верагодная дата вырабу гэтай кафлі – канец XVI – XVII ст.

Кафля з выявай «Маленне аб Чашы» больш позняя. На ёй цалкам адсутнічаюць гатычныя элементы, але вельмі яскрава выступаюць элементы эпохі Рэнесансу і Барока (маньерыстычныя). Першыя выражаны як у пабудове выявы, так і ў дынаміцы руху, напружанасці фігур, рэалістычнасці іх выканання. Другімі (рысамі ранняга Барока) з'яўляецца прамавугольная форма пласціны, наяўнасць дадатковай дэкаратыўнай рамкі з вельмі вытанчаным геаметрычным арнаментам і двухуступная рамка па краі пласціны. Гэтым самым яна нагадвае кафлю з выявай пешага воіна з Магілёва, датаваную сярэдзінай XVII ст. [7, с. 50], але прамавугольная дадатковая рамка полацкай знаходкі даволі выразная. Дзякуючы невысокаму рэльефу геаметрычнага арнаменту рамкі ў параўнанні з вонкавай двухуступнай рамкай і сюжэтнай цэнтральнай часткай, менавіта на апошняй канцэнтруецца ўвага. Звяртае таксама на сябе ўвагу і шыкоўны рэнесансны строй скульптурнай барэльефнай выявы мужчыны з кутняга вырабу. Характар касцюма нагадвае вопратку мушкецёра з кафлі, якая была знойдена на Верхнім замку. Але на кафлі з калегіума прыклад рэнесанснага строю, вельмі распаўсюджанага ў другой палове XVI – пачатку XVII ст. Такім чынам, гэтую кафлю можна датаваць першай паловай XVII ст.

Змест сюжэтаў гэтых кафляў дазваляе меркаваць, што першапачаткова з іх маглі быць збудаваны надстаўкі печаў езуіцкіх драўляных касцёлаў. Першая згадка пра будаўніцтва касцёла паміж замкам і горадам адносіцца да 1582 г. [8, с. 209], але магчыма, што ў хуткім часе ён быў перабудаваны альбо разбураны, бо зноў згаданы ўжо ў 1636 г. [9, с. 4]. У той час Будакам быў збудаваны касцёл на каменных крыптах. Гэты касцёл загінуў у пажары 1643 г. [4, с. 203], потым ён быў зноў адбудаваны і разбураны падчас руска-польскай вайны 1654–1667 гг. Па апошніх назіраннях за стратыграфіяй памяшканняў корпуса «З», верагодна, рэшткі гэтага касцёла могуць быць «пахаваны» пад яго паўднёвай часткай. Гэта найбольш раннія згадванні драўлянага касцёла езуітаў. Такім чынам, верагодна, да прыведзеных дат (паміж 1582 и 1643 г.) можна паспрабаваць прывязаць выраб гэтых кафляў. Для кафлі з выявай «Пакланенне вяшчуноў» верагодныя ніжняя і верхняя мяжа іх вырабу 1582 і 1636 г., а для кафлі з выявай «Маленне аб Чашы» – 1636 і 1643 г. апаведна, бо пасля пажару печы касцёла, магчыма, упершыню былі пакрыты кафляй з «дывановым арнаментам». Менавіта яна разам пласцінамі з езуіцкай сімволікай знойдзена ў пластах, якія непасрэдна перакрылі рэшткі каменных падмуркаў касцёла.

Назіранні паказалі, што ўся дадзеная кафля сустракалася толькі на тэрыторыі калегіума альбо ў непасрэднай блізкасці да яе. Так, падобныя фрагменты кафлі з сюжэтам «Маленне аб Чашы» былі сустрэты ў засыпцы скляпення над першым паверхам корпуса «В». Знойдзеныя кавалкі былі пакрыты белым ангобам. Таксама кавалкі падобнай кафлі знойдзены на вул. Стралецкай, 7 (на паўднёвы захад ад корпуса «Е»).

Незвычайна дакладная прапрацоўка скульптурнай выявы мужчыны на кутняй кафлі дазваляе меркаваць, што гэта выява можа быць партрэтнай. Вялікасвецкі дваранскі рэнесансны касцюм і наяўнасць кароны дазваляюць меркаваць, што гэта можа быць выява караля, верагодна, Стэфана Баторыя – дабратворцы, абаронцы і патрона полацкіх езуітаў. Аднак гэта версія патрабуе дадатковай праверкі.

Высновы. У выніку даследаванняў корпуса «В» былі сустрэты унікальныя сюжэтныя кафлі, дагэтуль у Полацку невядомыя. З'яўленне падобных кафляў з евангельскімі сюжэтамі, выявы якіх вельмі падобны на царкоўныя абразы, можа быць вынікам імкненняў езуітаў прыстасавацца да варожага для іх праваслаўнага гарадскога асяроддзя. Гэта таксама

можа сведчыць і пра адваротны ўплыў рэфармацыі на контррэфармацыю. Знаёмыя сюжэты павінны былі прыцягваць ўвагу палачан, перш за ўсё вучняў калегіума. На падставе вышэйпрыведзеных назіранняў можна меркаваць, гэтыя кафлі былі зроблены па спецыяльнай замове для касцёла альбо вучэбнага памяшкання. Найстарэйшай з'яўляецца кафля з сюжэтам «Пакланенне вяшчуноў». Выява носіць рысы позняй готыкі і рэнесансу. Яна магла быць выраблена паміж 1582 і 1636 г. На кафлі паказаны тагачасны інтэр'ер грамадзянскай пабудовы, што робіць яе вельмі каштоўнай крыніцай па вывучэнні матэрыяльнай культуры Полацка канца XVI – XVII ст. Другі від сюжэтнай кафлі крыху больш пазнейшы – носіць рысы рэнесансу і маньерызму (нават барока). Час яе стварэння – прыкладна перыяд паміж 1636–1643 гг., бо пазней ў моду пачаў уваходзіць «дывановы арнамент». «Дывановай» кафляй разам са старой адбудоўваліся печы калегіума пасля пажару 1643 г. Цалкам дапушчальна, што скульптурная барэльефная выява мужчыны на яе кутнім экзэмпляры з'яўляецца партрэтнай і належыць аднаму з патронаў езуітаў ў Полацку, напрыклад Стэфану Баторыю. Гэтае меркаванне патрабуе далейшай праверкі.

Літаратура

1. Салаўёў, А. А. Каменныя будынкі Полацкага езуіцкага калегіума падчас яго мадэрнізацыі / А. А. Салаўёў // Беларускае Падзвінне, методыка вопыт і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у Полацку): зб. навук. прац рэсп. практ. семінара, Полацк, 20–21 лістап. 2008 г. / пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 70–79.

2. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.: іл.

3. Трусов, О. А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв.: архитект.-археолог. анализ / О. А. Трусов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 160 с.: ил.

4. Гравюры Ф. Скорины. На белорусском и русском языках / рэд. І. Крымава; мастакі У. і Н. Басалыгі; маст. рэд. В. Курусь; карэктары А. Жукаў, В. Харэўскі. – Мінск: Беларусь, 1972.

5. Барвенава, Ганна. Гатычны касцюм. ВКЛ / Ганна Барвенава // CASTRUM, URBIS ET BELLUM: зб. навук. прац. – Баранавічы: Баранав. узбуйн. друк., 2002.– 422 с.

6. Новый завет. (Евангелие от Марка).

7. Дук, Д. У. Аб адным «паралельным» сюжэце полацкай і магілёўскай кафлі з выявамі рыцараў / Д. У. Дук // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зб. навук. прац / уклад. І. А. Пушкін. – Магілёў: Магілёўская абл. узбуйн. друк., 2001. – С. 47.

8. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2002. – 912 с.: іл.

9. Глинник, В. В. Благоустройство территории комплекса иезуитского коллегиума в г. Полоцке. Комплексные научные изыскания / В. В. Глинник. – Лицензия № П-920/1. – Минск, 2004.

Резюме

А. А. Соловьёв

Новые находки сюжетных изразцов в Полоцке

В статье приводится описание сюжетных изразцов, выявленных при исследовании одного из корпусов бывшего иезуитского коллегиума в г. Полоцке. Изображения на изразцах носят евангельский характер. Они отражают сюжеты: «Поклонение вещунов» и «Моление о чаше» и датируются концом XVI – серединой XVII в. Один угловой изразец отображает, предположительно, покровителя иезуитов – короля Стефана Батория.

Summary

A. Soloviov

New Finds of plot tiles in Polotsk

Plot stove tiles from the excavations of a building of jesuits' collegium are deseribed. The images on the tiles are of religions character. They represent a number of plots from New Testament. The tiles date from the end of the 16th – mid 17th c.

Паступіў 10.03.2011

В. У. Мядзведзева, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск)*

Культура сярэдневяковага насельніцтва Полацка (на аснове касцярэзнай вытворчасці)

Культура насельніцтва Полацка сярэдневяковага перыяду вельмі багатая і разнастайная. Розныя яе аспекты можна прасачыць на матэрыялах касцярэзнай вытворчасці, якая была дастаткова развіта ў XI–XVII стст. Прадметы, што характарызуюць культуру, адносяцца да катэгорый інтэлектуальных лагічных гульняў і забаў, музычных інструментаў, вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Да інтэлектуальных лагічных гульняў належаць шахматы, шашкі і кубік-фішка. У Полацку пры археалагічных даследаваннях выяўлена 12 абстрактных умоўных шахмат у выглядзе геаметрычных фігур. У калекцыі маюцца ўсе фігуры, акрамя каня: 2 каралі, 3 ферзі, 1 фрагмент ферзя (?), 1 ладдзя, 2 слоны, 3 пешкі, якія ўяўляюць фігуры новага ўзору XIII–XVII стст. Новы тып шахмат атрымаў асаблівае распаўсюджванне ў XIII–XIV стст., калі шахматы ў асноўным выраблялі на такарным станку, што дало магчымасць паскорыць працу рамеснікаў-касцярэзаў.

Два каралі знойдзены пры археалагічных даследаваннях С. В. Тарасава. Адзін кароль выяўлены на Вялікім пасадзе ў 1987 г. (мал. 1: *1*). Вышыня фігуры 7,2 см, аснова дыяметрам 2,6 см. Шахмата цэлая, добрай захаванасці, вытачана з рогу на такарным станку і складаецца з круглай асновы, ад якой уздымаецца каркас з размешчанымі на ім трыма вялікімі ярусамі, двума кальцавымі перахватамі. Ніжні ярус зроблены ў выглядзе паўсферы, сярэдні – цыліндрычнай формы, а апошні ярус завяршаецца падабенствам кароны. Уся фігура ўпрыгожана цыркульна-лінейным арнаментам, захаваліся нават сляды інкрустацыі жоўтым металам (золата?). Аўтар раскопак датаваў фігурку канцом XVI – пачаткам XVII ст. і палічыў яе за ферзя. Але ўсебаковы разгляд шахматы дазваляе канстатаваць, што гэта кароль – першая фігура шахматнага набору. На карысць гэтага сведчыць увесь яе выгляд: складаецца з трох вялікіх ярусаў, што характэрна толькі для фігур каралёў, а завяршэнне ў выглядзе кароны здымае ўсялякія сумненні. Вялікія памеры, упрыгажэнне арнаментам і інкрустацыяй толькі пацвярджаюць інтэрпрэтацыю шахматы як фігуры караля. Аддалена падобная фігурка вядома з раскопак Пскова, дзе яна датуецца XVI–XVII стст. [9, с. 46, мал. 11: *1*].

Другі шахматны кароль знойдзены ў 1993 г. на Верхнім замку (мал. 1: *2*). Зроблена фігура з рога на такарным станку, добра захавалася і мае вышыню 6,5 см, дыяметр асновы 2,6 см. На круглай аснове вышынёй 0,8 см размешчаны 2 масіўныя ярусы, якія падзелены 3 паяскамі. Далей узвышаюцца 2 невялікія ярусы з перахватам з 4 паяскоў, а завяршае канфігурацыю сплюшчаны круг з адным поясам. Аўтар раскопак лічыць гэту фігуру «каралевай» (ферзём) і датуе яе XVI–XVII стст. Але, на нашу думку, гэта таксама кароль, толькі іншага шахматнага камплекта. Аб гэтым сведчаць памеры фігуры, колькасць ярусаў і вышыня асновы. Зроблена шахмата ў аналагічным стылі, як і вышэйапісаная фігура караля з Вялікага пасада Полацка, фігура з Пскова, а таксама падобна на шахматы з Вялікага пасада Масквы (XIV–XVI стст.) і Мангазеі (XVII ст.) [9, с. 46–47, мал. 11: *2*].

Падчас археалагічных даследаванняў 2003 г. на Вялікім пасадзе Д. У. Дук[1] знайшоў шахматную фігурку ферзя XV–XVI стст. (мал. 1: *3*) [1, с. 48, 54; 2, с. 89, мал. 7: *9*; 4, с. 196, мал. 81: *4*; 7, с. 124, мал. 66; 9, с. 48, мал. 11: *3*]. Шахматная фігура добрай захаванасці, выраблена з рога аленя на такарным станку і адносіцца да шахмат новай абстракцыі, мае вышыню 4,3 см, дыяметр круглай асновы – 2,4 см. Шахмата цыліндрычнай формы складаецца з высокай асновы (2,3 см), перахопленай пасярэдзіне паяском, 2 чашападобных ярусаў і конусападобнай верхавіны. Манера выканання гэтай фігуры зусім іншая, чым папярэдніх: яна масіўная, шырокія чашы маюць зверху прарэхі (па 4 на кожным ярусе). Аснова і ярусы ўпрыгожаны лінейным арнаментам.

Дзве фігуры ферзяў знойдзены на Верхнім замку пры раскопках В. Р. Тарасенкі і Г. В. Штыхава ў 1961 г. Адна з фігурак вышынёй 3,2 см, дыяметрам асновы 2 см (мал. 1: *4*) складаецца з асновы і 2 ярусаў чашападобнай формы, размешчаных адзін над адным на конусападобным каркасе. Завяршае кампазіцыю невялікі «ярус» з канічным паглыбленнем у цэнтры. Аснова і ярусы пакрыты лінейным арнаментам. Аўтарамі раскопак знаходка датуецца канцом XIII – пачаткам XIV ст. і інтэрпрэтуецца як кароль [14, с. 94, рис. 48: *25*]. На нашу ж думку, гэта фігура ўяўляе ферзя, таму што над невысокай асновай ўзвышаюцца толькі два выступы. Невялікія памеры таксама сведчаць на карысць гэтай думкі [9, с. 32–33, мал. 7: *2*; 14, с. 94, рис. 48: *25*].

Ад другога ферзя захавалася аснова і больш-менш ніжні ярус, другі ярус і верх адламаны (мал. 1: *5*). Вы-

[1] Большасць касцяных артэфактаў, прыведзеных у артыкуле, знойдзена ў час археалагічных даследаванняў, праведзеных Д. У. Дукам, якому выказваю шчырую падзяку за магчымасць іх выкарыстання, а таксама апублікавання новых матэрыялаў.



Мал. 1. Прадметы інтэлектуальна-лагічных гульняў – шахматныя фігуры: *1* – кароль (канец XVI – пачатак XVII стст.); *2* – кароль (XVI–XVII стст.); *3* – ферзь (XV –XVI стст.); *4, 5* – ферзі (канец XIII – пачатак XIV стст.); *6* – слон (XIII–XIV стст.); *7* – слон (XIII ст.); *8* – ладдзя (XVI ст.); *9, 10* – пешкі (XIII–XIV стст.); *11* – пешка (XII–XIII стст.); *12* – фрагмент ферзя (?) (XII–XIII стст.)

шыня часткі, што засталася, складае 3,3 см, дыяметр асновы – 2,2 см. Гэта фігура па ўсяму выгляду больш магутная, шырэйшая, чым першая: дыяметр і вышыня асновы большыя, тулава і ярусы таўсцейшыя. Калі б абедзве фігуркі адносіліся да аднаго шахматнага набору, то, напэўна, гэта шахмата магла быць каралём. Па аналогіях датуецца канцом XIII – пачаткам XIV ст. [9, с. 33, мал. 7: *3*].

Новы абстрактны тып слана, вытачаны на такарным станку ў выглядзе конусаў без верхніх выступаў, выяўлены пры раскопках Г. В. Штыхава ў 1963 г. на Верхнім замку і датуецца аўтарам XIII–XIV стст. (мал. 1: *6*) [9, с. 36–37, мал. 8: *3*; 14, с. 94–95, рис. 18: *7*]. Захаванасць шахматы не вельмі добрая, бо адлама на адна з верхніх частак. Слон уяўляе фігуру агульнай вышынёй 3 см. На круглай аснове вышынёй

0,6 см, дыяметрам 2 см размешчана тулава з двума высокімі разрэзанымі часткамі-біўнямі. Аналогіі гэтай шахматнай фігуры маюцца ў г. Тракаі (Літва), якія датуюцца XIV–XV стст. [8, с. 87, рис. 2б; с. 123–125, рис. 6].

Другі слон знойдзены пры даследаваннях Д. У. Дука ў 2007 г. на гарадзішчы (мал. 1: *7*). Параметры шахматы наступныя: вышыня 2,2 см, дыяметр авальнай асновы 1,5 × 2 см. Датуецца аўтарам раскопак XIII ст., і аналогіі ёй вядомы ў Мінску [5, с. 23–24, мал. 49: *4*, фота 30: *1*; 9, с. 38, мал. 8: *6, 7*].

Ладдзя XV–XVII стст. таксама выяўлена Д. У. Дукам пры раскопках 2010 г. на тэрыторыі Запалоцкага пасада (мал. 1: *8*). Гэта вельмі мініяцюрная фігурка вышынёй 1,3 см, дыяметрам круглай асновы 1,8 см і выраблена з рога лася або высакароднага аленя. Падобныя шахматы маюцца ў матэрыялах Ліды, Віцебска і Мсціслаўля [6, с. 12, мал. 37: *6*; 9, с. 34–36, мал. 7: *5–8*].

Пешка знойдзена А. Г. Мітрафанавым пры раскопках 1959 г. (мал. 1: *10*) [9, с. 40–41, мал. 9: *8*]. На жаль, у шахматы абламаны верх, але, мяркуючы па форме і памерах часткі, што захавалася, – гэта пешка. На аснове, якая складаецца з 3 валікаў дыяметрам 1,5 см і вышынёй 0,5 см, узвышаецца тулава, на якім бачны сляды аднаго або двух невялікіх чашападобных ярусаў. Агульная вышыня часткі фігуры, што засталася, складае 2 см, напэўна, цэлая шахмата была не больш 2,5 см.

Падчас археалагічных даследаванняў А. Г. Мітрафанава, В. Р. Тарасенкі, Г. В. Штыхава ў пачатку 1960-х гадоў выяўлена яшчэ адна шахматная фігурка, вельмі падобная на папярэднюю (мал. 1: *9*) [9, с. 41, мал. 9: *4*]. На круглай аснове вышынёй 0,4 см, дыяметрам 1,7 см, упрыгожанай лінейным арнаментам, размешчана невялікая падстаўка, над якой узвышаецца тулава са слядамі дзвюх чаш. Фігура дрэннай захаванасці: адламаны верх, адсутнічаюць бакавыя ярусы, вышчарблена аснова. Вышыня захаванай часткі шахматы складае 2,4 см.

Абедзве полацкія фігуры датуюцца XIII–XIV стст. і падобны на пешкі з Навагрудка, Тарапца і Тракая [8, с. 121, 125].

Фрагмент ніжняй часткі пешкі знойдзены Д. У. Дукам у 2005 г. на тэрыторыі Вялікага пасада (мал. 1: *11*) [3, с. 14, мал. 14: *1*, 20: *1*]. Шахмата мае невялікія памеры: вышыня фрагмента 0,9 см, дыяметр асновы 1,1 см. Па стратыграфіі датуецца XII–XIII стст.

Фрагмент шахматы, круглай у аснове і з паясным арнаментам, выяўлены на тэрыторыі Вялікага пасада пры археалагічных даследаваннях 1988 г. С. В. Тарасавым (мал. 1: *12*) [9, с. 44, мал. 10: *5*]. Вышыня фрагмента і дыяметр па 1,2 см, па перыметры прасочваецца арнамент у выглядзе прамых ліній. Фрагмент ад верхняй часткі, магчыма, ферзя, аб чым сведчаць дастаткова вялікія памеры. Захаваная частка ўяўляе сабой прамавугольны цыліндр, на самым версе якога ўзвышэнне таксама прамавугольнай формы. Датуецца па аналогіях XII–XIII стст.

Шашак знойдзена 5 экз., выраблены яны з рагоў лася і высакароднага аленя. Класіфікацыйна належаць да тыпу круглыя пляскатыя, падтыпаў: шашкі з канцэнтрычнымі кругамі (3), шашка камбінаваная, шашка з выявай. Дыяметрам 3,4–5,0 см, вышыня 0,4–1,0 см, бытавалі ў XII–XVI стст.

Дзве шашачныя фігуркі выяўлены на Верхнім замку пры археалагічных даследаваннях А. Г. Мітрафанава ў 1959 г. [10, с. 190, мал. 2: *4,5*]. Адна з шашак добрай захаванасці, цэлая, запаліраваны абедзве паверхні, мае дыяметр 3,6 см пры вышыні 0,6 см (мал. 2: *1*). З абодвух бакоў з краю глыбокая двайная канцэнтрычная лінія, у цэнтры – тры невялікія канцэнтрычныя кругі. Другая фігура дыяметрам 3,4 см, вышынёй 0,4 см з аднаго боку мае невялікі скол, а з краю і пасярэдзіне – неглыбокія канцэнтрычныя кругі (мал. 2: *2*). Датуюцца вырабы XII–XIII стст.

Пры даследаваннях Г. В. Штыхава знойдзена шашка камбінаваная (з канцэнтрычнымі кругамі і цыркульным арнаментам), якая датуецца пачаткам XIII ст. (мал. 2: *3*) [10, с. 192, мал. 3: *5*; 14, с. 94, рис. 48: *20*]. Дыяметрам яна 4,8 см, вышынёй 0,7 см. Знешняя паверхня ўпрыгожана 6 двайнымі глыбокімі канцэнтрычнымі лініямі, паміж чацвёртым і пятым кругамі маецца пояс з вочкамі, шчыльна прылягаючымі адно да аднаго. Тыльная паверхня роўная, гладкая, без арнамента, а на бакавой – дзве паралельныя лініі.

У 2011 г. на тэрыторыі Запалоцкага пасада Д. У. Дук выявіў шашку з канцэнтрычнымі кругамі без адтуліны (мал. 2: *4*)[1]. Дыяметр шашкі 5 см, таўшчыня 1 см. Зроблена яна з рога высакароднага аленя. Па знешнім выглядзе і параметрах падобна да вышэй апісанай шашкі, па стратыграфіі датуецца канцом XV – першай паловай XVI ст. Гэта самая вялікая па памерах шашачная фігура з усіх, выяўленых на тэрыторыі Беларусі.

Пры археалагічных даследаваннях Н. І. Здановіч на вул. Леніна, 35 у 1992 г. знойдзены фрагмент выяўленчай шашкі XVI ст. (мал. 2: *5*) [10, с. 194, мал. 4: *5*]. Выраб абламаны з усіх бакоў, дыяметр захаванай часткі складае 2,6 × 1,8 см. На шашцы адлюстравана выява нейкай фантастычнай істоты: твар чалавека з вушамі жывёліны.

Полацкая фішка-кубік выяўлена Д. У. Дукам на тэрыторыі Верхняга Замка пры даследаваннях 2003 г. (мал. 2: *6*). Гэта адна з васьмі падобных рэчаў, знойдзеных на Беларусі. Фішка-кубік выкарыстоў-

[1] Шашка знойдзена пры археалагічных раскопках летам 2011 г. і яшчэ не апублікавана аўтарам даследавання, таму выказваю ўдзячнасць Д. У. Дуку за дазвол выкарыстання гэтага прадмета ў дадзенай публікацыі.



Мал. 2. Прадметы інтэлектуальна-лагічных гульняў і музычныя інструменты: *1, 2* – шашкі з канцэнтрычнымі кругамі (XII–XIII стст.); *3* – шашка камбінаваная (пачатак XIII ст.); *4* – шашка з канцэнтрычнымі кругамі (канец XV – першая палова XVI ст.); *5* – выяўленчая шашка (XVI ст.); *6* – фішка-кубік (XVII ст.); *7–9* – дудкі-жалейкі (XII–XIII стст.)

валася як дапаўняльны прадмет пры першапачатковых гульнях у шашкі і шахматы, ці ў якасці самастойнага прадмета ў азартных гульнях (напрыклад, зернь). Уяўляе сабой кубік з вочкамі правільнай формы, памерамі граняў 1,2 × 1,2 см, з аднаго боку фішка крыху абламана. На кожным з шасці бакоў размешчаны кружкі-вочкі, якія складаюцца з двух канцэнтрычных кругоў (адзін у адным), а ўнутры знаходзіцца кропка. Па часе бытавання – гэта самы позні кубік на тэрыторыі Беларусі (XVII ст.) [1, с. 48, мал. 2; с. 89, мал. 7: *8*; 4, с. 195, мал. 81: *1*; 7, с. 124, мал. 66; 11, с. 137, мал. 1: *4*].

Да катэгорыі музычных інструментаў адносяцца дудкі-жалейкі ці свісцёлкі (3 экз.) (мал. 2: *7–9*). Музычныя прадметы ў выглядзе свісцёлак часцей выраблялiся з трубчастых костак птушак. Дзве дуд-

кі знойдзены на тэрыторыі Верхняга замка і зроблены з тонкіх птушыных костак (даследаванні Д. У. Дука). Адна з іх уяўляе полую трубачку даўжынёй 7,7 см, з аднаго боку пашыраную, дыяметр яе складае 1,0–1,2 см. У верхняй частцы – маленькая скразная адтуліна памерам 0,2 × 0,4 мм. Другая трубачка вельмі тонкая, дыяметрам 0,6 см, даўжынёй 8,2 см, у верхняй частцы – невялікая адтуліна дыяметрам 0,3 мм. З абодвух краёў упрыгожана геаметрычна-лінейным арнаментам, сярэдзіна не арнаментаваная. Падобная на свістульку рэч знойдзена на Вялікім пасадзе і выраблена таксама з птушынай косткі (дыяфіз плечавой косці) і з аднаго боку зламана (даследчык С. В. Тарасаў). Мае невялікія памеры, адна частка крыху пашырана, другая – зроблена ў выглядзе роўнага шасцівугольніка. Даўжыня захаванай часткі прадмета 6,5 см, дыяметр 1,7–1,8 см. Усе тры вырабы па слоі і аналогіях датуюцца XII–XIII стст. Падобныя музычныя інструменты знойдзены на тэрыторыі Беларусі ў Слуцку і Пінску, таксама вядомы ў археалагічных матэрыялах Расіі і Германіі.

З XII–XIII стст. рамеснікі-касцярэзы пачалі надаваць асаблівую ўвагу вырабу высокамастацкіх твораў, каштоўных у эстэтычных адносінах, якія з'яўляюцца ўзорамі сярэдневяковага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. За гады археалагічнага даследавання ў Полацку сярод шматлікіх касцяных вырабаў сабрана дастаткова выразная калекцыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва свецкага і культавага характару. Дадзеныя вырабы характарызуюць высокі ўзровень вытворчасці і культуры тагачаснага насельніцтва горада, з'яўляюцца крыніцай па вывучэнні яго культурных, гандлёвых, эканамічных сувязяў, даюць падставы для параўнання з агульнаеўрапейскім матэрыялам.

З гэтай групы вырабаў у Полацку знойдзены разнастайныя пласціны, ігольнік, капавушкі, паясныя накладкі, рытуальная лыжка, наверша і некаторыя іншыя рэчы.

У XIII–XIV стст. шырока выкарыстоўваліся пласціны-накладкі для ўмацавання і аздаблення куфэркаў, шкатулак, а таксама калчанаў і іншых прадметаў. Многія з іх упрыгожаны складанымі ўзорамі: раслінным, геаметрычным ці камбінаваным арнаментам, або выкананы ў тэраталагічным стылі, як накладка з галавой дракона (сабакі?) памерам 2,0 × 5,5 см (мал. 3: *6*) (даследчык Г. В. Штыхаў) [14, с. 114, рис. 59]. Адна з такіх пласцін-накладак для калчана даўжынёй 10 см выраблена паўкруглай формы і ўпрыгожана складанымі геаметрычнымі ўзорамі (мал. 3: *1*) (даследчык Д. У. Дук).

Асабліва вылучаецца сярод прадметаў гэтай групы разны́ аб'ёмны ігольнік XII–XIII стст., аздоблены камбінаваным геаметрычна-цыркульным арнаментам (мал. 3: *3*) (даследаванні Д. У. Дука). Яго даўжыня складае 7,5 см, дыяметр – 2 см. Гэта прадмет бытавога ўжытку, аднак выраблены з высокім майстэрствам і ў асобай манеры выканання.

Капавушкі служылі прадметамі гігіенічнага выкарыстання, а таксама дапаўнялі набор упрыгажэнняў, які насілі жанчыны на грудзях альбо каля пояса. Дзве капавушкі знойдзены на тэрыторыі Вялікага пасада, яны фрагментаваныя (адсутнічаюць ніжнія часткі з лапатачкай) (мал. 3: *2, 4*) (даследаванні Д. У. Дука і С. В. Тарасава). Адна з іх выканана ў выглядзе аб'ёмнай выявы галавы птушкі з разяўленай дзюбай, вялікімі вачыма. Сярэдняя частка аздоблена разны́м плеценым арнаментам, які нагадвае жаночую касу. Вышыня фрагменту 7 см, дыяметр 1 см. Датаваны ён па аналогіях XII ст. Верхняя частка другой капавушкі мае памер 5,2 см, дыяметр 0,9 см. Верх уяўляе амаль прамакутнік з вушкам і падоўжанай скразной адтулінай памерам 0,2 × 0,7 см. Далей ідуць тры валікі, сярэдзіна аздоблена лентачным кручаным арнаментам, а ніжняя частка з лапатачкай абламана. Выраблена з метаподыя буйной рагатай жывёлы і датавана XII–XIII стст. [12, с. 145, мал. 2: *1, 5*].

Паясныя накладкі з'яўляліся неабходнымі элементамі вопраткі, служылі для замацавання адзення, у той жа час выконвалі і ролю ўпрыгажэння. Паясная накладка (мал. 3: *5*) – гэта пласцінка, аздобленая па баках геаметрычным арнаментам (трохкутнікі з маленькіх ромбаў, падзеленыя трыма прамымі лініямі) (даследчык Г. В. Штыхаў). Даўжыня яе складае 9 см, шырыня – 3,3 см, таўшчыня – 0,2 см. Датавана яна XII–XIII стст.

Пры правядзенні рэлігійнага абраду – прыняцця прычасця – прымяняліся касцяныя лыжачкі. Такая лыжачка знойдзена з адламанай ніжняй часткай – адсутнічае лапатачка (мал. 3: *7*) (раскопкі Г. В. Штыхава). Уяўляе доўгі гладкі стрыжань даўжынёй 12 см і дыяметрам 0,7–1,0 см. Зверху і знізу ручка ўпрыгожана плеценым арнаментам у выглядзе касы, а сярэдзіна добра адпаліраваная. Костка, з якой выраблена рэч, мае цёмны ненатуральны колер, напэўна, была апрацавана растворам ці фарбай. Па вызначэнні аўтара раскопак Г. В. Штыхава лыжачка датавана XIII ст. [13, с. 135–136, мал. 2: *4*; 14, рис. 48: *24*]. Аб тым, што гэта рэч адносіцца да царкоўнага начыння, сведчаць маленькая, неглыбокая лапатачка, доўгая ручка і дасканалая арнаментацыя.

Наверша на посах, жэзл, ці іншы прадмет выканана ў выглядзе аб'ёмнай скульптурнай выявы – галавы жывёліны (мал. 3: *8*) (раскопкі С. В. Тарасава). Вышыня рэчы 4 см, дыяметр 2 × 3 см. Ніжняя частка аздоблена геаметрычным арнаментам, верхняя – вочкава-цыркульным, што нагадвае вока. Адносіцца да перыяду XII–XIII стст.

Падводзячы вынік, можна канстатаваць, што вышэйпрыведзеныя мініяцюрныя скульптуркі, аб'ёмныя



Мал. 3. Прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: *1* – накладка калчана (XIII–XIV стст.); *2, 4* – капавушкі (XII ст.); *3* – ігольнік (XII–XIII стст.); *5* – накладка паясная (XII–XIII стст.); *6* – пласціна-накладка з выявай дракона (сабакі?) (XIII ст.); *7* – рытуальная лыжка (XIII ст.); *8* – наверша (XII–XIII стст.)

прадметы, а таксама дэкарыраваныя плоскарэльефныя і разны́я рэчы з'яўляюцца сапраўднымі творамі прыкладнога мастацтва. Прадметы інтэлектуальналагічных гульняў і музычныя інструменты адлюстроўваюць высокі інтэлектуальны ўзровень, традыцыі жыхароў горада. Сярод іншых вырабаў з косці дадзеныя рэчы вылучаюцца мастацкім густам майстра і дасканаласцю прапрацоўкі нават у дэталях. Такія вырабы – гэта каштоўны матэрыял па гісторыі старажытнай мастацкай вытворчасці, матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва Полацка сярэдневяковага перыяду.

Літаратура

1. Дук, Д. У. Побыт і матэрыяльная культура палачан XVI–XVII стст. / Д. У. Дук // Беларус. гіст. часоп. – Мінск, 2004. – № 5. – С. 48–55.

2. Дук, Д. У. Полацкая касцярэзная майстэрня XV – першай паловы XVI ст. / Д. У. Дук // Acta archaeologica Albaruthenica / уклад. М. А. Плавінскі, В. М. Сідаровіч. – Мінск: ІП Логвінаў І. П. – 2007. – Vol. II (вып. 2) – С. 86–101.

3. Дук, Д. У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе / Д. У. Дук // Вестн. Полоцкого гос. ун-та. – Сер. А, Гуманитарные науки. – 2007. – № 1. – С. 2–15.

4. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.: іл.

5. Дук, Д. У. Справаздача аб археалагічных раскопках на Полацкім гарадзішчы ў 2007 г. / Д. У. Дук // ААНД Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Спр. 2537, 2537а.

6. Дук, Д. У. Справаздача аб археалагічных раскопках на тэрыторыі Запалоцкага пасада г. Полацка ў 2010 г. / Д. У. Дук // ААНД Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Спр. 2736.

7. Дук, Д. У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2010. – 180 с.: [22] арк. іл.

8. Линдер, И. М. Шахматы на Руси / И. М. Линдер. – 2-е изд. – М.: Наука, 1975. – 207 с.

9. Мядзведзева, В. У. Сярэдневяковыя шахматы Беларусі (гіст.-археалаг. даследаванне) / В. У. Мядзведзева. – Мінск: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2005. – 82 с.

10. Мядзведзева, В. У. Сярэдневяковыя шашкі Беларусі (па матэрыялах археалаг. даследаванняў) / В. У. Мядзведзева // ГАЗ / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2006. – № 22. – С. 187–200.

11. Мядзведзева, В. У. Да пытання аб адной групе рогавых вырабаў / В. У. Мядзведзева // Материалы по археологии Беларуси: науч. сб. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2006. – Вып. 11: Древности Беларуси в системе межкультурных связей. – С. 136–139.

12. Мядзведзева, В. У. Капавушкі X–XV стст. з тэрыторыі Беларусі / В. У. Мядзведзева // ГАЗ / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2007. – Вып. 23. – С. 144–151.

13. Мядзведзева, В. У. Хрысціянскія рэліквіі сярэдневякоўя (па матэрыялах касцярэзнай вытворчасці) // Беларусь: государство, религия, общество: материалы Междунар. науч.-практ. конф. (Минск–Жировичи). – Минск, 2008. – С. 131–137.

14. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.: ил.

Резюме

О. В. Медведева

Культура средневекового населения Полоцка (на основе косторезного производства)

В статье на основе материалов косторезного производства характеризуется аспект материальной и духовной культуры населения Полоцка средневекового периода. Представленные артефакты находили широкое применение в декоративно-прикладном искусстве (высокохудожественно орнаментированных накладках, навершии, ритуальной ложечке, резных копоушках, игольнике), интеллектуально-логических занятиях горожан (шахматах, шашках, фишке-кубике) и музыкальной культуре (дудочках).

Summary

O. Medvedeva

Culture of the medieval population of Polotsk (on a basis bone carving manufactures)

In the article on the basis of materials bone carving manufactures the aspect of material and spiritual culture of the population of Polotsk of the medieval period is characterized. The presented artifacts found wide application in arts and crafts (highly artistically ornamented overlays, a ritual spoon, carved earcleaners, a needle case), is intellectual-logic employment of townspeople (chess, drafts, a counter-cube) and musical culture (pipe).

Паступіў 29.04.2011

Н. Ю. Шарковская, *УК «Витебский областной краеведческий музей», ведущий научный сотрудник, хранитель археологической коллекции (г. Витебск)*

Находки с Замковой горы в собраниях витебских музеев

История Витебска тесно связана с Замковой горой (Ломихой)[1], которая долгое время хранила память и ценные свидетельства о древнейшей истории города. Она могла еще многое рассказать, если бы не была срыта в конце 1890-х годов[2], похоронив нераскрытые тайны.

Сегодня каждый исследователь, обращаясь к древней истории Витебска, по крупицам собирает информацию о Замковой горе и найденных на ней предметах.

Цель работы – собрать все сведения, имеющиеся в научном архиве и фондах Витебского областного краеведческого музея (далее – ВОКМ) о находках с Замковой горы, выявить сохранившиеся предметы.

Историография. Данные о находках с Замковой горы являются краткими и лакунарными.

В 1895 г. в ряде местных губернских российских изданий (Виленский вестник, 1895, № 176 и др.) были опубликованы заметки о срытии Замковой горы в Витебске, перечислялись найденные там предметы. «При раскопках в южной части под слоем чернозема найдено 14 костяков… Из предметов в черноземном слое найдено: глиняные грузила, точильные камни, ручные жернова… Из оружия – несколько ножей позднего времени, часть сабельной рукоятки, круглые свинцовые пули, железные наконечники стрел, чугунные ядра, железные копья, топоры…» [цит. по.: 3, с. 62].

В 1897 г. в нескольких номерах местной газеты было опубликовано вышедшее позже отдельным изданием исследование Н. Я. Никифоровского о витебской керамике, найденной преимущественно при раскопках на Замковой горе. Автор работы [15, № 135–138] отмечал тождество «гончарной посуды Киева (раскопки А. И. Хойновского) и Витебска» с Замковой горы.

В 1912 г. в изданном Каталоге музея Витебской ученой архивной комиссии перечислялось несколько вещей, поступивших из раскопок на Замковой горе: несколько ключей (№ 192, 303); «сулея» (№ 309), медная пряжка (№ 193); изразцы (№ 313–352); осколки глиняной «вазы» (№ 356) [5, № 192, 193, 303, 309, 313–352, 356].

В 1930 г. А. Н. Лявданский опубликовал фрагменты лепной керамики, найденной им в 1928 г. в остатках культурного слоя Замковой горы (Городище), датируя их домонгольским временем [10, с. 93–94, табл. X]. Керамика из фондов Института истории НАН Беларуси (сборы А. Н. Лявданского, 1928 г.) была опубликована О. Н. Левко в 1988 г. [11] (прилож. 1: *3*). Фактически этим исчерпываются опубликованные сведения о находках с Замковой горы.

Анализ материалов научного архива ВОКМ позволяет сделать вывод, что находки с Замковой горы находились в собраниях нескольких витебских дореволюционных музеев: в частном музее В. П. Федоровича и в музее при ВУАК, преобразованном позднее в музей при Витебском Высшем Педагогическом институте.

В довоенном собрании музея хранился «треножник-подставка к солнечным часам». На экспонате сохранилась надпись: «найдена в Замковой горе при постройке гимназии в 1877 г.» [13, л. 289об.–291, № 321] (прилож. 2: *4*)

Самым массовым материалом раскопок является керамика.

Сведения о керамике с Замковой горы – бытовой и архитектурно-декоративной, прослеживаются в описях предметов музея В. П. Федоровича и музея Пединститута. Как отмечалось выше, ее анализу посвящена работа Н. Я. Никифоровского.

В собрании В. П. Федоровича хранится любопытный комплекс, дошедший до наших дней (ВОКМ КП 525/1-16). Это «коллекция из 15 осколков глазурованной посуды с красочным растительным и геометрическим орнаментом». Тут же стереоскопический снимок раскопок на Замковой горе [13, л. 342об.–343, № 525].

Фотография уже довольно известна – экспонировалась на выставках, опубликована в ряде изданий [16, с. 36] (прилож. 1: *2*). Это пока единственный фотодокумент, запечатлевший момент раскопок на Замковой горе. На снимке хорошо просматриваются своды «арки с подвалом», а «15 осколков посуды»[3] – в основном расписные тарелки и майоликовые сосуды – являются типичными для слоев XVII–XVIII вв. Витебска. Подобные находки имеются в комплексах материалов раскопок Г. В. Штыхова, Л. В. Колединского, М. А. Ткачева, Т. С. Бубенько, О. Н. Левко, исследовавших в XX в. город [4; 9, рис. 28].

В коллекции В. П. Федоровича имелось и 4 фрагмента верхних частей сосудов-баклаг разного раз-

[1] Расположена на левом берегу р. Витьбы в 120–200 м от впадения в р. Западную Двину. Высота 15 м (к концу XIX в. – 9,0–10,5 м), площадь 0,7 га. Почти полностью срыта в конце XIX в.

[2] Л. В. Алексеев выявил в архивах Археологической комиссии «Дело о срытии Замковой горы в Витебске» и одним из первых собрал и обобщил сведения об ее истории [1, с. 228; 2, с. 102–105; 3, с. 62–63].

[3] На донце одного из фрагментов на обороте сохранились отверстия для крепления этой декоративной расписной тарелки на стене (ВОКМ КП 525/9).

мера с Замковой горы. Целый экземпляр баклаги[1] в его коллекцию поступил из ямы, заложенной под фундамент дома Ниренштейна на ул. Замковой у подножия горы.

Фрагменты и целая баклага запечатлены на сохранившейся фотографии музея В. П. Федоровича (ВОКМ н/в 7271/6).

На Замковой горе был найден еще один вид посуды – шаровидный, на поддоне с узким горлышком, – называемый в описях «сулея». Целый экземпляр высотой 10 см хранился в музее Пединститута [13, л. 2об.–3]. Запечатлен на фотографии (ВОКМ н/в 7271/8: 16) (прилож. 5: *12а*; прилож. 6: *12*).

В том же музее находились две вазы. Первая «разбитая терракотовая из светло-желтой глины, красиво орнаментированная черной краской (из 9 склеенных кусков нижней, 6 крупных и 16 мелких верхней части)» (прилож. 6: *13*). Вторая (из 14 осколков) большая терракотовая ваза «со следами росписи темно-серой краской (5 кусков от верхнего края 8 от средней части и один от основания)» (прилож. 6: *15*) [12, л. 322об.–323].

Еще один комплекс из собрания музея Пединститута долго остававшийся в тени, но постоянно привлекающий внимание, – это «коллекция и 48 осколков изящной глазированной и орнаментированной посуды» [12, л. 13об.–14, № 123; 13, л. 342об.–343, № 522].

Комплекс[2] сохранился до наших дней (ВОКМ КП 523/1–48) и представлен фрагментами полуфаянсовых кашинных золотоордынских и одного иранского сосудов XIII–XIV вв. с подглазурной и люстровой росписями, а также красноглиняных плиток с подглазурной бирюзовой и черной росписью (прилож. 7: *17–17а, 18–18а*). Аналогичная керамика на территории Беларуси была найдена в Новогрудке, Лукомле, Гродно, Слониме [8, фото 53–66]. Особняком в комплексе представлена византийская красноглиняная керамика, орнаментированная «сграффито», датируемая XII в. (по определению К. А. Лавыш). Это фрагменты центральных частей донцев сосудов на высоком кольцевом поддоне с декором на внутренней поверхности (прилож. 7: *19–19а, 20–20а*).

В комплекс также вошли два фрагмента импортных среднеазиатских сосудов [14, с. 264, рис. 12: *4*] из каменной светло-серой массы со штампованным орнаментом снаружи (прилож. 7: *16–16а*), а также два фрагмента местных изделий красноглиняной полихромной расписной тарелки и тигля.

Фрагменты керамики со штампованным орнаментом имеют близкие аналоги в материалах раскопок Нового Сарая [17, рис. 12.4]. По мнению Федорова-Давыдова это «керамика среднеазиатская или золотоордынская, изготовленная под влиянием среднеазиатских образцов» [17, с. 264].

Скорее всего, этот комплекс происходит с Замковой горы, а что из Витебска, бесспорно.

Можно предположить, что эта посуда принадлежала семье витебских князей. Возможно, золотоордынскую керамику привезла в Витебск тверская княжна Ульяния, ставшая второй супругой Ольгерда, а может быть, это подарок Александра Невского родителям жены. Византийские чаши (если они действительно византийские, а не являются золотоордынским подражанием византийским образцам) привезли с собой полоцкие князья, возвратившиеся из изгнания.

Архитектурно-декоративная керамика с Замковой горы имелась в собраниях музеев Пединститута и В. П. Федоровича.

В музее Пединститута была выделена коллекция изразцов, «найденных в Витебске главным образом на Замковой горе» [12, л. 134об.–14]. Среди них целые формы и фрагменты составляют порядка 79 предметов. К сожалению, описаны немногие из них и то схематично (табл.: {*11–90*}).

Несомненно, в богатой коллекции витебских изразцов В. П. Федоровича (а он в первую очередь коллекционировал геральдические) были экземпляры и с Замковой горы, но пока восстановить их не представляется возможным.

В числе «терракот» с Замковой горы в собрании В. П. Федоровича значились «четыре обломка гончарных полуциркульных оконных или дверных сводов из грубой, непромятой глины с большой примесью гальки размерами 7 × 11 × 16; 7 × 11 × 16; 7 × 11 × 26; 7 × 12 × 30 см» [13, л. 404об.–405, № 310–313]. Вероятно, это какие-то архитектурно-строительные элементы постройки (дворца), подвалы которой были обнаружены при раскопках 1895–1896 гг.

Еще один вид находок составил подколлекцию «замковых» предметов, таких, как: ядра разных размеров, картечные пули и так называемые гранаты (целые и осколки), которые в количестве 79 единиц находились в собрании музея Пединститута [12, л. 15об.–16, № 181–269].

В заметках на полях довоенных коллекционных описей В. Г. Краснянский отмечал, что: «как видно, из черновых заметок В. П. Федоровича и известно с его слов, составлена (подколлекция – *Н. Ш.*)

---

[1] «Целый, глиняный, в виде круглой коробки глазуров. зеленой поливой на 4 ножках с невысоким горлышком и двумя боковыми в верхней части ушками для ношения на шнурке; орнаментир. зубчатыми насечками на краевом ободке и тремя […] ободками на плоской стенке и внутри их волнообразными линиями. Выс. 15½ см; диам. 11½ см; в. горла 3 см; выс. ножек 1 ½ » [13, л. 334об.–335].

[2] Автор выражает глубокую признательность К. А. Лавыш за помощь в первичном определении материалов данного комплекса и в работе с ними.

из предметов, найденных на территории бывших Витебских замков, главным образом при раскопках Замковой горы». Подколлекция была представлена следующими предметами, частично схематично зарисованными В. Г. Краснянским.

I. Топоры железные

Богатая коллекция железных топоров в количестве 19 единиц, 12 из которых схематично зарисованы [13, л. 217–222]. Они представлены 8 узколезвийными и 6 широколезвийными видами.

Узколезвийные топоры имели длину от 12 до 19 см при ширине лезвия 5–7 см. Особняком в этой подгруппе массивный прямоугольный топор (прилож. 8: *25*) и узколезвийный топор наподобие птичьего клюва (по терминологии В. Г. Краснянского) (прилож. 8: *26*).

Длина *широколезвийных топоров* от 13,5 до 18 см. Ширина лезвия 9–13 см. К числу широколезвийных относится топорик с большим обухом и короткой лопастью, вероятно, некогда инкрустированный: «по обе стороны штамп с неразборчивыми знаками и орнаментом» [13, л. 222об.–223, № 18] (прилож. 9: *30*).

Еще один инкрустированный экземпляр имел «ближе к обуху на пластине следы знаков в виде лучей» [13, л. 222об.–223, № 16] (прилож. 9: *28*).

Топоры-секиры представлены двумя предметами с широкими плоскостями, один из которых имеет цельнометаллическую ручку (прилож. 10: *32, 33*).

В. Г. Краснянский по неведению отнес к топорам-секирам и орудие «лунообразной формы» с дугообразно выгнутым лезвием (прилож. 10: *31*). На самом деле это орудие труда кожевников (сапожников). Его изображение встречается на западноевропейских гравюрах и миниатюрах с XIV в.[1] (прилож. 11).

II. Наконечники копий, дротиков, стрел и другое оружие. Амуниция

Представлены шестью предметами. Из них три наконечника копья, два наконечника дротика и один, по терминологии В. Г. Краснянского, наконечник ощепа, а также один наконечник стрелы [6, 7].

Заслуживают внимания описание и зарисовки этих предметов, составленные В. Г. Краснянским [13, л. 222об.–223, 230об.–233] (прилож. 12: *34–40*).

Кроме наконечников копий, дротиков и стрелы, в описи В. Г. Краснянского значится и несколько других фрагментов оружия: рукоятей шпаг (прилож. 16: *42, 45*); «рукоятки меча» (прилож. 16: 44) и «обломка наконечника (клинка – *Н. Ш.*) меча» (прилож. 12: *41*). Предметы амуниции представлены 16-зубчатым колесиком от шпоры (прилож. 16: *43*) и ременной пряжкой от ружья.

III. Предметы домашнего обихода. Орудия труда и другие железные предметы

Ножей в описи В. Г. Краснянского насчитывалось 11. Из них 4 зарисовано (прилож. 17: *46–49*). Среди ножей один «с втульчатым насадом», а у двух сохранились рукояти: деревянная и костяная.

Ряд однотипных предметов из железа с Замковой горы хранились как в собрании ВУАК, так и в собрании В. П. Федоровича:

коллекция кованых гвоздей с различными шляпками (прилож. 20: *67*);

коллекция обувных подковок под каблук (прилож. 19);

оконные фигурные наугольники, дверные завесы с фигурными накладками[2] (прилож. 20: *62, 63*);

пробои и дверные крючки.

В описях также значатся: пряжка «с рельефной головой льва» (прилож. 18: *54*); цепочка с якорем (прилож. 18: *56*), петля с крючком (прилож. 18: *55*); железный циркуль; ножницы для резки железа; клещи; «железные грабельки о 8 зубцов» (прилож. 20: *65*); верхняя часть прута от ограды (прилож. 20: *66*); «витой железный стержень с обломанным концом, на другом конце кольцо», «круглый стержень. Один конец согнут в кольцо, в другом раздвоенном конце короткая пластинка на шарнире»; ключ.

Обращает на себя внимание тот факт, что в описях значится большое количество (5 штук) иголок разных размеров и форм [13, л. 231об.–233, № 81–85]. Следует отметить, что и сегодня фиксируется значительное количество случайных находок иголок в русле Витьбы у подножья Замковой горы, осевших в частных собраниях.

Точку в списке предметов, найденных на витебской Замковой горе, ставит случайная находка – «Вобраз Мадонны, знойдзен у 1914 г.» [14, л. 94об.–95, № 989].

Вот такие находки с Замковой горы, судя по сохранившимся описям, хранились в собраниях витебских дореволюционных музеев. Из них значительная часть относится к позднему средневековью, однако есть и интересные ранние формы, например так называемый клювовидный топор. Наличие инкрустированного оружия говорит о достатке обитателей данной месности. Это касается и сохранившейся керамики, среди которой много импорта.

[1] Автор выражает признательность С. Бабенко за поиски аналогов и определение предмета.

[2] В собрании ВУАК, а затем в собрании Пединститута были отдельно выделены и размещены на двух планшетах коллекции предметов, «найденных в Витебске при раскопках Замковой горы». На одном планшете находились 2 целые дверные завесы и один фрагмент от нее; 3 дверных крюка, угольника (для оконных рам – *Н. Ш.*), железная скоба, гвоздь и пуговица [12, л. 13об.–14]. На другом – 28 кованых железных гвоздей разной величины длиной от 5 до 15 см.

Выводы.

1. Находки с Замковой горы хранились в витебских музеях ВУАК (позднее – Пединститута) и в частном собрании В. П. Федоровича.

2. В музей ВУАК поступили непосредственно находки из раскопок, а в собрание В. П. Федоровича – преимущественно подъемный материал и случайные находки.

3. Среди находок с Замковой горы насчитывалось, по крайней мере, три инкрустированных предмета (два топора и один наконечник копья).

4. Наличие среди находок импортной керамики, аналогов которым не встречалось при более поздних археологических раскопках Витебска.

5. Среди находок большинство предметов датировано поздним Средневековьем, однако встречаются и предметы раннего периода. Выявленные предметы и комплексы требуют специального изучения на следующем этапе работы.

6. Сегодня в собрании ВОКМ выявлено порядка 90 предметов из раскопок Замковой горы, хранившихся в довоенных музеях.

7. Несомненно, в фондах ВОКМ сохранились и другие «замковые» находки, такие, как ядра, грузила и пряслица, но выявить их из общего числа музейных экспонатов пока не представляется возможным.

8. В изученных описях отсутствуют ювелирные изделия, но это не значит, что их не было. Скорее всего, они попали в опись раздела находок из русла р. Витьбы. Их еще предстоит выявить и изучить.

Литература

1. Алексеев, Л. В. Археологические памятники эпохи железа / Л. В. Алексеев // Вопросы этнической истории народов Прибалтики. – М., 1959. – С. 228.

2. Алексеев, Л. В. К истории топографии древнейшего Витебска / Л. В. Алексеев // СА. – 1964. – № 1. – С. 99–111.

3. Алексеев, Л. В. Западные земли домонгольской Руси: в 2 кн. – М.: Наука, 2006. – Кн. 1. – С. 62; 124–125.

4. Ганецкая, І. У. Маёліка на Беларусі ў XI–XVIII стст. / І. У. Ганецкая. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 120 с.

5. Змигродский (Змитроцкий), К. А. Каталог музея Витебской Ученой Архивной Комиссии / К. А. Змигродский. – Витебск, 1912.

6. Кирпичников, А. Н. Древнерусское оружие / А. Н. Кирпичников // САИ. Копья, сулицы, боевые топоры, булавы, кистени – М.; Л.: Наука, 1966. – Е 1-36. – Вып. 2. – 145 с.

7. Краснянский, В. Краткий очерк музейного строительства в Витебске / В. Краснянский // Віцебскі сшытак. – Віцебск, 2000. – № 4.

8. Лавыш, К. А. Художественные традиции восточной и византийской культуры в искусстве средневековых городов Беларуси (X–XIV вв.) / К. А. Лавыш. – Минск: Беларус. навука, 2008. – 208 с.

9. Левко, О. Н. Средневековое гончарство северо-восточной Белоруссии / О. Н. Левко. – Минск.: Навука і тэхніка, 1992. – 127 с.

10. Ляўданскі, А. М. Археалагічныя доследы ў Віцебскай акрузе / А. М. Ляўданскі // Працы БАН. – Менск, 1930. – Т. 2. – С. 93–94.

11. Левко, О. Н. Витебск: энциклопедический справочник / О. Н. Левко. – Минск: БелСЭ, 1988.

12. Научный архив Витебского областного краеведческого музея. – Ф. 8. – Д. 1.

13. Научный архив Витебского областного краеведческого музея. – Ф. 9. – Д. 1.

14. Научный архив Витебского областного краеведческого музея. – Ф. 17. – Д. 1.

15. Никифоровский, Н. Я. Гончарные терракоты Витебска по археологическим находкам / Н. Я. Никифоровский // Витебские губернские ведомости. – 1897. – № 135–138.

16. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск: БелЭн, 2002. – Кн. 1. – 648 с.

17. Федоров-Давыдов, Г. А. Раскопки Нового Сарая в 1959–1962 гг. / Г. А. Федоров-Давыдов // СА. – 1964. – № 1. – С. 248–271.

Рэзюмэ

Н. Ю. Шаркоўская

Знаходкі з Замкавай гары ў зборах віцебскіх музеяў

У публікацыі разглядаюцца пытанні пошуку і вызначэння знаходак з Замкавай гары горада Віцебска.

Замкавая гара (Ламіха) – адзін з апошніх унікальных старажытных гістарычных і археалагічных помнікаў Віцебска, які ўжо не існуе.

У раннім жалезным веку на ёй знаходзілася гарадзішча. У сярэдневякоўі – гэта месца , дзе быў размешчаны летапісны дзяцінец і княжацкі двор.

Культурны пласт гары працяглы час захоўваў памяць і звесткі аб старажытным мінулым горада. Шмат аб чым ён здолеў бы яшчэ расказаць, каб гара не была знішчана ў 1890-ыя гады.

Таму ў дадзеным артыкуле сабраны звесткі, што захаваліся ў навуковым архіве і фондах ВАКМ (Віцебскага абласнога краязнаўчага музея), аб знаходках з Замкавай гары, якія паступілі ў розныя віцебскія музеі і прыватныя зборы напрыканцы XIX – першай чвэрці XX ст. Апублікаваны вынікі работы па выяўленні гэтых знаходак, што захаваліся ў зборы ВАКМ, прыведзены іх фотаздымкі.

У дадаткі ўключана табліца, складзеная па рукапісным вопісам віцебскага краязнаўцы В. Г. Краснянскага з пералікам і кароткім апісаннем знаходак з Замкавай гары, перадазенных ВОКМу ў даваенны перыяд. Замалёўкі некаторых з іх, зробленыя В. Г. Краснянскім, таксама размешчаны ў артыкуле.

Выяўленныя матэрыялы змяшчаюць новую інфармацыю па старажытнай гісторыі Віцебска і могуць зацікавіць даследчыкаў.

Summary

N. Sharkovskaya

Finds from the Castle hill of Vitebsk in Vitebsk's museums

The questions connected with search and revealing of finds from the Castle hill of Vitebsk are considered in the article.

The Castle hill of Vitebsk of Lomiha is one of the last unique ancient historical and archaeological parts of Vitebsk.

There was the hill-fort in the Iron Age. Then it was the residences of Vitebsk princes in the Middle Ages. Under the legend the Kiev princess Olga ordered to put Vitebsk here. This hill kept valuable artefacts for the long time but it was destroyed in late 1890s.

Today every scholar, addressing to the ancient history of Vitebsk, on particles collects the information about subjects which were found on it. Therefore this publication is the data which are available in scientific archive and funds of Vitebsk regional museum of local history.

There is the table with brief description of finds from the Castle hill of Vitebsk, acted in museum before the 2nd world war made under hand-written inventories of Vitebsk regional scholar V. G. Krasnyansky in the appendix. There are some drawings of finds made in V. G. Krasnyansky's inventories, too.

These materials are of interest for researchers and contain the new information on ancient history of Vitebsk.

Поступила 25.02.2011

Находки с Замковой горы Витебска
(из Описи предметов археологии довоенного музея, составленной В. Г. Краснянским)

Номер по описи В. Г. Краснянского	Откуда поступил	Предмет и его описание. Размеры. Материал. Состояние	Архивный источник	Рисунок, фотоизображение предмета (приложение)	Место хранения
1	Музей В. П. Федоровича № 456, 457, 458	Узкий боевой топор с овальным обухом с широким отверстием; большей части лезвия, съеденной ржавчиной, нет. Длина 12,5 см, ширина 7,0 см. Отверстие 3,0 см. Железо. Изъеден ржавчиной, конца нет	ВОКМ н/а, ф. 9, д. 1, л. 217об.–219	Не имеется	Не известно
2	То же	Узкий боевой топор, прямо сверху и дугообразно изогнутый снизу, постепенно расширяющийся от обуха (гнезда) к лезвию. Длина 13 см, ширина 3,0–5,5 см. Отверстие 3,0–3,5 см. Железо. Заржавел	То же	То же	То же
3	– » –	Узкий боевой топор, совершенно прямой с несколько расширенным острием. Длина 13 см, ширина 3–5 см. Гнездо 3,0 × 3,5 см. Железо. Заржавел	– » –	Зарисован В. Г. Краснянским, рис. 21 (прилож. 8)	– » –
4	– » –	Такой же топор. Длина 15 см, ширина 2,5 × 5,0 см. Гнездо 3,5 × 4,5 см. Железо. Заржавел	– » –	Не имеется	– » –
5	– » –	Боевой топор с овальным обухом и шипом снизу и с постепенно расширяющимся лезвием, прямым сверху и дугообразно расширенным снизу. Длина 16 см, ширина 2,75–5,25 см. Гнездо 3,0 × 3,5 см. Железо. Заржавел	– » –	Зарисован В. Г. Краснянским, рис. 22 (прилож. 8)	– » –
6	– » –	Топор того же типа, но на обухе с двух сторон по язычку вверху и внизу (всего 4). Длина 17 см, ширина 3–7 см. Гнездо 4 × 4 см. Железо Заржавел	– » –	Зарисован В. Г. Краснянским, рис. 23 (прилож. 8)	– » –
7	– » –	Топор того же типа, но боковых язычков на обухе нет, а только сзади по одному вверху и внизу. Длина 19,5 см, ширина 2,75–7,00 см. Гнездо 3,5 × 4,5 см. Железо. Хорошая сохранность	– » –	Зарисован В. Г. Краснянским, рис. 24 (прилож. 8)	– » –

Продолжение табл.

Номер по описи В. Г. Краснянского	Откуда поступил	Предмет и его описание. Размеры. Материал. Состояние	Архивный источник	Рисунок, фотоизображение предмета (приложение)	Место хранения
8	Музей В. П. Федоровича № 456, 457, 458	Такой же; длина обуха с с язычками 7 см. Длина 19 см, ширина 2–6 см. Гнездо 4,00 × 4,25 см. Железо. Загрязнен	ВОКМ н/а, ф. 9, д. 1, л. 217об.–219	Не имеется	Не известно
9	То же	Топор другого типа: широкий массивный четырехугольный обух; верхний край острия прямой, нижний – фигурный. Длина 20 см, ширина 3,5–7,0 см. Обух 5 × 7 см. Гнездо 3,75 × 5,00 см. Железо. Заржавел и покрыт какой-то синей окисью	То же	Зарисован В. Г. Краснянским, рис. 25 (прилож. 8, 14), фото 25а (прилож. 14)	ВОКМ КП 188
10	– » –	Узкий плоский своеобразной формы топор наподобие птичьего клюва. Длина 17 см, ширина 1,5–3,0 см. Отверстие круглое диаметром 4 см. Железо. Сильно заржавел	– » –	Зарисован В. Г. Краснянским, рис. 26 (прилож 8, 14), фото 26а (прилож. 14)	ВОКМ КП 171
11	– » –	Топор с широким лезвием из железной пластины с большим дугообразным выступом снизу. Длина 18 см, ширина 1,0–11,5 см. Длина обуха 8 см. Гнездо 3,5 × 4,0 см. Железо. Изъеден ржавчиной	– » –	Зарисован В. Г. Краснянским, рис. 27 (прилож. 9)	Не известно
12	– » –	Топор такого же типа. Длина 17,5 см, ширина 1,5–9,5 см. Длина обуха 8,5 см. Гнездо 4 × 4 см. Железо. Заржавел. Конец острия обломан	– » –	Не имеется	То же
13	– » –	Такой же, но с более широкой пластинкой острия. Длина 17 см, ширина 2–9 см. Длина обуха 6,5 см. Отверстие 3,0 × 3,5 см. Железо. Нижняя часть обломана	– » –	То же	– » –
14	– » –	Такой же топор с более узким лезвием. Длина 17 см, ширина 2,0–6,5 см. Длина обуха 7 см. Гнездо 3,5 × 4,0 см. Железо. Заржавел	– » –	– » –	– » –

15	– » –	Топор своеобразной формы, с узким обухом и широким лезвием; отверстие двойное; ближе к обуху на пластине следы знаков в виде лучей. Длина 14 см, ширина 3,0–13,5см . Длина обуха 3 см, ширина 4 см. Железо.	– » –	Зарисован В. Г. Краснянским, рис. 28 (прилож. 9)	– » –
